Аксана
БЯЗЛЕПКІНА

# Ляўша на тэнісным корце



Ляўша на тэнісным корце
Моцарт і Моцарт
Улляна, або Нарадзі ў сабе гейшу
Смерць на роліках
Нястрымнае жаданне
Забойства ў студэнцкім інтэрнаце

Аксана
БЯЗЛЕПКІНА

# *Ляўша на тэнісным корце*

*Аповесці
і апавяданні*



Аксана
БЯЗЛЕПКІНА

# *Ляўша на тэнісным корце*

***Аповесці і апавяданні***

Мінск
«Беларускі кнігазбор»
2002

УДК 882.6-3
ББК 84 (4 Беи) 6-44
Б 99

**Бязлепкіна А.**

Б 99 Ляўша на тэнісным корце: Аповесці і апавяданні/ А. Бязлепкіна. — Мн., «Беларускі кнігазбор», 2002. — 352 с.

ISBN 985-6638-58-5.

Творчасць маладых (аўтарка — студэнтка філфака БДУ) цікавая не столькі літаратурнай формай твора і зместам (змест усяго створанага на зямлі — жыццё ва ўсёй яго паўнаце, за рамкі якога нікому выйсці не ўдалося — ды і ці ёсць патрэба), а сваім маладым голасам, маладым позіркам на акаляючы свет і сённяшнюю рэчаіснасць. І менавіта позіркам і голасам творы маладых асабліва цікавыя.

УДК 882.6-3
ББК 84 (4 Беи) 6-44

ISBN 985-6638-58-5

© Бязлепкіна А., 2002
© Глекаў А., Бязлепкіна А., афармленне, 2002

## ЛЯЎША НА ТЭНІСНЫМ КОРЦЕ

Я вельмі люблю тэніс. Праўда, ужо васемнаццаць год не бяру ў рукі ракетку і не збіраюся яе браць. Я намагаўся забыць здарэнне, якое перакуліла маё жыццё, але ўчора гэтая гісторыя ажыла на экране майго тэлевізара. Сын досыць эмацыянальна сачыў за падзеямі чарговага тэніснага турніру і быў заўзятарам нейкай дзяўчыны-спартсменкі. І калі яна перамагла, сын кінуўся абдымаць маці, а пасля ад радасці збіў кулаком газету, якую я чытаў, і амаль што крыкнуў:

— Як ты можаш быць такім абыякавым? Беларуска перамагла!!!

— Беларусы шмат дзе перамагаюць, — я адказаў стрымана і, не маючы жадання падтрымліваць гэтую бессэнсоўную размову, пачаў распраўляць пакамечаную газету.

— Ты проста не бачыў, што там было... Гэтая амерыканка нават не спрабавала адбіваць мячы, яна ўцякала, круцілася, як на патэльні, каб у яе мяч не патрапіў. А Хрысціна — віртуоз! Яна як машына, ніякага хвалявання, бясконцая ўпэўненасць... О, зараз усе будуць ведаць, дзе на карце знаходзіцца Беларусь! Але самае галоўнае, што яе фоткі ва ўсіх часопісах. Я таксама купіў, — Валерка не вытрымаў, каб не пахваліцца, і разгарнуў нейкі глянцавы часопіс.

Што ж... Знаёмы твар... такія родныя вочы, усмешка... і рука... Гэта было як насланнё, як жывое ўвасабленне таго жаху, што я перажываў столькі год... Я нават жонцы ніколі не расказваў пра тое, што здарылася за год да нараджэння Хрысціны...

Значыць, Міраслава стала трэнеркай уласнай дачкі... Малайчына, Міра! Хто б мог падумаць, што яна з дачушкай дасягне такіх вяршыняў.

Наступную гульню я глядзеў разам з сынам. Нястомныя рухі, вылітая, як з металу, фігура, рэкламная, зусім небеларуская ўсмешка... і рука. Хрысціна была ляўшой, але зараз гэтым нікога не здзівіш. Тэніс — адзінае поле чалавечай дзейнасці, дзе якраз ідзе дыскрымінацыя праварукіх людзей. Ляўшам усюды дрэнна: усе дзверы ў шматлікіх установах зроблены так, каб іх было зручна адчыняць правай рукой, у банках асадку прымацоўваюць з разлікам на правую руку, ляўшы мусяць пісаць злева направа, хоць для іх гэта ненатуральна, на лекцыях ва універсітэце іх садзяць з краю, каб не піхалі суседа левай рукой, а калі ляўша навучыцца граць на гітары, то вымушаны насіць усюды з сабой менавіта сваю гітару, не будзеш жа струны перастаўляць... Ляўшам паўсюдна дрэнна: у малодшых класах, ва універсітэтах, у офісах... Ім добра толькі ў тэнісе. Так што тэнісістка-ляўша сёння ўжо нікога не здзіўляе. І ўсё ж маю памяць на тым часопісным фотаздымку абудзіла менавіта яе левая рука... Калі гэткую руку яна зрабіла сваёй візітнай карткай, я магу яе толькі павіншаваць...

У мае развагі цвіком убіўся звонкі голас сына:

— Можа, і мне пазаймацца тэнісам? Як ты думаеш? — сын замахнуўся ўяўнай ракеткай.

— Не, — я не здолеў схаваць свой страх і, за секунду прыдушыўшы баязлівыя інтанацыі ў голасе, безуважна дадаў: — Гэтае пытанне не будзе нават абмяркоўвацца.

— Ну, тата! — узвіўся сын.

— «Тата, тата», — я заўжды ўдала пераймаў сынавыя інтанацыі, — не з тваімі адзнакамі! Скончы школу, тады пагаворым. У адзінаццатым класе раскідацца сваім часам? Гэта немагчыма! У твае гады я паспяхова вучыўся! — распачаў я заўсёдную гаворку.

— Ах, так? Ды я гэтую школу ўвогуле кіну! — Валерка звыкла і таму няшчыра шантажаваў мяне. — Мне там нецікава, ты разумееш? А тэніс... Можа, гэта мой лёс? А ты ўсё псуеш, сунешся са сваёй вучобай!

Валерка ўжо не першы раз нагадваў мне пра жаданне заняцца тэнісам. І я шматкроць адмаўляў яму, забараняў. Без аніякіх тлумачэнняў, калі не лічыць сталае ўпіканне зашмальцаваным дзённікам, дзе бацькоў ветліва, а пасля і не вельмі, запрашалі ў школу. Валерка адчуваў, што гэта звычайная адгаворка дарослых. Значыць, надышоў час. Я ведаў, што калісьці я буду пакутваць за сваё баязлівае маўчанне, падмацаванае шчырай сімпатыяй да Міраславы. Гэта было натуральна, і я не ўяўляю сабе мужчыну, які паставіўся б да яе непрыхільна.

О, яна была на ўсе густы: дасканалая фігурка — для эстэтаў, аматараў зрокавай асалоды, і незвычайная дасціпнасць — для інтэлектуалаў. Але насамрэч яна нікому не належала, нават здавалася, што яна свядома пазбягае больш блізкіх узаемаадносін з людзьмі, хоць гэта мала стасавалася з ейнай працай — яна была трэнеркай па тэнісу.

Міраслава была дзіўнай, і я не мог зразумець яе. Яна ахвотна размаўляла пра розныя адцягненыя рэчы, смяялася з нашых ідыёцкіх жартаў і недарэчных кампліментаў, але ўпарта адсякала ўсе спробы прыватных кантактаў. Ёсць корт, і ёсць яна. Па-за кортам яе не было. Я не ўяўляю, як можна было б спытаць, што яна робіць вечарам. Яе твар камянеў, яна высока падымала галаву і холадна адказвала, што мы плацім толькі за яе час на занятках, а ў вольныя гадзіны яна мае права на прыватнае жыццё. Гэта было смешна, нібыта я ці мой сябра хацелі прыдбаць Міраславу ва ўласнасць. Я грашыў на яе няўдалы любоўны досвед, а сябрук цынічна зазначаў, што Міраславу не цікавяць мужчыны. Але нашто майму сыну ведаць пра тыя брудныя гіпотэзы, і я пачаў здалёк.

— Валера, прынясі мой альбом, — я спадзяваўся заінтрыгаваць сына, які ведаў, што без патрэбы я фотаздымкі не разглядаю.

— Сынок, я раскажу табе казку, — млява расцягнуў словы Валера, але пыльны фаліянт усё ж прынёс. — Можа, гэта старасць? Я занадта часта чую ад цябе: «Калі мы былі маладымі...»

— Выбачай, я не скеміў, што гэта табе так надакучае, — я шукаў патрэбны фотаздымак. — Ты ведаеш, хто гэта? — я тыцнуў пальцам у малады твар.

— Ну, мабыць, нейкі твой сябар, вось вы на наступнай старонцы побач. Навошта ты мне ўсё гэта паказваеш, я на памяць усіх ведаю. Зрокава. Ты ж ніколі нічога не тлумачыш, не расказваеш, нібыта тваё жыццё незваротна засакрэчана і пыліцца ў архіве, — справядліва папракнуў мяне сын.

— Вось я і наважыўся выправіцца. Дык будзеш слухаць «казку», сынок? — паіранізаваў я.

Сын згодна кіўнуў, а сам кінуў вокам у тэлепраграму: праз гадзіну мусіў быць нейкі фільм. Што ж, трэба мірыцца з тым, што дзеці жывуць ад фільма да фільма і спатканні прызначаюць, зверыўшы час з праграмай.

— Я калісьці граў у тэніс... — Я чакаў, што Валера здзівіцца, і ён сапраўды зацікаўлена падняў галаву. — А гэты хлопец на фотаздымку — мой лепшы сябар. Зваць Табіян.

— Табіян? — здзекліва перапытаў Валерка. — У яго бацькі былі вычварэнцы? Так жыццё дзіцяці сапсаваць! Слухай, а як яго скарочана? Табу? А дзецям якая пакута: Табіянавіч ці Табіянаўна!

— Мы раслі разам, і для мяне ён быў проста Тобка. Мы былі як спарышы: заўжды разам. Я сябе без яго не памятаю. — Валерка памкнуўся нешта спытаць, але я рукой паказаў, маўляў, слухай. — Школа, універсітэт... Час быў зменлівы, бурны, выплывалі самыя кемлівыя, і ў ягонага бацькі ўсё атрымалася. Гэта быў, як мы зараз кажам, канец XX ста-

годдзя, але тады ніхто не ўсведамляў значнасці і незвычайнасці пераломнага моманту, мы проста жылі. Тобка запрасіў мяне ў бацькоўскую фірму. Ад ягонага невыноснага характару мяне ратавала толькі мая прывычка да ягоных выбрыкаў. У офісе ж усе стагналі: яго выключная памяць і гэткая ж выключная помслівасць вымушалі цярпець Тобкавыя здзекі, і насмешкі, і абразы... І калі я намагаўся стрымаць яго, ён спрабаваў пагражаць і мне ці то звальненнем, ці то помстай праз забойства. Ён ведаў, што я не пакрыўджуся.

— Ты яму быў як хлопчык для біцця? Ён табе ў лыч, а ты яму «дзякуй»? — Валерка відавочна абурыўся за маю негераічную маладосць.

— Ты можаш называць гэта як заўгодна, але я быў адзіным чалавекам, які мог сказаць Тобку праўду, мог хоць неяк паўплываць на яго. Так што, Валера, я не думаю, што ўсё было так дрэнна. Дрэнна стала пасля. Тобка вырашыў заняцца сваім жалезным здароўем. Як на мой тадышні погляд, гэта было нахабнае марнаванне грошай. Тэніс быў патрэбны Тобку, каб хваліцца, а не гуляць у яго. А каму? Нельга ж спыняць людзей на праспекце і выхваляцца. А каб нібыта прызнацца, як на споведзі, дык не было каму. Шчырых сяброў не было, яго выкідалі вонкі з любога сяброўскага кола. Напрыклад, нехта скардзіцца на жонку без спадзеву на нейкія парады. А Тобка перапыняў няшчаснага і сам пачынаў ганіць чужую жанчыну. Муж спрабаваў яе абараніць і Тобку больш ніколі не спавядаўся. Ды і ніводная дзяўчына вытрымаць яго не магла. Уяві, яны выпраўяцца ў госці, а ён дарогай пачынае дакалупвацца, а што гэта ў цябе за сукенка абы-якая, а нашто ногі выставіла альбо нашто схавала, а нашто нафарбавалася, як прастытутка, і з рота ў цябе ўчарашняй вячэрай тхне. Ну, якая дзяўчына стрывае? Ён, мабыць, хацеў з іх зомбі закамплексаваных зрабіць, але яны своечасова ўцякалі, — сёння гэта дзіўна і недарэчна, а тады мяне гэта не абыходзіла.

— Хворы быў хлопец, — вырвалася ў Валеркі.

— Ну, хворы ці не хворы, не табе меркаваць, — я лічу, што нельга дазваляць сыну ацэньваць дарослых, малы яшчэ. — Тобка тры разы на тыдзень ірваўся на корт і ўсё мяне запрашаў, а я адмаўляўся: у офісе толькі тады і можна было паспяхова працаваць, пакуль не было маладога шэфа. Карацей, клопату хапала і без тэнісу. Ну, і недзе праз месяц знясільваючых заняткаў ён прапанаваў мне прыйсці проста паглядзець. Калі ласка, я прыйшоў.

Валерка ўважліва слухаў мой зацягнуты расповед, а я адразу ўспомніў, як я ўпершыню пабачыў Міраславу. Яна ішла нам насустрач — і я зразумеў Тобкаву апантанасць тэнісам. Спартыўнай загарэлай фігуркай яе захацеў бы авалодаць кожны мужчына, ды, вылізаная нашымі позіркамі, Міраслава нікога не заўважала вакол сябе.

Я хацеў бы да яе дакрануцца, да яе моцных рук і спартыўных ножак, да яе шыі, да яе цела, якое нібыта само прасілася ў абдоймы. Мая прага дакранання ў прамільгнула як маланка. І за эфектнай знешнасцю я ўбачыў асобу. Міраслава была жвавай і смяшлівай, гэта першае, што прыходзіць у галаву, калі я ўспамінаю Міру. Я мог бясконца глядзець, як яна смяецца, а яна — магла смяяцца бясконца: ніжняя губка па-дзіцячы адтапырвалася і аднекуль з грудзей вырываўся смех, вочы прымружваліся — яна цалкам аддавалася сваім эмоцыям. Але адзін смелы і выклікальны позірк — і яна хавалася ў свой «панцыр». Я не мог зразумець, чаго яна баіцца. Яна не хацела, каб яе ўспрымалі як жанчыну? У яе ж і прафесія крыху бясполая — трэнер. Не жанчына, не мужчына, а трэнер. Праўда, на тых жа кортах працавала трэнерка, на якую мужыкі сыходзіліся проста паглядзець. Міраслава ж была зусім іншай. У кожнай жанчыны павінна быць таямніца, але такая, каб яе можна было паспяхова выкрыць. Міраслава ж была ў палоне свайго сакрэту, здавалася, што

менавіта ён дыктаваў Міры і схему паводзінаў, і манеру размовы, і адстароненасць дачыненняў. Мяне прыцягвала яе зачараванасць, але Валерку пра мае пачуцці да Міраславы ведаць, вядома ж, было не трэба.

— І я прыйшоў, — задумліва паўтарыў я. — Глядзець не было на што. Міраслава, яго трэнер, з лёгкасцю выйгравала сет за сетам, гейм за геймам. Тобка выціраў пот, чырванеў, але быў нязменна ветлівы і ўсмешлівы. А вось гэта мяне здзівіла: у офісе наш Табіян Казіміравіч лаяўся на сакратарку, кідаўся тэлефоннай трубкай, а аднойчы, калі ў самы непрыдатны момант у друкарцы скончыўся картрыдж, Тобка пхнуў яго нагой так, што толькі «пер’е» паляцела. Таму я не верыў, што яго магла стрымліваць прысутнасць дзяўчыны, джэнтльмен — гэта не пра Табіяна.

— Закахаўся! — выгукнуў Валерка з незразумелым мне зларадствам.

— Табе абы закахацца! Валер-кавалер! — не пагадзіўся я. — Не, я спачатку нават не мог сцяміць, у чым тут прычына. І ўсё — інакш і быць не магло — растлумачылася ягонай помслівасцю. Прайграўшы чарговую гульню, Табіян падышоў да сеткі і, калі Міраслава працягнула яму руку для поціску, пацалаваў яе мазолістую далоньку. Міраслава толькі рассмяялася. Я быў уражаны — не тэнісны корт, а школа этыкету. Я ўжо — быў грэх — падумаў, што Тобка перавыхаваўся, але я сам жа гэтую вар’яцкую думку і адпрэчыў. І правільна зрабіў! У тыя часы я мог бы кнігу напісаць «Правілы карыстання Табіянам Яўнутам».

— Ну і ў чым была фішка? — пацікавіўся Валерка.

— Усё вытлумачылася вельмі проста. Калі Табіян пайшоў пераапранацца, Міраслава падышла да мяне і прапанавала, каб я таксама заняўся тэнісам.

«О, не, што вы, я зусім не спартовец!» — вымушаны быў прызнацца я. І яна, зразумеўшы, што голымі рукамі мяне ў тэніс не зацягнуць, расказала ўсё як ёсць. «Тут выйшла такая непрыемная гісторыя. Я ўпэўненая, што Табіян вам не расказваў, але... Ведаеце, ой, ну канешне ж, вы ведаеце, што ён па натуры пераможца, і я бачыла, што ён ледзь трывае. І на мінулым тыдні я паддалася, прайграла адзін гейм: адзін раз нібыта не дабегла да мяча, другі — адбіла мяч ў аўт. Ён бессаромна трыумфаваў. Але калі прайграў наступныя геймы, то ўсё зразумеў. Але выгляду не падаў! І гэта самае страшнае, калі б ён даў волю эмоцыям — гэта было б натуральна». Валерка, я адчуў, што яна яго баіцца... Ці нават не баіцца, а вінаваціць сябе за ягоныя перажыванні. Яна не хацела з ім сварыцца, — я шукаў вытлумачэння іхніх паводзінаў.

— Значыць, яна закахалася! — Валерка лічыў, што ўсе жаночыя дзеянні можна растлумачыць праз каханне.

— Не, я тады мог толькі канстатаваць факты, але не інтэрпрэтаваць. Міма нас нехта прайшоў, і Мірaслава спужана зірнула ў бок раздзявальні, вінавата паглядзела на мяне і нарэшце прызналася, што Тобка нават ужо не мацюкаецца, калі мяч не адаб'е. Ён хлопец эмацыянальны і кожны пракол падмацоўваў адпаведнымі выразамі. І я згадзіўся выратаваць Мірaславу.

Валерка толькі раскрыў рот, як я яго апярэдзіў:

— Не, Валерык, я не закахаўся.

— Ды я не тое хацеў сказаць, — выкруціўся мой падазроны сынок. — Я хацеў спытаць, доўга ты яшчэ? Ці ты хочаш серыял зрабіць: кожны вечар новая частка аповеду?

— Ну, калі табе нецікава, дык што ты маўчыш? А то я выглядаю як кат: прымушаю сына слухаць гісторыі сваёй маладосці! — Па майму голасу было чуваць, што я не крыўджуся.

— Я не пра тое... Ты, татусь, проста здзекуешся! Заінтрыгаваў, а нічога не раскрываеш, — Валера чакаў найхутчэйшага завяршэння гісторыі.

— Я расказваю, як расказваецца. Так што, калі пачнецца твой фільм, ціхенька вазьму свае газеты і сыду ў спальню, згода? — я здолеў крыху супакоіць Валеркаву нецярплівасць. — Вечарам таго ж дня за півам я нязмушана, як мне падалося, пажартаваў: «Тобка, ты, можа, закахаўся ў сваю трэнерку? Гелена-сакратарка ніколі не забудзе, што ты ёй сказаў на неадпраўлены факс. А тут ты проста сама выхаванасць!» А ён зусім абыякава назваў Мірaславу машынай для забівання галоў і заглыбіўся ў куфаль з півам, каб не адказваць далей. І я згадзіўся гуляць разам з Тобкам у тэніс.

І я ўжо ведаў, што адкажа Тобка: «Я ж даўно табе казаў, трэба займацца сабой. А то дзяўчаты разбіраюць поўсць на тваіх дохлых грудзях!» — Ох, любіў Тобка пажартаваць з маёй валасатасці, ведаў, што мне гэта не падабаецца. «Лепш я буду з поўсцю, чым мая дзяўчына!» — звыкла адмахнуўся я. Валерку, напэўна, не спадабалася б такая наша размова, і таму я дыпламатычна абмінуў гэтыя падрабязнасці.

— Увесь час я падладжваўся пад Тобку. У дзяцінстве, калі мы былі суседзямі, ягоная мама прасіла, каб мы не крыўдзілі Табіяна, бо ён вельмі нервовы хлопчык. Яго нервовасць з гадамі не паменшала, а ў мяне выпрацавалася звычка ва ўсім яму саступаць. Уседазволенасць не сапсавала Тобку: не было ўжо куды псаваць. Як я ўжо казаў, Тобка быў жывёлай помслівай. Менавіта праз гэта я вырашыў дапамагчы Міраславе, бо яе шчырасць і даверлівасць схілялі мяне на яе бок.

Я мусіў заняцца тэнісам і не кідаў ненавісную ракетку толькі таму, што адчуваў адказнасць за Міраславу. Яна сачыла за кожнай нашай гульнёй, рабіла разбор палётаў і, самае галоўнае, калі ў мяне

зусім не атрымлівалася падача, яна станавілася за мной, блізка-блізка, брала маю руку ў сваю і паказвала правільны рух. Я адчуваў спінай яе цеплыню і не думаў пра тэніс. Праз некалькі тыдняў цяжкіх занямкаў я пачаў усведамляць, што яна мне вельмі падабаецца.

Я, вядома ж, не мог выйграць у Тобкі, бо стаж навучання істотна розніўся, а гэты мсціўца крыху акрыяў пасля некалькіх чыстых перамог. І ўсё ж не пакідаў ён мары перамагчы саму Міраславу. Але, Валера, сам падумай, яна ж спецыяльна вучылася, столькі год трэніровак. Як можна было яе перамагчы?

— Ну, можна што-небудзь прыдумаць! Руку за спіну прывязаць! Дамовіцца з кімсьці, каб ёй перад самай падачай крычалі «га»! Спужаецца, і ўсё! — Валерка заўсёды быў добрым вынаходнікам розных несумленнасцяў.

— Ён прыдумаў прасцейшы варыянт. На корце перамагчы яе немагчыма, значыць, трэба біць у іншае месца, — услых разважаў я.

— У галаву, — засмяяўся Валерка.

— У сэрца! — выгукнуў я. — Тобка зацікавіўся яе таямніцай. Ён меркаваў, што трапіць у ейны ложак будзе добрым рэваншам. І ён лічыў, што гэта зрабіць прасцей, чым перамагчы яе на корце. У ложку з Міраславай! Я не верыў, што яе можна спакусіць, проста не верыў. А Тобка са звыклай заўзятасцю кінуўся ў новую авантуру.

— Атрымалася? — амаль шэптам спытаў Валерка, спадзеючыся на якуюсьці непрыстойную гісторыю.

— Лепш бы не атрымалася! — з болем вырвалася ў мяне. — Ён цалкам змяніў свае паводзіны. Ягоная напятая ветлівасць перакінулася ў сапраўднае, шчырае пакланенне, натуральную павагу і захапленне. Вітаючыся з Міраславай, ён моршчыў ва ўсмешцы свой пацучыны носік і маленькі рот. Гэта выгляда-

ла так... так... не ведаю, як сказаць... гэта было насамрэч. Я ведаў Тобку і таму здагадваўся, што гэта двайная гульня, але немагчыма было яго падлавіць. Я нават сам пачынаў сумнявацца ў яго няшчырасці. Тобка паводзіў сябе менавіта так, як трэба было ў гэтай сітуацыі. Ён ні разу не прынёс Міры кветак ў час сваіх заляцанняў. На 8 Сакавіка ён сарамліва прамовіў: «Віншую!» І калі ён здолеў падмануць мяне, то што казаць пра Міраславу? Яна маральна падрыхтавалася да нейкіх прапаноў і запрашэнняў, мабыць, меркавала, што ён захоча сустрэцца з ёй па-за кортам. А ён маўчаў. Ніякіх спробаў, ніякіх прыватных пытанняў, нічога.

— І праз месяц ён сарваў яе, як спелы яблык, — здагадаўся Валерка.

— Праз тры месяцы, — удакладніў я. — Ён не раскідваўся кампліментамі. Яна проста зразумела з ягоных паводзінаў, што яе ранейшае жыццё і нейкія праблемы яго не датычаць, што ён прыме яе любой, што яна ўжо нічога не зможа зрабіць, каб разбурыць ягонае каханне. Яна адчула, што ён надзейны. Для жанчын гэта вельмі важна.

— А ён яе ўсё адно не кахаў? — Валерка не верыў, што можна так удала жангляваць пачуццямі.

— Мне здаецца, яна зразумела, што сама вінавата ў тым, што яе баяцца мужчыны. І крыху палагоднела, пачала правакаваць нас на досыць... ну, такія... тэмы, — я не ведаў, як патлумачыць сыну ўсё гэта.

— Я ўжо дарослы і ведаю такія-сякія слоўцы для абазначэння такіх-сякіх тэм, — разрагатаўся сын. — І калі ты зараз пачнеш сюсюкаць альбо называць усё залішне апісальна... — падбухторыў сын, які ўжо адчуў, што ў мяне большая патрэба гэта расказваць, чым у яго слухаць.

Што ж, ён меў рацыю, я на некага павінен быў скінуць гэты цяжар, з кімсьці раздзяліць свае падазрэнні. Я давяраю жонцы, але не змог расказаць

ёй, яна замітусілася б, перапужалася, а мне трэба было, каб нехта не паверыў мне і сказаў, што я ўсё гэта прыдумаў, што ўсё гэта няпраўда, хлусня і мае здагадкі. І вось я дажыў да таго часу, калі адшукаў патрэбныя мне спакой і надзейнасць у сваім сыне. А гэта вельмі важна — адчуць плячо сябра, які адначасова з'яўляецца тваім дзіцем. Выгадуй сабе самага надзейнага сябра — вось быў бы добры лозунг для актывізавання нараджальнасці ў нашай краіне.

— Насамрэч! Буду шчырым. Яна пачала спакушаць яго. Разумееш, тая праблема, той комплекс, што атруціў ёй жыццё, здаваліся дробнымі ў параўнанні з той сарамлівасцю, якую выяўляў Тобка. Ён паказаў, што самы закамплексаваны чалавек у свеце — ён. І тым вымушаў яе ратаваць яго ад сябе самога... Валера, так ужо сталася, што чыстага кахання не бывае. Гэта фікцыя і прыдумка рамантыкаў! Ты сам пасля адчуеш, — я зірнуў на сына і раптам зразумеў, што ён сапраўды ўжо дарослы. — Пасля адчуеш ці, можа, ужо адчуў, што да пачуццяў заўсёды прымешваецца нешта яшчэ. Ты нават і жадаць гэтага не будзеш, а так атрымаецца. Напачатку ты вар'яцееш: «А што ж яна пра мяне думае?» Пасля пачынаеш успамінаць размовы з ёй і ўзважваць кожнае слова, кожную думку. Ці можаш мімавольным жартам так яе пакрыўдзіць, што... У гэтай сферы нічога нельга растлумачыць рацыянальна. І ты будзеш яе шчыра кахаць, але ўсе спрэчкі, сваркі, сакрэты і недагавораныя фразы, усе крыўды, усе ўчынкі будуць атручваць вашыя пачуцці. І аднойчы ты апынешся ў такім стане, што не зможаш адназначна сказаць, кахаеш ты яе ці не. І самае крыўднае, што яна адчувае тое ж, — я сам спужаўся сваіх разваг. — А далей усё залежыць ад вашай далікатнасці і разумнасці. Можна разысціся і больш не сустракацца, а можна пачаць выпраўляць памылкі.

— Гэта ты пра Тобку з Міраславай ці пра сябе з мамай? — іранічна заўважыў Валерка.

— Дарма ты так пра нас з мамай! У нас, дзякуй Богу, было не так шмат крыўдаў! Я меў на ўвазе менавіта непазбежныя дадаткі да кахання. Насамрэч, Міра баялася блізкіх стасункаў з мужчынамі. І на тое ў яе была важкая прычына. Раптам — побач з ёй Тобка, які выяўляе абсалютную няўпэўненасць, баязлівасць. І яна падумала, што ён, як падлетак: калі баіцца — кусае. Відаць, так яна растлумачыла сабе яго колішняе нахабства. Не ведаю дакладна, як у іх там усё развівалася, але мяркую, што секс адбыўся па яе ініцыятыве.

— Ваў! Які мужчына не марыць, каб яго згвалціла жанчына! — Валерка відавочна некага цытаваў.

— Гвалту не было. Быў надзвычайна якасны разлік з боку Тобкі. Гэта талент бізнесмена — разлічыць свае і чужыя крокі на дзесяць дзеянняў наперад. Але ў офісе сядзяць розныя эксперты і аналітыкі, ад якіх патрабуюцца дакладныя прагнозы. А Тобкава сітуацыя вымагала яшчэ і акцёрскага таленту.

— А можа, яна проста стамілася ад сваёй адзіноты? — зусім па-даросламу запытаў сын.

— Зараз гэта неістотна. Галоўнае, што ў іх усё адбылося.

— Усё? — усміхнуўся Валерка.

— Ведаеш, я чакаў, што Тобка адразу кіне яе, як толькі дасягне мэты. Я, шчыра кажучы, быў упэўнены, што ён пачне выхваляцца ці што-небудзь такое... Не першы ж раз... А ён прыйшоў на наступны дзень у офіс і зачыніўся ў сваім кабінеце. Нетыповая была сітуацыя, і Гелена, яго сакратарка, паклікала мяне. Я як бы незнарок паднёс яму паперкі нейкія падпісаць, кавы з ім папіў... А ў яго вочы гарэлі так... Гэта былі вочы не пераможцы, а чалавека, у якога ёсць геніяльны і грандыёзны план. Звычайна гэта адухаўляе... Я нават на секунду па-

думаў, што мяне чакае нейкі сюрпрыз, кшталту жаніцьбы.

Валерка асуджана зірнуў на гадзіннік, цішком выцягнуў з-пад газет пульт ад відэамагнітафона і націснуў кнопку «запіс». Значыць, я ўсё ж яго заінтрыгаваў.

— А што было далей? — сын спадзяваўся падштурхнуць мяне да фіналу гісторыі. — Якая ў яе была таямніца?

— А гэта па сутнасці дробязь, галоўнае, што яна была. І Тобка яе ведаў. А калі мы прыйшлі на корты, Тобка прапанаваў Міраславе згуляць з ім. Яна закахана ўсміхнулася і пагадзілася, а Тобка глянуў ёй у вочы, як бы нешта перадаў тэлепатычна, і холадна дадаў: «Я перамагу!» Міраслава сцялася, зменшылася ад позірку і ад словаў... Гэта быў тонкі шантаж! І яна прайграла. Але мне здаецца, яна не паддавалася, проста з яе ўсе сілы сышлі, ногі не хацелі бегаць, і яна нагадвала параненае маленькае птушанятка, якому крылы падрэзалі...

— І ногі падпілілі... — недарэчы дадаў Валерка. — Ну што ты, адразу не можаш усё расказаць... Літаратуршчынай займаешся? Інтрыгоўны аповед!

— Усё, усё! Болей не інтрыгую. Карацей, нас запрасілі на адно надзвычай важнае мерапрыемства. Вельмі ўплывовай фірме споўнілася дзесяць гадоў. Сувязі з прэзідэнтам кампаніі Андрэем Рыгоравічам Мітчанкам былі наладжаны яшчэ Казімірам Яўнутам, Тобкавым бацькам, яны некалі разам у камсамоле працавалі. Стары Яўнута адыходзіў ад бізнесу і павінен быў пазнаёміць Тобку з Андрэем Рыгоравічам. Не так, як у дзяцінстве, — маўляў, гэта мой сын, бо не трэба шмат розуму, каб нарадзіць сына. Тобка быў не проста сын, ён быў спадкаемцам, ён прыняў кіраўніцтва нашай фірмай і быў насамрэч апантаны бізнесам. Ён любіў сваю працу — і яна ў яго спорылася. Стары Яўнута ганарыўся сынам! У Тобкі была яшчэ старэйшая сястра, якая рана вый-

шла замуж і хуценька зрабіла Яўнуту тройчы дзедам. Яўнута любіў яе жэўжыкаў, але Тобку любіў больш.

— Я ж прасіў пра Міраславу! — засупраціўляўся Валерка.

— А я да гэтага і вяду. Нас запрасілі, я павінен быў ісці з Геленай, а Тобка прапанаваў суправаджаць яго Міраславе. Ну, мужчынам добра — маеш тры касцюмы і можаш сто год пражыць. А кабеты сваю прыгажосць павінны штораз падмацоўваць новай сукенкай. Мне, праўда, усё адно, якая на маёй спадарожніцы вопратка, а вось Тобка быў кавалерам неабыякавым. Таму ён павёў Міраславу ў нейкі буцік, а я пайшоў з імі. Калі ў жанчыны фігура дасканалая, то няма чаго доўга выбіраць. Тобка пачаў прапаноўваць сукенкі. Прыклаў да Міры чырвоную... Я і зараз усё памятаю... Калі б умеў намаляваць, намаляваў бы! Але апісаць не магу: доўгая, дэкальтаваная... І раптам новы, ветлівы Тобка перакінуўся ў Тобку ранейшага, грубага, помслівага. Ён стаяў з сукенкай і вельмі здзіўлена прамовіў: «Дзіўна, што табе не пасуе чырвоны колер. Ён жа ўсім да твару». Сам разумееш, што сталася з радасным настроем Міраславы. Тобка перабіраў сукенкі з такой зацятасцю, нібыта для сябе. Чорныя ён абмінаў са словамі: «Большасць будзе ў чорным, а мы — меншасць!» Пасля была кароткая чорна-белая... Але Тобка паказаў пальцам на ногі Міры і ці не грэбліва запярэчыў: «Нашто выстаўляць свету твае залішне мускулістыя ногі». Але ж ногі ў яе былі бездакорныя! Тэніс увогуле выдатны від спорта: трэніруюцца ўсе мышцы, але няма іх ненатуральнай развітасці, як напрыклад, у плаванні ці бегу. Звычайна такія паскудствы жанчынам утвараюць няўпэўненыя ў сабе мужчыны. Але ж сам бачыш, Тобка выглядаў зусім нармальна. Не было ў ім той слінявай прыгажосці, як у хлопчыкаў-мадэляў з глянцавых часопісаў. Ды залішняя прыгажосць перашкаджала б

у яго сур'ёзнай працы. У яго была натуральная мужчынская фігура. Вось у нашага камп'ютэршчыка быў жаночы віхлясты азадак ды Х-падобныя ножкі, але ён не рабіў з гэтага праблемы. У Тобкі нос трошкі вытанчаны, востранькі...

— Ты казаў ужо — пацучыны! — нагадаў Валерка, які відаць, слухаў уважліва.

— Хай пацучыны, як ні назаві — нос быў прыстойны, арыстакратычны рот, не якая-небудзь зяпа... Блакітныя вочы з цёмнымі вейкамі — гэта ва ўсе часы выглядае прывабна... Тобка заўсёды хадзіў са строгай стрыжкай — праца вымагала. Яго густыя валасы былі шорсткімі і калючымі, але я неяк раней заўважыў, з якой асалодай, амаль фізічным задавальненнем Міраслава праводзіла па іх рукой. Яна яго кахала, так, кахала... А Тобка? А Тобка выцягнуў цёмна-сінюю сукенку, такую блішчастую... з тонкімі шлейкамі... і на спіне так зроблена палоскамі тканіны... Ну, ты разумееш?

— Мгы, — няўпэўнена кіўнуў Валерка.

— А чорт з ім. Міраслава збялела і спужана адштурхнула руку Тобкі. А ён рассмяяўся, штучна, гучна, як д'ябал, — я не мог падабраць добрага азначэння.

— Зразумела, як Мефістофлік! — пажартаваў Валерка. — Слухай, ты дарма так напружваешся, я ўжо зразумеў, што ў Міраславы нейкія праблемы з целам ці там... са скурай. Давай, што там было? Наколка сінімі чарніламі «1937 год» ці шнары ад капытоў зубра?

— Радзімая пляма... — прызнаўся я.

— І ўсё? — расчаравана прамовіў Валерка. — Выбачай, але я чакаў нейкай экзотыкі. Напрыклад, пісягі ад кіпцяў усурыйскага тыгра ці... ну нават не ведаю... І ты мне столькі часу расказваў гісторыю пра закамплексаваную паненку?

— Не, я толькі падыходжу да кульмінацыі! Міраслава выбрала нейкі досыць закрыты строй і пайшла

прымерыць. Мы чакалі каля кабінкі, і Тобка гучна, каб яна пачула, са смехам расказаў мне пра яе пляму. Міра рэзка адсунула шторку... Яна ўжо паспела зняць кашульку і стаяла ў джынсах і станіку. А ў кабінках жа люстэрка... і я ўбачыў... там адлюстравалася... Міра схапіла кашулю, насунула і выбегла з крамы. Усё, на вечарыне мы былі ўтрох: Казімір Яўнута, Тобка і я, мы нават і Гелену не ўзялі.

— І ўсё скончылася? Я думаў — будзе хэпі-энд! Кшталту... Ты-ды-ды-дынь. Аб'яўляю вас мужам і жонкай, — перадражніў Валерка.

— Не так усё скончылася! Тобка, як бы нічога і не было, заявіўся на трэніроўку. А я дык і саромеўся ёй у вочы глядзець. А яна, відаць, ужо супакоілася, прынамсі, мне так падалося. Яна ўсміхнулася Тобку ды іранічна запытала: «Згуляем? Ты ж мяне адной левай?» Тобка нечакана ўчапіўся за апошняе слова: «Дык, можа, левай?» І яны адначасова перакінулі ракеткі з правай рукі ў левую. Я сабе дараваць не магу... Як я не заўважыў, што яна занадта правільна і ўпэўнена трымае ракетку ў левай руцэ... Разумееш, калі ўжо ты прывучаны іграць правай рукой, то вось так адразу згуляць левай немагчыма! Ты не тое што не падасі, ты самы лёгкі мяч не адаб'еш! Некалькі гадзін трэніровак ішло толькі на тое, каб навучыцца правільна трымаць ракетку, і тут Тобку захацелася менавіта левай! Магчыма, ён вырашыў, што так яны будуць на роўных? — мне цяжка было здагадацца пра Тобкавыя думкі. — Яны ж і згуляць не паспелі. Яна падавала першая. Зірнула на Тобку з нянавісцю, падкінула мяч і — з усяе моцы! Мяч патрапіў яму ў шыю — і насмерць!

— Забіла? — не паверыў Валера.

— Забіла. З таго часу я ў тэніс не гуляю. Хачу жыць! — выгукнуў я.

— Пачакай, пачакай, дык яна што, спецыяльна? — дапытваўся сын.

— Не ве-да-ю! Я пасля праз стрыечнага дзядзьку, ты яго не ведаеш, пра яе крыху так... даведаўся. Калі яна толькі пачынала, яна іграла левай рукой. Разумееш, ёсць розныя ляўшы: адныя пішуць левай, а ўсё астатняе робяць правай, і другія — пішуць правай, а іншую работу — левай. Яна пісала правай, і таму мы не маглі здагадацца, што насамрэч яна ляўша. Ды і адкуль мы маглі ведаць, што яна вучылася граць у тэніс левай. Яна максімальна аслабіла свой удар, калі перавучылася на правую руку. Калі б яна працягвала гуляць левай, у яе партнёраў і вучняў не было б аніводнага шанцу на выйгрыш. І ўсё адно яна засталася лепшай. У свой час трэнер ускладаў на яе столькі надзей... Ён верыў, што гадуе зорку еўрапейскага тэнісу, а можа, увогуле зорку! Але яна кінула ўласную кар'еру, так і не распачаўшы яе, і пайшла працаваць.

— Я нават скажу, чаму яна кінула прафесійны спорт. Мабыць, умовы былі савецкія, і ёй трэба было раздзявацца пры іншых дзяўчатах. А яна саромелася, — здагадаўся Валерка. — Але тады гэта ідэяфікс! Слухай, ну, немагчыма ж праз такую дробязь паламаць сабе жыццё. Можа, у яе быў яшчэ нехта як Тобка? Комплекс «узгадаваць» прасцей, чым выбітную тэнісістку.

Наступных навучэнцаў той спартыўнай школы выхоўвалі на легендах пра Міраславу. Дзецям паказвалі ўвагнутасці на сцяне ад яе магутных удараў. Ім давалі пагуляць з яе «лысым» тэнісным мячыкам. Ён вельмі хутка адскоквае, каб з ім гуляць, трэба было мець вокамгненную рэакцыю. Расказвалі, ейны трэнер клаў у кут пляцоўкі мячык, а другі падаваў Міры, і яна адбівала другі, каб ён патрапіў у першы! Тэнісны більярд!

— Дык яна спецыяльна ці не? — не мог даўмецца Валерка.

— Ну, глядзі. Калі спецыяльна, то яна павінна была занадта шмат улічыць... Трэба было справака-

ваць Тобку на гульню левай рукой, бо так ёй было больш зручна. І яна павінна была патрапіць у шыю... У яе быў вельмі моцны ўдар, значыць, можна было па галаве... ці куды-небудзь яшчэ... Але калі б Тобка зрабіў адзін крок убок — застаўся б жывы! Атрымліваецца, што гэта проста жахлівая выпадковасць. Уся сістэма абвінавачвання руйнуецца ад аднаго кроку! Я разумею, што нельга забараняць табе займацца тэнісам толькі таму, што мой сябра быў забіты тэнісным мячыкам. Я разумею, што можна закалоцца звычайным відэльцам альбо загінуць, разліўшы ваду на камп'ютэр. Але ніхто не пераходзіць на лыжкі ці кітайскія палачкі... І ўсе працуюць на камп'ютэрах... Я не магу табе забараніць, я табе раю, я прашу цябе кінуць гэтую мару пра тэніс. Менавіта таму, што ты мой сын. Мой. Я не хачу двойчы атрымаць такі ўдар...

— А што ёй было за забойства? — пацікавіўся сын.

— Нічога. Гэта ж не было забойства, гэта быў няшчасны выпадак. Я сам засведчыў, што Тобка першы прапанаваў гуляць левай рукой. Калі Міраславе сказалі, што ён забіты, яна страціла прытомнасць... Аказалася, што яна цяжарная! Далі ёй нешта ўмоўна, здаецца. Я нават дакладна не ведаю, — прызнаўся я.

— І што, Казімір Яўнута не захацеў, каб яе косткі спарахнелі ў турме? — здзівіўся Валерка.

— Дачка яго якраз тады распачала развод з мужам, і стары Яўнута спрабаваў ўратаваць хаця б тое, што засталося. Забраў унукаў, памяняў ім прозвішчы на Яўнутаў і пачаў з дзяцінства рыхтаваць для працы ў фірме. Усіх трох хлопчыкаў.

— Ведаю: Ігнась, Юрка і Францішак, — назваў Валерка імёны хлопцаў, з якімі ён будзе працаваць пасля атрымання вышэйшай адукацыі. — А што з Міраславіным дзіцём?

— Гэта твая улюбёная Хрысціна! — выгукнуў я.

— Тэнісістка? Ляўша? — Валерка зноў разгарнуў часопіс і ўпіўся вачыма ў левую руку дзяўчыны.

На яе руцэ, як на Міраславінай спіне, была радзімая пляма. Міра відавочна выхоўвала дачку зусім па-іншаму: тое, што адрознівае мяне ад астатніх, — мая вартасць, а не недахоп. І калі яе фатаграфавалі, яна заўжды паварочвалася да аб'ектыву левым бокам. Тварык у яе быў шляхетны: вытанчаны носік, арыстакратычныя вусны і вельмі кранальная ўсмешка, нібыта яна прасіла прабачэння за сваю прыгажосць. Яна была выхавана як прыгажуня. Галоўнае ж, не быць прыгожай, а шчыра верыць у сваю прыгажосць! Калі Хрысціна ўжо стала вядомай, нехта заўважыў, што плямка на руцэ нагадвае лагатып адной з гадзіннікавых фірм. Так што Хрысціна працуе і на ніве рэкламы. А я так і не ведаю, ці была смерць Тобкі выпадковай...

## МОЦАРТ І МОЦАРТ

Старшакурснікі нас папярэдзілі: галоўнае ў гэтым семестры — пераажыць залік па рускай літаратуры. Маладая выкладчыца-«арыстакратка» цярпець не можа расфарбаваных студэнтак і меліраваных хлопцаў з завушніцамі. Калі гэтыя ж старшакурснікі зірнулі на наш рознакаляровы, нефармальна апрануты паток, яны гучна абвясцілі: «Даражэнькія, яна вас узненавідзіць!»

Я нічога не баялася: сціплая, ненафарбаваная і з адзеннем не эксперыментавала.

На першай лекцыі мы былі моцна ўражаныя: рускую літаратуру нам выкладалі па-беларуску. Ірына Яўгенаўна лічыла, што беларускае аддзяленне не павінна навучацца ні на якой іншай мове. І ў гэтым я была з ёй згодная. Першыя лекцыі, праўда, былі крыху пуставатымі, поўнымі захаплення дзекабрыстамі. Мне вось дзіўна: дзекабрысты былі няўдачнікамі, але як імі захапляюцца, а ў бальшавікоў усё атрымалася — а паслухайце, што пра іх сёння кажуць! Любяць рускія пакрыўджаных Богам!

З кожнай лекцыяй усё мацней заўважалася яе непрыхільнасць да нашага патоку. Аднойчы мая сяброўка Насця спазнілася на лекцыю, і трэба ж было ёй у той дзень скруціць высачэзны хвост на макаўцы, за што і атрымала ад выкладчыцы заўвагу:

— Як жа тут не спазніцца?! Гэта ж час патрэбны такую фрызуру зрабіць!

З таго часу нам было забаронена заходзіць у аўдыторыю пасля званка, маўляў, спачатку студэнт звяртае на сябе ўвагу ўсяго патоку, а пасля — пачынае расказваць суседзям пра здарэнне, у якое ён нібы-

та трапіў. Калі мая сяброўка спазнілася зноў (праўда, апранута яна была ўжо амаль класічна), выкладчыца спрачалася з ёй дзесяць хвілін і ўсё адно не пусціла. А з апошняга рада нехта падаў рэпліку:

— Гэта яшчэ пытанне, хто ў нас час адбірае!

Ірына Яўгенаўна павольна павярнулася і зірнула на нас, вочы яе злосна бліснулі. Усталявалася жахлівая цішыня, выкладчыца ўсміхнулася куточкамі вуснаў, і мы сцяліся ад гэтай яе ўсмешкі.

З таго моманту мы ўсе страшэнна баяліся рабіць іранічныя заўвагі ці спазняцца, і ўсе былі ўпэўненыя, што Насця здолее здаць залік толькі з Божай дапамогай і з чацвёртай спробы!

Здавалася, гэта быў цудоўны літаратурны перыяд, чытаць не так ужо і шмат: вершыкі дзекабрыстаў, усяго Пушкіна, Лермантава і Гогаля. Мая суседка па пакою ў інтэрнаце старшакурсніца Валя неяк спыталася:

— Вам Лермантаў спадабаўся?

Мы з Насцяй параіліся і вырашылі, што ён нам спадабаўся.

— Паспрабуйце сказаць гэта ёй на заліку, а потым хавайцеся ў бульбу! Яна яго цярпець не можа, ледзь стрымліваецца! Барані вас Бог, даражэнькія!

Я падумала: якая ў нас недасканалая сістэма адукацыі, калі здаць сесію з дапамогай адных толькі ведаў немагчыма і калі падтрымка Бога такая неабходная.

Выкладчыца па-ранейшаму не пускала на лекцыі тых, хто спазняўся, але часам любіла пагуляць у дэмакратыю. Аднойчы па каналу «Культура» паказвалі п'есу Грыбаедава «Горе от ума» ў вельмі позні час, і наша Яўгенаўна недаглядзела, а назаўтра спыталася, хто глядзеў. Падняла руку студэнтка з апошняга рада, прыгажуня з зялёнымі валасамі. Выкладчыца няўдала зрабіла выгляд, што нармальна ставіцца да зялёнавалосых і запрасіла дзяўчыну выступіць перад намі. Лена сціпла стала ля дошкі і

пачала расказваць, што было зменена ў спектаклі ў параўнанні з п'есай, распавяла пра падрабязнасці ігры Алега Меншыкава, кажучы, што Чацкі яго — хлопец на сваёй хвалі. Але ў цэлым яе роўны расповед не пасаваў да яе экстравагантнай знешнасці. Выкладчыца даслухала з відавочным задавальненнем, для сябе, магчыма, адзначыўшы, што зялёнавалосыя таксама людзі. А мы сталі меней яе баяцца.

Было зусім зразумела, чаму яна не любіла расфарбаваных дзяўчат. Маючы ідэальную скуру, можна ненавідзець дзяўчат, якія прыкладалі ўсе намаганні, каб быць прыгожымі. Мы не маглі добра яе разглядзець, але старасты, якія пасля кожнай лекцыі падносілі ёй журнал для роспісу, распавядалі байкі пра доўгія чорныя вейкі Ірыны Яўгенаўны. Канешне, ёй зусім не трэба было фарбавацца. А на тую ж старшакурсніцу Валю, пакуль яна не зробіць макіяж, глядзець было балюча.

Выкладчыца аказалася асобай дзейснай, актыўнай і любіла хадзіць па тэатрах. (Хаця ў яе ўзросце і з яе знешнасцю самы час бегаць на спатканні, а не рабіць выгляд, што яна спазнала ўсе ісціны гэтага Сусвету). І сутыкнулася яна аднойчы ў фае нейкага тэатра з Насцяй, зацятай тэатралкай. Сказаць, што яна здзівілася, — значыць, нічога не сказаць, яна аслупянела і нават першая павіталася, ды з таго часу пачала паглядаць на Насцю з вялікай прыхільнасцю.

Мая сяброўка пасля гэткай сустрэчы паведаміла:

— Я зараз разумею, чаму яна такая злая. Паглядзі, вось ты, маючы мужа ці сябра, няўжо хадзіла б па тэатрах?

— На самай справе прычына яе лютасці зусім не ў тым, што ў яе няма мужчыны. Дарэчы, паглядзі, якая яна прыгожая, хутчэй за ўсё ў яе нехта ёсць, ён проста дома застаўся, можа, не любіць хадзіць па тэатрах. Яна проста маладая.

— І што ты на філфаку робіш?! Табе толькі па судах абараняць інтарэсы кліентаў! Ну, добра, суд улічыць змякчальныя абставіны — маладосць вашай кліенткі. Толькі хоць забі мяне, але я не ўяўляю, як здаць ёй залік.

Выкладчыца захоплена чытала лекцыі па Пушкіну, бясконца цытуючы ягоныя вершы, не забывалася на ўсе дробязі ягонага жыцця, загадваючы нам занатоўваць цяжкія прозвішчы любімых паэтаў шаноўнага Аляксандра Сяргеевіча — Парні і Мельваа, якія мы чулі першы і апошні раз. І на практычных мы праходзілі таго ж Пушкіна і яго маленькія трагедыі. Яна засяродзіла нашую ўвагу на адной з іх — «Моцарт і Сальеры». Як звычайна, я выратоўвала сваю групу (калі ніхто не ведае, пра што казаць, ахвярую сабой, неістотна, ведаю я адказ ці не). Асабліва мяне ўразіла, як Моцарт, несучы сваю чарговую геніяльную мелодыю, заслухаўся ігрой сляпога музыкі. Сальеры жахнуўся, маўляў, як можна, напісаўшы геніяльнае, яшчэ зважаць на нейкага музыку!

Я не ведаю, ці правільна я тое заўважыла, але выкладчыцы спадабалася, і ўсе жартавалі, што залік мне ўжо забяспечаны.

Пушкін, канешне, аказаўся любімым паэтам нашай выкладчыцы, і лекцыі па яго творчасці і біяграфіі займалі недзе палову канспекта, што, відавочна ж, не падабалася студэнтам, бо сшытак быў мала прыдатным для падрыхтоўкі да заліку. А яна ўсё вычытвала нам Пушкіна, кананізуючы, захапляючыся, праводзячы паралелі з вядомымі беларускімі і замежнымі творцамі. Паціху яна дабралася і да Вальтэра. Мабыць, нехта на яе ў той момант неяк не так зірнуў, і яна спыталася:

— Вы ж чыталі Вальтэра?

Я міжволі кіўнула галавой. Яна заўважыла і загадала:

— Падрыхтуйце да наступнай лекцыі маленькі даклад, можаце не карыстацца ніякай крытыкай, выкажыце свае думкі па тэме «Чаму Пушкіна мог вабіць Вальтэр».

Не карыстацца крытыкай? Якія яны дзіўныя, выкладчыкі, заўсёды думаюць, што студэнты не могуць абысціся без крытыкі. Яна тут зноў выявіла сваю дэмакратычнасць, маўляў, я дазваляю. Насамрэч жа яна была ўпэўнена, што без крытыкі не абысціся. А для мяне — чым менш крытыкі, тым лепей, я заўсёды маю сваё меркаванне па кожным пытанні. Адзінае, што мне спатрэбілася дадаткова, дык гэта гады жыцця Вальтэра, каб суаднесці іх з гадамі жыцця Пушкіна.

Я нібыта перасялілася ў асобу вялікага паэта, уяўна ўзяла ў рукі творы Вальтэра і пачала думаць, што ж мяне, Аляксандра Сяргеевіча, магло вабіць у тых паперах. Я сама сабе паставіла псіхалагічную загадку і адказ бачыла ў асобе рускага класіка. Але што я ведала пра яго асобу? Шчаслівы каханак, геніяльны паэт, не суперактыўны, але і не пасіўны грамадзянін. Але, як заўважаў дзядуля Фрэйд, усё пачынаецца з дзяцінства. Маці не любіла будучага паэта, вось вам і глеба для першых комплексаў. А! Яшчэ ён быў неграм. Я дакладна не ведаю, як гэта быць неграм. Але разумею, як жыць непадобным да іншых. У нашую вёску невядома якім ветрам прынесла хлопца, ён ці то аварац які, ці то інгуш, меў імя — Рашыд. Прыгажэйшага хлопца не было ў радыусе ста кіламетраў! А як ён песні спяваў! Толькі спачатку гаварыў дрэнна, а потым асвоіў нашу трасянку. Працаваў у калгасе трактарыстам, не лайдачыў. Усе дзяўчаты былі ў яго закаханыя, а суседка мая, як вяртаецца ноччу ад яго, дык абавязкова мне ў акно пастукае, залезе ў пакой і паўночы спавядаецца: і з гэтага боку ён добры, і з таго — харошы, і ўсё ў ім выключна. А яна ўсё нейкія недахопы шукае. Я кажу:

— Кахаеш — ідзі за яго замуж, ён жа прапаноўваў.

— А ты ведаеш як яго хлопцы называюць? Цыган! Рашыд-Цыган! А ты кажаш «замуж»! Каб дзяцей цыганятамі клікалі?!

Што ж, Аляксандру Сяргеевічу пашанцавала, знайшоў сабе жонку. Праўда, прамаўчу, чым усё скончылася.

Я сабрала ўсе свае веды пра Пушкіна і Вальтэра на адзін лісток і рушыла ў бой.

Чаму Пушкіна мог вабіць Вальтэр? Адама Міцкевіча любілі жанчыны, Пушкіна — гусары. (Ад такога пачатку выкладчыцы стала блага, але мяне было ўжо не спыніць.) Чаму ж? Напіцца да ачмурэння і пайсці па бабах!

Ён быў неграм, непрыгожым неграм, і гэта было вызначальным ў ягоным жыцці. Ён жыў з комплексам непаўнавартасці! І ўсё жыццё ён паклаў на тое, каб самасцвердзіцца. Як маленькія дзеці дзеляцца цукеркамі, каб з імі сябравалі, так і Пушкін паіў гусараў, а яны яго любілі.

— Добра хоць, што любілі, а не кахалі! — выгукнулі хлопцы з апошняга рада.

— Падумайце, нават сёння, — працягвала я, не зважаючы на каменны выраз твару Ірыны Яўгенаўны, — нельга сказаць, што мы нармальна ставімся да неграў, успомніце розных скінхэдаў, якія могуць збіць чалавека да паўсмерці толькі за тое, што ён мае іншы колер скуры. Што ўжо казаць пра тыя часы, калі неграў было вельмі мала, ды і тое гэта былі мурынчыкі-слугі. Як павінен быў пачувацца Пушкін?!

Яму трэба было, каб яго баяліся, асабліва мужчыны. Калі яго папракнуць неграм, ён мог бы адказаць: «Так, я — негр, а ты... ты хто? Раганосец!!! Я быў з тваёй жонкай!!!», потым ён мог бы дастаць нататнік і назваць дакладную дату наведвання іхняга шаноўнага дома. Але ж якімі рызыкоўнымі павін-

ны былі быць жанчыны, што кахаліся з Пушкіным: дзіця-негр паважанай дамы ў Пецярбургу — дзіця Пушкіна, не будзе ж дама з вышэйшага свету мець каханкам слугу-негра.

— А чаму б і не?!—зноў выгукнулі хлопцы. Аўдыторыя канчаткова разняволілася: нехта смяяўся з майго выступу, нехта — з рэакцыі Ірыны Яўгенаўны.

— Дарэчы, цёмнаскурага дзіцёнка на мужа не спішаш. А вось каханкам ён быў зручным — ноччу яго не бачна. Асабліва калі ён не ўсміхаецца і вочы заплюшчыць. Хаваць не трэба.

Але пачну з вытокаў. Дырэктар Царскасельскага ліцэя апраўдваўся: «...ён (Пушкін) прыйшоў у ліцэй распусным, і пайшоў з яго такім жа». Вось мы праходзім ліцэйскую лірыку Пушкіна, і я ўпэўнена: яны ў ліцэі пісалі з сябрамі акрамя прыстойных твораў яшчэ і такія вершыкі, што ў выкладчыкаў, калі б яны прачыталі, валасы дыбарам сталі б. Колькі сакрэтаў маем мы ад выкладчыкаў! Колькі нашых вершаў яны не чыталі! Дык ці ж ведаюць яны студэнтаў? Хоць зусім верагодна, што пісаў паэт такія вершы, каб чытаць іх потым сябрам, каб, зноў жа, заваяваць іх прыхільнасць, выпендзюрыцца, як мы сёння кажам.

І тут Пушкін сустракаецца з творамі Вальтэра. Мы ўсе чыталі тыя тэксты па праграме. І перадавалі адзін аднаму: маленькія і цікавыя, варта пачытаць. А Пушкін чытаў і разумеў, што можна быць геніем і распуснікам адначасова. Пушкіну ў ліцэйскія часы было недзе 12 год. У гэтым узросце ён бачыў тое, што было бачна, а не што трэба было ўбачыць. Мы ж таксама толькі з крытыкі даведваліся пра ідэі, якія мы павінны былі там заўважыць.

Дык чаму ж Пушкіна вабіў Вальтэр? І ў Пушкіне, і ў Вальтэры было нібы два чалавекі: сціплячок і распуснік. У Пушкіне гэта злучалася наступным чынам. Ён піша: «Я помню чудное мгновенье», а праз некаторы час занатоўвае ў дзённіку: «Вчера

с Божьей помощью... Аннушку Керн». Гэта немагчыма патлумачыць нічым іншым, акрамя раздваення.

Калі б Пушкін меў звычайны колер скуры, ён сам быў бы звычайным.

— Ну ты скажаш! — абурыўся наш факультэцкі любімчык і паэт Лёшка, які меў самы звычайны колер скуры.

— Але Пушкін быў *неграм*! У ім усё утрыравалася. Ён усё адчуваў на 200%. Ён адчуваў спапяляльны боль і наймацнейшае каханне, ён быў цнатлівым паэтам і распусным мужчынам адначасова. Ён стаў геніем, бо быў цёмнаскуры. І калі ўжо адрознівацца, то ўсім, чым можна!

Пушкіна вабіла ў Вальтэры гэткае ж, як і ў яго самога, раздваенне асобы. Цнатлівы і распусны. Два ў адным. І суіснаванне гэтых іпастасяў дало міру стольких геніяў! Але як геній Пушкін дайшоў да Вальтэра і пераступіў праз яго, — паспрабавала я лінуць кроплю бальзаму на знерваванае за час майго выступлення сэрца выкладчыцы. Не дапамагло.

— Мяне дзівіць такі нелітаратурны падыход да праблемы! Я хацела, каб вы параўналі філасофію Вальтэра і філасофію Пушкіна. А гэта... ну тое, што вы нам расказалі ... гэта ж жах нейкі... Канешне, вельмі добра, што вы так эмацыянальна расказвалі... але так ненавукова... на пабытавым узроўні.

Хацелася нагадаць ёй, што яна дазволіла не карыстацца крытыкай. Няўжо я падобна да генія, які возьме з галавы матэрыял па філасофіях Пушкіна і Вальтэра? Я ж кажу, яна любіла гуляць у дэмакратыю.

— Але ў 12 год дзеці не разумеюць філасофіі! І дакладна не яна вабіла Пушкіна ў творах Вальтэра. І пры чым тут колер скуры?!

— Але нідзе не напісана, як уплываў на яго творчасць і ... філасофію колер скуры!

— А вы лічыце гэта істотным?

— Не проста істотным — вызначальным.

— Ну, гэта вашае меркаванне, — спакойна прамовіла яна і неяк дзіўна на мяне паглядзела. Уважліва, ці што?

Яна стала за кафедру, доўга стаяла, перабірала паперы. Ужо набірала паветра, каб пачаць чытаць лекцыю, але патрапляла позіркам на мяне і не знаходзіла слоў. Яна вырашыла не глядзець на аўдыторыю, і лекцыя пачалася. А мая сяброўка, зноў нафарбаваная да непрыстойнасці, шаптала: «Ты геній... так ёй і трэба... яна ўнутры сухар... яна таго Пушкіна толькі па крытыцы чытала... А Вальтэра ўвогуле не чытала». І хоць Насця казала глупства, мне стала лягчэй. Яна памаўчала колькі часу, каб не прыцягваць увагу Ірыны Яўгенаўны, і дадала: «Але залік ты таксама не здасі!»

... Я сядзела на сваім ложку, а дзяўчаты хадзілі па пакоі і супакойвалі мяне:

— Ты — асоба! Ты нестандартная! Яна не чакала, што ты закранеш гэтую праблему. Вы з ёй Моцарт і Сальеры! Ты — Моцарт! — Насця стаяла на суседнім ложку і актыўна жэстыкулявала.

— А Сальеры Моцарта атруціў! — Машка не магла слова сказаць, каб не пад'юдзіць.

— А я таксама Моцарт! — закрычала сяброўка і схапіла гітару. Іграць яна не ўмела да такой ступені, што ейнае брынькanne забіла б любога Моцарта.

— Бачыла б ты яе твар! Я думала, што яна прытомнасць згубіць. Ха-ха-ха! Прабач, але як толькі ўспомню, хочацца смяяцца да бясконцасці. Ох, які гэта для яе ўрок!!! Яна, такая прыгожая, правільная, бязгрэшная, шчыра верыць у тое, што Пушкін быў цнатлівым, ніколі не займаўся ананізмам і ўвогуле, калі заходзіў у прыбіральню, адварочваўся, каб не глядзець на свой орган.

— Але вочы не слухаліся яго! — пафасна дадала адна з жартаўніц.

— Вось я дурная, але нават я не дадумалася б да такога даклада, а калі б дадумалася, то мне не хапіла б смеласці выступіць з ім. А ты ведаеш, на чым Яўгенаўна пагарэла? У цябе знешнасць класічная, ты песціла ёй вочы, седзячы сярод нас. І яна падумаць, уявіць не магла, што ты такая!

Ад усяго гэтага мне хацелася плакаць, я ж зусім не збіралася даводзіць выкладчыцу да непрытомнага стану, я была ўпэўненая ў сказаным мной. Дзяўчаты-мярзотніцы курчыліся ад смеху, успамінаючы выраз твару Ірыны Яўгенаўны, а я абяцала сабе, што дакажу сваю правату.

Я прачытала ўсе 248 вершаў Пушкіна, што былі названы ў лекцыі. У іншай сітуацыі я абмежавалася б якім-небудзь дзесяткам, але гонар вымагаў абсалютнага ведання лірыкі майго «злога» генія. Я рыхтавалася да заліку, як ніколі не рыхтавалася да самага страшнага экзамена. Я ўжо не баялася самога заліку, бо я ведала ўсё дасканала, я прачытала ўсе вершы, усе драматычныя і празаічныя творы ўсіх аўтараў. Колькі разоў было, што да чарговага экзамена па літаратуры я магла не дачытаць аднаго-двух аўтараў, а да залікаў я чытала аднаго-двух толькі. Дзіва? Не! Бо я рыхтавалася не да заліку, а да апраўдання. Усе творы Пушкіна я чытала з пункту гледжання выказанай мною тэорыі. У «Арапе Петра Великого» я знайшла сцэну інтымных прыгод ў Парыжы негра, што накіроўваўся да Пятра Вялікага. Там былі развагі пра адчуванні галоўнага героя ў модных салонах пад перакрыжаваннем позіркаў. Ці ж гэта не ўласныя назіранні апісаў аўтар?! Ці ж не тое самае ён перажыў?!

А любімыя паэты Пушкіна ў слоўніках пазначаліся як аўтары інтымнай, эратычнай лірыкі. Так што захапленні юнацтва ў генія былі адпаведныя.

Надышоў Судны дзень. Калі я прыйшла, нашы ўжо трэсліся пад дзвярыма аўдыторыі, перачытвалі канспект і падручнікі, нехта пераказваў змест «Мёрт-

вых душ», а побач кола з чатырох чалавек паўтарала даты, што датычыліся паўстання на Сенацкай плошчы. Усе са шкадаванне зірнулі на мяне, і хоць па часе свайго прыходу я павінна была ісці дваццаць восьмай, мяне вырашылі прапусціць наперад, маўляў, усё адно будзе пераздача, нашто дарма дрыжаць. Я ішла дванаццатай. Мая сяброўка надзіва ўсім выйшла з «залікам». Нашы сціхлі, і нехта шэптам прамовіў:

— Значыць, на сёння абрана іншая ахвяра. Усе мы зараз пажадаем ёй «ні пуха ні пер'я».

І я зайшла.

Наша маладая, прыгожая выкладчыца была ў гуморы. Але твар яе адразу змяніўся, калі яна ўбачыла перад сабой мяне.

— Пазавіце наступнага, — нібы праспявала яна.

Сэрца маё абарвалася, рукі пачалі дрыжаць. Я выглянула ў калідор і запрасіла наступнага. Усе глядзелі на мяне запытальна, але я шчэ сама не ведала свайго лёсу.

Наступная студэнтка выцягнула білет і пайшла рыхтавацца. Нібыта здалёк я пачула пытанне:

— Якія артыкулы Бялінскага вы прачыталі?

— Другі — адзінаццаты, — упэўнена адказала я.

— Толькі два? — расчаравана працягнула яна.

— Другі, працяжнік, адзінаццаты, — я паспяшалася выправіцца.

— Сядайце, што ж вы стаіце, — яна палагаднела. — Ну, і як вам Бялінскі?

— Страшэнна спадабаўся! — шчыра прамовіла я, просячы Бога, каб яна не спытала, што ж менавіта я ўпадабала. Прыйшлося б зноў нарывацца на скандал, бо найлепшымі мне падаліся моманты, дзе вялікі крытык Бялінскі ганіў вялікіх творцаў Пушкіна, Гогаля і іншых.

Яна не спытала, а моўчкі запоўніла маю залікоўку і працягнула мне. Я аслупянела глядзела на яе, нічога не разумеючы, а Ірына Яўгенаўна ўсё яшчэ

працягвала мне залікоўку. Нібы самнамбула, я ўзяла яе і выйшла з кабінета, нават не падзякаваўшы.

Усе кінуліся да мяне:

— Ну што?

— Залік... — толькі і здолела прашаптаць я, яшчэ не верачы самой сабе, мяне запоўніла нейкая млявасць і абыякавасць.

— Залік?!?! — мае аднагрупнікі аслупянелі.

— Людзі, яна сёння добрая!!! — пачаў працаваць студэнцкі тэлеграф.

Я ішла па вуліцы, сэрца, якое некалькі хвілін таму абрывалася, зараз калацілася ад шчасця, сапраўднага студэнцкага шчасця! Не, яна не Сальеры! Яна Моцарт! Яна таксама Моцарт! Моцарт і Моцарт!!! Яна падумала і зразумела мяне! Зразумела!!! Моцарт і Моцарт! — крычала сэрца.

# УЛЛЯНА,
# АЛЬБО НАРАДЗІ Ў САБЕ ГЕЙШУ

## 1

Лекцыя скончылася. Празвінеў званок, як бальзам на сэрцы стомленых філфакаўцаў. Шоргат замкоў перакрываўся ляпаннем крэслаў, усе загаманілі. Высачэзны сівы выкладчык усміхнуўся: студэнты ёсць студэнты, нават калі яны ўжо трэцякурснікі. Калі ўключаеш святло, прусакі разбягаюцца ва ўсе бакі, так і студэнты: прагучаў званок — і ўсе падскокваюць, нехта нават не можа дачакацца, пакуль усе па чарзе пройдуць, перакідае ногі праз стол і вось ужо выбягае з аўдыторыі.

Выкладчык не спяшаючыся склаў свае паперы і накіраваўся да выхада, калі яго спыніла студэнтка, якая, як ён адразу ўспомніў, усю лекцыю не зводзіла з яго вачэй. Дзяўчына была амаль роўнага з ім росту, яе густыя каштанавыя валасы былі сцягнуты ў хвост, доўгая майка і шырокія джынсы хавалі фігуру. Усё гэта за секунду Міхась Пятровіч заўважыў спрактыкаваным позіркам старога лавеласа.

Паводле першага ўражання дзяўчына была абсалютна абыякавая да сваёй знешнасці. А вочы з цёмнымі кароткімі, як падстрыжанымі, вейкамі былі такімі шчырымі, што ён паверыў, калі яна сказала: «Міхась Пятровіч, вы — мой любімы пісьменнік! Я ў захапленні ад кожнага вашага твора... ды што твора... ад кожнага вашага сказа! У мяне адчуванне, нібы гэта я сама ўсё напісала. Вы здагадваецеся пра самыя патаемныя чытацкія жаданні. Можа, я, канешне, не ўмею хваліць, як трэба, але я шчыра! Прабачце, што затрымала вас!»

Міхась Пятровіч перакінуў папку з правай рукі ў левую, паклаў свабодную руку дзяўчыне на плячо і запытаў:

— Вы яшчэ не выбралі спецсемінар? Прыходзьце ў мой. Я на лекцыях буду запрашаць, але вас агітую ўжо зараз. І... калі я правільна ўсё зразумеў, то вы і самі нешта пішаце, не толькі чытаеце?

Дзяўчына набрала паветра, нібы хацела нешта сказаць, але замест адказу проста кіўнула. Міхась Пятровіч зноў перакінуў папку з адной рукі ў другую і прапанаваў:

— Можаце мне даць пачытаць.

Дзяўчына падзякавала і паабяцала прынесці свае творы. Міхась Пятровіч паблажліва ўсміхнуўся на развітанне. Калі ён знік на лесвіцы, Улляна падкінула заплечнік угору і з крыкам «йй-ее-ссс!» пабегла да другой лесвіцы. У калідоры яна ледзь не збіла з ног маленькую жанчыну, якая ціха сказала ёй услед: «Шалёная...»

2

Улляна сядзела перад камп'ютэрам у абдымку з клавіятурай, закінуўшы ногі на стол, калі мама вярнулася са службы (яна працавала карэктаркай у рэкламнай газеце). Ірына Сяргееўна зайшла ў пакой, пацалавала дачку ў макаўку і прашаптала: «Ах ты мой парсючок любіменькі!» Улляна кінула клавіятуру і павярнулася да мамы:

— Калі я парсючок, то хто ты?

Мама села на ложак, уважліва паглядзела на дачку і з сумнай усмешкай адказала:

— Не ведаю, напэўна, вялікі парсючок!

Дачка села побач, яны абняліся і доўга так сядзелі. Праз Улляніна плячо мама глядзела ў акно, раптам яе погляд упаў на крэсла, дзе ляжалі чорная доўгая майка і пацёртыя джынсы.

— Трэба табе нешта новае купіць, — сказала мама, вызваляючыся з даччыных абдымкаў.

Улляна ўстала, прайшлася па пакойчыку і незадаволена адказала:

— Ты ж сама заўсёды гаварыла, што галоўнае — розум, а не знешнасць, зручнасць, а не прыгажосць!

— А я сказала, што хачу купіць нешта прыгожае? — засмяялася мама.

— 1: 0 на тваю карысць! — неахвотна ўсміхнулася Улляна.

Мама пайшла ў свой пакой пераапранацца і адтуль пракрычала:

— Было што-небудзь цікавае ва універсітэце?

— А вось і не скажу, — Улляна зайшла ў мамін пакой, легла на ложак і ўзяла з тумбачкі мамін фотаздымак у рамцы. Маме там было дваццаць тры гады, яна была такой прыгожай і такой маладой. У дваццаць два яна пазнаёмілася з Уллянiным бацькам, але неўзабаве ён загінуў у аўтакатастрофе, нават не пабачыўшы дачкі. Ён быў сіратой, таму ва Улляны не было ні бабулі, ні дзядулі, і ўвогуле ніякай радні з боку таты, і не было татавых фотаздымкаў, ён, відаць, не любіў фатаграфавацца. Улляна ведала, што бацькі не былі жанатыя, і страшэнна шкадавала, што яны не паспелі ўзяць шлюб: калі б яны пажаніліся, то, магчыма, былі б фотаздымкі з загса. А так нічога, зусім нічога, нават пахаваны ён у агульнай магіле, бо многа людзей загінула ў той аварыі. Калі гэта і была звычайная легенда для пазашлюбных дзяцей, то вельмі прафесійная. Улляна паставіла рамку на месца, павярнулася на спіну і залажыла рукі за галаву. Мама села побач і паказытала ёй жывот. Улляна засмяялася і скурчылася, як вожык:

— Добра, раскажу, толькі не чапай. Я нарэшце выбрала спецсемінар. Пайду да Міхася Пятровіча.

Мама ведала па аповедах дачкі ўсіх выкладчыкаў і ўсіх аднакурснікаў. Улляна так цікава расказвала і так смешна перадражнівала іх, што мама магла б пазнаць кожнага, пра каго дачка расказвала.

— Да Міхася Пятровіча? Гэта той, які пісьменнік? Ну, можа, яно і правільна! Ты ведаеш, я заўсёды хацела, каб ты пісала. Твой тата, калі б застаўся жывы, стаў бы таленавітым журналістам.

— Мама, а тата вельмі абрадаваўся, калі даведаўся, што ў вас буду я? — у тысячны раз спыталася Улляна, каб пачуць звыклы адказ:

— Канешне, Уля. Ну ўсё, хопіць успамінаў, пойдзем вячэраць.

Улляна скацілася з ложка на падлогу, крыху паляжала, потым салодка пацягнулася і ўстала.

## 3

Спецсемінары паставілі на панядзелак. Улляна падышла да аўдыторыі, якая была пазначана ў раскладзе. Там яшчэ йшлі заняткі, і пад дзвярыма сядзеў Ваня Новік, Улін аднакурснік, хлапчына вельмі худы і вельмі высокі. Толькі ў адрозненне ад Улляны ён свайго росту саромеўся і ўвесь час уціскаў шыю ў плечы, за што з першага курса меў мянушку Гусь. Ён супраціўляўся такому найменню, маўляў, у беларускай мове слова гусь жаночага роду. Аднакурснікі адказвалі: «Тым горш для цябе, Гусь».

Улляна, мабыць, была адна з тых нямногіх, хто не дражніў Ваню Гусём ці, дакладней, Гусяй, бо ён быў адзіным хлопцам з курса, вышэйшым за яе. Астатнія аднакурснікі былі Улляне па плячо і ніжэй, таму толькі з Ванем ёй было камфортна, да таго ж і хлопец ён быў цікавы. Яшчэ на першым курсе ён абвясціў, што будзе пісьменнікам. І не абы-якім, а геніяльным. Калі ў яго пыталіся, што ён ужо напісаў, Новік адказваў: «Пакуль нічога. Але дарэмна смеяцеся, Анарэ дэ Бальзак у маладосці таксама быў упэўнены ў сваёй геніяльнасці, нават нічога не напісаўшы. Так што яшчэ за аўтографамі будзеце бегаць». І вось гэты самы Ваня сядзеў пад дзвярыма і чакаў. Уля спачатку прайшла міма, потым вярнулася і спыталася:

— Ваня, ты да Міхася Пятровіча ў спецсемінар запісаўся?

— Па-першае, заві мяне цяпер Янка, па-беларуску так будзе правільней. Па-другое, да каго яшчэ я мог пайсці? Ён жа дыназаўр, мастадонт. Мне ўжо расказалі: Каляда — стары халасцяк, дзяцей няма, а ўзрост такі, што хочацца падзяліцца сваімі ведамі. І тут у яго пад рукой студэнт, таленавіты хлапчына, гатовы слухаць і запамінаць.

Улляна засмяялася, прысела побач і іранічна спыталася:

— А калі раптам побач апынецца студэнтка, таленавітая дзяўчына, гатовая слухаць і запамінаць? Што тады?

— Ніводнага шансу, Уля, мужчынская салідарнасць! — Ваня нібыта канстатаваў факт. Ён заўсёды быў такім побач з Уллянай, упэўнены, смелы, сапраўдны мужчына, як яму здавалася, за якім, як за каменнай сцяной. А Улляне здавалася, што яму самому патрэбна каменная сцяна. Уля падыгрывала яму, слухала яго з адкрытым ротам і раз-пораз асцярожна давала яму парады наконт ягонай творчасці.

— Як твой раман пра сэнс жыцця? — звыкла пацікавілася Уля. — Пішаш?

— Цяжка ідзе! — Ваня выцер з ілба ўяўны пот. Ды я і не ўпэўнены, ці зразумее грамадства такую задуму. Я іду наперадзе свайго часу.

— А інтымныя сцэны там будуць? — Улляна радавалася, што на калідоры не гарыць святло і Ваня не бачыць іранічны выраз яе твару.

— А ты думаеш, трэба, каб былі інтымныя сцэны? — разгублена спытаўся Ваня.

— Вядома ж! — выгукнула Уля.

— Ведаеш, я не ўпэўнены... Уля, а можа, як-небудзь без іх абысціся? — Ваня амаль што заікаўся.

І тут Уля зразумела, чаму Ваня не можа пісаць пра інтымныя адносіны. Канешне, праз недахоп досведу ў такіх справах.

— Янка, я разумею, што ў цябе пакуль што невялікі вопыт, табе толькі 20 год, але ў наш час нават трынаццацігадовыя дзеці ўжо ўсё ведаюць пра секс, не думаю, што ты ведаеш менш. — Уля нават расхвалявалася, ці дастаткова яна дыпламатычная. — Пісьменнікі таму і становяцца пісьменнікамі, што яны могуць вольна апісваць нават тое, што яны не перажылі.

Званок з пары прагучаў як выратаванне. З аўдыторыі ламануўся надушаны парфумай натоўп на высокіх абцасах і ў кароткіх спаднічках. Ды Ваня на аголеныя ножкі ніколі не рэагаваў.

Хлопец закінуў заплечнік у аўдыторыю і збег. «Так мне і трэба! Спужала бедалагу!» — падумала са смехам Ульяна. Праз дзесяць хвілін празвінеў званок, потым у дзверы ціхенька пастукалі, і ў праёме з'явілася калматая Ванева галава. Калі ён убачыў, што Міхась Пятровіч яшчэ не прыйшоў, то стаў за кафедру і з пафасам спытаўся:

— Падзяліцца з вамі вопытам, спадарыня Ульяна? Ці не падзяліцца?

Усё гэта было прамоўлена з характэрнай інтанацыяй Каляды. Ульяна так і паехала са смеху. Ваня любіў такіх удзячных слухачоў і яшчэ больш уваходзіў у ролю. Раптам у аўдыторыю зайшоў Міхась Пятровіч. Парачка застыла, нібы злоўленая на месцы злачынства. Уля павольна закрыла рот, а Ваня адступіў ад кафедры, прашаптаў «прабачце!» і сеў побач з дзяўчынай. Міхась Пятровіч, здавалася, нічога не пачуў, бо сваім звычайным голасам пажартаваў: «Бачу, вы без мяне не сумуеце!» Ён дастаў з папкі паперу і працягнуў студэнтам:

— Напішыце прозвішча, імя і імя па бацьку, а таксама курс і групу.

Ваня не па-джэнтльменску першым ухапіў ліст і хуценька запісаўся туды сваёй нечытэльнай вяззю. Улін почырк таксама меў прыкметы геніяльнасці, але яна, маючы адвечныя праблемы з імем, намага-

лася пісаць разборліва. Міхась Пятровіч прачытаў уголас:

— Новік Янка Леанідавіч і ... Гаманкова Улляна Алегаўна... Улляна? Такое рэдкае імя, — ён пагля- дзеў на Улю.

— Сямейная традыцыя, — дэманстратыўна ўздыхнула студэнтка. — У кожнай галінцы нашага сямейнага баабаба была хаця б адна Улляна.

— Добра, я прынёс спіс літаратуры, якія, на маю думку, вам трэба засвоіць. І, можа, менавіта па гэтых творах вы выберацe дыпломныя работы. Хоць я, канешне, не прымушаю. Я мяркую, за месяц вы вызначыцеся. Згодныя, Улляна Алегаўна і Янка Леанідавіч?

Студэнты асуджана кіўнулі. Такая рэакцыя поўнасцю задаволіла прафесара, і ён прачытаў кароткую лекцыю пра сучасны літаратурны працэс і расказаў некалькі вясёлых гісторый з жыцця пісьменнікаў. Усю гэтую прамову Ваня слухаў краем вуха, з больш пільнай увагай ён паставіўся да спіса літаратуры, дзе налічыў дваццаць шэсць твораў і прадчуваў, што ўсе яны будуць таўсценныя і занудныя. Не даюць геніям развівацца! Можа, ён напісаў бы твор, якім бы праславіў беларускую літаратуру на ўвесь сусвет, а замест гэтага трэба чытаць чужую пісаніну.

Ён цішком зірнуў на Улляну, якая ўважліва слухала. «Што я тут раблю?» — незадаволена перасмыкнуў вуснамі хлопец. Міхась Пятровіч, заўважыўшы ахвярны выгляд Вані, расказваў больш для Улляны, хлопец убачыў гэта і пакрыўджана падумаў: «Стары певень!», потым ён падумаў яшчэ горш і ўрэшце апошнія паўгадзіны правеў за прыдумваннем мянушак для Міхася Пятровіча. Нарэшце пара скончылася, і выкладчык спытаўся:

— Улляна, вы прынеслі мне што-небудзь са сваіх твораў?

Такой здрады ад Улі хлопец не чакаў, яна так яго распытвала, а сама не сказала, што нешта нясе выкладчыку. Можа, здзекавалася? Ды не, не магла Уля насміхацца. Можа, ёй няма чым хваліцца, зразумела, так яно і будзе, і на наступны раз выкладчык прынясе яе паперкі і сумна скажа: «Ніколі не бярыце ў рукі асадку, раптам параніцеся, Уля!»

Калі Міхась Пятровіч выйшаў лёгкім упэўненым крокам, Ваня паблажліва прамовіў:

— А спінка ў яго роўненькая, ідзе як па лінейцы! Уля, я здагадаўся, ён школу для шляхетных паненак скончыў.

— Ваня, што ты так? А, раззлаваўся, што я сваё дала яму пачытаць? — са спачуваннем прамовіла дзяўчына. — Ваня, калі б ты менш расказваў пра свае творы, ты больш бы пісаў. Твор можна перажыць толькі адзін раз, а калі ты расказваеш, ты яго ўжо перажываеш. Потым не хочацца запісваць, бо ўзнікае адчуванне, нібы ён ужо кімсьці напісаны. Праверана на практыцы.

Хлопец ашалела глядзеў на Улю, і калі мова вярнулася да яго, ён не ўтрымаўся, каб не пад'юдзіць:

— Гаворыш, як член Саюза пісьменнікаў! А калі сур'ёзна, то сама ведаеш, якія ўмовы ў інтэрнаце. Добра табе, мінчанцы.

— Запрашаю ў госці для напісання інтымных сцэн! — урачыста прамовіла Уля.

— Сродкі засцеражэння, то-бок асадку і паперу, браць ці ў цябе знойдзецца? — з'едліва запытаў хлопец.

— Ваня, тут халява не пройдзе. Калі напішаш твор амаль поўнасцю, тады і прыходзь. Толькі пакінь месца для інтымных сцэн. Ты сам усё добра напішаш пад маім пільным наглядам. Я адчуваю ў табе вялікі патэнцыял, калі ты мне летам ліст напісаў, я была ў шоку. Такое пасланне адразу друкаваць можна — гэта ж класічны ўзор эпісталярнай спадчыны для наступнікаў! Ты хвалішся, што геній, але ж геній —

гэта 90% поту і толькі 10% таленту. Ты сам ведаеш, што не праліў яшчэ гэтыя 90% поту.

— Уля, за інтымную сцэну з табой, у творчым сэнсе, я буду працаваць, як вол! — хлопец казаў сур'ёзна, але ў вачах блішчэлі агеньчыкі. — А як табе ўвогуле наш Міхась Пятровіч? — нечакана змяніў тэму Ваня.

— Спадабаўся, Ваня, я ж ведала, да каго іду. Мне і лекцыі ягоныя падабаюцца. Разумееш, мы з ім людзі адной хвалі. Нам смешныя аднолькавыя рэчы, я ўпэўнена, мы смяяліся б з аднолькавых анекдотаў, мне жахліва падабаюцца ягоныя творы, і думаю, яму таксама яны падабаюцца. Карацей... Я не ведаю, як табе растлумачыць. Во, я з табой таксама на адной хвалі, — старанна падшукваючы словы і паралелі, гаварыла дзяўчына.

— Дык чаму тады я з ім на розных хвалях? Не дапрацавала ты яшчэ сваю тэорыю, — пасмяяўся Ваня, хоць быў цалкам згодны, што яны з Уляй людзі адной хвалі.

4

Разам яны падышлі да аўдыторыі, дзе па раскладу была наступная лекцыя. Ваня пайшоў з хлопцамі паліць, а Уля далучылася да дзяўчат. Яна села на падаконнік і, боўтаючы нагамі, слухала парады сяброўак.

— Ты да Каляды пайшла? Дарма! — спяшалася падзяліцца плёткамі Маша, больш-менш блізкая сяброўка. — У яго курсавую пісала дзяўчына з суседняга пакоя, ты яе ведаеш, Таня, ты яшчэ казала, што яна занадта шмат фарбуецца. Дык ён яе сто разоў ганяў. То яму гэты абзац не падабаецца, то іншы, быццам бы ён адразу ўсё сказаць не мог. Яна чатыры разы перапісвала. Ён бы і больш перапісваць прымусіў, але яна адзін раз змухлявала. Ён сказаў перапрацаваць асноўную частку, яна нічога не рабіла, а прыйшла праз тыдзень і прынесла тое

самае, а ён кажа: «Ужо лепей!» Значыць, ён нават не чытаў! Абы студэнтаў памучыць, я табе кажу!

Усе ведалі, што выбраць спецсемінар, гэта як замуж выйсці, можна, вядома ж, і «развесціся», але лепш у згодзе пражыць да пятага курса. А натуры эмацыянальныя, як Ульяна, былі амаль закаханыя ў кіраўнікоў сваіх спецсемінараў, таму ёй вельмі непрыемна было такое чуць пра Міхася Пятровіча.

— Калі б я была выкладчыцай, я сама б тую Таню ганяла тысячу разоў. Упэўнена, што яна нічога цікавага не напісала, перадрала адкуль-небудзь і прынесла. Прабач, але яна для мяне не ўзор, — Уля нават крыху раззлавалася.

З аўдыторыі выйшла дзяўчына з яблыкам, і Уля адчула, што таксама хоча есці, толькі, як назло, нічога з сабой не ўзяла, а ў буфет ужо не паспее. А тут яшчэ Маша круціць на пустым месцы, абы іншым сапсаваць настрой.

Са званком яны зайшлі ў аўдыторыю, селі на свае месцы ў першым радзе, бліжэй да акна. Выкладчыца, пажылая, але вельмі дагледжаная жанчына, моцна ляпнула дзвярыма і пайшла да кафедры.

— З такімі нагамі — і ў спадніцы! Ёй толькі дзяцей пужаць! —прашаптала Маша Улі на вуха.

— Якая табе розніца! — абурылася Ульяна. — Галоўнае, што лекцыі нармальныя.

— І прычоска ў яе сёння не атрымалася, — нібыта нічога не пачуўшы, дадала Маша.

Уля апусціла галаву і абаперлася ёю на руку, закрываючы далонню твар. Яна пасунула нагу пад партай і моцна наступіла на суседчыну нагу чаравіком на таўставатай падэшве.

— Куды ты свае «калхіды» сунеш! — зашыпела Машка, выціраючы пыл з абутку.

Уля спакойна працягвала запісваць лекцыю. Раптам дзверы расчыніліся і, як звычайна, у аўдыторыю праціснулася худое цела Вані Новіка, а за ім уваліўся Паша Васілевіч, лепшы Ванеў сябра. Курс

завыў: Паша на занятк̈і хадзіў рэдка, але калі ўжо прыходзіў, то ўсе выкладчыкі шкадавалі, што ён з'явіўся. І пакуль Ваня, глытаючы гукі, прасіў прабачэння, Паша за ягонай спінай павіхляў азадкам, у такт падымаючы бровы. Усе зарагаталі, а выкладчыца, не разумеючы прычыны смеху, узяла ў руку аловак, адставіўшы мезенец, і пастукала ім па кафедры. Цішыня крыху ўсталёўвалася, хоць было добра відаць, што некаторыя ўсё яшчэ смяюцца, прыкрываючыся рукамі.

— Сядайце, — дазволіла выкладчыца.

Замест таго каб сціпла сесці дзе-небудзь каля дзвярэй, хлопцы прайшлі паміж кафедрай і сталамі, прычым Паша так смешна падскокваў, што з апошняга рада пачуліся апладысменты. Калі Ваня праходзіў міма Улі, то паклаў ёй на стол нешта ў бліскучай абгортцы. Уля пад партай разгарнула фальгу і ўбачыла паўпліткі белага шакаладу. Страўнік зайграў урачысты марш. Дзяўчаты падзялілі шакалад, і Улі здалося, што такога смачнага яна ніколі не ела. І прыемна было, што Ваня пра яе падумаў. Таму абгортку яна адаслала Вані і Пашы на апошні рад, напісаўшы ўнутры: «Дзеўкі з'елі шакалат, хлопцам дзякуй гаварат». Ваня, атрымаўшы допіс, пашукаў Улю вачыма і, калі яна азірнулася, памахаў ёй рукой.

На наступны дзень ён падышоў да Ульяны і з гонарам паведаміў:

— Уля, я вырашыў пісаць іншы твор. Хлопец, прыблізна майго ўзросту, студэнт. Я паказваю ягоны лёс у наш цяжкі час. Гэта будзе сенсацыя!

— Па-першае, наш час не цяжкі. Цяжкі ён будзе, калі ты з кіёчкам не зможаш спусціцца з лесвіцы. А па-другое, у цябе зноў няма сюжэту. Ёсць ідэя, але гэтага мала. На гэтую тваю ідэю можна сто твораў напісаць. — Улю пачынала злаваць гэткая творчая інфантыльнасць. Але, гледзячы на разгублены

Ванеў твар, яна не магла крычаць на хлопца. — Ваня, а інтымныя сцэны будуць?

— А ты думаеш, трэба? — звыкла спытаўся Ваня.

## 5

Праз тыдзень Уля зноў сядзела пад дзвярыма, чакаючы спецсемінара. Да яе падышоў адзін з Ваневых сяброў і паведаміў:

— Гусь прасіў сказаць, што ён сёння не прыйдзе. У Пашкі дзень нараджэння. Тыдзень будуць гуляць!

Уля падзякавала і, па інерцыі гледзячы ўслед хлопцу, падумала, што Ваня ўмее быць сапраўдным студэнтам: дзе трэба — геній, дзе трэба — лайдак. Значыць, Ваня не прыйдзе. З'явілася адчуванне, што дзень праляціць дарма, што лепш бы яна ўвогуле ва універсітэт сёння не йшла.

Міхась Пятровіч на гэты раз не спазніўся. Ён быў у нейкім асаблівым настроі, паклаў папкі на стол і, усміхаючыся сваім думкам, абапёрся локцем на кафедру. Ён уважліва паглядзеў на Ульяну і хацеў нешта спытаць. Але Уля адразу яго папярэдзіла:

— Вані сёння не будзе.

— Ну, калі так, то спадзяюся, вы не супраць, каб мы пагаварылі пра вашы творы? — неяк абрадавана спытаўся Міхась Пятровіч і адразу выцягнуў яе паперы.

Уліна сэрца сціснулася, нібы яе самую зараз будуць разбіраць на кавалкі. І яна на секунду пашкадавала, што аддала яму свой твор.

— Ульяна, вам несумненна варта пісаць. Вам ужо можна выдаць маленькую кніжку ў «Бібліятэчцы часопіса «Маладосць». Гэта рэальна. Але я вас прашу, будзьце ўважлівей да слоў, да пабудовы сказаў. Я ў вас часам такія перлы знаходзіў! — ён пагартаў яе паперы і зачытаў некалькі фраз. Уля пачырванела ад сораму. Такое яна і сама магла заўважыць, але вось — прапусціла.

— Паспрабуйце чытаць сваю аповесць, а гэта ў вас аповесць, як я зразумеў, вачыма свайго ўяўнага ворага, які шукае, да чаго б прычапіцца.

І тут Уля не вытрымала:

— Я ведаю. Перад тым, як даць маме, я перачытала ўсё яе вачыма. І вашымі я таксама спрабавала чытаць.

— Але, мабыць, дрэнна пераўвасобіліся, бо ў мяне ёсць яшчэ заўвагі, — Міхась Пятровіч падняў вочы ад лістоў. — Вось ваша гераіня ўвесь час дае хлопцу парады, яна яму як маці, дык ці магла яна закахацца ў яго? На маю думку, не! — безапеляцыйна заўважыў выкладчык.

Уля зноў пачырванела і шэптам прамовіла: «Магла!» Міхась Пятровіч уважліва паглядзеў на дзяўчыну і рассмяяўся: «Вам лепей відаць як аўтару!» «І, відаць, прататыпу», — ледзь не дадаў ён.

Настаўнік яшчэ доўга разбіраў характары і сюжэты яе твораў і напрыканцы ці то пахваліў, ці то паўшчуваў:

— А інтымныя сцэны напісаны ўвогуле прафесійна. Толькі іх занадта шмат.

— Але ў вашых творах іх таксама нямала, — паспрабавала абараніцца Улляна. — Мы з сяброўкай ужо абмяркоўвалі маю аповесць і гэтыя сцэны. Ёй спадабалася. Яна толькі сказала, што ніколі б не падумала, што я так напішу. Я... — Уля запнулася, пачырванела і заікаючыся працягвала:

— Я сама ніколі ў такія сітуацыі не трапляла... — Ёй падалося, што яна зноў гаворыць нешта не тое. І яна амаль выкрыкнула: — Я ўсё гэта прыдумала, разумееце?

Стары пісьменнік зразумеў і яшчэ доўга гаварыў пра адказнасць пісьменніка перад чытачамі, пра важнасць выбару значных і вострых тэм, пра штодзённае ўдасканаленне і рост аўтара.

## 6

Улляна сядзела з Машкай ва ўнутраным дворыку філфака: цёплы верасень дазваляў. Улляна сарвала з дрэва лісток, склала напалам і парвала. Яна нервавалася і ўжо не хавала сваіх перажыванняў.

— Машка, ты не ўяўляеш, як мне было сорамна! Сядзець перад чужым мужчынам і апраўдвацца... А ягоны позірк, ты б бачыла! Павага і насмешка адначасова! Навошта я дала яму пачытаць!

— Пісаць трэба так, каб ты пасля не саромелася перад сваімі чытачамі, — Маша сказала гэта напышліва, але праз секунду стала самой сабой. — Уля, гэта ж гатовы сюжэт: пажылы пісьменнік чытае твор студэнткі, і сэрца яго аддадзена ёй навек. Апішаш усе позіркі і ўсмешкі старога Каляды.

— Самае смешнае ў тым, — не слухала сяброўку Улляна, — што нібыта сорамна... Ды ў мяне самой адчуванне, што я пры жыцці рыхтуюся да кананізацыі!

— Па-першае, не крычы, а то хлопцы, што паляць каля выхада, ужо на цябе пазіраюць! А падругое, Аленка з майго пакоя ўжо ўсё! — Машка нарэшце выдала навіну, якую ёй так карцела расказаць.

— І яна вам так адразу і прызналася? — прамовіла Уля ў аслупяненні.

— Яна нам яшчэ і падрабязнасці выдала! — Машка вытрымала паўзу, каб даць Улляне час ацаніць каштоўнасць інфармацыі. — Яна дазволіла, каб я табе расказала, можа, ты дзе-небудзь выкарыстаеш у сваёй пісаніне.

— А з кім яна? — не хавала зацікаўленасці Улляна.

— Не паверыш! З Пашкам! — Маша была ўпэўнена, што такая кандыдатура — вялікая нечаканасць для Улі.

— І як ёй? — Уля ўся ператварылася ў слых.

— Анекдоты ён лепш расказвае, — скрывіўшы вусны, адказала Маша.

Дзяўчаты разрагаталіся, і Маша працягвала:

— Першая яе думка: «І гэта ўсё?» Першыя яе словы: «Я цябе кахаю!» Вучыся, як трэба з мужчынамі ладзіць! А ўсё астатняе, як у кніжцы пра шлюбнае жыццё, і ў дадатак стойкі пах поту, як у рэкламе, — скрывілася Маша.

Улляна засмяялася, але раптам спынілася на паўсмяшку:

— Што ж ты нарабіла! Я не змагу пра гэта не напісаць! А падумаюць на мяне! Ад такога я ўжо не адмажуся... Ай, Машка, чорт з ёй, з рэпутацыяй. Твор даражэй.

— Ну, тады я раскажу табе, як Таццяна, тая, што занадта фарбуецца, аўтастопам дадому ездзіла, — усміхнуўшыся толькі вачыма, пачала Маша...

## 7

Дома Улляна дастала сшытак для сюжэтаў, разгарнула на апошнім спісаным лістку і напісала: «№ 17. Што-небудзь пра аўтастоп». Улляна ведала, што праз месяц, год ці два гэтая маленькая фразачка распаўзецца на паўстаронкі, а потым пераселіцца ў камп'ютэр, і з'явіцца яшчэ адно апавяданне, якое будзе выклікаць агіду ў саракагадовых і прымацца на «ўра» моладдзю. Улляна была ўпэўнена, што больш за ўсіх абураўся б той мужык-экзгібіцыяніст, які падвозіў студэнтку-аўтастопаўку. Ён першы б крычаў, што аўтарка разбэшчвае чытачоў, што яна сама здымае з хлопцаў штаны, што яна палюе на мужчын, што яна шлюха, што яна адразае чэлесы, што яна людажэр. Так заўсёды. Ролю самых строгіх пурытан у гэтым свеце граюць самыя распусныя вычварэнцы.

Уля ўключыла камп'ютэр, уставіла дыскету, адкрыла новы файл. Пра аўтастоп яна напіша пасля, тэма «першай ночы» здавалася больш цікавай. Не

ўсе ездзяць аўтастопам, а вось у ложку большасць апынецца. Толькі патрэбны нейкі сюжэт... У пошуках адпаведных ідэй Уля зазірнула ў свой сшытак: усё чыста і прыстойна, мабыць, яна ніколі не напіша гэтыя творы, творы, дзе няма нават пацалунку.

А з іншага боку, калі добра напісаць, то неістотна, што пісаць. Та-ак! Хай гэта будуць пятнаццацігадовая дзяўчына і хлопец гадоў дваццаці. Потым апісаць усё як мае быць. Потым ён яе кідае. А мараль такая: няма чаго станавіцца жанчынамі ў пятнаццаць гадоў. Не...

Чаму не, нармальна. Дзяўчаты расказвалі пра хворых на галаву, няйначай, хлопцаў, якім любую дзеўку давай, абы цнатлівая была. Уля падумала, як гэта, напэўна, непрыемна, калі цябе кахаюць не за тое, што гэта ты, а толькі за фізіялагічную асаблівасць. Зрабіць героя такім хворым, і дзяўчына сама яго кіне і сустрэне ў канцы нармальнага хлопца, які будзе яе кахаць. Тады... ёй будзе не пятнаццаць гадоў, а васемнаццаць. Вось так. Хай яны будуць студэнтамі, усё адбудзецца ў інтэрнаце. У Аленкі з Пашкам адбылося менавіта так. Толькі Пашка, здаецца, Алену кахае.

У кіно так прыгожа ўсё паказваюць, але ў жыцці не можа так быць. Тым больш у першы раз. Значыць, трэба прыпісаць розныя няёмкасці і нязручнасці. Толькі не кшталту паносу, бо гэта ўжо чорны гумар. Псаваць усё трэба па дробязях.

*Яны сядзелі ў пустым пакоі насупраць адзін аднаго. Ногі іх былі пераплецены, яны маўчалі.* Не, атрымліваецца, што ногі маўчалі, зноў Міхась Пятровіч засмяе. Трэба яшчэ імёны прыдумаць. Хай будзе Дзіма і Наташа. Нікому не крыўдна, бо калі назваць Антаніна і Марат, то па закону подласці ў нейкім класе ці на нейкім курсе абавязкова трапіцца парачка з такімі імёнамі. І Ульяне не хацелася псаваць з імі адносіны.

*Ногі іх былі пераплецены. Дзіма глядзеў у акно, раз-пораз кідаючы позіркі...* Не, проста *позіркі* дрэнна. Трэба якія-небудзь позіркі. Няўпэўненыя? Запрашальныя? Улляна паглядзела ў акно, раз-пораз кідаючы позіркі на камп'ютэр. Раўнадушныя позіркі, бо гэта ж камп'ютэр. А чорт з імі, няхай будуць *цікаўныя*, банальна, але нельга ж так доўга сядзець над кожным словам. *Наташа адчувала, як ногі награваюцца, і вось ужо з-пад калена пацякла кропелька поту. Дзіма, мабыць, адчуваў тое самае, але ўпарта глядзеў у акно. «Глупства», — падумала Наташа, устала, вызваліўшыся з ягоных ног, пайшла і зачыніла дзверы на ключ, каб суседкі па пакоі не турбавалі. Дзіма ўспрыняў гэта як знак да дзеяння, але яму хацелася пагуляць з яе жаданнем.* Нейкі сказ атрымаўся непісьменны, але далей, далей. Не, стоп. Улляна ўявіла, як Каляда будзе ўголас аналізаваць яе памылкі, яна ўспомніла ягоную з'едлівую інтанацыю, і сэрца сціснулася ад сапраўднага болю. Але выпраўляць фразу па-ранейшаму не хацелася, Улляна зафарбавала сказ у пяшчотна-блакітны колер, каб потым выпадкова не абмінуць і не забыцца. Цікава, пакоі ў інтэрнаце дастаткова вузкія, каб можна было пераплесці ногі? Трэба будзе спытаць у Гуся. Можна і ў Машкі, але лепш у Гуся.

Як паказаць, што Дзіму цікавіць толькі дзявоцкасць? Праз думкі? А я змагу перадаць думкі хлопца, каб потым гэткія ж хлопцы не пасмяяліся? Не, лепш Наташа падслухае яго размову з сябрам. А размова — гэта лёгка.

Цікава, ці павінны яны вызначыцца, чым яны будуць засцерагацца? Гэта толькі ў фільмах героі ўбачылі адно аднаго, пазрывалі адзенне і сталі адным цэлым. А з другога боку, як ні напішы, заўсёды можна даказаць, што нехта робіць менавіта так, як ты апісваеш у сваім творы. Трэба такое прыдумаць, каб чытаць было цікава, а праўда ці няпраўда, ніхто разбірацца не будзе.

— Уля-а-ана! Есці! — маму зусім не хвалявала даччына праблема напісання інтымнай сцэны.

— Іду-у! — дзяўчына з палёгкай выключыла камп'ютэр. Не, усё ж такі нельга пісаць з наскоку, кожная сцэна павінна вылежацца, выкрышталізавацца ў галаве, і тады трэба толькі запісаць як пад дыктоўку.

## 8

Улляна, як звычайна, сядзела ў калідоры на падваконні, Машка стаяла побач і расказвала чарговую гісторыю з жыцця студэнцкага інтэрната. Улляна штосекунды перарывала яе аповед непрыстойнымі каментарамі, але раптам заўважыла, як па калідоры з боку лесвіцы ідзе Ваня, і змоўкла, а Машка ўскрыкнула, бо Лілька Кішкайла цішком выйшла з аўдыторыі і ўхапілася штосілы за вабныя Машыны бакі.

— Яшчэ раз так зробіш, — пагрозліва сказала Маша, моцна трымаючы Ліьку за наманікюраныя пальчыкі, — іголкі пад пазногці пазаганяю, як у лепшыя часы інквізіцыі!

— А-а-ах! Я ўжо паралякалася і страціла прытомнасць! — І Лілька «страціла прытомнасць» проста на рукі Вані, які якраз падышоў да дзяўчат.

— Ну ты і карова, Ліля! — выдыхнуў хударлявы хлопец, прыняўшы худое Лільчына цела. Дзяўчына пакрыўджана адкінула Ваневы рукі, абцягнула спадніччку і, павярнуўшыся спінай да Вані, спытала ў дзяўчат:

— Вы што-небудзь ведаеце пра нейкага ці нейкую «дац. Крылько», як пазначана ў нас у раскладзе.

— Ліля, ты што, пакрыўдзілася? Ты ж такі дыстрофік, што я табе, можна сказаць, камплімент зрабіў! — абурыўся Ваня.

— Калі ты будзеш пісаць сваю інтымную лірыку ці прозу з такімі кампліментамі, ты станеш класі-

кам люмпенпралетарыяту! Не больш! — аджартавалася Ліля. — А магчыма, ты проста не можаш падняць дзяўчыну на рукі?

— Праехалі! — спыніла славесны двубой Ульяна. — Ваня, а як табе я... з выгляду? — дзяўчына спаўзла з падваконня. Хлопец узважыў яе позіркам, дэманстратыўна падцягнуў штаны, падхапіў Улю і закруціўся з ёю па калідоры. Ульяна задаволена вішчала, Машка смяялася, а Ліля павярнулася да акна, каб не глядзець на шалёную парачку, але яны ўсё адно адлюстроўваліся ў шкле. Ваня так раскруціўся, што не ведаў, як спыніцца, Ульяна спужалася, што яна зараз выслізне са слабых Ваневых абдымкаў. Прыпыненне было жахлівае, яны падбілі нейкага высокага хлопца, сам ён устаяў, а вось ягоная папка вылецела з рук і прашархацела па падлозе яшчэ два метры. Маша пабегла паднімаць папку, а Ваня фамільярна ляпнуў хлопца па плячы:

— Дзякуй, сябра, і выбачай!

— Выбачаю, супермен ты недавучаны. Вы з трыста сёмай аўдыторыі? Дык заходзьце, пара ўжо пачалася, — загадаў хлопец, абтрасаючы пыл з папкі. Ён па-джэнтльменску прапусціў у аўдыторыю дзяўчат, сам прайшоў перад Ванем і шэптам сказаў: «Зачыні дзверы, с-сябра!» «Ну, усё, гамон!» — пранеслася ў Ваневай галаве.

Выкладчык стаў за кафедру і, абвёўшы прыязным позіркам пераважна дзявочую аўдыторыю, сказаў з прыхаваным гонарам:

— Ну, не вінаваты я, што стаў кандыдатам філалагічных навук у дваццаць пяць і што выглядаю так молада, што студэнты прымаюць мяне за свайго. Такім чынам, запішыце маё імя. Антось Крылько. Гэта амаль па-сяброўску, — выкладчык з іроніяй паглядзеў на перапужанага Новіка. — Каму цяжка адмовіцца ад прывычных герархічных стасункаў, калі ласка, на Антося Генадзевіча я таксама адгукаюся.

Улляна шэптам запытала ў Машы: «Ты чула, ён сказаў *герархічных»*!» — «Ну і што мне? Павесіцца?» — адгукнулася Маша, закахана разглядаючы высокую постаць выкладчыка. Пад строгім пінжаком на ім быў досыць нефармальны шэры світэр, але ўсе гэтыя апранахі не перашкаджалі дзяўчыне разгледзець яго спартыўную фігуру. «Мабыць, з гантэлямі прачынаецца і спаць кладзецца», — Маша лёгенька штурханула Улляну. А тая гэтым часам накідала ў канцы сшытка ягоны профіль і падпісала алоўкам: «Ён у профіль і анфас — як два розныя чалавекі». Маша прыгледзелася да твара Антося і здзіўлена кіўнула.

Ягоны выразны, як высечаны з мармуру, профіль з прамым носам і цвёрдымі, сухімі вуснамі быў крыху жорсткім. Цёмная бародка падкрэслівала амаль геаметрычную правільнасць ягонага твару. А ў анфас на студэнтаў глядзелі добрыя невялікія вочы, класічнасць носа была малазаўважнай, а вусны штохвіліны мякчэлі ў шчырай усмешцы. Ён надзвычай роўна трымаў спіну і высока падымаў падбароддзе, але не выглядаў пыхліва, па усяму было відаць, што чалавеку ад нараджэння падорана Богам такая арыстакратычная фігура.

— Я разумею, што вас зараз найбольш цікавіць спіс літаратуры, то-бок спіс тых аўтараў і твораў, з якімі мы мусім пазнаёміцца ў гэтым семестры. Яшчэ дадамо маленькі спіс крытычнай літаратуры, — паведаміў Антось пад агульны стогн аўдыторыі. — Каб прафесійна размаўляць пра творы, трэба паглядзець, што пра іх кажа народ. Мне будзе вельмі прыемна, калі хто-небудзь з вас прачытае ў «Крыніцы» сціплыя артыкулы спадара Антося Крылька.

Аўдыторыя нязгодна загула, пачуліся сцішаныя смяшкі. Антось прыслухаўся і здзіўлена запытаў:

— Чую гвалт — не бачу бойкі! Што я сказаў не так?

— Нам здаецца, што ваша прозвішча не скланяецца! І лепш сказаць *артыкулы Антося Крылько*, — не пабаялася паправіць выкладчыка Надзя Жукавень.

— І насамрэч, тут пытанне, як больш правільна. Са скланеннем прозвішчаў увогуле блытаніна. Ведаеце ж Кандрата Крапіву? Ён мужчына, так? А ў артыкулах лёгка можна сустрэць: *з Крапівой*. З якой крапівой? З Крапівом, з мужчынам! Гэтаксама мне падаецца, што няма сэнсу не скланяць маё прозвішча. Крылько, Крылька, Крыльку, з Крыльком! Гучыць абсалютна натуральна.

«Лекцыя па гісторыі замежнай літаратуры канца XIX — пачатку XX і беларускай мове адначасова», — Улляна напісала на палях сшытка і падсунула Машы. Тая дапісала «лекцыя дац. Крылька», хвілінку падумала і дадала «цалавацца з Крыльком».

У гэты момант пачулася страшэннае рыпенне, Антось незнарок ссунуў кафедру, за якой стаяў. Ён паспрабаваў вярнуць яе на месца, але было відавочна, што цяпер ужо і Антосю яе не зрушыць.

— Так мне і трэба. Няма чаго гойдацца, а то сам сабе псую працоўнае месца, —закусіўшы ўсмешку, сказаў ён.

— «Няма чаго гойдацца, няма чаго гойдацца...» — шэптам перадражніла Антося Ліля, адводзячы палі ў сшытку. — Няма чаго з кафедрай абдымацца. — Яна адклала лінейку, падняла галаву і зразумела, што Антось яе пачуў. Выкладчык усміхнуўся толькі вачыма, але Ліля адчула, што нічога ёй за гэта не будзе.

Антось задуменна паскуб бародку і зазірнуў у свае паперы:

— Ага-а! А зараз я вам прадыктую тэмы і пытанні да практычных заняткаў. На ўсё мы маем толькі чатыры пары, то-бок восем гадзін, на жаль, бо пра сімвалізм я магу гаварыць гадзіны чатыры, а пра імпрэсіянізм увогуле бясконца. Даю на выбар,

якую тэму вы хочаце разабраць першай: імпрэсіянізм, натуралізм, сімвалізм і новая драма. Не, што гэта я, новая драма будзе апошняй, гэта дакладна. Як вам імпрэсіянізм, га?

— А можа, увогуле не будзем нічога? — нахабна спытаў Пашка.

Антось намагаўся скараціць дыстанцыю між сабой і студэнтамі, але пасля гэтага ідыёцкага пытання ён усвядоміў, што дарма ставіўся так па-сяброўску да гэтых паскуднікаў.

— *Йіншыя* прапановы ёсць? — спытаў ён так, што ўсе зразумелі, што больш ніякіх прапаноў не будзе і выбару таксама. І толькі Надзя меланхалічна паўтарыла: «*Йіншыя*». Антось неспадзявана палагаднеў і звярнуўся да Надзі: — Толькі не кажыце, што вы гэтага не ведаеце. Ётавы прыгук тут абавязковы, гэта норма беларускага вымаўлення.

— А *йіншыя* заўсёды кажуць *іншыя*, — нечакана нават для сябе сказала Уля каламбур.

— Ну дык то *йіншыя*, — заўважыла Машка, і ўсе засмяяліся.

На заканчэнне лекцыі пра дэкаданс і песімізм на мяжы стагоддзяў Антось «абрадаваў» студэнтаў незвычайным дамашнім заданнем:

— Бераце звычайны тэкст на *звычайнай* замежнай мове, хто якую ведае, і робіце падрадковы пераклад. Ну, зразумела ж, вершы імпрэсіяністаў. Для тых, хто вывучае англійскую, — Аскар Уайльд, нямецкую — Рыльке, польскую — ранні Леапольд Стаф, французскую — Поль Верлен. Пытанняў няма? Перапынак!

Студэнты заварушыліся, Антось склаў свае паперы і, кіўнуўшы ўсім разам і нікому ў прыватнасці, выйшаў з аўдыторыі. Улляна падрыхтавала канспект да наступнай лекцыі і выйшла ў калідор, за ёй з яблыкам ў руцэ выбегла Машка.

Пашка Васілевіч, заўжды хворы на дзяцінства, знайшоў пад партай нечую гумку, напісаў на ёй асад-

кай свае ініцыялы і прыклаў да паперы. Ініцыялы аддрукаваліся ў люстраным выглядзе.

— Ну ты ўжо зусім здзяцінеў! — насмешліва прамовіў Ваня. Пашка падкінуў гумку ў руцэ і з крыкам: «Што, думаеш, у лоб не пацэлю?» пабег за Новікам. Той выбег з аўдыторыі і памчаў па калідоры, а дзяўчаты Пашку перанялі, гумку адабралі, і толькі тады Ваня, ужо не баючыся, далучыўся да кампаніі:

— Не ведаеце, як яго здаваць?

— Толькі лекцыі пачаліся, а ты ўжо здаваць хочаш. А калі ты запытаўся проста так, дык лепш бы абмеркаваў надвор'е. Так холадна, нібы зіма пачынаецца, — уздыхнула Машка і адкусіла кавалак яблыка.

— Маша-а, дай яблык грызануць, — папрасіў Пашка. — Ну адзін разок!

— Ведаю я твой адзін разок, — дзяўчына глянула на яблык са шкадаваннем, — як прысмокчашся сваім ротам напрактыкаваным, дык не адарваць.

Пашка склаў броўкі домікам, і Маша не вытрымала:

— Чорт з табой, але толькі адзін разок! Калі ласка!

Пашка разявіў сваю пашчу, упіўся зубамі ў яблык, і ўжо добрая палова засталася б яму, але ён яшчэ пачаў круціць галавой, і Маша ўпусціла яблык. Пашка выцягнуў яго з рота і, адкусіўшы кавалак, сказаў:

— Дзякуй табе, Машачка, ты сапраўдная сяброўка!

— Ніколі табе болей не дам! — пакрыўдзілася дзяўчына.

— Ты маеш на ўвазе толькі яблык ці што іншае? — з'едліва запытаўся Пашка, злізваючы сок з пальцаў.

— Што *йіншае*, — міжволі Маша нагадала пра Антося, і ўсе засмяяліся.

— Ну і як вам Антосік? Як мужчына, вядома ж, — падышла Лілька.

— Мне — нармальна, — запэўніў яе Пашка.

— Ён, здаецца, нежанаты. І я з вялікім задавальненнем выйшла б за яго замуж. Разумны, прыгожы, кандыдат філалагічных навук у дваццаць пяць год! Я нарадзіла б яму хлопчыка і дзяўчынку, здзьмувала б з яго парушынкі, — Ліля міжволі зарыфмавала свае мары, — а ён бы пісаў доктарскую, у кватэры была б абсалютная цішыня, я сама на дыбачках хадзіла б і нават дзецям раты пазатыкала б.

— Ага, скотчам заклеіла б, для большай надзейнасці. Толькі не забывай ім соплі выціраць, каб не задыхнуліся, — Ваневыя словы прагучалі чамусьці раўніва.

— Я не чула, пра што вы тут размаўляеце, — нечакана побач з'явілася Надзя Жукавень, — але па тварах бачу, што ўжо ёсць ахвотніцы згвалтаваць беднага Антося Генадзевіча. І калі я добра ведаю Лільку, то яна зараз павінна марыць пра штамп у пашпарце. Людзі, муж—выкладчык — гэта пакаранне, бо побач заўсёды такія студэнткі, як Лілька.

— Калі б мой муж быў выкладчыкам на «дзявочым» факультэце, — не вытрымала Улляна, — я прымусіла б яго насіць заручальны пярсцёнак. Нават два заручальныя пярсцёнкі.

— Уллянка, выходзь за мяне замуж, — сур'ёзна прапанаваў Ваня, — я буду насіць нават чатыры пярсцёнкі, яшчэ і на нагах, і калі я буду распранацца, мае каханкі будуць бачыць, што я ўжо жанаты.

— Гусь, ты такое невылечнае дзіця, — Маша не дала Улляне адказаць, — што вельмі доўга не зможаш ажаніцца.

— Што значыць «доўга» ў параўнанні з вечнасцю! — пафасна прамовіў Ваня і недвухсэнсоўна паказаў на Машу.

— Та-ак, народ, ідзе маё самае вялікае каханне, — Уля першай заўважыла Міхася Пятровіча, які шыбаваў па калідоры і глядзеў на нумары аўдыторый, шукаў тую, што пазначана ў раскладзе. Тут ён заў-

важыў Улю з Ванем і ўпэўнена накіраваўся ў трыста сёмую. А Ваня тымчасам паспеў прапанаваць Лілі ў якасці мужа самога Міхася Пятровіча.

Міхась Пятровіч стаў за кафедру, пачаў лекцыю і толькі як бы незнарок змахнуў рукой пот са скроняў. У ягоныя шэсцьдзесят шлях на трэці паверх ён адольваў ужо не так лёгка, як раней.

— Уля-а-а, — Маша пацягнула сяброўку за рукаво, — табе больш падабаюцца лекцыі Антося ці Каляды?

— Ведаеш, калі ў мяне цяжка на душы і зусім не хочацца вучыцца, то думка пра спецсемінар і пра Каляду вяртае мяне да жыцця. І ніякі Антось не можа гэта змяніць, — у такой жартоўнай форме Уля выказала сваё сапраўднае стаўленне да кіраўніка спецсемінара.

— Уля, а Каляда і ёсць самы лепшы, — Маша на хвілінку змоўкла, каб паспець запісаць за выкладчыкам. — Адразу даў білеты, і я так бачу, што ён усё нам вычытае. І ягоныя лірычныя адступленні не займаюць паўлекцыі. Проста супервыкладчык і звышмужчына, — адзначыла Маша.

— Спадарыня Бунеева, — звярнуўся Каляда да Машы, — я ўжо стаміўся вас перакрыкваць, але ваша балбатанне на першым радзе можна было б не заўважаць, калі б вы не забіралі ўвагу маёй семінарысткі. Гэта я ўспрымаю як асабістую абразу, спадарыня Бунеева. — Міхась Пятровіч лёгка вярнуўся да лекцыі, Маша пачырванела аж да барвовага колеру, але ўсё ж напісала для Уляны: «І памяць на прозвішчы ў яго бездакорная... на жаль...»

## 9

Было вельмі холадна для восені, але ісці дадому не хацелася. Уля з Машкай крыху пастаялі на ганку, пачакалі, пакуль Надзя і Ліля атрымалі ў гардэробе свае паліто, і ўжо ўчатырох пачалі разважаць, куды б накіравацца. Насупраць факультэта, каля

тэлефона-аўтамата, стаялі Ваня і Пашка. Трэба было толькі памахаць рукамі і аб'ядначца кампаніямі.

— Можа, піва? — прапанаваў Ваня, запальваючы цыгарэту.

— Ваў, Гусь, як дарослы, з цыгарэтай, — пакпіла з Вані Машка. — І піва пьеш? А бацькі ведаюць?

— А твае бацькі ведаюць, што ты сябруеш з такімі дрэннымі хлопчыкамі, як я? — сказаў Ваня і выдыхнуў цыгарэтны дым ёй у твар. Дзяўчына закашлялася, Ваня памахаў рукой перад яе носам, каб разагнаць нікацінавы туман, і спачувальна дадаў:

— Няма ў цябе, Маша, здароўя са мной сябраваць! А мо яно й правільна, не паліш, не пьеш, наркотыкамі не забаўляешся.

— Толькі не кажы, што ты наркотыкі ўжываеш! — заклапочана сказала Улляна.

— Уллянка, — Ваня адвярнуў галаву, каб выдыхнуць дым ўбок, — у мяне толькі адзін наркотык — і гэта ты. Як убачу цябе, дык ад кайфу проста прытомнасць трачу, каленкі дрыжаць, рукі трасуцца. Як няма цябе побач — ломка. І прыходзіцца задавальняцца Пашкам, больш слабым наркотыкам. — Толькі Улляна зразумела, што Ваня так алегарычна прызнаўся ёй у каханні.

— Падрабязней, калі ласка, — прычапілася да Вані Ліля, — як ты Пашкам задавальняешся?

— Ідзі ты, дурная! — Ваня спужаўся, што Уля таксама не зразумела яго, кінуў цыгарэту на асфальт і пайшоў уверх па вуліцы. Улляна пабегла за ім.

— Я нешта прапусціла? — вінавата спытала Ліля.

— А я думаю, у іх з Уллянкай каханне, — зайздросна прамовіў Пашка, гледзячы ўслед сябру.

Уля ўзяла Ваню за руку, нешта пачала гаварыць яму, ён абняў яе за плечы, і яны пайшлі разам.

— Усё так проста, так проста, — механічна паўтарыў Пашка, ён знячэўку абхапіў за таліі Лілю і Машку і спытаў Надзю:

— Ну, хто ідзе па піва?

— З такім лавеласам, як ты, можна піць толькі мінералку! — пстрыкнула яго па носе дзяўчына.

## 10

— Мама-а-а! Давай у кнігарню, ну калі ласка! — Улляна пацягнула маму ў «Акадэмкнігу».

— Ужо і так няма куды твае тамы ставіць, — паспрабавала адмовіцца мама, але Уля ўпарта цягнула яе за руку да ўлюбёнай кнігарні.

Яны ўвайшлі ў краму і сутыкнуліся з Міхасём Пятровічам. Улляна, крыху пачырванеўшы ад хвалявання, пазнаёміла выкладчыка і маму:

— Гэта мая мама, Ірына Сяргееўна. А гэта Міхась Пятровіч, кіраўнік майго спецсемінара, я табе шмат пра яго расказвала.

Раптам між Уляй і Міхасём Пятровічам уціснулася калматая Ванева галава, ён павітаўся і спытаў:

— А можна мне з Уляй пагаварыць?

Уля адразу адмоўна захітала галавой, але мама кіўнула, маўляў, можна. Міхась Пятровіч лагодна ўсміхнуўся, і Ваня пацягнуў Улляну да стэнда з кнігамі параіцца наконт пакупкі.

— Ну, прывітанне, Іра, — па-будзённаму сказаў Міхась Пятровіч. — Колькі год не бачыліся, мабыць, дваццаць?

— Дзевятнаццаць год і сем месяцаў, — удакладніла Ірына.

— Дзевятнаццаць год і сем месяцаў, — паўтарыў ён. — Дык Уллянка твая дачка... Добрая дзяўчына, — і раптам ён зразумеў, адкуль узялася такая дакладная дата, павярнуўся паглядзець на Улляну, якая пра нешта спрачалася з Ванем каля кніжнага стэнда. — Іра... — неяк бездапаможна сказаў Міхась Пятровіч і, павярнуўшыся да Ірыны, наткнуўся на яе востры і бязлітасны позірк. — Іра, не можа быць... ты ж абяцала... чаму ты не сказала раней... яна ведае? — пот выступіў на сівых скронях Міхася Пятровіча.

— Не хвалюйся, Міша. Яшчэ з часоў сваёй студэнцкай цяжарнасці я не забылася, які ты баязлівец. Да таго ж я ведаю выбуховы нораў Ульяны і памятаю пра твае, калі не памыляюся, шэсцьдзесят год, — паблажліва ўсміхнулася Ірына. Гэтую фразу яна прыдумала даўно, тады характар Ульяны яшчэ не быў выбуховы, а ўзрост Міхася Пятровіча Ірына мусіла штогод змяняць.

Міхась Пятровіч зноў павярнуўся да таго стэнда, дзе стаялі Уля з Ванем. Смеючыся, Уля прытулілася ілбом да Ванінага пляча.

— Міша, ты моцна пастарэў, але па-ранейшаму неяк гіпнатычна ўздзейнічаеш на студэнтак. Уля ў цябе проста закаханая, — гэтымі словамі Ірына канчаткова дабіла Міхася Пятровіча.

— Божа мой... Божа мой... — бясконца шаптаў ён.

— Ты чытаў творы *маёй* Ульяны, — з націскам на слове «маёй» сказала Ірына Сяргееўна, — памятаеш, ты мне казаў, што прырода адпачывае на дзецях геніяў. Мабыць, ты не геній, Міхась Пятровіч.

Ульяна з Ванем нарэшце выбралі нейкую кнігу і ўжо падыходзілі да касы. Міхась Пятровіч раптам расправіў плечы, усміхнуўся, як дваццаць год таму і прашаптаў Ірыне: «Ведаеш, у мяне зараз усё будзе па-іншаму».

Да іх падбегла Уля і жартам паскардзілася на Ваню:

— Міхась Пятровіч, ведаеце, што такое сучасныя хлопцы? Дапамажы яму кніжку выбраць і яшчэ грошы на яе пазыч!

Ірына Сяргееўна кінула здзеклівы позірк на Міхася Пятровіча, Уля той позірк перахапіла, але не зразумела яго сапраўднага значэння.

## 11

Ульяна ў піжаме сядзела на сваім ложку, абхапіўшы калені. Мама зайшла пацалаваць дачку перад сном і здзіўлена запытала:

— Ты спаць не збіраешся?

— Мама, не перашкаджай, я мару. У мяне заўтра спатканне, — радасна сказала Улляна і, засаромеўшыся сваёй нястрыманасці, уткнулася тварам у калені.

— З Ванем? — здагадалася мама. — І што ты надзенеш? Ты ўжо вырашыла?

— Мы ідзем выбіраць падарунак для Машы на дзень нараджэння, — сказала Уля, не слухаючы маму. — У хлопца з ягонага пакоя сёння таксама дзень нараджэння, але Ваня абяцаў заўтра прыйсці а дзесятай. Мабыць, праз гэта піць не будзе. — Улляне было прыемна, што Ваня гатовы ахвяраваць сябравым святам дзеля яе.

— А чаму вы так рана сустракаецеся? — пацікавілася мама.

— Заўтра ж а другой дзядзька Мікола прыязджае, а пакуль мы ўсе крамы аб'едзем, ГУМ, ЦУМ, гэта ж за пяць хвілін не зробіш.

...Ваня сядзеў на сваім ложку, абхапіўшы калені і спадылба пазіраў на хлопцаў. Імяніннік, сусед па пакою Сашка Тарасевіч, па мянушцы Тарас, разгублена стаяў перад Ванем. Пашка сеў на ложак:

— Гусь, апошні раз пытаю, ты піць будзеш?

— Паша, нашто ты так груба, — слаба запэрэчыў Тарас. — Ваня, я хацеў бы, каб ты быў з намі. Я не разумею, чаму ты ўпарцішся?

— Гусь, я перакладаю словы гэтага інтэлігента на нармальную мову, — перапыніў імянінніка Пашка. — Калі ты зараз ляжаш спаць, то нам прыйдзецца мяняць сваю дыслакацыю, але ж нам няма куды ісці, і таму ты павінен быць з намі. Усё проста. І чаму ты ўпіраешся, як апошні асёл, я не ведаю. Не хочаш — не пі, проста пасядзі з намі.

— Я хачу спаць, — упарта паўтарыў Ваня. — Ідзіце ў Пашкаў пакой. Што, вы не адшукаеце, дзе выпіць? Да таго ж камендант зловіць, нашто лішнія праблемы?

— Калі ты пачаў баяцца каменданта? — у пакой увайшла Пашкава Аленка. — У цябе раптоўна з'явілася алергія на алкаголь? Ці ты баішся, што заўтра дрэнна выглядаць будзеш?

— Пайшлі вы ўсе! — Ваня залез пад коўдру з галавой і больш ні з кім не размаўляў.

Пашка на дыбачках падышоў да Ваневай тумбачкі, паглядзеў на ягоны будзільнік і занадта весела прапанаваў:

— Зараз мы «ашчаслівім» Аленчын пакойчык.

Кампанія са смехам выбегла, грукочучы пакетам з бутэлькамі.

— Слухайце, у Гуся будзільнік на дзевяць гадзін заведзены, — праз некалькі хвілін падзяліўся Пашка з сябрамі сваімі назіраннямі. — Вы калі-небудзь бачылі, каб ён у нядзелю прачнуўся а дзевятай? Дрыхне да дванаццаці! Што ж у яго заўтра такое, га?

Калі свята было ў разгары, Пашка цішком вярнуўся ў Ванеў пакой і перавёў будзільнік на дзесяць гадзін.

У нядзелю а дзесятай Ульяна стаяла ля помніка Якубу Коласу. Пачакаўшы дзесяць хвілін, яна пачала хадзіць ад Сымона-музыкі да дзеда Талаша і назад. Ваня прачнуўся, упэўнены, што да спаткання яшчэ далёка. Калі ён нарэшце зірнуў на гадзіннік, была ўжо палова адзінаццатай. Ваня вылецеў з пакоя і сутыкнуўся ў калідоры з Пашкам.

— Куды бяжыш, Гусь? — удаючы цікавасць, спытаў Пашка.

— Уля... Уля мяне чакае, — голас Вані зрываўся ад хвалявання. — А дзесятай...

— Ужо даўно палова адзінаццатай. Ведаеш, Гусь, я не сустракаў у сваім жыцці дзяўчыны, якая б прыйшла на спатканне і чакала хлопца хаця б дваццаць хвілін. Пайшлі лепш піва вып'ем, — Пашка паблажліва ўзяў Ваню за плечы і павярнуў у адваротны бок.

Ульяна чакала да адзінаццатай.

## 12

Мама са здзіўленнем адзначыла, што Улляна вельмі хутка прыйшла дадому і не ў гуморы. Дачка кінула запакаваны ў бліскучую каляровую паперу падарунак на свой ложак і села чытаць нейкую кнігу.

— Уллянка, я думала, вы яшчэ трохі пагуляеце, — мама зайшла ў даччын пакой.

— Загадаеш мне адной гуляць? Мама! Ён проста не прыйшоў. Не папярэдзіў, не прыслаў Пашку... Ведаеш, у мяне адчуванне, што мы і не дамаўляліся, нібыта мне ўсё прыснілася. Я ніколі не думала, што можна не прыйсці на спатканне. Рэўнасць, здрада, забойства з-за кахання — усё гэта мяне не здзіўляе, гэта ўжо банальна... А вось не прыйсці на сустрэчу... Мама, я ў шоку... Я не ведаю, як на гэта рэагаваць... Пакрыўдзіцца і не размаўляць? Зрабіць выгляд, што ўсё нармальна?

Мама села побач, яна разумела, што Улляне зараз патрэбны не дарадца, а слухач.

— Самае страшнае, што я зараз не ведаю, якія ў нас адносіны. Мы толькі сябры? Проста аднакурснікі, якія наведваюць адзін спецсемінар? Яшчэ ўчора мне здавалася, што я ... ну, не ведаю... кахаю яго... закаханая... І нейкая гадзіна чакання разбіла мае пачуцці ўшчэнт... Нічога не засталося... Я настолькі не чакала гэтага, што нават нармальна пакрыўдзіцца не магу... Мама, ну скажы што-небудзь!

— Я магу толькі сказаць, што тэлефанаваў дзядзька Мікола, ён хутка будзе. Сказаў, у яго для цябе нейкі сюрпрыз, — мама не захацела гаварыць пра Ваню, не ведаючы сапраўдных прычын ягонага неприходу, а нешта даводзіць Ulляне зараз было бессэнсоўна.

— Хопіць мне ўжо сюрпрызаў, — буркнула Ульяна і зноў адкрыла кнігу. Мама адчула, што дзяўчыне лепш пабыць адной, і пайшла.

...Дзядзька Мікола шумна ўцягнуў у кватэру вялікія каробкі. Ён, як заўсёды, гучна гаварыў, мама

паблажліва назірала за сваім балбатлівым братам, а Уля неахвотна выйшла з пакоя.

— Улька, Уллянка, разбірай гасцінцы. Гэта дыскеты, картрыджы для друкаркі, там папера. А гэта сюрпрыз! Ну, здагадайся! — ён мітусліва соваўся па пакоі, задаволена паціраў рукі і настойліва заглядаў у вочы пляменніцы.

Улляна глянула на дзядзьку Міколу з такой абыякавасцю, што той расчаравана апусціў сюрпрыз на падлогу і пагладзіў каробку, нібыта яна была жывой і магла пакрыўдзіцца на такое стаўленне.

— Гэта сканер... — няўпэўнена прамовіў дзядзька Мікола.

Уля толькі хацела спытаць: «А навошта ён мне?», але ў час зразумела, што Ваня не варты таго, каб з-за яго крыўдзіць мамінага брата.

— Сканер! — Уля ўдала сыграла захапленне.

Дзядзька Мікола ўзрадаваўся і пачырванеў ад гонару за сябе і за ўдалы падарунак для пляменніцы. Бурачковыя шчочкі зрабілі дзядзьку Міколу падобным да вялікага, таўсматага дзіцяці, а чорныя вусы былі зусім недарэчы і здаваліся штучнымі, нібыта прыклеенымі. Улляна ўсміхнулася, і дзядзька загудзеў, як чмель.

Калі дзяўчына знайшла ўсё ж нейкую прычыну, каб зачыніцца ў сваім пакоі, Мікола спытаў сястру:

— Ірынка, а што з Уляй? Нейкая яна, як атручаная...

— Праблемы на асабістым фронце. Хлопец не прыйшоў на спатканне, — нібыта бесклапотна сказала Ірына.

— І яна праз гэта такая кіслая? — жахнуўся легкадумны таўсцячок. — Іра, дык я з ёй пагавару, — Мікола так нечакана ўскочыў з табурэта, што сястра не паспела спыніць яго.

Ён нават не пастукаў у пакой пляменніцы, а жвава ўляцеў і плюхнуўся на ложак побач з Уляй. Ад

такога нахабства Уля разгубілася, а дзядзька Мікола пачаў яе настаўляць:

— Дзеўка, кінь дурное! Ну, не прыйшоў, ну і чорт з ім. Ты, можа, яшчэ і плакаць будзеш? — ён прыгледзеўся да Уліных вачэй. — Толькі свісні, я табе такіх хлопцаў прывяду! — па твары дзядзькі было відаць, што Ваню нават параўнаць немагчыма з тымі хлопцамі.

— Дзядзька Мікола, ты што, будзеш мне сюды хлопцаў вадзіць? — засмяялася Ульяна. — Ды і непатрэбныя мне ніякія хлопцы.

— Гэтага кахаеш? — зусім недалікатна спытаў дзядзька Мікола. — Уля, ён жа заўтра неяк растлумачыць... Можа, ён захварэў... ці...нагу зламаў... або...э-э... колькі ўсяго можа з чалавекам здарыцца, а ты так адразу на яго дрэнна думаеш!

— У ягонага сябрука ўчора быў дзень нараджэння, Ваня напіўся і праспаў. І ніякія тлумачэнні мяне не пераканаюць у адваротным, вось так! — апантана выгукнула Ульяна.

— Ну-у, Уля, святая справа. Грэх на чалавека крыўдаваць! Можа, пабілі хлопца альбо праседзеў усю ноч тварам ва унітаз, ну і зразумела ж, не захацеў з'яўляцца перад дзяўчынай у адсвяткаваным выглядзе! — для дзядзькі Міколы дзень нараджэння сябра быў важкім аргументам.

Ірына ледзьве выцягнула брата зноў на кухню. Уля з палёгкай уздыхнула, прыставіла да дзвярэй крэсла, каб наступным разам дзядзька Мікола так лёгка не ўвайшоў, і села рабіць падрадковік на верш Аскара Уайльда.

— Сядай, Мікола, я табе зараз такое раскажу... — Ірына наліла брату і сабе гарбаты. — Учора мы з Ульянкай пайшлі ў кнігарню... і сустрэлі там... — для большага эфекту Ірына зрабіла паўзу, — Міхася Пятровіча Каляду.

— Каго? — перапытаў Мікола. — А-а-а, — ён неяк спужаўся. — І?

— І нічога. Пакуль што нічога. Уля будзе пісаць у яго дыпломную, уяўляеш сабе пакуты: выкладаць ва ўласнай дачкі, якая не здагадваецца пра тваё існаванне, — летуценна прамовіла Ірына.

— Уллянцы скажаш? — пасур'ёзнеў Мікола.

— Навошта? Так цікавей! — штучна рассмяялася Ірына.

— Трэба сказаць! — пераканана загадаў Мікола.

— Я скажу, скажу, — Ірына паклала руку на руку брата. — Але мне здаецца, што я маю права на маленькую помсту, зусім маленечкую. Я вінна Міхасю пакуты, трэба аддаць, Мікола!

— Каму ты зробіш лепей? — брат пагаджаўся і не пагаджаўся з Ірынай.

— Мінулым летам адна са знаёмых сказала мне, што ў Міхася інфаркт. Я думаю, ніхто так не маліўся за яго здароўе, як я. Я гатова была стаяць на каленях перад Богам і дактарамі. Але я не магла сябе выкрыць. Я штоночы думала, хоць бы ён ачуняў. Я столькі год марыла, як пазнаёмлю яго з Уллянай, як ён будзе ўражаны, як будзе шкадаваць, што адмовіўся ад нас. А калі Уля пачала пісаць першыя вершыкі, я зразумела, што мы сустрэнемся з Міхасём на ягоным полі...

Мікола слухаў сястру і адчуваў, што толькі зараз Ірына асмелілася паказаць, як яна пакутавала ўсе гэтыя гады, толькі зараз, бо хутка прычакае рэваншу.

— Уяўляеш, гэты эстэт, які заўжды сумняваўся ў здольнасцях жаночага інтэлекту, прачнуўся сёння бацькам Улляны, якая спачатку разумная, а толькі пасля прыгожая, — Ірына гаварыла ўсё гэта, а сама глядзела нерухомым позіркам на сцяну.

Мікола слухаў споведзь сястры і не перапыняў яе пытаннямі.

— Ён мне неаднойчы паўтараў, што быць пісьменнікам — не жаночы занятак. Шавініст мужчынскі! А сам Улі прапанаваў кніжку выдаць... уласнай дач-

цэ прапанаваў... Уля — здзек з ягоных прынцыпаў. Уля — мая дачка! — сказала Ірына брату, які бачыў, што кніжныя палічкі Ульяны застаўлены кнігамі Каляды.

## 13

Ва універсітэт Ульяна ішла неахвотна, не хацелася бачыць сяброўак, якім трэба будзе тлумачыць, чаму яна больш не сябруе з Ванем. Ульяна была ўпэўнена, што з ім усё скончана, ніякага кахання не будзе. Як можна хаця б вітацца пасля такой абразы?

Але ўжо на першым паверсе філфака яна сутыкнулася з Ванем, які, заікаючыся і чырванеючы, прамовіў:

— Э-э... Ульянка... Я табе ўсё растлумачу...

— Што ты, не трэба, — Ульяна так прыязна ўсміхнулася, нібы ўжо даравала яму.

Ваня крыху асмялеў і папрасіў прабачэння:

— Даруй мне, Ульянка.

— А што ты такога страшнага зрабіў? — натуральна здзівілася дзяўчына.

— Як гэта «што»? Я не прыйшоў... — выкрыкнуў Ваня і адразу ж выправіўся, — спазніўся...

— Забудзем, Ваня! Калі б ты быў маім хлопцам, маім каханым, — Ульяна з болем зірнула Вані ў вочы, — я разарвала б цябе на кавалкі ад злосці! А так, якая крыўда? Гэта тое самае, калі б, напрыклад, Машка Бунеева не прыйшла.

Ваня аслупянеў, ён не чакаў такой абыякавасці, і падрыхтаванае апраўданне зараз не мела сэнсу, ён закінуў за спіну заплечнік, паглядзеў на Ульяну, ці не жартуе яна. Ульяна ўсміхалася. Ці насміхалася?

— Сапраўды, — з недарэчнай пакрыўджанасцю сказаў Ваня, — школьная звычка. Ведаеш, Уля, калі б ты кахала мяне, ты выслухала б мае тлумачэнні, а калі б я кахаў цябе, — Ваня наблізіўся да Ульяны і амаль прашаптаў ёй на вуха, — я прый-

шоў бы, — ён пераможна ўсміхнуўся, засунуў рукі ў кішэні і павольна пайшоў да лесвіцы. І Ульяна не бачыла, як Ваня перакрывіў твар, каб па-дзіцячы не расплакацца.

Упершыню Ульяне не хацелася ісці на спецсемінар. Гэта ж немагчыма, сядзець побач з Ванем, гаварыць з ім і рабіць выгляд, што ўсё нармальна, а так хочацца заплакаць, прытуліцца да яго і самой папрасіць прабачэння. Трэба было яго выслухаць, а зараз ужо позна. Нашто яна выяўляла сваю незацікаўленасць? Цераз гонар не змагла пераступіць? Божа мой, ну чаму ўсё так дрэнна?

Вясёлы настрой Міхася Пятровіча дысанаваў з горам ягоных семінарыстаў. Выкладчык няйнакш закахана глядзеў на Ульяну і нават на Ваню, студэнты заўважылі гэта і здзіўлена пераглядваліся. Міхасю Пятровічу так карцела бліжэй пазнаёміцца з дачкой, зразумець, якая яна, чым жыве, але ён не ведаў, ці зможа зрабіць так, каб яна бачыла ў ім не толькі выкладчыка.

— Нешта ўсё я ды я гавару, — Міхась Пятровіч паглядзеў на Ульяну, — Уля, вось вы якія кнігі любіце перачытваць?

Ульяна не ведала, што сказаць на гэтае нечаканае пытанне. Абраць сабе ролю інтэлектуалкі ці сказаць праўду?

— Ну-у... Я не люблю цалкам перачытваць кнігі... Толькі пэўныя моманты... А каб поўнасцю... Ну, можа толькі... — Ульяна заплюшчыла вочы, нібы зараз збіралася нырнуць, і назвала дзіцячую кнігу:

— Астрыд Ліндгрэн «Ронья, дачка разбойніка».

Міхась Пятровіч паўтарыў за дзяўчынай :

— «Ронья, дачка разбойніка»? — і сам спалохаўся нечаканага намёку.

Ён глядзеў то на Улю, якая вінавата ўсміхалася, то на Ваню, што ліхаманкава ўспамінаў, якія ж кнігі перачытвае ён. «Ульянка, дачка прафесара», — падумаў Міхась Пятровіч і на гэтых занятках больш

не рабіў ніякіх захадаў да спазнання ўнутранага свету сваёй дачкі.

На перапынку ў сяброўскай кампаніі Ваня здзекваўся з Улляны:

— Ганьба! Быкава, Мележа чытала? Чытала. Дастаеўскага, Ляскова чытала? Чытала. Бальзака, Вальтэра, Дзідро чытала? Чытала. А перачытвае Астрыд Ліндгрэн! Філолаг!

— Я проста застаюся дзіцём, — апраўдвалася Уля.

— Ну, не такое ўжо ты дзіця, — сказаў Пашка, аглядаючы Уліну фігуру, — я нават сказаў бы, што зусім не дзіця, дзякуй Богу.

— Я думаў, Пятровіч як узбурыцца за такія прыярытэты... А ён нічога. Так, трохі спужаўся, — з маляўнічымі перабольшаннямі распавядаў сябрам Ваня.

— Лепей пра Антося пагаворым, — перапыніла яго Улляна.

— Як ён там казаў, — Машка зморшчыла лоб, успамінаючы, — можа гаварыць пра сімвалізм чатыры гадзіны, а пра імпрэсіянізм увогуле бясконца?

— Уяўляеце, прыйсці на спатканне і гаварыць пра імпрэсіянізм, а не пра ... не пра.. пра што гавораць на спатканні? — Улляна шукала патрэбнае слова, а Ваня збянтэжыўся ад жорсткага напаміну і пайшоў да сваёй групы.

...Антось Генадзевіч, як заўжды бездакорна апрануты, увайшоў у аўдыторыю з дзяжурнай усмешкай на вуснах. Ён павітаўся з групай, сеў, расклаў свае паперы, падняў галаву і, пералічваючы студэнтаў, стукаў па сталу, нібы па клавішах раяля.

— Та-ак! Дваццаць тры, а ў спісе... — ён зазірнуў у свае лісты, — а ў спісе дваццаць пяць. Каго няма?

Стараста, пасада якой ператварылася ў мянушку, спрактыкаваным вокам вылічыла адсутных:

— Барысенка і Грыцай.

— Так і запішам, Барысенка і Грыцай, — Антось падняў галаву і паглядзеў на Старасту, крыху прыжмурыўшы вочы. Стараста нават разгубілася, не ведаючы, як рэагаваць на такое какецтва.

— Я памятаю са студэнцкіх часоў, дзякуй Богу, гэта было зусім нядаўна, як непрыемна было, калі выкладчык пачынае поўзаць асадкай па спісе, шукаючы ахвяру. Я так спадзяюся, што ў нас будуць не ахвяры, а ахвотнікі... — у чаканні Антось выразна паглядзеў на аўдыторыю.

Улляна, збіраючыся адказаць, гучна ўцягнула паветра, Антось павярнуўся да яе, але пад яго пільным позіркам дзяўчына зніякавела і выдыхнула, так нічога і не сказаўшы. Антось усміхнуўся Улі:

— Калі ласка, няма чаго баяцца. Я дапамагу, калі што. І... назавіце ваша імя.

— Гаманкова Улляна, — выразна вымавіла Уля, каб Антось лёгка адшукаў яе ў спісе.

— Улля-на, — са смакам прамовіў Антось, паставіў насупраць яе прозвішча кропачку і падбадзёрыў: — Ну, слухаю вас.

Улляна сваімі словамі пераказала Антосю ягоны канспект. Выкладчык згодна ківаў у час пераліку асаблівасцяў дэкадансу і ўсё астатняе слухаў, здавалася, таксама ўважліва. Калі Улляна скончыла гаварыць, Антось падзякаваў, хоць не было за што, падняўся з крэсла, падышоў да кафедры і абапёрся на яе локцем.

— Як слушна сказала Улляна, — Антось паглядзеў на Улю, якая ад гэтага позірку пачырванела, — дэкаданс — гэта не мастацкі метад, не накірунак у літаратуры, гэта светаадчуванне, светаўспрыняцце. Заўсёды майма гэта на ўвазе! Як слушна заўважыла Улляна, дэкаданс характарызуецца найперш песімізмам, агідай да жыцця, безнадзейнасцю...

Антось Генадзевіч яшчэ раз пералічыў усе характарыстыкі дэкадансу, перад кожнай з іх называючы імя Улляны. Дзяўчына стамілася чырванець і па-

дазрона назірала за бясконцымі паўторамі. Антось так закахана гаварыў пра дэкаданс, што занадта позна заўважыў стрыманыя смяшкі, ён спахапіўся і, разважаючы пра містыку ў дэкадансе, Уляну ўжо не згадаў.

— Хто хоча расказаць пра майго любімага Гюісманса? — Антось такім чынам санкцыянаваў пераход ад агульнага пытання да канкрэтнага.

— Пра каго? — гучным шэптам перапытаў у Старасты Пашка.

— Пра Гюіс-сманс-са, — незадаволена прашыпела Стараста.

— Гэта, дзе мужык з чарапашкай... ну... і кнігі перабірае?.. — з цяжкасцю ўспамінаў Пашка.

— Абсалютна з вамі згодны, — з'едліва прамовіў Антось. — Мужык з чарапашкай, якая не вытрымала здзекаў і памерла. А мужык тымчасам рабіў «еўрарамонт» і перабіраў сваю шыкоўную бібліятэку. Але гэта такая кароткая анатацыя. Хто-небудзь можа расказаць пра раман «Наадварот» больш падрабязна, каб я канчаткова не расчараваўся ў вашай групе?

Стараста прыняла агонь на сябе і распавяла ўсім, як Гюісманс сваім імпрэсіяністычным звышсуб'ектыўным раманам «Наадварот» «паклаў пачатак разбурэнню раманнага жанру на ўсіх ягоных узроўнях (тэматычным, сюжэтна-фабульным, прасторава-часавым і вобразным) і наблізіў яго да лірычнай паэзіі».

— І каб я не забыўся... што датычыць уласна паэзіі... На наступны раз пачытайце Арцюра Рэмбо, — Антось зазірнуў у свае нататкі.

— Не блытаць з Рэмба! — выгукнуў Пашка.

— І калі паспеем, то й Малармэ... — Антось праігнараваў гэты няўдалы жарт, пабудаваны на прымітыўнай асацыяцыі. — «Дар паэмы», «Папоўдне Фаўна», «Прыйдучае дзіва» і яшчэ колькі твораў.

Усе зашабуршэлі, зашапталіся: ніхто не ведаў, як правільна запісаць назву «Папоўне фаўна» ці «Па поўне фаўна» і што яна абазначае. Антось прычыны шуму не зразумеў і, каб зноў авалодаць аўдыторыяй, пажартаваў:

— Пачытайце нябожчыка Рэмбо. Дзякуй Богу, хэлоўін ужо мінуў, а то б ён да вас і прыйшоў.

— А вось гэтага не трэба, — з дэманстратыўнай заклапочанасцю адгукнуўся Пашка. — Ён жа быў гомікам!

— Але ўяві, якія б ты мемуары напісаў. «Рэмбо і Паша Васілевіч». Французскія выдавецтвы з рукамі адарвалі б, — падкузьміла хлопца Уля.

— А я і так магу напісаць! Без Рэмбо! — пачаў выхваляцца Пашка.

— Праблематыка знаёмая? — спачувальна запытала Машка.

— Яшчэ адно такое правакацыйнае пытанне — і я напішу бестселер «Маша Бунеева і Рэмба». А ў Галівудзе зробяць фільм. У галоўнай ролі сама Маша Бунеева, таму міжволі атрымаецца фільм жахаў, — Пашка зымітаваў пастаўлены голас прафесійнага дыктара.

Усе глянулі на Машу, на яе шыракаваты нос, дзе як на выставе дэманстраваліся ўсе віды і падвіды прышчыкаў і чорных кропачак. Дзяўчына сумелася і кінула на Пашу пагардлівы, поўны нянавісці позірк.

— Вось бачыце, як дзявочае асяроддзе заядае хлопцаў, на прыгожыя манеры і кампліменты не хапае сіл, — Антось быў відавочна на баку Пашкі.

«Мабыць, сам быў адзіным хлопцам у групе, і дзеўкі зацюкалі», — падумала Ульяна.

— Заданне я вам даў. Та-ак... Колькі ў нас часу яшчэ? Дваццаць хвілін. Выдатна! А зараз аналіз вашых падрадковых перакладаў зраблю, унікальная магчымасць атрымаць пяцёрку на халяву, — паабяцаў Антось.

— Нічога сабе халява! За кожным словам у слоўнік лазіў! — паскардзіўся Пашка. — Я ж з англійскай ведаю толькі алфавіт... і то не да канца.

Антось паскуб бародку прывычным жэстам, зірнуў на гадзіннік і запрасіў жадаючых выказацца. Ульяна падняла руку. Антось запрашальна кіўнуў, глянуў у свой спіс і папрасіў:

— Нагадайце мне, калі ласка, сваё імя.

Група замерла, усе паднялі галовы: каб не запомніць такое рэдкае імя, трэба прыкласці неслабыя намаганні. Антось пстрыкнуў колькі разоў асадкай і шчыра прызнаўся:

— Мужчыны заўсёды блытаюць прозвішчы, імёны, асабліва жаночыя. Ну, склероз у мяне на імёны, склероз. Твары запамінаю добра, а імёны ну ніяк. Недаравальны недахоп для выкладчыка, так?

«Не, браток, гэта клініка», — спагадліва падумаў Пашка, але, зразумела ж, прыхільнага стаўлення да Антося не змяніў.

Ульяна перад чытаннем перакладу мусіла некаторыя пытанні патлумачыць:

— Я ведаю, што самы вядомы імпрэсіяніскі верш Уайльда — гэта ... я дакладна не ўпэўнена, як чытаецца... назва французская ... «Impression du matin»? Я пераклала яго, але ён мне не падабаецца.

— Нават так? — непадробна здзівіўся Антось. — Што ж, гэта таксама праяўленне імпрэсіянізму. Суб'ектыўныя ўражанні чытача.

— Таму я пачытаю «Symphony in yellow». «Сімфонія ў жоўтым», — пераклала Уля для тых, хто англійскай не ведаў. — І... я не рабіла падрадковік. У мяне атрымаўся сапраўдны, наколькі магчыма, пераклад. Не хвалюйцеся, я памер захавала, рыфму... У яго рыфмуюцца першы — чацвёрты, другі — трэці... І ў мяне тое самае, — хвалюючыся, Ульяна забыла, як называецца такая рыфма. — Я ўсё захавала... што ў яго ў першым радку, тое і ў мяне. Напрыклад, у яго *an omnibus across the bridge*, у мяне

*якісьці омнібус праз мост*. Вось, бачыце, — мітусліва апраўдвалася Улляна. — Я толькі ў апошнім радку нахлусіла, бо не ведаю, як гэта можна ўвогуле перакласці.

— Калі ласка, калі ласка, мы вас слухаем, — запрасіў Антось. — Толькі прачытайце спачатку арыгінал.

«Фініш», — падумала Улляна, якая, выпісваючы пераклады незнаёмых слоў, зусім не звяртала ўвагі на транскрыпцыю. Спадзеючыся, што Антось ведае толькі французскую, Улляна прачытала верш так, што якасць была аддадзена ў ахвяру хуткасці. Антось быў знаёмы з англійскай настолькі блізка, што здолеў зразумець нават невыразнае чытанне студэнткі.

Якісьці омнібус праз мост
Поўз, нібы жоўты матылёк.
Прахожы прывідны здалёк,
Як мошка, што ляціць наўпрост.

Улляна чытала, зрэдку пазіраючы на Антося, які стаяў ля дошкі і ўважліва прыслухоўваўся да кожнага слова.

Якіясь баржы з сенам жоўтым
Ішлі ад прыстані кудысь.
Туман тугі замазаў высь,
Вісеў, як жоўты гальштук, потым.

Улляна сабрала ўсю сваю пільнасць, бо ведала, што чытанне наступнага чатырохрадкоўя вымагае пэўных артыкуляцыйных высілкаў не толькі ў арыгінале, але і ў перакладзе.

Лісты жаўцець пачалі нейк.
І з Тэмплскіх вязаў лісце спала.
І зелень Тэмзы цьмяна грала
Пра свой хваліста-жоўты век.

Заставалася толькі «прыплесці» да аналізу апове́д пра значэнне колераў і іх адценняў у імпрэсія-

нізме, пра суб'ектыўнасць асацыяцый, пра імкненне перадаць ураджанне праз штрыхі, асобныя адчуванні і г. д. і г. д., аж да таго моманту, пакуль не прагучаў выратавальны званок.

— Антось проста супер! — дзяўчаты пачалі заўсёднае абмеркаванне маладога выкладчыка.

— А вас на яго так адразу і пацягнула! — абурыўся Ваня, найбольш пільна віжуючы за рэакцыяй Уляны.

— А мяне зараз на ўсіх цягнуць будзе, вось толькі пад'ем, — засмяялася Уля і куснула абаранак.

— Перад маімі вачыма проста так і стаіць карціна: Гусь, Улянка, а за яе спінай Антосік. Ну, і дубальтоўка ягоная тырчыць, — Пашка нават рукамі паказаў, дзе, хто і як стаіць.

— У яго «дубальтоўка», кажаш, тырчыць? — пакрыўдзіўся Ваня.

— Пра што ты падумаў, Гусь? Сапраўдная дубальтоўка! 45-га калібру... ці якога там яны калібру? Я за свае грошы яму куплю дубальтоўку, каб ён ад дзевак нашых адбіваўся, — пажартаваў Пашка.

— Сякеру яму купі! — прапанаваў Ваня.

— Можна і сякеру, — засмяялася Машка, — сякерай ён будзе адбіваць хлопцаў ад студэнтак, а «дубальтоўкай»... адмыслова карыстаючыся... «адбіваць» саміх студэнтак, — Машка падміргнула Уляне, якая мройна ўсміхнулася.

— Цудоўненька, вучыліся-вучыліся, і тут прыйшоў нейкі Антось, імпрэсіяніст... — Ваню слоў не хапала, каб выказаць усе свае пачуцці, — дык гэта пра вас Максім Багдановіч пісаў: «Сярод дубоў філфакаўскай зямлі...» Нешта там... «Жыццёвая іх сіла ўзбудзілася і буйна... галасіла», — наўмысна блытана прадэкламаваў Ваня.

Маша рассмяялася гучна і ўсхліпваючы, але ўсё адно штучна:

— Ваня, ты проста раўнуеш! У вашай групе Антось практычныя вядзе?

— Ну і што? — злосна спытаў Ваня, шкадуючы, што не здолеў схаваць свае пачуцці і зараз дае ўсім падставы для сяброўскіх і таму жорсткіх кпінаў.

— Я думаю, што ў вашай групе ён такі ж, як і ў нашай. Ты ж не можаш не бачыць, які ён! Ды калі б той жа Гюісманс ведаў, як Антось пра яго гаворыць, як Антось увогуле гаворыць пра імпрэсіянізм, ён ажыў бы, каб прыйсці і па-мужчынску паціснуць Антосю руку, — Машка сказала б і болей, але ў гэты момант Ліля піхнула яе, бо па калідоры ішоў Антось.

Ён адразу заўважыў, як адна дзяўчына таўханула другую і як усе замоўклі. Антось Генадзевіч усміхнуўся куточкамі вуснаў, зразумеўшы, хто галоўны герой іх гутаркі. Калі Крылько праходзіў міма, Ліля апусціла вочы, Машка пачырванела, а Ваня зірнуў на яго з выклікам, але па выгляду выкладчыка было відаць, што ніякія выклікі яму не страшныя. Калі ж Антось Генадзевіч прайшоў, усе паглядзелі яму ўслед: адна яго штаніна зачапілася за «маланку» ботаў і выглядала нібы падкасаная.

— Ну, ідзіце свайму імпрэсіяністу штаны папраўце! — Ваня сеў на падваконне побач з Улляпай.

— Дарма ты так пра яго, — ціха сказала Ульяна. — Ён бог у імпрэсіянізме, а я заўсёды паважала людзей, асабліва мужчын, якія нешта ведаюць дасканала.

— Ведаюць нешта дасканала? — перапытаў Ваня. — Я вось нядаўна глядзеў анонс фільма. Стаяць два мужыкі з аўтаматамі, і морды ў іх расфарбаваныя чорнымі рыскамі. Адзін пытаецца: «Чаму яны выбралі нас забіць яго?» Другі адказвае: «Бо мы лепшыя!» Імі таксама трэба захапляцца?

— Любая станоўчая якасць, узведзеная ў абсалют, пераўтвараецца ў антыякасць, — Ульяна глядзела на падлогу перад сабой. — Абсалютная дабрыня становіцца мяккацеласцю, не чалавек ужо, а нейкаяануча. Абсалютная прыгажосць выглядае штуч-

най. Абсалютны-абсалютны геній насамрэч будзе вар'ятам.

— Вось я і кажу, што ваш Антосік Крылько вар'ят, — Ваня прычапіўся да Уллянінага слова.

— Ваня, — Улляна закусіла губу, думаючы, сказаць ці не сказаць. — Ты не разумееш. Ён такі... я сказала б, незямны, калі б гэта слова не было такім банальным... Ён ідэальны! І я не ўяўляю, як можна з ім хаця б пацалавацца. Разумееш? Хачу ўявіць і не магу! Ён недатыкальны, да яго ніякі бруд не прыстае! — Улляна абарвала сваю думку, і ўсе маўчалі, бо адчулі, што гэтыя словы былі не проста адказам, а нечым большым.

— Хочаш з ім пацалавацца? — нервова спытаў Ваня. — У чым праблема? Падыходзіш да яго і кажаш: «Хачу з вамі пацалавацца!» А ён спытае: «А нічога *йіншага* вы не хочаце?»

— Хачу, — не крыўдуючы, усміхнулася Улляна, — хачу Антося *Крылька*. Задаволены? Смешна, але... Я зараз не ведаю, як можна кахаць мужчыну, які не ведае, што такое імпрэсіянізм! І сімвалізм!

— І натуралізм! — дадала Ліля.

— І новая драма! — падхапіла Машка.

## 14

Малармэ, гэты незразумелы Малармэ... Як дайсці да такіх вышынь? Як дасягнуць гэтага ўзроўню? Антосевага ўзроўню, не Малармэ, канешне ж.

Антось зайшоў у аўдыторыю, сэрца Улляны закалацілася. Яна адчувала больш, чым змагла стрываць: Антосевы крокі рэхам адбіваліся ў яе свядомасці, ягоны позірк забіваў, ягоная ўсмешка паглынала. Антось, Антось... самы лепшы...

— Ну як, спадабалася «Прыйдучае дзіва» і *йіншыя* творы Малармэ? — Антось глянуў на Улляну і паскуб бародку правай рукой, бляск заручальнага пярсцёнка асляпіў дзяўчыну.

— Ааа-ааа-ыыы, — Ульяна прачнулася ад уласных рыданняў, слёзы сцякалі на падушку і нават зацякалі ў вушы. — Гэта я столькі наплакала? — уголас спытала сама сябе Уля.

— Ульянка, ты плачаш? — спытала мама праз дзверы. — Можна, я зайду?

— Мама, мне прысніўся жахлівы сон! Мама, гэта ж не можа быць... Каму сказаць... Я закахалася ў выкладчыка! — істэрычна засмяялася Уля, размазваючы па шчоках гарачыя ручаінкі.

Мама збялела, але ў цемры гэта было зусім незаўважна:

— У выкладчыка? У Міхася Пятровіча?

— Што ты, мама! Ха-ха! Не, што ты! — слёзы адразу высахлі. — Гэта Антось... замежная літаратура... імпрэсіянізм...

— Спі, Ульянка, — з палёгкай выдыхнула мама. — Заўтра пагаворым пра твайго Антося... Дабранач, дачушка.

— Угу, — адказала Уля, засынаючы.

Ва універсітэт Ульяна проста ляцела, было страшэнна цікава, ці будзе на руцэ Антося пярсцёнак. Трэба ж неяк патлумачыць сон, але вельмі не хацелася, каб ён спраўдзіўся. Ульяна ледзь дачакалася лекцыі Антося Генадзевіча.

Крылько ўвайшоў у аўдыторыю, кіўнуў, каб студэнты сядалі. Усё было як звычайна, і толькі забінтаваная правая рука зусім не пасавала да ягонай шляхетнай знешнасці.

— Мой кот Багрым можа загрызці любога сабаку. Выгадаваў вось на сваю дурную галаву, — растлумачыў Антось «раненне». — А што гэта вас так мала? Нейкае дзяржаўнае свята?

— Субота, — выгукнуў Пашка.

— Гэта нейкі асаблівы дзень для вашага курса? — спытаў Антось, дастаючы з папкі аркуш паперы. — Калі ласка, запішыце ўсіх прысутных.

Ён пачаў лекцыю, аркуш пераходзіў ад студэнта да студэнта, Ліля Кішкайла запісалася і перадала ліст далей, абмінуўшы Улляну.

— А я? — зашаптала Уля.

— Я цябе запісала, — запэўніла сяброўку Ліля.

Аркуш пайшоў далей, перыядычна чуўся шэпт і сцішаны смех, але ўсё гэта не перашкаджала лекцыі. Калі аркуш нарэшце дайшоў да Вані, хлопец напісаў: «Янка Новік, 2 гр.», і раптам ягоны позірк наткнуўся на іншы запіс: «Улляна Крылько, 1 гр.». Невядома, як бы паставіўся Антось Крылько да гэткага недарэчнага жарту, але Улляне Гаманковай гэткая слава без карысці. Ваня параўнаў почыркі і адразу вылічыў злачынцу — Лілька! У дзяўчыны, што сядзела перад ім, Ваня папрасіў карэктар, тлуста замазаў прозвішча выкладчыка і з любоўю напісаў друкаванымі літарамі Улляніна.

Антось зазірнуў у аркуш, пералічыў прысутных і параўнаў з колькасцю запісаных. Дзіўна, але лічбы сышліся, хоць звычайна многія намагаліся выратаваць адсутнага сябра.

— Улляна, ваша прозвішча Гаманкова? — спытаў Антось, узяўшы ў руку асадку.

Уля кіўнула, і ўсе зарагаталі. Лілька доўга не магла супакоіцца, у яе нават слёзы пацяклі ад задавальнення.

— Я не бачу, што тут смешнага. Проста незразумела, гэта літара Г ці Т.

Смех адразу сціх, Лілька падняла на Антося вочы, ці не здзекуецца ён. Уля ўвогуле не разумела ні прычыны смеху, ні прычыны такога калектыўнага здзіўлення. І толькі Ваня адчуваў сябе рыцарам, які выратаваў гонар сваёй каханай ад сусветнай ганьбы.

Пасля пары ўсе разыходзіліся па спецсемінарах, Уля з Ванем накіраваліся разам на кафедру да Міхася Пятровіча, бо аўдыторый не хапала і студэнты мусілі займацца ў нязвыклых умовах.

— Ваня, у мяне горла баліць, — паскардзілася Уля, — я марозіва ўчора з'ела... Гаварыць не магу... ты пагаворыш на спецсемінары?

— Няўжо праўда? Гаварыць не можаш? — Ваня не стрымліваў недарэчнай радасці, нават на каханне сваё забыўся. — Ты ж мне слова сказаць не даеш, і я да Міхася нашага хаджу, проста каб пасядзець.

— Я табе прыпомню... Я ж і пісаць, аказваецца, не магу... калі горла баліць... Сяджу на сярэдзіне твора, — прахрыпела Улляна непрыемным шэптам.

Міхась Пятровіч запрасіў семінарыстаў сесці, Ваню не цярпелася папярэдзіць пра Уліну хваробу:

— Можна, Улляна сёння гаварыць не будзе, у яе горла баліць.

Міхась Пятровіч заклапочана зірнуў на дзяўчыну, але ўголас пажартаваў:

— Ну, Янка Леанідавіч, вы ў нас сёння саліст. А мы з Уллянай — удзячная аўдыторыя.

Абгаварыўшы розныя нюансы Ваневай курсавой, прафесар і студэнт перайшлі да агульных пытанняў. Хлопец не вытрымаў і расказаў, што ён думае пра стан беларускай літаратуры.

— Міхась Пятровіч, спадзяюся, я магу крыху адарвацца ад гісторыі развіцця нашай літаратуры, — аптымістычна прамовіў Ваня. Улляна ж ведала, што Каляда ніколі ў жыцці не дазволіць гаварыць пра мову і літаратуру асобна ад жахлівай і несправядлівай гісторыі. — У мяне тут такая алегорыя. Уявім, што беларуская літаратура — гэта дзяўчына, а чытач — вядома ж, хлопец... Не, усё ж тут будзе крыху гісторыі... — Ваня на секунду задумаўся. — Калі хлопец кахаў гэтую дзяўчыну... і чакаў яе, а яна проста жыла і нічога не рабіла, каб зацікавіць, завабіць...

Міхась Пятровіч паспрабаваў перапыніць Ваню і забараніць назаўжды такія занадта неверагодныя параўнанні.

— Выслухайце мяне, калі ласка! — хлопец ўвайшоў у азарт. — У мяне ўсё разлічана! У кожнай дзяўчыны ёсць натуральныя вабнасці, у кожнай літаратуры ёсць свае вартасці. Але дзяўчаты ўсё ж фарбуюцца... Калі толькі не лічыць нашай Уллянкі... Але гэта так... па-за сістэмай... дык вось, дзяўчаты прыкладаюць намаганні, каб падабацца, яны думаюць пра хлопцаў ці не ўвесь свабодны час.

— І несвабодны таксама, — прахрыпела Уля.

— Вось бачыце! Беларуская літаратура... маецца на ўвазе... пісьменнікі... павінны былі ўвесь час думаць пра чытача, займаць яго, запрашаць, вычварацца, калі трэба!

Міхась Пятровіч зразумеў, што студэнта стрымліваць бессэнсоўна.

— Але раптам, — Ваня ўжыўся ў ролю, — хлопец кідае дзяўчыну! Знаходзіць сабе іншую! Калі хочаце, рускамоўную... Але гэта дробязі, галоўнае, што наша застаецца адна, самотная. Можа, канешне, хто і з'явіцца ў яе, але не факт! І яна ссівее адна, змарнее, ссохне. А хлопец-чытач з іншай дзяўчынай-літаратурай народзяць сабе нашчадкаў і ў іх будуць жыць вечна!

Міхась Пятровіч праз экскурсы ў гісторыю і звароты да выбітных твораў айчыннай літаратуры пачаў выпраўляць Ваню, а Уля раптам зразумела, што ўсё, пра што казаў Ваня, гэта не пра літаратуру і чытача, а пра яе і Ваню, маўляў, не ацэніш маё каханне, застанешся адна. Але чаму адна? Ёсць жа яшчэ Антось! Нават неістотна, чый ён, галоўнае, што ён існуе! А калі вярнуцца да літаратуры... можа, Ваня і мае рацыю... Боль у горле трохі сціх, і Уля сказала ўголас:

— А я, напэўна, магу пагадзіцца з Ванем... Толькі Ваневу сістэму трэба крыху ўдасканаліць. Мала сказаць, што дзяўчына-літаратура не сачыла за сабой... Больш рэалістычна будзе, калі яна адмовіцца ад інтымных зносін з хлопцам-чытачом... Філасоф-

скія развагі ў цёмную ноч дзе-небудзь на сене (літаратура ж — дзеўка вясковая) гэта ўсё цудоўна, але толькі для высокаадукаваных хлопцаў, для самадастатковых хлопцаў, якія не кінуцца гвалціць дзеўку, як толькі будзе магчымасць! Для элітнага, як вы сказалі, чытача! А наш хлопец-чытач — дзяцюк вясковы, і ўсіх гэтых сантыментаў мала, каб яго ўтрымаць! І гэта не прыніжэнне нашага чытача! Я сама такі ж чытач, хачу жыцця і кахання нават у філасофскіх раманах. Любую ідэю можна закласці так у галаву, што чытач і не зразумее, што адбылося, нават самую складаную ідэю можна растлумачыць дванаццацігадоваму дзіцёнку! Навошта штучная складанасць? Я, магчыма, яшчэ дарасту да класічнага занудства, бо я гэтага хачу... У нас такая сітуацыя... У нас не чытач гвалціць літаратуру, а літаратура — чытача!

— А нашто гвалціць? Можна ж дамовіцца! — пажартаваў Ваня.

— І я пра тое! Міхась Пятровіч, чытаць доўгія-доўгія апісанні прыроды — гэта такі стрэс у маім узросце, — прызналася Улляна.

— Як усё заблытана, — павольна прамовіў Міхась Пятровіч. — Вы на кожным занятку раскрываецеся з новых бакоў... нечаканых... І не магу сказаць, што мне гэта падабаецца... Але вы яшчэ не безнадзейныя... Будзем лячыць...

— Ведаеце, усе кнігі падзяляюцца для мяне на тры групы, — сказала Уля. — Па-першае, кнігі, якія я пачынаю чытаць і дачытваю, па-другое, кнігі, якія я пачынаю чытаць, але працягваць мне ўжо не хочацца. І па-трэцяе, кнігі, якія я пачынаю чытаць, працягваць не хочацца, але цікава, чым усё скончыцца. Таму я й кажу, што галоўнае — сюжэт! Бо калі чытачу не спадабаецца мой стыль, мая мова, ён хаця б пагартае, не адкладзе ўбок! І я мушу яго зацікаўліваць! Чым? Усім, чым магу! Трэба пазбавіць

беларускую літаратуру цнатлівасці! — выгукнула Уля.

— Улляна, вашыя развагі галаслоўныя! У мяне адчуванне, што вы не сочыце за літаратурным працэсам... Выходзяць новыя кніжкі... Вы чытаеце часопісы?.. Пра цнатлівасць гаворка ўжо не ідзе! — Міхась Пятровіч, выйшаўшы з ролі бацькі, зноў стаў выкладчыкам.

— Міхась Пятровіч, можна быць мільянерам, а мець псіхалогію жабрака і зносіць хлеб з самых дарагіх рэстаранаў, — Улляна зацята спрачалася з прафесарам. — Можна быць апошняй брудэркай з псіхалогіяй святой і ... наадварот.

— Наадварот? — перапытаў Ваня. — Гэта ты што, пра сябе?

— А хоць бы і пра сябе! Калі я прачытаю інтымную сцэну ў творы, я не бягу лаяць пісьменніка на рагу вуліцы! Пад кульгавыя сталы падкладаюць Біблію! Гэта Караль Іжыкоўскі сказаў. Не люблю, калі старэйшыя кажуць, што сучасная моладзь — дрэнная! — зрывала голас Улляна.

— А пры чым моладзь да літаратуры? — засмяяўся Ваня.

— Усё звязана! Героям у творах нічога не дазваляецца, і тое самае моладзі! Усе павінны быць святымі! А тады нецікава жыць! Вось я пішу пра студэнтаў. Сціплыя і правільныя мяне зусім не займаюць. Апісваць шлюхаватых дзевак і фрывольныя размовы вельмі цікава, хоць сярод маіх блізкіх знаёмых няма такіх дзяўчат. Наколькі я ведаю, няма, — удакладніла Уля.

— Дык, можа, ты ім зайздросціш? Хто перашкаджае? — з’едліва запытаў Ваня.

— Не ў зайздрасці праблема... Я, напрыклад, не магу пафарбаваць валасы ў зялёны колер... Я буду адчуваць, што гэта не маё, мне будзе некамфортна... І брудэркі з мяне не атрымаецца. Для мужчын — шэршэ ля фам... А для мяне — шукай Мужчыну...

Не ведаю, як гэта будзе па-французску... — сказала Уля і паглядзела на Ваню.

— У Антося спытаеш, як гэта будзе па-французску... — па-свойму зразумеў яе хлопец.

Міхась Пятровіч адчуў, што між яго студэнтамі ёсць нейкія адносіны, большыя за звычайнае сяброўства. І невядомая яму раней рэўнасць, бацькоўская рэўнасць, апякла яго, а хворае сэрца шалёна калацілася і ад гэтай рэўнасці, і ад таго, што Каляда адчуў сваю аддаленасць ад дачкі, сваё бяссілле, немагчымасць уплываць на дзяўчыну, і стала шкада і сябе, і Улляну, недасведчынае дзяўчо з упартасцю трохгадовага дзіцяці.

## 15

— Я вось думаю, як гэта — прысвяціць сваё жыццё імпрэсіянізму? — паціснула плячыма Ліля.

— Хочаш да Антося далучыцца? — клапатліва пацікавілася Машка.

— Не, я не да таго кажу... Вось мы вучым: увага да меладычнасці верша! Гэта ж было заўсёды! Пакажыце мне такога паэта, якога не цікавіць, як гучыць ягоны верш! — злавала Ліля.

— Зараз столькі розных вычварэнцаў... Ліля, на кожнае правіла можна знайсці выключэнне, — вытрымана паправіў яе Ваня. — Кажуць, што ўсе дзяўчаты хочуць замуж, але, напэўна ж, ёсць выключэнні, — Ваня паглядзеў на Улю.

— А чаму на мяне ківаеш? — жартоўна абурылася Уля. — Думаеш, я замуж не хачу? Ну, сёння не хачу, а заўтра — хто ведае. Глупства выходзіць замуж толькі таму, што ўсе выходзяць! Чароўнае жыццё — буцвець каля некаханага чалавека! Хочацца прыдбаць самага лепшага!

— Антося? — пакпіў Ваня.

— Бог не можа ажаніцца! — з найгранай тугой прамовіла Улляна.

— Можна толькі прытуліцца, пакахацца і забыцца, але толькі не жаніцца, — экспромтам выдаў Ваня.

— Прафесійны вершаплёт! — засмяялася Ліля. — I заўважце, якая ўвага да меладычнасці верша! Пейзаж душы, акумуляцыя перажыванняў, га? Найтанчэйшыя нюансы і паўтоны!

— Я так бачу, ты можаш адшукаць імпрэсіянізм нават у фразе выкладчыка «сядайце!». Перажыванні скандэнсаваліся і выліліся, так? — здзекліва ўдакладніў Ваня.

— Народ, у нас сёння практычныя па сімвалізму, а я і з імпрэсіянізмам на «вы». Уля, ты ж усё ведаеш, растлумач, — папрасіла Ліля.

— Няма праблемы. Імпрэсіянізм па-французску «ўражанне». Уяві, стаю я на калідоры, міма мяне ідзе Антось. Ён мінае мяне, і я ўдыхаю зрушанае ім паветра. У маёй галаве ствараецца ўражанне, то-бок «імпрэсьён», і я пішу верш. Бачыш, усё проста, — Уля паспрабавала «самую складаную ідэю растлумачыць дванаццацігадоваму дзіцёнку».

— А змест верша, Лілька, залежыць ад таго, што канкрэтна Уллянка здолела ўнюхаць! — паіранізаваў Ваня. — «Old Spice» ці пах зношаных шкарпэтак. I... даруйце маю недасведчанасць, багі носяць шкарпэткі?

— Ну, пра шкарпэткі я зразумела, — усміхнулася Лілька. — Эх, дзеўкі, скончу філфак — пайду працаваць гейшай.

— А чаму менавіта гейшай? — здзівіўся Васілевіч.

— Наша адукацыя ідэальная менавіта для гэтай прафесіі. I не глядзі так, гейша ж не прастытутка. Гейша — гэта занадта адукаваная жанчына. Яна можа пагаварыць і з такім, як Пашка, пра глупства рознае, і з такім, як Антось, пра імпрэсіянізм. Ну, каб спадабацца Пашку, не трэба быць звышразумнай, хопіць кароткай спаднічкі. Антось — гэта зусім іншае, даруйце, *йіншае*. У кожнай жанчыне павін-

на быць нешта ад гейшы: майстэрства падабраць ключ да кожнага мужчыны, майстэрства падабацца і захапляцца, майстэрства гаварыць і слухаць! Карацей, фемінізм незваротна састарэў, і зараз у нас новы лозунг — нарадзі ў сабе гейшу!

— Хто ў нас самая лепшая гейша? Хто можа напісаць верш пад уражаннем ад Антосевай закасанай калашыны, га? Улляна!!! — выкрыкнуў Пашка.

— Я ўсё магу, толькі папрасі, — задышліва прамовіла Уля, выгнуўшы спіну і павольна праводзячы языком па вуснах.

— Ну, яшчэ раз так языком зрабі, Антосю б ты спадабалася, — пад'юдзіў Ваня.

— Ваня, а пра што гейша павінна гаварыць з табой? — спытала Улляна, набліжаючыся да хлопца.

— Я дам ёй спіс тэм, на якія я гаварыць не хачу. Пункт першы: імпрэсіянізм. Пункт другі: сімвалізм. Не, я ёй увогуле ўвесь свой канспект па Антосю аддам... Хай чытае і абмінае! — зрыфмаваў зноў Ваня.

— А гейша здымае парык, Антось так працуе даўно, ён скажа табе «незалік» й направіць сваё кімано, — з трыумфам прадэкламаваў Пашка.

— Хто гэта хоча ўбачыць мяне ў кімано? — Антось Генадзевіч падышоў занадта незаўважна. — Упершыню сустракаю ў хлопцаў такія сексуальныя фантазіі, — Антось паглядзеў на Пашку, імя якога ён, вядома ж, не памятаў. — Але фантазіі ў вас правільныя.

Усе здзіўлена паглядзелі на выкладчыка.

— Фантазіі правільныя, асабліва там, дзе пра «незалік», — Антось застаўся задаволены зніякавелымі тварамі студэнтаў і пайшоў далей па калідоры.

Пашка зусім пералякаўся:

— Ну, што мне, не ісці на яго? Зараз жа выкліча, а я гэтага хворага Рэмбо не чытаў... так, паглядзеў толькі... Ох, дзеўкі, ён жа мяне зараз як апошнюю гейшу...

...Антось сядзеў і перабіраў паперы, група ж моўчкі чакала. Выкладчык на хвіліну задумаўся, ён гладзіў левай рукой бародку, а правую, забінтаваную, паклаў на папку.

— Ну, мой склероз... Я пакінуў ваш спіс дома... Прадыктуйце, калі ласка, прозвішчы адсутных, — Антось ужо прывык спісваць усе свае ўчынкі на ўяўны склероз.

— Мы вас паб'ём, калі вы яшчэ раз спіс забудзеце, — асмелілася пажартаваць Стараста, але трох чалавек назвала.

— Калі ласка, біце, а я раскажу вось гэтым тром чалавекам, што вы іх выдалі, хоць маглі і не рабіць гэтага. Я ж не магу праверыць, — Антось падтрымаў гульню. — Ну, што, пачыталі дзядулю Рэмбо? Спадабаўся?

— Калі вы самі чыталі яго вершы, як вы можаце пытацца, ці спадабаўся? Гэта ж вар'яцтва! Алкаголь, наркотыкі, нетрадыцыйны секс... А мы павінны чытаць ягонае ... не магу нават вершамі назваць... — ужо не жартавала Стараста.

Антось не пагадзіўся:

— Вы не так разумееце... Існуе дзве рэальнасці. Адна нас акружае, мы можам дакранацца да рэчаў, бачыць, чуць, мы спасцігаем яе праз нашыя пачуцці... І сімвалісты грэбавалі ёю... Другая рэальнасць схавана ад нас, і пасрэднікі між гэтымі рэальнасцямі — сімвалісты. Арцюр Рэмбо меркаваў, што яго мэта — сягнуць у невядомае, пачуць нячутае, убачыць дагэтуль не бачанае... І кожны паэт сягаў у другую рэальнасць, як мог. Калі гэтаму спрыяла гомасексуальная сувязь, што ж.... Алкаголь, наркотыкі — усё гэта было дзеля мастацтва...

— Вы ўхваляеце ўжыванне наркотыкаў дзеля мастацтва? — здзіўлена спытала Ульяна. — Мабыць, не выпадае казаць пра другую рэальнасць... Ну, не ведаю... У кожным разе ... гэтыя вершы — запісаныя галюцынацыі. Ці не так? Але, напэўна, можна

паспрабаваць напісаць верш без такіх шкодных стымулятараў.

— Паспрабуйце! — прапанаваў Антось.

— Мне дастаткова не выспацца, каб усё перад вачыма плыло... Альбо моцна прагаладацца... Мабыць, я змагу так напісаць! — пацвердзіла Улляна.

— Напэўна, толькі студэнтам філфака ўласціва такая вера ва ўласную ўсемагутнасць, — чамусьці з крыўдай прамовіў Антось. — Упэўненыя ў сваёй геніяльнасці!

— Ну, добра, я не буду пісаць такі верш, — згадзілася Уля.

— Ну, што вы так адразу, напішыце, — падахвоціў Антось.

Тут Улляне цішком перадалі запіску ад Пашкі: «Я ўсё магу, толькі папрасі», ён нагадаў размову пра гейш. Што было далей на занятках, Улляна не слухала, яна абдумвала будучы верш. І толькі недзе ў падсвядомасці адгукалася: «Сімвал павінен быць шматзначным, ён мае цьмяны, туманны сэнс, не паддаецца аднаварыянтнай дэшыфроўцы...»

На перапынку Ваня спытаў Пашку:

— Ну што, выклікаў цябе?

— Не, мужчынская салідарнасць! Будзем спадзявацца, і на заліку таксама. Антось — нармальны мужык, — самаўпэўнена прамовіў Пашка.

— У мяне заўтра па ім практычныя. Што вы праходзілі, падрабязна пытаўся? — пацікавіўся Ваня.

— На, калі хочаш, мой канспект, — прапанавала Ліля, — у канцы там вершыкі Малармэ. Разумееш, што такое сімвалізм? Пачытай верш «Дар паэмы». Ідзе такі больш-менш нармальны верш і раптам «О, пальмы» і далей, нібыта ніякіх пальмаў не было. Антось гэтымі пальмамі асабліва захапляўся. Ён нам казаў пра абавязковасць інтэлектуальных высілкаў...

— Гэта Поль Валеры казаў, а не Антось, — папраўіла сяброўку Маша.

— Але чым выціскаць з сябе гэтыя высілкі, пачытай, тут у мяне збоку з крытыкі выпісана... І не спрабуй сам дадумацца, не атрымаецца, сто пудоў, — папярэдзіла Ліля.

На апошняй лекцыі Уля пачала пісаць верш для Антося: натхненне не задушыш, нават калі яно перашкаджае запісваць лекцыю. У сімвалы чамусьці прасіўся тэнісны мячык. Такі непрыемна жоўты, ён вельмі пасаваў да галюцынацыі. Хацелася навярзці рознай лухты, нагрувасціць, наблытаць і аддаць Антосю. Рука сама напісала ў сшытку «Тэнісны мячык».

Адпраўлялі мяне ў падарожжа,
І з атрутнай сваёй жаўцізной
Пралятаў я над кортам прыгожа,
Абы гол быў любою цаной.

Што ж, пачатак ёсць, далей можна ўжо і дома дапісаць, галоўнае, добра пачаць.

Дома прыйшлося спачатку пад'есці і толькі пасля можна было зачыніцца ў пакоі і пісаць. Крыху дадаць «глюкаў», таго, што не з'явіцца ў галаве нармальнага чалавека.

І пражэктараў цьмяныя вочы
Ненавідзелі ціха мяне.
Футарал ад ракеткі крочыў
Ці то ў марах, ці то у сне.

Захацелася яркага вобраза, нейкай дэталі незвычайнай, ужо пляваць на сімвалізм, Ульяна пісала верш, перамагаючы сябе. Верш, які яна не напісала б, калі б не Антось. Здавалася, што трэба зламаць логіку і сябе, а зрабіць гэта немагчыма. Ульяна проста пісала, ці атрымаецца сімвалізм, ці не, ужо не мела значэння.

Абадраны быў лак на пазногцях
Тэнісісткі, якая мяне
Аб падлогу так жорстка малоціць,
Я, адбіўшыся, споўз па сцяне.

Класна, лак на пазногцях. Абадраны. Нармальны чалавек не зверне ўвагі... Каго цікавіць, якія пазногці ў тэнісісткі? Глупства. Мячык не можа спаўзці па сцяне, ён павінен адляцець, але ў трызненнях аўтара-вар'ята мячык можа нават польку таньчыць.

Улляна не памятала, ці звярталі сімвалісты ўвагу на меладычнасць верша, але аднекуль узялася неадольная прага рытмічнасці, якая будзе выклікаць ледзь ці не пафаснасць... Божа, якое глупства лезе ў галаву... зараз разумею, чаму Рэмбо кінуў пісаць вершы ў дваццаць год. Ну, пачаў у шаснаццаць, кінуў у дваццаць, і стаў сусветна знакамітым... Але не зайздрошчу... Наркотыкі... Лепей быць сціплай беларускай студэнткай, чым геніяльным французскім паэтам, сексуальным вычварэнцам.

Не шкадуючы, лупіць ракеткай,
Выяўляючы моцу сваю.
Пралятаю удала над сеткай,
Зноў аб струны ракеткі пяю.

Дадаць крыху лёгкай распусты... Голага цела... ног ... жаночых... Так хочацца спаць... Верш нейкі атрымліваецца, нібы п'яны прыйшоў на тэнісны турнір, і галаву яго кідае то ўправа, то ўлева. То пазногці тэнісісткі, то ножкі суддзі.

Запаліла суддзя цыгарэту
І паклала нагу на нагу,
Выяўляючы цэламу свету,
Што я болей лятаць не магу.

А зараз крыху садызму... Мабыць, якая-небудзь з каханак Рэмбо прывязвала яго да ложка. Як у фільмах.

Зноў ляжыць пада мною пляцоўка,
Ды пасланы я неяк не так,
Я патрапіў у дзеўчыну лоўка.
(Мабыць, з тыдзень не сыдзе сіняк!)

Пасля Улляна напісала пару слупкоў пра тое, як тэнісістка перамагла, але разззлавалася на мячык за той сіняк. Трэба зноў крыху вар'яцтва, бо нешта зусім мала тут ад сімвалізму. Куды ж кінуць позірк для большай неверагоднасці? Улляна ўзяла хрэстаматыю і перачытала некалькі вершаў Рэмбо. Та-ак, а зараз пачуцці «сімвала»:

Ў столі вокны закратаваныя,
І сціскае паветра грудзі.
Тэнісістка, хоць котка драная, —
Пераможцаў ніхто не судзіць.

Ну, ужо відно фініш. Якую-небудзь брыдоту пра мячык напісаць... Лятаў, лятаў і далятаўся.

Абадрана мая «пазалота»,
Скура луснула, я — не для спорту.
І мяне падфутболілі ботам.
Будуць іншыя лётаць над кортам.

Ну і як гэтае глупства расшыфраваць? Улляна перачытала верш і зразумела, што не такое гэта глупства, як яна чакала. «Значыць, не сімвалізм», — падумала дзяўчына. Ну, а што тады? Трэба паспрабаваць расшыфраваць. Та-ак, шматзначны? Цьмяны сэнс? Ну, сэнс не вельмі цьмяны, тут Рэмбо, канешне, перамагае, але я затое без допінгу. Лёс тэніснага мячыка — гэта...

1. *Лёс генія, выбітнай асобы любога полу*. Спачатку лётаеш акрылены, а пасля хрусь — і ты нікому не патрэбны.

2. *Эвалюцыя цывілізацыі*. Спачатку цікавы ўсім, а пазней толькі археолагам.

3. *Лёс бібліятэчнай кніжкі*. Як у нас кажуць, пайшла кніга па руках, як жанчына. Ну, а зараз, як тэнісны мячык...

6. *Лёс мужчыны ў жаночым калектыве, або хлопец на філфаку*. Дзяўчаты выцягнуць усе жыццёвыя сокі і выкінуць на сметнік.

7. *Свой варыянт*.

Хачу спаць...

## 16

Уля чакала Машку на першым паверсе. Аддрукаваны верш ляжаў у сярэдзіне сшытка, Улляна думала, аддаваць яго ці не. Хацела параіцца з Машкай, але не паспела. Насустрач ішоў Антось уласнай персонай. Ён прыпыніўся пагаманіць з нейкімі хлопцамі. Аддаваць верш ці не? Напэўна, ён не настолькі сімвалічны... ці сімвалісцкі... Як жа правільна сказаць... лепш скажу: у рэчышчы сімвалізму... Антось ідзе.

— Добры дзень, Антось Генадзевіч, — Улляна спыніла выкладчыка, які накіроўваўся да раскладу.

— Добры дзень, — Антось, канешне ж, не памятаў яе імя.

— Я напісала сімвалісцкі верш, — ад хвалявання Уля зусім забыла, як трэба сказаць, але адчула, што ўжыла не тое слова. Яна выцягнула ліст са сшытка і працягнула Антосю.

— Мне зараз прачытаць? — ён неяк спужана спытаў.

— Не, калі ласка, можна да наступнай пары, — спакойна сказала Улляна.

— Добра, я прачытаю, — ён паклаў ліст у папку і пайшоў да раскладу.

Да Улляны падышла Машка і запытальна кіўнула на Антося, маўляў, пра што ты з ім размаўляла? Улляна чамусьці не захацела прызнавацца. Усё адно на практычных Антось сам усё скажа. Антось і сказаў. Толькі не перад Улінай групай, а перад Ваневай.

Ваня падышоў да Улляны на перапынку:

— Гэта не ты Антосю верш напісала? Сімвалічны?

— Я. А ён вам сказаў? — здзівілася дзяўчына.

— Ён сказаў «адна студэнтка», але мы ведаем, што калі «адна», то гэта ты. Хто яшчэ? — усміхнуўся Ваня.

— І што ён вам сказаў? — пацікавілася Уля.

— Што не разбіраешся ты ў сімвалізме... І мы, вядома ж, — дадаў Ваня, баючыся пакрыўдзіць дзяўчыну.

— Ён вам ... верш чытаў? — удаючы абыякавасць, спытала Ульяна.

— Не... Мабыць, ты якуюсь парнаграфію напісала... Я ж ведаю, якія ты вершы пішаш.

— А больш ён нічога пра верш не сказаў?

— Не. Толькі доўга тлумачыў тэрміны, каб мы не блыталі сімвалісцкі і сімвалічны. Проста запужаў усіх, — паскардзіўся Ваня.

«Сімвалісцкі і сімвалічны, гэта ж я памылілася, не мог мяне адразу выправіць, трэба было праз другую групу перадаць. Што ж, добры ён псіхолаг, ведаў, што не паспее сказаць, як данясуць», — пакрыўдзілася Ульяна.

— Уля, — асцярожна звярнуўся да дзяўчыны Ваня, — я хацеў табе сказаць... Я цябе разумею... і... я заўсёды на тваім баку...

— Навошта ты гэта гаворыш? — Уля была непрыемна здзіўлена ягоным спачуваннем.

— Табе лепей было б не ведаць, што ён... за спінай... І мне непрыемна, што гэта я табе расказаў... Але я ведаю нашых дзевак: і данясуць, і сваё прыплятуць! Я не люблю Антося, за тое, што ён падабаецца табе, — цяпер Ваня мог сабе дазволіць празмерную шчырасць. — І я хацеў бы пазлараднічаць, але чамусьці не атрымліваецца... Дурны ён, твой Антось... І ўсё ж, Ульянка, як будзеш ствараць свой фан-клуб — свісні, запішуся першы!

— Дзякуй, усё нармальна, — запэўніла Ваню Ульяна, хоць было жахліва шкада сябе, але яна загадала: «Плакаць будзеш дома, трымайся, Ульянка».

Дзяўчына пайшла ў аўдыторыю, села на сваё месца і пачала бязмэтна гартаць канспект. Побач села Алеся з другой групы:

— Улляна, гэта не ты Антосю вершык напісала?

— Я, — нахабна адказала Уля і зразумела, што вымушана будзе прайсці праз пекла.

— Не атрымаўся ў цябе сімвалічны верш, — павучальна прамовіла Алеся, — Антосік сказаў, што ты не разумееш існасці сімвалізму...

«Ды пайшоў ён, гэты Антось», — падумала Улляна, але ўголас нічога не сказала.

— Ну і пачаў нас правяраць. А што мы... Як ён сам сказаў: «Пачыталі Малармэ — і ножкамі наперад». А нашто ты яму верш пісала? Каб падлабуніцца? — дапытвалася Алеся.

— Я з ім паспрачалася. Добра, што проста так, а не на сто баксаў. А то б ён усё адно перамог! — Улляна раптам успомніла Ваневы словы пра тое, што дзеўкі нахлусяць, і дзеля чысціні эксперыменту спытала:

— А ён вам верш зачытваў?

— Так, некалькі радкоў... Я ўжо і забылася, пра што яны былі, — залівала Алеся.

«Малайчына, Ваня, што папярэдзіў», — падумала Улляна і заглыбілася ў чытанне канспекта. Алеся здзіўлена на яе паглядзела, гмыкнула і ўстала.

Пасля заняткаў Ваня, Пашка, Ліля і Маша сталі на калідоры і размаўлялі, Улляна выйшла з аўдыторыі і прайшла міма.

— Уля-я! — памкнуўся за ёй Пашка, але Ваня спыніў таго за світэр.

— Не чапай, у яе быў цяжкі дзень, — Ваня ведаў, што Улляна павінна перажыць і перадумаць усё на самоце, без дарадчыкаў.

Улляна ішла да метро, вакол было столькі людзей, столькі шуму. Вясёлая кампанія выйшла з «Іспанскага кутка», нехта з іх п'яна прапанаваў Улі далучыцца, але ёй было не да знаёмстваў. Дзяўчыне здавалася, што яна ідзе між манекенаў, для якіх недасяжныя яе пакуты і боль. «Якое глупства, нейкі верш», — Улляна падняла галаву ад ходніка і

паглядзела на людзей, але ўсё зноў змяшалася ў халодную масу.

Ульяна спускалася ў метро, ногі самі намацвалі прыступкі. Па нейкай шчаслівай выпадковасці яна ні з кім не сутыкнулася. Яна дастала праязны, каб паказаць яго кантралёрцы, ля турнікета стаяў маленькі мужычок, падобны да пацука, і вылоўліваў пасажыраў-ільготнікаў, каб прыдзірліва праверыць іх дакументы, а студэнтаў прымушаў паказваць студэнцкія білеты. Стварылася маленькая чарга, Уля стаяла і нерухома трымала ў руцэ праязны. «Пацук» глянуў на яе і не спыніў.

У вагоне натоўп прыціснуў Улю да дзвярэй, яна прытуліла лоб да халоднага шкла. У чэраве метрапалітэна беглі бясконцыя правады, Уля цьмяна адлюстроўвалася ў шкле. «Чаму ён так зрабіў?.. Я ж зусім не хацела, каб ён за ручку адвёў мяне ў куток і ўсё раскрытыкаваў шэптам... Хай бы сказаў тое самае, але ў маёй групе... Нашто так? Ён што, мяне баіцца?.. Адна студэнтка... нейкая студэнтка... Ужо назваў бы прозвішча, склерознік, я ж напісала на лісце...» — Ульяна безуважна глядзела перад сабой.

Жанчына, якая стаяла побач, нарэшце не вытрымала і спытала:

— Што з вамі?

— Усё нармальна, — удзячна зірнула на яе Уля.

«Які ж ён мярзотнік... Усе хлопцы зараз такія... Ваня на сустрэчу не прыйшоў, Антось з вершам... Ну як тут можна сабе знайсці блізкага чалавека? Ты яму сваю душу, а ён цябе перад натоўпам людзей зганьбіць...» — думкі Ульяны пайшлі ў зусім іншым накірунку. «Няма побач нікога вартага... Можна пісаць абвестку ў газеты... Аддам свой гонар у добрыя рукі... О, толькі ў вашыя рукі... магу я свой гонар аддаць... Стоп, гэта ж верш... не, думаць зусім не хочацца... Ну чаму ён так зрабіў?» — з надрывам думала Ульяна.

Яна яшчэ трымалася, пакуль ішла ад метро да свайго дома, але з ліфта яна выйшла рыдаючы.

Мама нават спужалася:

— Уля, што здарылася? Уля!

— Гэта Антось, — сказала Уля, і мама перапужалася яшчэ болей.

— Што ён зрабіў? Уля, не маўчы! — мама за плечы трэсла дачку, якая аж заходзілася ў рыданнях.

Уля з большага расказала пра верш і Антося.

— Ну, што ты галосіш, суседзі падумаюць, што я цябе тут забіваю! — мама злавала, што праз гэткую дробязь Уля так яе напужала. — Так, уставай, здымай боты... Божа мой, ну не раві так, нібыта цябе рэжуць... Уля, ты проста даўно не плакала...

— Мама, тады я пайду паплачу, так? — Уля выцерла рукавом слёзы і высмаркалася ў скамечаную насоўку.

Яна зайшла ў свой пакой і закрыла нагой дзверы. Святло не ўключала. Сумка паляцела на крэсла, Уля кінулася на ложак, слёзы цяклі несупыннымі ручаямі. Хацелася рыдаць гучна, на ўвесь свет, але ж панельны дом і суседзі... Уля моцна прыкусіла падушку. Плач пераходзіў у выццё. Пра Антося неяк не думалася.

Нарэшце слёзы скончыліся, Улляна выцерла мокрыя шчокі, слёзы дацяклі нават да шыі. Яна здзіўлена памацала волкую падушку. Слёз ужо не было, але плечы самі трэсліся, і дыханне было перарывістае, нібы Уля працягвала плакаць. Мама зайшла ў пакой, села побач і прытуліла Улляну да сябе:

— Хадзем вячэраць, дачушка.

— Навошта ён так, мама? — змененым ад плачу голасам спытала Улляна.

— Не ведаю. Можа, проста не палічыў гэта за такую важную справу? — мама не бачыла тут вялікай праблемы, вартай такой буры эмоцый.

— Мамачка, я ўжо ўсё перадумала... Ён жа мяне бачыў перад практычнымі ў другой групе, верш ён

прачытаў быў, бо расказваў жа на занятках... Я ўспамінаю яго твар, калі ён міма ішоў... Ён ухмыльнуўся... ці мне зараз ужо здаецца... Я ўжо нават напрыдумляла, што як малады выкладчык ён хацеў пахваліцца, маўляў, я так сваіх студэнтаў правакую, што яны нават вершы мне пішуць... хай сабе і не сімвалічныя... ці, можа, я паводзіла сябе нахабна... і ён вырашыў аднавіць гармонію ў Сусвеце... — горача выкладала свае гіпотэзы Улляна. — Ніяк не магу ўдала закахацца... Кожны раз памыляюся... Я так дрэнна думаю пра Антося, але калі адкінуць гісторыю з маім вершам, то ён бездакорны выкладчык, апантаны сваім імпрэсіянізмам і добразычлівы да студэнтаў... Я сама ўсё псую... Я ўсё жыццё марыла сустрэць разумнага, нават звышразумнага мужчыну, суперадукаванага, але я ніколі не думала, што можа быць *такая* прорва між намі...

## 17

Антось спазніўся на лекцыю. Ён уляцеў у аўдыторыю і абрадавана застыў перад студэнтамі:

— Дзякуй, народ, што дачакаліся. Я ўжо думаў, разыдзецеся... Ну, слухайце, пацешылі, — казаў Антось, ідучы да кафедры. — У мае гады мы ледзь ці не з секундамерам стаялі... Пятнаццаць хвілін — і па дамах!

— Дык вы спазніліся толькі на чатырнаццаць з паловай, — сарвалася з непаслухмянага Пашкавага языка.

— Павел, я яшчэ пра кімано не забыўся, так што трымайце свае хайку пры сабе! — сур'ёзна, але з жартаўлівымі ноткамі ў голасе застрашыў студэнта Антось, ды Пашка шчыра верыў у дабрыню *Крылька*.

— А як жа ваш склероз? — не вытрымала Ліля, прыгадаўшы, што Антось не мог запомніць імёнаў, і раптам Пашку так удала ідэнтыфікаваў.

— Які склероз? — прытворна здзівіўся выкладчык. — А, мой склероз? Хутка канец семестру, і кожнаму склерозу ёсць мяжа. І ўвогуле, няўжо я даў падставы так дрэнна пра мяне думаць, га? А сёння ў нас не што *йіншае*, як Генрык Ібсен, Бернард Шоў і новая драма.

Антось хадзіў каля дошкі, не заўважаючы паркетнага рыпу, і расказваў пра новыя тэндэнцыі ў заходнееўрапейскай драматургіі мяжы стагоддзяў. Ён, не зазіраючы ў свае паперы, пералічваў п'есы Ібсена так хутка, што не ўсе студэнты паспявалі запісваць.

— Спадар Антось, не маглі б вы павольней называць, бо мы не паспяваем... — папрасіў Ігар, які стаміўся зазіраць у Лільчын канспект, — і, можа б, вы на дошцы напісалі? А то на слых такая лухта атрымліваецца.

— Даруйце маю ўчэпістасць, але... Вы цвёрда вымаўляеце... не па*сп*яваем, не па*сьп*яваем... тут павінна быць асіміляцыя... Вы дома папрактыкуйцеся са словазлучэннем «са*сь*ніў *цьв*ік»... На дошцы, кажаце, запісаць... — задумліва паўтарыў Антось, — ну, паспрабуем...

Ён узяў крэйду, напісаў пару слоў і, відаць, занадта моцна націснуў, бо батончык крэйды пераламаўся, толькі пыл пасыпаўся на падлогу і на адпрасаваныя штаны выкладчыка. Антось паклаў крэйду і чхнуў.

— Ваў, дык ён усё ж такі чалавек, а не машына, — гмыкнула Машка.

Антось чхнуў яшчэ раз і пацягнуўся за насоўкай.

— У анучку зараз шмаргане, — цынічна заключыла Машка.

Антось папрасіў прабачэння і выйшаў з аўдыторыі. Калі ён вярнуўся, ягоны класічны нос адліваў чырванню, а вочы слязіліся. Ён пашамацеў сваімі лістамі, падняў галаву і патлумачыў:

— Алергія на крэйду... Можна сказаць, прафесійная непрыдатнасць... Як у лётчыкаў. Так, на чым я спыніўся... Ага, п'есы Ібсена...

— Можа, сваю п'еску напішам? — шэптам спытала Машка, выдрала са сшытка двайны ліст і напісала першую рэпліку.

...Напрыканцы лекцыі да Вані прыйшоў складзены двайны лісток і запіска: «Драматургі-пачынальнікі просяць вашай прыхільнасці. Уля Г. і Маша Б.». Хлопец разгарнуў ліст. Галоўнымі асобамі былі людзі яму вядомыя, почыркі разборлівыя, і Ваня пачаў чытаць:

«Марыя Бунеева<br>Улляна Гаманкова

## Мужчына з дубальтоўкай

*Аднаактовая п'еска для тэатрыка абсурду*

Асобы:

Уля, Маша, Ліля — студэнткі філфака, незамужнія дзяўчаты 19 год, здаецца, традыцыйнай арыентацыі.

Ваня — студэнт філфака, нежанаты, арыентацыя дакладна традыцыйная.

Антось — выкладчык, малады мужчына (ах!), лічыць, што мужчынскія прозвішчы на -о трэба скланяць, напрыклад: Крылько, Крылька...

Дзеянне адбываецца ў нейкім пакоі, дзе, магчыма, жыве Ліля. Пасярэдзіне стаіць вялікі ложак на чатыры асобы, каля яго табурэтка на шэсць асобаў, злева ад увахода — вялікая шафа, у якую можа схавацца мужчына, справа — маленькае акно, праз якое мужчына не зможа вылезці (ды і нашто праз акно, калі можна праз дзверы). На сцяне вісяць пісталет і дубальтоўка. У куце стаіць няўдалая копія «Давіда» Мікеланджэла, але падпісана, што гэта Арцюр Рэмбо.

Уваходзяць У л я і М а ш а (*з пустымі рукамі*), Л і л я *(апранутая)* сустракае.

У л я *(сплёўвае семку)*. Прывітанне, любая! Не сумуеш без мяне?

Л і л я *(хлусіць)*. Проста жыццё спыняецца, калі цябе няма побач *(падцягвае панчоху на левай назе)*. Я вас чакала.

М а ш а *(хацела пацалаваць яе, але перадумала)*. Можна мне сесці?

Л і л я *(пачасала спіну)*. Ножкі не падломяцца. А як падломяцца, то паляжыш.

М а ш а *(зацікаўлена і таму ціха)*. З кім паляжу?

У л я *(пырскаючы слінай)*. У вас нейкія таямніцы ад мяне?

Л і л я *(кідае асцярожны позірк на шафу)*. Ніякіх таямніц!!!

У л я. Калі няма чаго хаваць, нашто апраўдвацца? Калі я даведаюся... *(Думае, што тады будзе, не прыдумала і замоўкла.)*

М а ш а *(з'едліва)*. Ты, можа, раўнуеш?

У л я. Не, ратуй Божа *(здымае са сцяны дубальтоўку)*.

Л і л я *(заікаецца )*. А наш-што дубальтовачку?..

У л я. Хачу ў шафу пацэліць... (*Прыладжвае дубальтоўку да пляча.)* Калі атрымаецца. У цябе там ніякіх шкілетаў няма?

А н т о с ь (*вывальваецца з шафы*). Ёсць, ёсць адзін шкілет... з мясам...

У л я *(пакалупалася шомпалам ад дубальтоўкі ў зубах)*. Люблю мяса... І шкілеты... А ў мяне дома таксама шафа ёсць...

А н т о с ь *(спужана)*. Х-мм!

У л я *(пяшчотна настаўляе на Антося дубальтоўку)*. Нешта я не зразумела?

М а ш а *(засланяе сабой Антося)*. Ва ўсіх шафы ёсць! У мяне нават дзве. Давайма ўстановім чаргу!

Ліля тымчасам прыпадае да Антосевых грудзей і прыклейваецца вухам. Сардэчныя рытмы іх сінхранізуюцца, іх грукат чуваць нават у апошнім радзе партэра.

Дзверы сваім (!) ключом адмыкае В а н я. Ад неспадзявання Ліліна вуха адклеілася, Антось ледзь не паваліўся на падлогу, але яго падхапіла Уля, крыху пакалыхала, дастала бутэлечку з малаком і ўторкнула яму ў рот.

В а н я *(у скураных штоніках).* А што вы тут робіце?

М а ш а *(паслініла пальчык і паправіла броўкі).* Я так болей не магу. *(Сыходзіць.)*

У л я бярэ А н т о с я за руку, ён крыху паторгаўся, але не вырваўся. Яны выходзяць за кулісы, адтуль чуваць рытмічнае: «Крылько, Крылька, Крыльку...» Ваня здымае скураныя штонікі, акуратна складвае іх на падлозе, кладзецца пад коўдру і адразу засынае.

Ліля кладзецца побач з Ванем. Цішыня. Потым чуваць храп. Нават два храпы.

Апладысментаў няма, каб не пабудзіць Ваню і Лілю.

*З а с л о н а*».

На перапынку Ваня пачаў нежартоўны разбор твора:

— Антось чытаў лекцыю па драматургіі, і вы натхніліся. Але ў вас п’еса абсурду, а ў тыя часы такіх п’ес яшчэ не было.

— Будуць, — хорам адказалі Улляна і Машка.

— Та-ак, а чаму назва «Мужчына з дубальтоўкай», а ў вас тут ёсць толькі дубальтоўка без мужчыны, — прычапіўся Ваня.

— Памятаеш, як мы назвалі дубальтоўкай пэўны мужчынскі орган: і паводле такой канцэпцыі ўсе мужчыны з дубальтоўкамі, — Маша паказала рукой на Ваню.

— Тады рабіце спасылку і пазначайце, што дубальтоўка — рэч фізіялагічная і да зброі ніякага дачынення не мае. Хоць не... трошкі мае... У тым

сэнсе, што калі ў пачатку твора ёсць дубальтоўка, то ў канцы яна павінна выстраліць... Вось яна ў вас як можа, так і выстрэльвае... — зазначыў хлопец.

— Не трэба спасылак! Гэта ж тэатр абсурду! Ты ўвогуле што-небудзь чытаў? — смехам абаранялася Улляна.

— Я чытаў Іанеску, Мрожака, Бекета і іншых. Ды ты сама столькі не прачытала, — Ваня не любіў, калі яго падазравалі ў некампетэнтнасці.

— Па праграме гэта ў наступным семестры... І таму я сапраўды не чытала... Я пішу! — Улляна зрабіла рэверанс і дадала: — Апладысментаў не трэба.

— Вернемся да тэксту, — тонам сапраўднага знаўцы прамовіў Ваня. — Першае, што я бачу адразу... Нашто тут «Давід», ён жа Рэмбо, ён жа Арцюр Рэмбо? Ён ніяк не ўдзельнічае ў дзеянні. Яго можна выкінуць, і нічога не зменіцца, — развёў рукамі Ваня.

— А гэта, каб Антосю было не сумна! — выпаліла Машка і ляпнула сябе па калену.

— Ну, дубальтоўка — знаходка ўдалая. Гучыць, — Ваня засмяяўся. — Далей... Нашто Антосю бутэлька з малаком і чаму тут з'яўляюся я? Мяне таксама можна выкінуць, — прапанаваў Ваня.

— Цябе выкінуць, як і Рэмбо? — перапытала Машка, — але ж ты патрэбны, каб паляжаць у ложку з Ліляй. Хлопец у ложку — гэта свята, а беларускамоўны хлопец у ложку — нацыянальнае свята! — урачыста абвясціла дзяўчына.

— А бутэлька... — Улляну разбіраў смех, — Ну... не ведаю... Гэта ж драма абсурду! — Адказ адшукаўся сам.

— Дык так усе недахопы можна спісваць! А мяне выкідайце, я не пакрыўджуся... Блін, і як можна ўявіць мяне ў скураных штоніках? Вы, дзяўчаты, вычварэнкі, — падагульніў дамарослы крытык.

— Мы — творчыя асобы! — Улляна ганарліва паклала рукі на талію, — нам дазваляецца ўсё: ал-

каголь, наркотыкі, сексуальныя выбрыкі... але чамусьці не хочацца, — Улляна сыграла засмучэнне. — Дзякуй табе, Ваня, за добрыя словы, як буду пісаць мемуары, абавязкова напішу пару слоў пра цябе.

— Дзякуй, дзякуй, — падыграў ёй Ваня.

— Дзякуем не адбудзеш, — пажартавала Улляна. — А можаш яшчэ верш разабраць?

— Эратычны? — прашаптаў Ваня.

— Парнаграфічны, — загучна адказала Улляна і прадэкламавала:

О, толькі у вашыя рукі
Магу я свой гонар аддаць.
І без аніякай прынукі
Я буду вас вечна кахаць.

Ваня паглядзеў на Улляну і зразумеў, пра каго гэты верш. Ён апусціў вочы, сплёў пальцы і падумаў, што дарма спадзяваўся, нібыта гісторыя з вершам можа нешта змяніць у стаўленні Улляны да Антося.

Выкладчык-хлапец разгубіўся,
Не ведаў, што трэба сказаць,
Бо вельмі ён моцна здзівіўся,
Як гонар рукамі узяць.

Маша і Ваня здзіўлена падняла галовы: такой трактоўкі яны не чакалі.

Ён ведаў другія прыёмы
І гонар аднойчы ўжо браў.
Ды гэтакім спосабам новым
Нікога ён шчэ не кахаў.

«Цікава, яна калі-небудзь напіша верш пра мяне?» — з зайздрасцю да Антося падумаў Ваня.

О, толькі у вашыя рукі
Магу я свой гонар аддаць.
І без аніякай прынукі...
А можна мне іншым узяць?

— А можна мне *йіншым* узяць? — паўтарыў Ваня. — Дубальтоўкай? Дасі дзве хвіліны на падрыхтоўку — і будзе адказ!

Улляна згодна кіўнула і зрабіла запрашальны жэст рукой. Маша з захапленнем глядзела то на Улю, то на Ваню: падабаюцца адно аднаму, чэрці, а як іграюць у абыякавасць!

Праз некалькі хвілін Ваня пстрыкнуў пальцамі і з выразнымі жэстамі прачытаў:

> Антось Крылько са скрылікам лімона
> Чытае дома пра каханне вершы:
> Ніяк не могуць ўтаймаваць гармоны
> Філфакаўскія гейшы.

— Ну, што я магу адзначыць, — Улляна зрабіла выгляд, што задумалася, — адчуваецца ўплыў імпрэсіянізму. Звярніце ўвагу на незвычайную меладычнасць верша. А якая алітэрацыя: *Крыл*ько са с*крыл*ікам! Бракуе толькі *крыл*аў, але крылы, відаць, ёсць у аўтара верша. Каб напісаць гэты верш, аўтар, акрамя ўсяго *йіншага,* павінен быў валодаць значнымі ведамі па біялогіі, маю на ўвазе інфармацыю пра гармоны, а гэтаксама адчуваецца шырокая эрудыцыя аўтара. Гейшы — якое незвычайна прыемнае японскае слова! І гэта толькі фармальны разбор, — працягвала сваю пародыю Улляна. — Трэба глыбей... Герой сядзіць са скрылікам лімона! Уявіце сабе сітуацыю! Лімона! Ён жа кіслы!!! Чаму аўтар не напісаў, што скрылік пасыпаны цукрам? І чаму лірычны герой чытае вершы з лімонам?

— Бо ён галодны, — клапатліва падказала Маша.

— А чаму ён галодны? Ён жа будзе думаць пра ежу, а не пра вершы. Хай бы спачатку пад’еў. А то сядзіць галодны мужчына, смокча дохлы скрылік лімона і чытае вершы! Але тут узнікае другое пытанне. Філфакаўскія гейшы — гэта, відаць, студэнткі-японкі, замежныя студэнткі. Якая далікатная сітуацыя... І на якой мове яны пісалі яму вер-

шы? Па-японску? Значыць, герой ведае японскую мову! Але навошта нармальнаму, сярэднестатыстычнаму чалавеку ведаць японскую мову, га? І зараз становіцца зразумелым, што ён шпіён і спецыяльна рыхтаваўся да нейкага задання, таму і мову ведае. І значыць, ён чытае зусім не вершы, а сакрэтныя дакументы. Вяртаемся да пачатку твора... Са скрылікам лімона... Відаць, данясенне напісана на спецыяльнай паперы спецыяльным атрамантам. І калі выціснуць некалькі кропелек лімоннага соку на паперу, то іерогліфы праясняюцца!

— А чаму ён сядзіць дома? — Вані было цікава, ці здолее Уля выкруціцца.

— Дома? Дамашні арышт! Альбо проста хаваецца! З твора нельга сказаць больш дакладна, — працягвала вярзці бязглуздзіцу Улляна.

— А гармоны? — улезла ў размову Машка.

— Там і гармоны былі? Ну, вядома ж... Як японкі перадавалі паперы? Яны ўдавалі, нібыта ў іх вiруюць гармоны, — і яны пішуць любоўныя лісты! Ну і код ідзе адпаведны: зброя шыфруецца праз часткі цела, назвы дзяржаў — праз імёны, яўкі — праз месцы спатканняў і г. д., — з ходу выдумляла Уля.

Яе развагі былі гвалтоўна перапынены Ваневым выгукам:

— Гэта твая валасня? — Ваня зняў са світэра доўгую светлую валасінку і паглядзеў на Машку.

Машка выхапіла валасіну, стрэсла яе на падлогу і падазрона спытала:

— Як гэта ты каля мяне цёрся, што я нават не заўважыла?

— Я ім пра літаратуру, пра высокае, пра духоўнае, а яны валоссе падзяліць не могуць! Няўдзячныя! — абурылася Улляна. — Усё, я іду дамоў.

— Уля, — спыніў яе хлопец, — я заўтра, мабыць, не пайду на спецсемінар, буду сядзець у чыталцы. Сустрэнемся каля кафедры, раскажаш, што ён гаварыў.

## 18

Міхась Пятровіч выцягнуў з шуфлядкі Улляніны творы і сеў насупраць дзяўчыны. Лабарантка кафедры выключыла камп'ютэр, падфарбавала вусны і ціхенька выйшла.

— Ульяна, вы ўжо самі зразумелі, што пісаць — гэта праца. І цяжкая праца. Калі вы хочаце выдаць кніжку... — Міхась Пятровіч выпрабавальна паглядзеў на дачку, — то вы павінны папрацаваць над вашымі творамі. Мала толькі напісаць! І было б добра, калі б вы ўлічылі мае заўвагі. — Пачнём з назваў, — Міхась Пятровіч насунуў на нос акуляры,— яны альбо банальныя, альбо запазычаныя, напрыклад: «Ідылія». Гэта яшчэ ў Дуніна-Марцінкевіча было. «Дзень святога Валянціна»... Альбо выклікаюць занадта... ммм.. асацыяцыі... «Стогны моцнага мужчыны...» ці «Экстрэмальнае каханне». Улляна, у вашых творах няма ні стогнаў моцнага мужчыны, ні экстрэмальнага кахання!

— Я хачу прывабіць чытача! — Улляна нарэшце ачомалася і пачала тлумачыць сваю пазіцыю.

— Чым прывабіць? Што ты ведаеш пра моцных мужчын і экстрэмальнае каханне? Ды хаця б проста пра каханне? — пачула Улляна, і ёй падалося, што яна стаіць аголеная перад натоўпам, яна нават не заўважыла, як Міхась Пятровіч выпадкова, ад лішку эмоцый, сказаў ёй «ты». — Улляна, чым можна здзівіць чытача ў 19 год? Калі завабліваць чытача пустымі назвамі, ён расчаруецца і больш не будзе рэагаваць на вашае прозвішча.

— А для гэтага ён павінен будзе маё прозвішча запомніць! — парыравала дзяўчына. — І кожны раз ён будзе спадзявацца, што я ўсё ж апраўдаю назву.

— Улляна, праз пяць гадоў рабіце, што вам захочацца. Але першыя спробы павінны быць больш традыцыйнымі, стрыманымі. Калі вашыя першыя творы будуць асацыявацца з нейкімі ніжэйшымі

інстынктамі, то пасля вам прыйдзецца ўвесь час даводзіць, што вы ўсё ж сур'ёзны пісьменнік, — засцерагаў Міхась Пятровіч.

— Значыць, вы не сумняваецеся, што я стану сур'ёзным пісьменнікам? — Улляна заўважыла, што ён назваў яе не пісьменніцай, а пісьменнікам, так гучала больш годна.

Міхась Пятровіч прапусціў пытанне міма вушэй:

— Я не магу сказаць, што вы непісьменная, вы хутчэй няўважлівая. Ну што гэта за назва «Ноч на бігудзях»? Слова «бігудзі» не скланяецца, — заўважыў прафесар.

— Я гэта ведаю... Але можна ж курсівам вылучыць... каб было зразумела, што гэта спецыяльна, — апраўдвалася Улляна.

— Можа, яшчэ чырвоным вылучыць? І ў дужках напісаць, што аўтару так больш падабаецца? — з'едліва прамовіў Міхась Пятровіч і паглядзеў на Улю паверх акуляраў.

— Не трэба, — скрозь зубы выціснула Улляна, зразумеўшы, што не адолее яго.

— Так, значыць, тут вы са мной пагаджаецеся, — задаволена прамовіў Каляда. — Ідзем далей. Я вам пазначыў, якія інтымныя сцэны можна выкінуць без шкоды для сюжэта. І навошта так падрабязна распісваць? Дзякуй Богу, вы не апісваеце самога працэсу, але навошта такія дробязі? Хто што сказаў, куды сеў, як падумаў...

— У фільмах усё занадта прыгожа, — Улляна ад бездапаможнасці сціскала пад сталом кулакі, — я, канешне, не ведаю, але шчыра веру, што не можа ўсё быць так ідэальна.

— І вы лічыце, што тут у вас павінна ў самы адказны момант зваліцца з шафы гітара? — з іроніяй пацікавіўся Міхась Пятровіч.

— Уявіце, што ў нейкай пары такое адбылося. У людзей стрэс. Магчыма, што яны перад чарговым... эээ... Наступным разам яны будуць правяраць, ці

няма дзе побач гітары. І тут яны чытаюць мой твор, і аказваецца, што не яны адны трапілі ў такую сітуацыю! — горача тлумачыла Уля.

— Карацей кажучы, вы сваімі творамі хочаце лячыць людзей ад розных фобій. Ухваляю і падтрымліваю, але ж пісьменнік не доктар, у яго крыху іншыя функцыі. Некалькі сцэн усё ж трэба выкінуць. У вас зашмат дыялогаў, вы не апісваеце сваіх герояў... Я разумею, што часам можа быць неістотна, які чалавек з выгляду, але ў вас гэта проста хранічная хвароба.

— А як трэба? Дзяўчына падышла да хлопца, чытач чакае дзеяння, а я пачынаю апісваць прычоску, адзенне, ногі, чаравікі, дзядулю і бабулю на старым сямейным фотаздымку, да якіх дзяўчына вельмі падобная. Пасля прыгадваю бабуліна каханне ў дванаццаць год... Наш дынамічны час патрабуе дынамічных твораў! Я пішу так, каб з маіх твораў нічога нельга было выкінуць! Нават інтымную сцэну! Міхась Пятровіч, калі мы з сяброўкай чытаем нешта па праграме і спяшаемся, напрыклад, да практычных, то сядзім над кнігай і гартаем лісты з пэўным рытмам, каб паспець кінуць адзін позірк на левую старонку і адзін на правую! Бывае, што гераіня зацяжарыла, а мы не ведаем, ад каго, і гартаем назад. Дык вось я хачу, каб у маіх творах нельга было беспакарана прапусціць столькі старонак!

— Пішыце тэлеграмы. Бо толькі ў іх нельга прапусціць нават адно слова, каб не сказіць сэнс, — усміхнуўся куточкамі вуснаў Міхась Пятровіч. — Нашто тады пісаць, калі вы хочаце канстатаваць факты? Мы ўсе пішам пра аднолькавыя рэчы і з'явы, ёсць нават меркаванне, што насамрэч існуе толькі тры тэмы, а ўсё астатняе — іх варыяцыі. І мы адрозніваемся спосабам апісання! Стаіць на стале чарнільніца, — Каляда паказаў рукой на неіснуючую чарнільніцу. — І вы са сваім бліц-метадам напішаце, што яна стаяла, поўная ці пустая, замежнай вы-

творчасці ці айчыннай, і, магчыма... ну, што вы можаце яшчэ ведаць пра чарнільніцу? — не патрабуючы адказу, спытаў выкладчык. — А чалавек з большым лексіконам, з большым досведам, майстра, апіша яе на васьмі старонках...

— А хто будзе чытаць гэтыя восем старонак? — ускінулася Улляна. — Вы, пара спецыялістаў, пара фанатаў, і ўсё! Бо я не буду! Гэта ж сапраўдны здзек!

— Гэта вам заданне — апісаць чарнільніцу на васьмі старонках, не больш і не менш! — уладарна прагучаў голас Міхася Пятровіча.

— Я напішу, што чарнільніца была люстраная, і апішу інтымную сцэну, якая будзе адлюстроўвацца на яе паверхні! — узбунтавалася Улляна.

— Пачытаю з вялікім задавальненнем. — Улі здавалася, што яна малое і капрызнае дзіця, а Міхась Пятровіч як дарослы глядзіць на яе зверху ўніз. — А цяпер, Улляна, мы падышлі да саміх сюжэтаў... Вы тут пішаце пра студэнтаў. Калі выкладчыкі пачытаюць вашыя творы, яны не захочуць ісці на працу! Брыдота! — не стрымаўся ў азарце Міхась Пятровіч.

— Дзе там брыдота? — Уля зазірнула ў падсунутыя выкладчыкам лісты. — Няпраўда, яны нічога дрэннага не робяць, тут жа толькі дыялогі!

— У чытачоў ствараецца меркаванне, што яны сексуальна заклапочаныя, вы свядома так робіце? — здзекліва запытаўся Міхась Пятровіч.

— Я пішу праўду, — зменены ад крыўды галасам адказала Улляна. — Значыць, мы сексуальна заклапочаныя, але мы нікому не робім нічога дрэннага! Нашыя словы і жарты не пераходзяць у дзеянне.

— Чорт з імі са студэнтамі, Уля, тут вы ўсё ж не выйшлі за межы стэрэатыпаў. А вось вашыя выкладчыкі... за што вы нас не любіце? Няўжо я такі прымітыўны, як, напрыклад... тут у вас недзе было... — Міхась Пятровіч пачаў шукаць у тэксце.

— Я… я не хацела… І чаму прымітыўны?.. Я не думала пра гэта… — Уля нават разгубілася і засмучана разважала ўслых. — А з другога боку… усё натуральна… мне толькі 19 год, і ў думкі выкладчыкаў я даю самае разумнае, што я магу прыдумаць у свае гады, і, мабыць, дзевятнаццацігадовы выкладчык выглядае смешна… Міхась Пятровіч, але вы павінны ведаць, што я паважаю ўсіх выкладчыкаў, амаль без выключэння! Паважаю, бо ведаю іх як добрых спецыялістаў… яны могуць быць якімі заўгодна людзьмі, але для мяне яны найперш прафесіяналы… — Уля спатыкнулася аб пранізліва-іранічны позірк Каляды. — Божа мой, я адчуваю сябе ідыёткай! Вы заганяеце мяне ў кут, і што б я зараз ні гаварыла, гэта выглядае абсалютным глупствам.

— Глупства не можа быць абсалютным, яно альбо ёсць, альбо яго няма, — стомлена заўважыў Міхась Пятровіч. — Улляна, вы павінны адчуваць слова, — выкладчык асцярожна выцягнуў перад сабой руку, нібыта ў яго на далоні ляжала безабароннае слова. — Вы павінны адчуваць сваю місію. Вы як бог-дэміург, у якога ў руках гліна для стварэння Адама. І з вашых рук можа выйсці чалавек, а можа і пачвара нейкая. Вы павінны бачыць слова наскрозь, адчуваць яго патэнцыял, ведаць, як яно гучыць, выглядае, пахне, якое яно на смак і навобмацак. Бо калі гэтага няма, то і пісьменніка таксама няма, — Міхась Пятровіч нават не глядзеў на Улляну, ён думаў услых.

— А як жа сюжэт? — баязліва варухнула вуснамі Улляна.

— Улляна, маўчыце. Як вы можаце навучыцца, калі вы ўвесь час спрачаецеся? — Каляда ледзь стрымліваў свае эмоцыі. — Вас немагчыма перакanaць, бо вы не ўяўляеце, што можа існаваць другі бераг ракі, другі бок медаля. Я гавару, а вы мяне не чуеце, вы проста чакаеце, калі я зраблю паўзу, каб набраць паветра, і ўкліньваецеся ў мой маналог. Ёсць

такая ўсходняя прыпавесць... Прыходзіць вучань да настаўніка, яны сядаюць на падлогу адзін насупраць другога, і настаўнік найперш пытаецца: «Якога колеру неба?» Вучань глядзіць на неба і ўпэўнена адказвае: «Яно блакітнае, Настаўнік». «Ты памыляешся, — выпраўляе яго настаўнік, — яно чырвонае». І калі вучань тыцкае пальцам у неба і абурана пярэчыць: «Паглядзіце самі, яно блакітнае», то гэта дрэнны вучань. А калі вучань згодна скланяе галаў і кажа: «Зараз бачу, яно сапраўды чырвонае», тады настаўнік пачынае яго вучыць далей. І я кажу вам, што неба чырвонае! — Каляда нават ускочыў ад узрушанасці.

— Я так не магу... — прашаптала Ульяна. — Калі неба чырвонае, значыць, я не маю рацыі, значыць, і я, і мае творы проста непатрэбныя... Значыць, усё дарма... — Ульяна, як ужо асуджаная на смерць і забыццё, паклала галаву на складзеныя рукі.

Міхась Пятровіч не чакаў такой рэакцыі. Ён разгублена пераступіў з нагі на нагу, вінавата прамармытаў: «Ну, што вы, Уля» і пагладзіў яе па галаве.

У гэты момант дзверы адчыніліся, Міхась Пятровіч хапатліва прыняў руку, але гэты рух не застаўся незаўважаны лабаранткай. Яна застыла, і было відаць, як на яе твары здзіўленне змяняецца абурэннем. Ульяна абы-як зграбла свае творы і, кінуўшы невыразнае «да пабачэння», як агаломшаная выбегла ў калідор, дзе няўпэўнена прайшла некалькі крокаў і прыхінулася плячом да сцяны.

Ваня жвава збег з лесвіцы, завярнуў да кафедры і натыкнуўся на Ульяну. Ён перапужаўся:

— Табе дрэнна? Ты ўся белая.

— Ён мяне ў пух і прах... Ваня, у цябе калі-небудзь было адчуванне, нібыта ўсё, што ты робіш, марна і дарэмна? Я ўжо нічога не разумею... Гэта што, методыка такая, спачатку хваліў, падахвочваў і раптам — «інтымныя сцэны выкіньце, назвы змяніце, размовы хай будуць прыстойнымі, а студэнты

— анёльчыкамі!» — гаварыла Улляна, каб выгаварыцца.

— Карацей, ішла ваякам, а назад ракам, — падагульніў Ваня.

— І што мне зараз рабіць? — Улляна падняла на Ваню пустыя вочы.

— Па-першае, жыць, па-другое, павесіць фотаздымак Каляды на сцяну і кідаць у яго дроцікі. А па-трэцяе, даць мне што-небудзь пачытаць, — жартам папрасіў Ваня.

— Я зараз не магу даць нічога, — прамовіла Улляна. — Пачытаю дома ягоныя заўвагі. Я сёння яму яшчэ адзін творык несла, абсалютная парнаграфія нават на маю думку, Міхась Пятровіч страціў бы прытомнасць, а пасля пазбягаў бы сустракацца са мной вачыма, — паспрабавала пажартаваць Улляна. — Бяры, калі хочаш.

— Я, напэўна ж, захачу выказацца. Можа, сустрэнемся заўтра? — з прытворнай абыякавасцю спытаў Ваня. — Толькі дзе? У чыталцы?

— Бібліятэкаркі выганяць за размовы, — адпрэчыла прапанову дзяўчына.

— Можа, пустую аўдыторыю пашукаем? Хаця не, канец семестра... Не будзе пустых... Можа, проста сустрэнемся на першым паверсе і пасля вырашым, куды пайсці? — стаміўся прыдумваць Ваня.

— І калі ты раптам не прыйдзеш, — Улляна нагадала пра няўдалае спатканне, — я буду, як швейцар, стаяць у фае і пакорна чакаць? О, не! Сустрэнемся ў «акадэмцы», і калі ты забудзеш пра сустрэчу, я не буду губляць час і пачытаю што-небудзь, згода? — паспешліва прамовіла Улляна.

Ваня пагадзіўся і пачаў успамінаць, дзе ж ляжыць ягоны чытацкі білет з бібліятэкі Акадэміі навук.

...Мамы дома не было. Улляна ўключыла святло, кінула на табурэт папку са сваімі творамі, не развязваючы снуркі, зняла паўбацінкі і сумна падміргнула свайму адлюстраванню ў вялікім люстэрку...

Калі мама прыйшла з працы, то ўбачыла, як Улляна сядзіць па-турэцку перад люстэркам. Мама паглядзела на раскіданую вопратку і заклапочана спытала:

— Што робіш, Улляна?

— Рэфлексую! — з выклікам адказала дачка.

— І што з'яўляецца прадметам тваёй рэфлексіі? — мама падышла да Ульяны, глянула на сябе ў люстэрка і паправіла прымятую шапкай прычоску.

— Я думаю пра марнасць жыцця! І пра тое, як гэтае жыццё можна разбурыць да самага фундамента адным толькі словам... Хіба можна сказаць пра чалавека, што ён цудоўны, і пасля дадаць, што ён да таго ж дурны і непрыгожы? Ад такіх «кампліментаў» жыць не захочацца. А можна ўзяць твор і сказаць яго аўтару, што творык нядрэнны, вось толькі дужа слабая мова і сюжэцік нічога не варты. І не захочацца болей пісаць, — распавядала Уля. — Таму я сяджу перад люстэркам і ўгавораю сябе, што я лепшая, што я выключная, што я самая геніяльная...

— Геніяльная? — мама села побач на падлогу і засмяялася. — А можа, таленавітая?

— Добра. Самая таленавітая... — пагадзілася Уля.

— Пачакай, калі мы ўжо пачалі таргавацца, то, можа, здольная? Як табе самая здольная? — усміхнулася мама.

— Не, спынімся на таленавітай, — заўпарцілася Уля.

— Штосьці здарылася на спецсемінары? — здагадалася мама. — Міхась Пятровіч нешта сказаў?

— Сказаў. Нешта, — пацвердзіла Улляна. — «Злазь з даху, не псуй гонту», — сказаў стары пісьменнік маладому. Але малады пісьменнік быў насамрэч маладой пісьменніцай, і таму ўзнікае яшчэ і гендэрная праблема, то-бок праблема ўзаемадачынення мужчынскага і жаночага полаў. І таму я скажу так: усе мужыкі сволачы!

— Ну, на ўсіх не кажы. Ты ўсіх не ведаеш, — запярэчыла мама.

— Мама, а ўсіх і ведаць не трэба, кола маіх знаёмых досыць рэпрэзентатыўнае для такога сцвярджэння. Можа, толькі адзін з іх не сволач. Мой тата. А астатнія дакладна сволачы, — як аксіёму паўтарыла Улляна.

— А што канкрэтна ён табе сказаў? І пакажы, якія ў яго заўвагі, — мама намагалася не выдаць сябе і пацягнулася за папкай з творамі.

— А нічога такога... У нас канцэпцыі розныя: я хачу зацікавіць чытача, а ён хоча, каб мяне не выкінулі з літаратуры за разбэшчанасць, несумяшчальную з пісьменніцкай дзейнасцю... У яго неба чырвонае, а ў мяне — блакітнае. Вось і ўсё, — Улляна апатычна лягла на падлогу, але ўпірацца лапаткамі ў цвёрдае было нязручна, і яна зноў села.

— Та-ак, — мама праглядала праўкі Міхася Пятровіча. — Нічога страшнага я тут не бачу. Назвы, калі хочаш, можаш адстойваць. Калі гэта для цябе так прынцыпова. Ад тваіх «бігудзей» прыйдзецца, вядома ж, адмовіцца. А «стогны моцнага мужчыны» мне таксама не спадабаліся. Ага, глядзі, якіх ён табе «блох» навылоўліваў: на пачатку твора дзяўчо з зялёнымі вачыма, а напрыканцы каханы паглядзеў у яе блакітныя вочы, — засмяялася мама.

— А можа, яна ў каляровых лінзах? — абурылася Улляна за няўважлівасць да яе праблем.

— Тады пішы, што ён паглядзеў у яе блакітныя вочы, якім іх цудоўны колер давалі лінзы, — мама не хацела павялічваць праблему там, дзе яе можна зменшыць. — А вось яшчэ... *Міргаць вачыма*... А ён табе піша, што міргаць не вачыма немагчыма!

— Ты мне зараз усё ўслых зачытваць будзеш? Дзякуй, я і сама пачытаю! — пакрыўдзілася Улляна.

— Улляна, я цябе апошнім часам не пазнаю, — мама адклала ўбок паперы. — То ты рыдаеш, аж

захліпаешся, толькі з-за таго, што недастаткова ацанілі твой верш... То ты сядзіш, як Буда ў нірване, калі цябе крыху пакрытыкавалі... Загадаеш цябе толькі хваліць?

— Толькі ты адна ведаеш, як я пішу... І колькі маіх сіл гэта забірае... Я пішу не таму, што я хачу быць класікам і трапіць у школьную праграму. І нават не для таго, каб мяне прачыталі... Я пішу, бо не магу не пісаць! У маёй галаве безліч сюжэтаў. Я даўно ўжо не жыву сваім жыццём. Бо што такое маё жыццё? Ваня, які не прыйшоў на спатканне? Антось Генадзевіч Крылько з німбам над галавой? Міхась Пятровіч Каляда з чарнільніцай на васьмі старонках? І бяссонныя ночы перад камп'ютэрам! Універсітэт — дом, дом — універсітэт. Ну і яшчэ — бібліятэка. Але я не магу сказаць, што я жыву жыццём сваіх герояў. Не, я заўсёды памятаю, што яны прыдуманыя, але і жывыя адначасова. Ты ведаеш, што я плачу з імі, я смяюся з імі. Яны — мае. І блакітныя ў іх вочы ці зялёныя — гэта неістотна. Міхась Пятровіч хоча ўсё паставіць на навуковыя рэйкі: там выкінь, тут дапішы. А гэта не я пішу, гэта ідзе аднекуль з глыбіні свядомасці ці падсвядомасці, і рацыянальнасці туды шляху няма.

— І хто мне гэта кажа? Ці не тая паненка, што хацела ў кожны твор уціснуць столькі эротыкі, колькі ўлезе? А хто ў нас свядома ідзе на эпатаж? А хто ў нас піша верш, толькі калі ёсць варты працы сюжэцік, га? — падкалола мама.

— А... ну... так... Я сама не ведаю, як я пішу... Як атрымліваецца, так і пішу. Мама, ну навошта ты мне нагадала? Мабыць, я стану сапраўднай пісьменніцай, калі зразумею, як я пішу.

— А ты ўсё ж марыш стаць сапраўднай пісьменніцай? Ты ж толькі што казала, што не хочаш станавіцца класікам. Але сапраўдная пісьменніца напэўна стане класікам, як мяркуеш?

## 19

Уля прачнулася, паглядзела на гадзіннік, лягла на жывот і абняла падушку. Мама зазірнула ў яе пакой:

— Уля-анка, устава-ай! У вас жа з Ванем спатканне перад заняткамі...

— Я яшчэ не спазняюся, але калі і спазнюся, то хай чакае. — Улляна сонна пацягнулася і пазяхнула: — Як зорка беларускай літаратуры я магу дазволіць сабе такую раскошу?

— Падымайся, зорка, — мама сцягнула з Улі коўдру. — Ты ж хацела нешта яшчэ раздрукаваць...

— Ага, — падхапілася Улляна. — Не хачу даваць Вані тыя асобнікі, дзе Міхась Пятровіч накрэмзаў. Дам яму чысценькія, каб аўтарытэт Каляды на яго не ціснуў.

Пакуль Улляна раздрукоўвала, перачытваючы асобныя лісты, пакуль апраналася, час ляцеў, і яна спазнілася. Задаволена пазіраючы на гадзіннік, яна ўвайшла ў будынак бібліятэкі Акадэміі навук. Ваня стаяў на першым паверсе.

— Я думаў, ты не прыйдзеш... забыла ці ... спецыяльна, — замест прывітання сказаў Ваня.

— Я хацела не прыйсці, але мне стала цікава, ці ты сам не забыўся на нашу сустрэчу, — пажартавала Улляна, здымаючы паліто. — Я спадзяюся, ты мае апавяданні за гадзіну адолееш? І пасля пагаворым. А я пакуль што тваё пачытаю, згода?

У філалагічнай зале было мала людзей. Ваня сеў за вялікі стол бліжэй да акна, а Улляна — за суседні столік на аднаго чалавека. Праз гадзіну Ваня пацягнуўся і кіўнуў Улляне:

— Пакуль не забыўся... Назвы ў цябе класныя! «Стогны моцнага мужчыны»... Ха, падманваеш чытача, Уля! Але так і трэба, пакуль ён разбярэцца, што ў цябе там усё цнатліва, як у манастыры, будзе позна. Гэта правільна, ты пішаш тое, што табе хочацца напісаць, чаго прагне твая душа, і што, маг-

чыма, будзе не вельмі цікава чытачу, але ты даеш кідкую назву, і твор чытаецца пад зусім іншым асвятленнем, — шпарыў Ваня, не гледзячы на Улляну.

— Наш прафесар сказаў тое самае, толькі наадварот, — Улляне было цікава, як хлопец адрэагуе на такое паведамленне.

— Я ж не прафесар. І мне не 60 год. Хаця, вядома ж, не ўсё залежыць ад узроста. — Ваня на секунду задумаўся. — Уллянка, я не ведаю, з чаго пачаць. У мяне адчуванне, што пра твае творы можна гаварыць бясконца... Я буду думаць пра ўсё гэта і, мабыць, кожны дзень буду табе казаць штосьці новае пра цябе ж.

— Ты будзеш пра мяне думаць? — з іроніяй спытала Улляна.

— Абавязкова. Нават два разы на дзень, — з лёгкай усмешкай падыграў ёй Ваня і зноў заглыбіўся ў свой аналіз. — У цябе вельмі шмат дыялогаў. Але не ў гэтым недахоп. Рэплікі вельмі кароткія і таму шмат «паветра» на лісце, белага шмат. Ты распішы, што і з якой інтанацыяй было прамоўлена, які быў твар, і ўсё само запоўніцца. Твае творы занадта дынамічныя. Нагрувашчваюцца дзеянні, дзеянні, — хмурыў бровы Ваня.

— Мне здаецца, што зараз не дзевятнаццатае стагоддзе і ніхто не будзе разбіраць завалы з апісаннямі прыроды, нават калі яна адпавядае настрою галоўнага героя. Час іншы, больш дынамічны, — Улляна паўтарала тое, што яна казала Міхасю Пятровічу.

— Усё залежыць не ад часу, — спакойна і ўпэўнена запярэчыў Ваня, — а ад людзей. А людзі не змяняюцца! Улляна, ты пішаш для сябе, для людзей, якія падобныя да цябе. Ты мітуслівая, хуткая, ты ўсё разумееш адразу, табе не трэба паўтараць. Памятаеш, ты казала, што не любіш перачытваць творы.

— Чужыя, — засмяялася Ульяна.

— Бо яны «павольныя», «марудныя» для цябе. Твая хуткасць не недахоп, але і не вартасць. Усе людзі розныя, гэта натуральна. А вось мой сусед, Сашка Тарасевіч, чытае вельмі павольна. Для яго істотна кожнае слова. Ён так доўга чытае, што для яго сам працэс чытання больш важны за тое, што ён чытае. Яму можна энцыклапедыю падсунуць, і ён не заўважыць розніцы.

— І ты хочаш сказаць, што ён мяне не прачытае? — Ульяна ўбачыла тут намёк.

— Ужо чытаў. Праўда, толькі адно апавяданне, але і ад аднаго ў Сашы паскорыўся пульс і рытм дыхання, — Ваня на хвілінку замоўк, каб сабрацца з думкамі.

І раптам Уля і Ваня пачулі дыханне, гучнае і глыбокае, нібы чалавек перажываў найвышэйшую ступень узрушанасці ці нават экстазу. За суседнім сталом, сагнуўшыся над сваімі паперамі, сядзеў нейкі мужчына, які ўцягваў паветра перарывіста і з хліпамі.

— Стогны моцнага мужчыны, — прашаптаў Ваня. — Што ён такое чытае? Парнаграфію якую? Каб так дыхаць, трэба трэніроўка. Ну, што ён сапіць, як у аквалангу?

— Сашка Тарасевіч таксама так дыхаў? — з кволай надзеяй спытала Ульяна.

— Не, мяне саромеўся, — Ваня не зводзіў вачэй з «аквалангіста».

— Ваня-а-а, алё-о-о, ты дзе? — Уля памахала рукой перад Ваневым тварам.

— А, дык пра што я гаварыў? Пра Сашку Тарасевіча. Не, там я ўжо ўсё сказаў. Далей. Твае творы вельмі няроўныя. Ты яшчэ расцеш як чалавек, вучышся. І твае творы як рыскі на лінейцы, дзе мераюць рост дзіцяці. Ты часам наіўная, смешная, а між іншым, гэтыя моманты ты якраз пісала ад душы, там такі парыў, які немагчыма з твора выкінуць,

але і пакінуць немагчыма. Там, дзе ты кантралюеш сябе, усё нармальна.

— Адкуль ты ведаеш пра парыў і «ад душы»? — здзівілася дзяўчына.

— Не забывай, што я таксама пішу, і я ведаю, што як толькі не ўпільнуеш, з усіх дзірак лезе наіўнасць. Я ведаю сваю памылку і таму магу заўважыць яе ў іншых, — рассакрэціў Ваня свае таямніцы. — Але шараговы чытач ўсё праглыне, не хвалюйся. Я ведаю, што жанчынам такія моманты падабаецца чытаць. Ведаеш, як яшчэ можна такія моманты пазнаць? Будзе здавацца, што чалавек «распрануўся» не там, дзе трэба. Будзе сорамна чытаць, нібыта падглядаеш, хоць змест можа быць абсалютна прыстойны.

— А ты прыроджаны крытык! — Уля шчыра пахваліла Ваню. — Я такое не заўважала. Але зараз я ўспамінаю і пагаджаюся. Не верыш, што гэта ты напісаў. Сорамна абнародаваць і балюча выкінуць. Усё так, але які ж ты ўважлівы. Я не бачыла раней, не звяртала на такое ўвагі.

— Ты — эгаістка, гэта агульнавядома, — Ваня тыцнуў у яе пальцам.

— Замкні буркала, — Улляна са сцішаным смехам піхнула Ваню пад сталом.

— Я шчыра прызнаюся, што гэта ўсё дробныя прычэпкі, — Ваня паглядзеў на свае чырвоныя ад маразоў далоні. — Ты добра пішаш, але я магу зразумець Міхася Пятровіча. Ты ў жыцці нашмат лепшая і прыстойнейшая, чым у творах, хаця і ў творах няма нічога, за што трэба аддаваць на гільяціну. Але ў мяне адчуванне, што Міхась хацеў цябе абараніць. Некаторыя твае гераіні прайшлі агонь, ваду і медныя трубы. І які-небудзь несумленны чытач можа атаясамліваць цябе і такую тваю гераіню. Ты павінна быць, як анёл: святая і недатыкальная. А ты грахі апісваеш з такім смакам, праўда, ты заўсёды паказваеш, што такое добра і што такое дрэн-

на. Я, хлопец, не змагу так сакавіта падабраць слоўкі да гэтага... ну... разумееш.

— А што там цяжкага — падбіраць слоўкі? Ваня, людзям дадзены пэўны набор пачуццяў, і мы не можам выйсці за яго межы. Ты калі-небудзь талерку з-пад варэння аблізваў? — нечакана спытала Уля.

— Так, — Ваня не зразумеў, да чаго гэтае пытанне.

— Праз пяць хвілін язык стамляецца і не хапае сілы яго назад у рот запіхнуць, — засмяялася Ульяна, а Ваня няўцямна кіўнуў. — А зараз уяві, што ты аблізваў не талерку з варэннем, а дзяўчыну. Для языка тут нічога не змяняецца: праз пэўны тэрмін ён бязвольна высалапіцца з разяўленага рота. І для таго каб апісаць усе гэтыя ігрышчы ў творы, табе не трэба шукаць дзяўчыну для аблізвання. І ты мусіш разумець, што адбываецца між героямі. Ты можаш уключыць усе пачуцці героя — і ён адчуе пах поту ці водар духоў, ён адчуе аксамітнасць скуры ці гузік ад джынсаў.

— А табе не сорамна пісаць інтымную сцэну? Ну, няёмка? — насцярожана пацікавіўся Ваня.

— Ты хочаш сказаць, што я з імі трэцяя? — засмяялася Ульяна. — Я не трэцяя. Я нават не глядач, які назірае збоку. Я — рэжысёр-пастаноўшчык, які загадвае, куды каму пакласці рукі і куды пацалаваць. Чытаць гэта нашмат цікавей, чым пісаць.

— А пісаць цікава? — удакладніў Ваня. — Уля, чаму мы пішам? У нас з табой няма жыццёвага вопыту, а ў фундаменце літаратуры менавіта досвед.

— Досвед можа быць і чужым! Гэта па-першае. А па-другое, той, хто ў нашым узросце актыўна назапашвае досвед, на жаль, не хоча гэты досвед апісаць, — Ульяна выняла з кішэні фанцік ад цукеркі і пачала яго скручваць. — Ваня, калі ты апісаў тое, што было, — гэта журналістыка, а калі тое, чаго не было, — гэта мастацтва.

— Значыць, па-твойму, журналістыка абсалютна аддаленая ад мастацтва? — падлавіў сяброўку Ваня.

— Так, аддаленая. Мастацтва — гэта зусім іншае, — Улляна заблыталася ў сваіх развагах.

— *Йіншае*, — паўтарыў Ваня.

— *Крылька*, — падхапіла Улляна і вінавата ўсміхнулася.

— Вось мы і прыйшлі да размовы пра імпрэсіянізм і сімвалізм. Якіх у тваёй творчасці няма, — Ваня назіраў за рэакцыяй Улляны.

— Зараз мне здаецца, што я магла б напісаць верш для Антося, але навошта? Я болей не магу слухаць гэтыя сухія тэарэтычныя развагі. Для мяне сімвалізм... не, не так... каб напісаць сімвалічны верш, я павінна зламаць сябе і мой учэпіста-рэалістычны погляд на жыццё і свет... Я безумоўна паважаю Антося, але не буду рабіць такое злачынства дзеля яго...

— Гэта не твой профіль, — з лёгкай, няўлоўнай іроніяй пацвердзіў Ваня, — ты ў нас эксперт па лёгкаму чытву.

— Дарма смяешся! — Улляна ўхапілася за любімую тэму: — Мая самая найвялікшая мара — каб людзі чыталі мае творы ў метро. Менавіта такіх кніг мне самой не хапае ў беларускай літаратуры. Але я праблему не развязала. Для мяне нічога не змянілася, буду чакаць каго-небудзь лёгкага і павярхоўнага, сентыментальнага і чуллівага.

— Ніхто ў нас не будзе свядома пісаць дамскія раманы, — Ваня мусіў забіць Улляніну мару.

— А раптам хтосьці адважыцца? — Улляна заплюшчыла вочы. — Я разумею, дамскі раман пісаць цяжка. Калі адна пішаш. Вельмі лёгка пасадзіць мужыка ў пусты пакой, даць яму бутэльку і дазволіць разважаць пра сэнс жыцця. А паспрабуй распішы ўсе расстанні-каханні якойсьці несур'ёзнай асобы! Глядзі, каб пупок не вылез ад такіх намаганняў. Ведаеш, я ўзяла бульварны раманчык і палічыла,

колькі лістоў фармата А4 ён займае. Чатырыста-пяцьсот. Калі не больш. Я адна не напішу столькі. І яны, мабыць, таксама не напішуць. Удвух, утрох ці ўчатырох, напэўна, весела і лёгка пісаць. Ваня, давай напішам разам чароўнае глупства? Мы — людзі з няскончанай філалагічнай адукацыяй, дык і ўставім туды цытаты з Антосевага канспекту і яшчэ публіку будзем адукоўваць.

— Шукаеш рабоў пад гатовы праект? — не згадзіўся Ваня.

— Рабоў? Не, гэта занадта. Калі б мы з табой паставілі зараз дыктафон і ўсю размову запісалі, то маглі б пасля ўціснуць яе ў раманчык. Танна і карысна! Ваня, — Улляна прысунулася бліжэй да хлопца, — я магла б з табой суткамі размаўляць!

— Узаемна, — выціснуў з сябе Ваня.

— А яшчэ я хачу напісаць твор і адразу рэцэнзію на яго, і каб рэцэнзія была ўтрая большая за сам твор. Ці... можна ў самім творы спасылкі... каментары... Гэта ж будзе... ну, шыкоўна... Як табе? — Улляна пацягнулася за ўхваленнем.

— Позна, — лаканічна адказаў Ваня.

— Што позна? — не зразумела Улляна.

— Ідэя ўжо з барадой, Улляна, ты пішаш, але не чытаеш чужое, і гэта дрэнна. Я, вядома ж, не ўспомню ўсе прозвішчы, але ... Каментары, кажаш... Каментары Харужага да «Уліса» Джойса выглядаюць як самастойны твор. Гэта для пачатку... Вось з беларускіх не ведаю... З рускіх пісьменнікаў... Галкоўскі з «Бясконцым тупіком». Сотні каментароў да зыходнага тэксту... А сам тэкст ён выкінуў, бо той стаў непатрэбны... Яўгеній Папоў «Сапраўдная гісторыя «Зялёных музыкантаў»... І нарэшце швед Петэр Карнель «Шляхі да раю. Каментары да згубленага рукапісу». Безліч каментароў да неіснуючага тэксту. І чытаць іх можна ў любым парадку, бо нелінейны характар твора... Як у «Хазарскім слоўніку» Павіча... — лёгка выцягваў з памяці Ваня.

— Адкуль ты пра ўсё гэта ведаеш? — Улляна была ўражана.

— Сашка Тарасевіч дыпломную піша, міжволі набярэшся, — раскрыў таямніцу Ваня.

— Дык ты, можа, усё гэта чытаў? — усё яшчэ ў захапленні спытала Уля.

— Што чытаў, што ў руках трымаў, па-рознаму... — не прызнаўся Ваня.

— А з беларускіх нікога няма? Дык я буду! — не засмуцілася дзяўчына.

— Спачатку навучыся пісаць традыцыйна, каб пасля было чым абараняцца. Маўляў, умею пісаць па-ўсялякаму. І ўсё ж, мне здаецца, што ранавата для нас уся гэтая нелінейнасць. Нават я не магу прызвычаіцца і Міларада Павіча чытаю, як надрукавана. А пасля толькі спрабую чытаць у адваротным кірунку і гляджу, ці не распадзецца сюжэт... Гэта ўсё цікава, але... У кожным разе, глядзі сама, Уля, — відаць было, што сам Ваня з задавальненнем пачытаў бы такі яе твор, але быў неўпэўнены, ці ўхваляць гэтую спробу іншыя.

— А каго баяцца? Міхась Пятровіч абатрэ пот з ілба, ліхаманкава пагартае старонкі, але са спецсемінара не пагоніць, так? Астатніх жа я не ведаю! — жэстыкулюючы і спяшаючыся выкласці свае думкі, Улляна выглядала трохі смешна.

— Пачакай крыху, Уллянка, а то гракнешся на пустым месцы. Трэба спачатку імя зрабіць, аўтарытэцік такі-сякі, падтрымачка, а пасля хоць рэвалюцыю рабі, — клапатліва падказваў Ваня.

— А пасля мне будзе сорак год, муж, дзеці, сабака... Мне не тое што рэвалюцыі, эвалюцыі не захочацца. Дайце спакойна дажыць... А пакуль у мяне ёсць жаданне і сілы, я павінна пісаць, — Улляну апанавала вера ва ўласную запатрабаванасць.

— Пакуль ёсць сілы графаманіць па пяць старонак у дзень. Пакуль ёсць жаданне ўтрапёна гаварыць пра сваю ролю ў гісторыі літаратуры... З ча-

сам ачмурэнне нейтралізуецца побытам і штодзёнымі клопатамі. І гэта ўжо будзе не Ульяна, — Ваня паглядзеў на Улю з такім замілаваннем, такой закаханасцю, што яна скурай адчула сваю непаўторнасць.

— Ну, мяне нават побыт не сапсуе, — ганарліва прамовіла яна.

— Гэта ты сапсуеш любы побыт і атруціш жыццё любому мужу, — не вытрымаў Ваня такой дэманстрацыі маніі велічы.

— Я выхавана так, каб ашчасліваць любога мужа. Так што без наездаў! І наконт каментароў... Можна ж узяць нашу п'еску для тэатрыка абсурду і дапісаць каментары, — жартам прапанавала Ульяна. — Вось ты ў нас у п'есе асоба другога плана, і як толькі ты там з'яўляешся, мы робім спасылачку, дзе на сем старонак расказваем, як ты не прыйшоў на сустрэчу са мной. Там, дзе ёсць Антось, зноў спасылачка і ўстаўляецца гісторыя з вершам... сімвалічным. Там, дзе храп, спасылка пра шкоднасць храпу. Спадзяюся, ты за мной запісваў, бо я яшчэ раз усё гэта не паўтару.

— Сачыняеш ты хутка. Віртуоз імправізацый! А літаратура, Уля, гэта праца з потам і крывёй. Гэта боязь чыстага ліста. Гэта страх напісаць горш за папярэднія свае творы, — Ваня гаварыў ментарскім тонам агульнавядомыя рэчы.

— Ваня, я не пішу, я вяжу карункі, я пляту павуцінне, дзе нічога нельга змяніць, — запярэчыла дзяўчына, — у мае дыялогі немагчыма дапісаць ніводную фразу, бо яна адразу будзе лішняй. Я чапляю сказ за сказ. І я не баюся чыстага ліста. Я пішу адразу на камп'ютэры, і ўвесь час гляджу, а колькі ж засталося да канца старонкі. І мне няма чаго баяцца напісаць горшы твор, бо я яшчэ амаль нічога не напісала, — Ульяна лёгка перайшла ад маніі велічы да комплексу непаўнацэннасці. — Гэта хвароба лаўрэатаў розных прэмій, а мая творчасць увогуле ... нефарматны і некандыцыйны тавар... Для мяне не будзе прэмій, так што я магу спаць спакойна!

— Можа, табе лепш пісаць ад рукі? А то ў цябе пальцы блямкаюць па клавіятуры хутчэй, чым думкі ў галаву прыходзяць. А пасля маркоцішся, што твае творы як паветраныя палацы... у тым сэнсе, што паветраныя, — іранізаваў Ваня.

— Ёсць тры спосабы пісання: ад рукі, на машынцы і на камп'ютэры. Ад рукі... ты можаш змяняць толькі што напісанае, але знешні выгляд не для чужых вачэй... На машынцы — чыста і разборліва, але нельга змяніць нешта адразу, трэба выцягнуць ліст і ад рукі дапісаць... А камп'ютэр! Чыста і адразу ўсё выправіць можна! Самы лепшы варыянт! — зацята абаранялася Ульяна.

— Але любы твор можа ні за што загінуць у нетрах камп'ютэра. І ўсё ж пішы хоць зрэдку ад рукі, як кажуць, на трактар спадзявайся, а каня не прадавай, — Ваня верыў, што ягонае слова нечага варта для Ульяны.

— Ты мяне ўжо са сваімі парадамі... Звернемся лепей да тваіх твораў. Ох, я табе навышукваю, — Ульяна пацёрла рукі. — Ваня, ты ж сам не з вёскі, так?

Ваня кіўнуў і ўмомант занепакоіўся.

— А вось у цябе апавяданне пра вёску. І герояў завуць Мануйла і Гурэй. Хлопцам дваццаць год! Ты свайго сына так назавеш? Мануйла! А дзеўка Палута! Імя нічога, але ж... Ты хоць адну дзяўчыну з такім імем ведаеш? — адкрыта насміхалася Ульяна.

— Гэта ўсё несур'ёзна! Калі хочаш, імя можна змяніць! — Ваня паблажліва слухаў яе заўвагі.

— А я, напрыклад, не магу змяняць імёны героям, яны ж як людзі! Дакладней, яны і ёсць людзі! І праблема насамрэч не ў імёнах, а ў тым, што ты імкнешся быць такім беларусам-язычнікам, якіх ужо і не засталося. Дзякуй Богу! Мануйла! — зноў паўтарыла Ульяна. — А што такое *гуртажытак*?

— Інтэрнат, — здзівіўся Ваня на такое простае пытанне. — Нармальнае беларускае слова. Жыць

гуртам! Во, я ўспомніў яшчэ адну заўвагу да твайго апавядання «Стогны моцнага мужчыны». Ты ўжываеш там слова *шырынка*. У беларускай мове яно з'явілася пад уплывам рускай, па-беларуску лепш сказаць прарэх, прарэха ці крэсла!

— Немагчыма! — не пагадзілася Улляна, — які жах! Выбачай, але паглядзі на свае джынсы. Гэта ў цябе прарэха? Прарэха — гэта ж дзірка!

— Па сутнасці, гэта і ёсць дзірка, але з «маланкай», — разважыў Ваня.

— Ніколі не пагаджуся! А крэсла! Крэсла — гэта ў штанах-галіфэ! Гэтакая скураная ўстаўка між ног, каб не працёрлася, калі на кані сядзець! — выбухала эмоцыямі Улляна. — Трэба адшукаць нейкае слова, яно ж ёсць, буду шукаць, жыцця не пашкадую! — засмяялася Уля. — А ў цябе тут нейкі маршалак! Ну, раней маршалкі былі, а зараз хто маршалак?

— Тамада! — Ваня падзівіўся нездагадлівасці Улляны.

— У мяне ёсць унікальная па свайму значэнню магчымасць спытаць гэта ў цябе самога, а што рабіць тваім чытачам? Пісаць лісты? — абуралася Улляна за чытачоў. — Ты ж мог дзе-небудзь растлумачыць натуральна і цішком, каб ніхто не здагадаўся, што гэта тлумачэнне.

— Я што, кожнае слова павінен тлумачыць? — завёўся Ваня.

— Кожнае не трэба, досыць цераз адно, — Улляна злавіла Ванеў незадаволены позірк. — Ну, сюжэты традыцыйныя, тут не падкапаешся. Такое адчуванне, што табе сто гадоў і ты вось пішаш. Куды ты схаваў сваю маладосць? Ты ж такі жартаўнік, пасля многіх тваіх рэплік ад смеху перахоплівае ўнутры і няма чым дыхаць! Я не ўбачыла гэта ў творах! Дык дзе ты сапраўдны: у апавяданні ці ў кампаніі? Ты не павінен раздвойвацца!

— Улічу, выпраўлюся! — Вані было прыемна, што ягоны талент забаўніка высока ацэнены такім жорсткім крытыкам, як Улляна.

— І вось ты паспрабаваў пісаць інтымную сцэну, — сказала Уля шэптам і азірнулася, ці не слухае хто іх размову.

Мужчына, што задышліва чытаў кнігу, ніяк не рэагаваў на несупынны шэпт, астатнія сядзелі досыць далёка ад іх.

— Твае героі — распуснікі, але я думаю, што ім трэба даць медалі за пакуты, — Улляна адшукала ў тэксце апісанне інтымнай сцэны.

— За што медалі? За якія пакуты? — Ваня адчуў прыхаваны здзек.

— За секс на стале! — загучна прашаптала Улляна, і нейкая жанчына перастала шапацець газетай і прыслухалася. — Ваня, гэта ж нязручна і нават балюча!

— Адкуль ты ведаеш? — Ваня раўніва зірнуў на Улляну.

— Я нядаўна сядзела на падлозе, і раптам захацелася легчы, і я паспрабавала расцягнуцца дыванком. На секунду, бо нават проста ляжаць на цвёрдым балюча. А ўяві, як на стале! — горача шаптала Уля.

— Гэта зноў твая тэорыя «Як напісаць, не ведаючы»? Як і пра аблізванне? — Твар хлопца пайшоў пунцовымі плямамі.

— Ну, вядома ж, бо ўсё ведаць немагчыма. Але ўявіць сітуацыю заўсёды можна. Стол у цябе невялікі, значыць, ногі будуць звісаць. Яны цягнуць уніз, і цела ненатуральна выгінаецца, у гэтым мала прыемнага. Тут і без хлопца напакутуешся, — разважала дзяўчына.

— Уля, усё няправільна. Ты разлічваеш на свой рост. А такіх доўгіх дзяўчат мала. Мая гераіня невысокая, — знайшоўся Ваня.

— Ты можаш яе ўяўляць хоць высокай, хоць малой, але пакуль гэта нідзе не занатавана, я не веру тваім уяўленням, а маю свае, — Улляна лёгка запярэчыла і дадала з задаволенасцю міліцыянера, які злавіў злачынцу. — Дапішы таксама, што яна гімнастка, бо так, як ты апісаў... Ну як тут магла апынуцца яе нага, — Уля ткнула пальцам у сказ. — А як сюды дацягнулася яе рука? У яе рукі, як у арангутанга? Я табе зараз намалюю, што ў цябе атрымалася, — яна вырвала са сшытка ліст і накідала алоўкам Ваневых герояў.

— Ну, праўда, — быў вымушаны пагадзіцца Ваня, — я не заўважыў.

— Таму што ты пачаў пісаць адразу нейкія вычварэнні. А досведу ў напісанні такіх сцэн няма. Напісаў бы, як Мануйла куляўся з Палутай у стозе сена. І ніякіх праблем, — Улляна склала рукі на каленях.

Мужчына, што дыхаў цяжка і гучна, прагна зацягваў паветра і выціскаў яго з сябе. Ён нізка схіляўся над кнігай, узіраючыся ў шчыльныя радкі.

— Калі б я не бачыла, што ён адзін, падумала б, што з жанчынай, — зусім ціха вымавіла Улляна. — Можа, дзеўка якая нябачная, га?

Мужчына ўзяў адну з кніг, другую пакінуў разгорнутай і мітусліва пабег, відаць, рабіць ксеракопію. Улляна ўстала і, не азіраючыся на людзей, падышла да дзядзькавага стала, як да свайго месца, і зазірнула ў кнігу.

Ваня кідаў заклапочаныя позіркі на наведвальнікаў бібліятэкі, якія не заўважалі недарэчнасці сітуацыі. Хлопцу было чамусьці сорамна. Улляне хапіла смеласці нават пагартаць кнігу туды-сюды. Ваня азірнуўся на дзверы, праз якія павінен быў вярнуцца тэмпераментны дзядзька. Улляна не спяшалася адыходзіць ад стала, яна прагледзела назвы кніг, што былі стосікам складзеныя каля вялізнага сшыт-

ка, і падалася ўжо да Вані, калі дзядзька забег у залу, абдымаючы кнігу і лісты ксеракопій.

Улляна села побач з Ванем і цёпла падзьмула на вуха вымаўленымі словамі:

— Так узбуджальна дзейнічае! Армія Краёва, 1939 год. Ён гісторык, Ваня. Ой, мы на лекцыю спазняемся! — Уля выпадкова паглядзела на гадзіннік і пачала паспешліва збіраць рэчы.

## 20

Міхась Пятровіч выцер лоб і пачаў лекцыю. Ён марна спадзяваўся, што студэнты не заўважаюць, як ягоная галава пакрываецца непрыемнай вільгаццю, як кроплі поту насычаюць валасы і мкнуцца сцячы па сківіцы. Сонечнае святло ўрывалася праз акно і асвятляла профіль выкладчыка са спатнелым ілбом і скроняй. Але талент не здароўе, з узростам яго не меншае, таму гэтая лекцыя, як і іншыя, заварожвала.

Улляна, якая, сгорбіўшыся, пісала канспект, раптам выпрасталася і сціснула рукой рот. Машка заклапочана спытала:

— Табе блага?

У адказ Улляна моўчкі хітнула галавой. «Не трэба было есці гэты чортавы торт», — падумала дзяўчына, а Машка вінавата апусціла галаву. На перапынку Ваня ў гонар свайго дня нараджэння прынёс маленькі торцік. Ён ведаў, што Уля да яго ў інтэрнат не прыйдзе, бо... Ай, у яе заўжды шмат адгаворак, то далёка жыве, то не п’е, то не хоча бачыць ягоных сяброў, якія не ведаюць меры... Менавіта таму торт быў прынесены ва універсітэт, дзе ўсе гэтыя прычыны адпадалі самі сабой. Улляна глянула на тлусты слой крэму і, хоць было вельмі няёмка, паспрабавала зноў адмовіцца, маўляў, пасля будзе млосна. Усе засмяяліся, бо ніхто не паверыў, што Улляна не любіць салодкага. Ваня разгублена трымаў кавалак торта на папяровай сурвэтцы, Пашка

недаверліва разглядаў Улю, а Машка ўшчыкнула яе за бок і падміргнула, і Ульяна мужна з'ела кавалачак. Але зараз змест лекцыі адступаў перад тым танга, што адбывалася ў страўніку.

Машка паслужліва прапанавала:

— Можа, табе лепш выйсці? Хочаш, я правяду?

Ульяна знакам адмовілася, перачакала крыху, падхапілася — добра, што сядзела з краю — і выбегла з аўдыторыі. Лілька адразу перадала запіску Машы, каб высветліць падрабязнасці. А Пашка нясціпла рагатнуў і крыкнуў Вані на ўсю аўдыторыю:

— Віншую, Гусь! На хрэсьбіны паклічаш?

Ванеў твар пайшоў плямамі, хлопец апусціў галаву, але і на галёрцы немагчыма было схавацца ад пранізлівага позірку Міхася Пятровіча. Маршчыністай рукой з доўгімі пальцамі выкладчык правёў па валасах, але лоб зноў узмакрэў. Вечарам ён доўга сядзеў у старым фатэлі з газетай у руках...

У маладосці Міхась Пятровіч ніколі не марыў пра дзяцей, ён нават баяўся, што якая-небудзь з ягоных жанчын прынясе ў яго кватэру белы канверт, перавязаны ружовай альбо блакітнай стужкай, і аднойчы зразумеў, што позна ўжо, што ў старасці яго будуць атачаць паліцы, застаўленыя шматлікімі выданнямі ягоных кніг. І ён ужо не памятаў, што сам адмовіўся ад гэткага шчасця, калі Ірына зацяжарыла. Ён быў упэўнены, што дваццаць год розніцы — важкая прычына для разрыву, каб не ламаць лёс ні сабе, ні гэтай легкадумнай студэнтцы, а калі ўжо ён, сталы мужчына, не наважыўся мець дзіця, то і нейкая студэнтка не асмеліцца падпарадкавацца свайму мацярынскаму інстынкту.

«Божа мой, няўжо ўсё паўтараецца!!! Мая дачка! Мая! І гэты Ваня!» — трывожна круцілася ў галаве. Ён яшчэ не прывык да ролі бацькі, а тут можа і дзедам стаць. Яна народзіць! Міхась Пятровіч раптам зразумеў, што ён нічога не можа змяніць ці па-

раіць дачцэ ды Ірыне. Ён проста не мае права ўмешвацца ў жыццё дарагога яму чалавека. Вось яна, неадольная дыстанцыя! Каляда не мог вінаваціць Ірыну ў тым, што яна недагледзела дачку.

Гэта ён сам яе недагледзеў. Міхась Пятровіч успомніў, што аднойчы бачыў Улляну і Ваню ў двухсэнсоўнай сітуацыі. Уля, відаць, забрала Ванеў канспект, і хлопец круціўся вакол яе, намагаючыся адабраць. Нахабніца завяла рукі за спіну, а Ваня, цягнучыся за сшыткам, абняў яе. Яны застылі, Улляна крыху павярнула галаву набок, і немагчыма было яе не пацалаваць, і Ваня памкнуўся да яе вуснаў. Міхась Пятровіч ішоў да іх як заварожаны і бачыў, што літаральна ў міліметры ад яе вуснаў Ваня спыніўся, недаверліва ўсміхнуўся і выняў канспект з Уліных млявых рук. Міхась Пятровіч ніяк не мог паверыць, што гэты няўпэўнены ў сабе хлопец зрабіў яго дзедам.

На сямейнай нарадзе ён быў бы лішнім, і Каляда, відаць, здаўся б на волю лёсу, калі б не адно здарэнне. На наступны спецсемінар Улляна прыйшла без Вані. Яна папярэдзіла, што яны будуць наведваць заняткі па чарзе, каб не сустракацца. Міхась Пятровіч дакрануўся да ўзмакрэлага лба.

Уллянін твар быў незвычайна белы, рысы твару расплывістыя, як бы хто намаляваў бездакорны малюнак, які хутка абрыдзеў, і ў нервовым прыпадку аўтар паспрабаваў сцерці вочы, нос, вусны...

Улляна зусім не слухала выкладчыка, так хацелася спаць, што ўсё вакол плыло, і гукі гучалі амаль што рэхам. Не трэба больш пісаць па начах... Усё так заблытана... Яна піша ноччу, бо піша пра Ваню. Як можна было так недарэчна пасварыцца! Зараз яна можа апісваць сардэчныя пакуты з уласнага досведу. Бясконцыя думкі, мары і трызненні... Ён жа ніколі, ніколі не падыдзе першым! Ён будзе пакутаваць, ягонае сэрца будзе сціскацца, калі ён

будзе бачыць Улляну, ён будзе пільна сачыць за кожным яе крокам, але ніколі не здыме маску абыякавасці. Ён так баіцца, каб з яго не насмяяліся, што гатовы аддаць сябе на вечныя пакуты. Ён так баіцца, што Улляна выпадкова словам ці позіркам зняважыць яго... Лілька пачала да Вані заляцацца і папрасіла пры ўсіх ва Улляны дазволу. Улляна смехам згадзілася, а Ваня ўскіпеў. Ён схапіў яе за руку і адцягнуў убок. Намагаючыся не крычаць, ён выдушыў з сябе:

— Хочаш, каб я з ёй быў? Для цябе — усё, што заўгодна!

— Я не разумею, чаму ты крыўдуеш? — прашаптала Уля, азірнуўшыся на прыціхлую кампанію. — Ваня, мы жартуем! Ніхто не можа цябе, ці мяне, ці таго ж Пашку некаму аддаць! — гаварыла Улляна і бачыла, што Ваня не супакойваецца, а наадварот, кожнае слова яе апраўдання робіць Улю яшчэ больш вінаватай. — Пачакай, а між намі нешта было? Даруй, я не заўважыла! Ты мяне кахаеш? Ці я цябе кахаю? — Улляна разумела, што нельга так гаварыць, але ўжо не магла стрымацца.

— Думаеш, ты такая адна? Ды я толькі свісну — паўфілфака ў чаргу пашнуруецца! — Ваня кінуў на Улляну зневажальны позірк.

— Калі ты мяне да ложка не давёў, то моцна сумняюся, што паўфілфака давядзеш! Хуткасць і сексапільнасць — гэта не пра цябе!

Яны разумелі, што нагаварылі адно аднаму рознага глупства, што ўсё няпраўда і што яны кахаюць па-сапраўднаму. Але як можна дараваць такія, хай сабе і хлуслівыя, словы? Няўжо можна яшчэ нешта аднавіць? Улляна штоночы ўспаміналa, як ён не прыйшоў на сустрэчу, як ён... Што ён мітуслівы, наіўны, няўпэўнены да самаўпэўненасці, як ён залежыць ад меркаванняў Пашкі... Яна прымушала сябе верыць у тое, што ён дрэнны і слабы, што яна

ва ўсім лепшая за яго... Ну няўжо можна такога кахаць! Ну чаму немагчыма вытруціць з сябе гэтае непатрэбнае каханне, якое звязвае, не дае дыхаць вольна?

...Ваня стагнаў у сне, але ніхто з хлопцаў яму пра гэта не гаварыў, бо нарэшце яны зразумелі, што найдрабнейшая недалікатнасць можа ўсё парушыць. Што менавіта парушыць, ніхто не ведаў, але ўсе міжволі хваляваліся.

Эгаістка, чортава эгаістка, пыхлівая, індычка надзьмутая... Яна геній?.. графаманка недабітая... Да ложку яе не давёў... давядзеш такую... А ноччу снілася, як Улляна падыходзіць да Ваневага ложка, адхінае коўдру і садзіцца на край. Яе пальцы пяшчотна дакранаюцца да Ваневых валасоў і пераходзяць на пароcлае свежым шчаціннем падбароддзе. Яна схіляецца і лёгенька — не, не цалуе — толькі прытуляецца да ягоных вуснаў. І Ваня прачынаўся ад таго, што падымаўся насустрач гэтаму прывіднаму пацалунку і зграбаў коўдру ў абдымках, якія прызначаліся Улляне. Кожны дзень ён угаворваў сябе, што яна нявартая нават сяброўства, а яна ўпарта штоночы прыходзіла ў снах.

І памірыцца ўжо немагчыма. Не засталося ніводнай агульнай тэмы. Усе творы абмеркаваныя, а калі трэба перапісаць канспект, Лілька прапаноўвае свой, усё, пра што можна было б спытаць ва Улляны, можна спытаць і ў іншых. А калі падысці менавіта да яе, яна адразу зразумее, што ён саступіў, што ён прагне міру. І на спецсемінар зараз ходзяць паасобку, можна, вядома ж, прысунуцца без чаргі, але Улляна збяжыць, гэта дакладна.

Ваня перажываў ўсё ўнутры, нікому не спавядаючыся і ад усіх хаваючы сваё гора. Улляна ж пісала пра свае пакуты і пра свой невычэрпны боль. Бяссонныя ночы перад камп'ютэрам выціскалі ўсе фарбы з яе твару, сінечу пад вачыма ўжо ўбачылі ўсе.

Уля ліхаманкава аблізвала сухія вусны і не заўважала зменаў у люстэрку. А ў Міхася Пятровіча сэрца сціскалася ад думкі: «Гэта ж таксікоз!»

На наступны спецсемінар Ваня прынёс уступ і палову асноўнай часткі курсавой. Міхась Пятровіч зрабіў некалькі дробных заўваг, выслухаў далейшыя планы па напісанню работы. Але калі зазваніў званок і Ваня ўжо сабраў лісты і паклаў у папку, Міхась Пятровіч нечакана падышоў да дзвярэй кафедры і замкнуў на замок. Ваня здзіўлена азірнуўся.

... З кафедры ён выйшаў на «аўтапілоце», ціхенька прычыніў дзверы і пайшоў, амаль не паднімаючы ног, шархочучы па старым паркеце. «Гэта немагчыма!» — думка запоўніла ўсю свядомасць. Трымаючыся за парэнчы, Ваня спусціўся па сходах і адстаяў чаргу ў гардэроб. Ён абы-як насунуў паліто і, не зашпіліўшы яго, выйшаў з факультэта і накіраваўся да таксафона. А перад вачыма стаяў Каляда, які выціраў насоўкай недарэчную слязу. Вані й самому хацелася тады заплакаць, стрымлівала толькі прафесійнасць і падрыхтаванасць, якія адчуваліся ў аповедзе Міхася Пятровіча.

— Добры дзень, Улляну можна? — спытаў Ваня, выдыхнуўшы ў марознае паветра клубок пары, які адразу ж знік.

— Гэта я, — халодна адказала дзяўчына, відавочна пазнаўшы Ваню.

— Мне трэба з табой пагаварыць! — папрасіў Ваня, да болю прыціскаючы трубку да вуха.

— Зараз? — здзівілася Улляна. — Мне трэба да заўтра напісаць рэферат, заўтра і раскажаш, спадзяюся, твая размова ноч пратрывае? — сказала Улляна зусім не тое, што хацелася сказаць.

— Заўтра я магу і перадумаць! — Ваня паспрабаваў папужаць яе.

— Значыць, гэта не вельмі важна! — сказала Улляна і паклала трубку.

Яна адразу ж падняла яе, але, вядома ж, было позна. «Ідыётка, якая ідыётка!» — Улляна не стрымлівала слёзы, якія ўмомант пакаціліся ўніз, каб кропелькамі павіснуць на падбароддзі. «Ідыётка, якая ідыётка!» — падумаў Ваня і выцягнуў з заплечніка нататнік, дзе быў запісаны Улін адрас.

Улляна не столькі ўбачыла ў дзвярное «вочка», колькі адчула, што за дзярыма стаіць Ваня. Яна апранулася, крыкнула маме, што хутка будзе і выйшла з хлопцам да Свіслачы, якая цякла ля яе дома.

— Я павінен табе нешта сказаць, — было відаць, што Ваня не можа адшукаць патрэбных слоў.

— Я таксама хачу табе нешта сказаць.. прабач мне... я вельмі шкадую, што нагаварыла табе тады... — Улляна падняла вочы на Ваню, спадзеючыся ўбачыць такія ж моцныя пачуцці.

Ваня легкадумна адмахнуўся:

— Ды я не пра тое!

— Не пра тое? — расчаравана перапытала Улляна, — ээ-ээ... Я шкадую... але гэта ж праўда... У нас нейкія дзіцячыя пачуцці, давайма будзем сябрамі, гэта больш надзейна!

— Дзіцячыя пачуцці? — Ваня спыніўся і павярнуўся да Улляны. — У цябе што, клёпак у галаве бракуе? Я ж цябе кахаю, а ты проста не можаш... не ўмееш кахаць. Для цябе перажыванні як трэнажор! Ты ж пасля твор напішаш! А мо ўжо і пачала пісаць? А ты спачатку пра Антося напішы, ты ж вар'яцела ад аднаго яго позірку! Так ці не так?

— Ды каго б цікавіў той імпрэсіянізм, калі б не Антось яго выкладаў? — выбухнула Улляна. — Ты яму проста зайздросціш! Ты ніколі не станеш такім!

— А я і не імкнуся! — агрызнуўся Ваня. — Чаму там зайздросціць? Ну, вешаліся на яго нашы дзеўкі, а стане ў хуткім часе такім, як Каляда, і дзеўкі будуць на яго ўвагу звяртаць, толькі калі ён папросіць цераз дарогу яго перавесці. А маё ад мяне не ўцячэ!

— Па ўсіх праехаўся? І Каляду закрануў! І Антося! Паскуда ты, Ваня! Самая сапраўдная! — перайшла на лаянку Улляна. Яна разумела, што дзяўчына не павінна сварыцца такімі і больш моцнымі словамі, але тыя, хто пішуць розныя этыкеты, мабыць, жывуць у акварыумах і ім незнаёмыя моцныя пачуцці.

— Я паскуда? Гэта Каляда твой паскуда! — са смехам выгукнуў Ваня. — Каляду абараняеш? Малайчына, бацьку свайго абараняеш!

— Ён да нас з табой сапраўды, як бацька... а ты... — Улляна адчувала, што зараз расплачацца, і Ваня ўбачыць, якая яна слабая і безабаронная, а гэта якраз было непажадана.

— Не, памыляешся, гэта для цябе ён, як бацька! Ён мне сёння сказаў, што ён і ёсць твой бацька! — нарэшце Ваня паведаміў тое, што яму карцела сказаць.

Улляна аслупянела, потым павольна павярнулася і пайшла дадому. Ваня пабег следам. Ён паспрабаваў спыніць яе і схапіў за рукаў, дзяўчына тузанулася і каменным голасам папрасіла:

— Не чапай мяне, калі ласка!

— Уллянка, ну выслухай мяне. Ты можаш маўчаць, ды што хочаш рабі, толькі паслухай. Уля, ён думаў, што ты цяжарная, таму і расказаў мне ўсю гісторыю, каб прымусіць ажаніцца. Ён пералякаўся, калі мы пасварыліся. Ён так баяўся, што з табой здарыцца тое самае, што і з тваёй мамай. Ён казаў, што ён гад, і казаў, што страшэнна аба ўсім шкадуе, што калі б можна было вярнуць усе гэтыя гады... ну, сама разумееш...

Улляна стаяла адвярнуўшыся, але ўважліва слухала.

— Уллянка, ты ведаеш, чаму ён раскрытыкаваў твае творы? Пакуль ты была для яго проста студэнткай, ты магла пісаць, як табе заўгодна, хоць парну-

ху, хоць філасофскі раман. А калі ён даведаўся, што ты яго дачка... О, дачцэ Каляды не дазволена пісаць абы-як! Ты ведаеш, ён расказаў, што калі сябры і... іншыя пыталіся, чаму ён не жэніцца, чаму ў яго няма дзяцей, ён заўсёды адказваў, што прырода адпачывае на дзецях геніяў. А ён пісьменнік геніяльны і суперпапулярны ў савецкія часы! Нашто пладзіць графаманаў! Ён казаў, што і марыць не мог, што ў яго такая дачка, як ты! Улляна, ён плакаў! — выгукнуў Ваня і, пакуль Улляна не бачыць, сам змахнуў слязу. — Ён хацеў, каб ты даведалася, што ён твой бацька. Але ён баіцца твайго гневу, ён баяўся сам табе сказаць. Твая мама, відаць, не хацела, каб ты ведала. І ён расказаў мне... Мне так здалося... што ён нікому, акрамя мяне, не расказваў... Усё, вядома ж, гучала вельмі красамоўна... ён усё ж пісьменнік... Было відаць, што не раз і не два ён прагаворваў усё сам сабе... Улляна!

Уля павярнула да Вані заплаканы твар. Хлопец падышоў да яе і абняў. Улляна прытулілася галавой да Ваневай шчакі, ён пацалаваў яе ў скронь. Яна падняла твар, Ваня мацней сціснуў яе ў абдымках, пяшчотна пацалаваў і адчуў салёны-салёны смак яе вуснаў.

## 21

Улляна ляпнула дзвярыма і сцягнула шапку, наэлектрызаваныя валасы, што выбіліся з хваста, смешна закруціліся на скронях. Мама раззлавана крыкнула з кухні:

— Уля, я ж прасіла цябе прытрымліваць дзверы!

Улляна ў паліто села на скрыню для абутку. Мама выйшла ў вітальню і хацела насварыцца на дачку, але па яе выгляду зразумела, што нешта здарылася. Уля падняла на маму вочы:

— Ты павінна была мне сказаць, павінна!

— Што я павінна была табе сказаць? — мама на ўсялякі выпадак усміхнулася.

— Гэта праўда, што Каляда мой бацька? — зрываўся голас Ульяны, і мама зразумела, што далей утойвацца немагчыма.

— Вось ты пра што... — мама села побач з дачкой, але Уля падскочыла і стала насупраць.

— Значыць, праўда... — выдыхнула Ульяна. — Але чаму? Чаму ты не сказала праўду? Мне так трэба было ведаць, што мой бацька жывы! Што ён недзе ёсць! А калі ты так яго ненавідзела, нашто ты дазволіла мне чытаць яго кнігі і пайсці да яго ў спецсемінар? Ты ж ведала, што мы будзем побач... Як мне зараз глядзець яму ў вочы? Што змянілася б, калі б я ведала праўду? Мама! Нашто ты зрабіла такое са мной? — крычала Ульяна, аж на лбе напялася сіняя жылка.

— А што я магла табе сказаць? Што ён хацеў, каб я зрабіла аборт? Што ён нічога не хацеў пра нас ведаць? Што мы былі разам усяго тыдзень? Што... Уля, раней ці пазней ты пайшла б да яго, каб сказаць, што ты ёсць. У дзесяць год, у трынаццаць... розніцы няма... І каго ён убачыў бы? Даўгалыгую дзяўчынку, дзіця! — мама нервова скручвала Ульянін шалік. — Я хацела вас пазнаёміць... Я ведала, што змагу табой ганарыцца! Самая лепшая, самая таленавітая, самая разумная... Ён павінен быў адчуць, як шмат ён згубіў...

— Ён адчуў... і што зараз? Ганарышся мной? Самая разумная? О, не! Проста ў мяне мазгоў больш, чым жаночых гармонаў! Ты ўсё жыццё дзяўбла мяне, што я павінна быць лепшай! Я думала, што гэта трэба табе... Табе... не дзеля нейкай там аднаразовай помсты... — Ульяна не захацела глядзець на маму.

— Ты не можаш казаць мне такое! — не верыла мама. — Ульяна, я жыла тваім жыццём... Я заўсёды магла цябе зразумець, дык няўжо адзін раз... адзін раз... ты не можаш зразумець мяне? Я заўсёды цябе падтрымлівала... І зараз ты так лёгка ўсё

забыла? О, я не веру... Уллянка, — мама памкнулася, каб яе абняць.

— Не дакранайся да мяне! — Улляна схапіла шапку і выбегла з кватэры.

Мама абхапіла галаву абедзвюма рукамі і заплакала. Я зноў вінаватая, я заўсёды вінаватая... I ніхто, нават дачка, не хоча мяне зразумець... Усе бацькі хочуць, каб іх дзеці былі лепшымі, гэта натуральнае бацькоўскае жаданне, ну, магчыма, у мяне яно было крыху большым... Але не настолькі, каб атруціць жыццё Улі... Я чуйна шукала ў ёй талент, які-небудзь. Я ж не прымушала яе адначасова наведваць музычную школу і мастацкі ды спартыўны гурткі. Я чакала, я прыглядалася... I калі трэба, я скіравала і падтрымала яе... I зараз яна ляпае дзвярыма толькі таму, што ў яе ёсць бацька, якому ўсе гэтыя гады пляваць было на яе існаванне... Чароўная перспектыва... Гэта ён расказаў... Чаго яму трэба?

Разбудзі яе сярод ночы — Ірына адразу назвала б ягоны нумар, здавалася, ён уеўся ў яе памяць назаўжды. Але зараз яна няўпэўнена шаптала першыя дзве лічбы і ад хвалявання не магла ўспомніць астатнія. Ірына адшукала ва Улляніным нататніку тэлефон Каляды.

Міхась Пятровіч шчыра прызнаўся ў сваіх падазрэннях наконт Улінай цяжарнасці і расказаў пра мужчынскую размову з Ванем.

— Я не загадваў яму маўчаць. Ён усё адно расказаў бы ёй. Даруй мне, але я сапраўды перапужаўся за яе, — упэўнена і так па-бацькоўску гаварыў Міхась Пятровіч.

— Значыць, ты ўжо лезеш у нашы сямейныя праблемы? Ты з кожным яе хлопцам будзеш так размаўляць? Ты ў яе целаахоўнікі запісаўся? Калі ёй будзе трэба, я заўсёды дапамагу, і ты нам не патрэбны! — Ірына хацела пакрыўдзіць Міхася Пятровіча, хаце-

ла, каб ён на яе накрычаў, каб прыпомніць яму ўсе грахі, яна хацела на кім-небудзь спагнаць сваю шматгадовую злосць.

— У цябе быў цяжкі дзень. Я ўсё разумею і не хачу з табой сварыцца, Іра, я проста хачу стаць сапраўдным бацькам, калі я столькі прапусціў, — рацыянальна разважаў Каляда.

— Я што, хавала яе ад цябе? — выкрыкнула Ірына.

— Ты ўжо крычыш, пагаворым іншым разам, да пабачэння, — Міхась Пятровіч хацеў яшчэ перадаць прывітанне Ульяне, але пабаяўся Ірыны і паклаў трубку.

Ірына пачула надакучлівыя гудкі і раз'юшана скінула тэлефон з палічкі. Яна пайшла ў свой пакой і доўга плакала, шкадуючы сябе і дачку.

А першай гадзіне Ульяна вярнулася дадому пасля доўгага шпацыру. Мама чула, як дачка піла на кухні кампот, але з пакою не выйшла. Ульяна ціхенька зайшла да мамы, абняла яе і прашаптала: «Даруй мне, мама! Ты ў мяне самая лепшая... Я так цябе люблю!»

## 22

Ульяна стаяла перад дзвярыма кафедры, а Ваня лёгенька падпіхваў яе ў спіну. Дзяўчына раптоўна павярнулася і прашаптала сухімі вуснамі:

— Я баюся... Пайшлі разам.

— Ульянка, — Ваня прытуліў яе да сябе, — вам трэба пагаварыць сам-насам, а мяне ён дык і ўвогуле бачыць не захоча... ніколі... за тое, што я табе расказаў. Ульянка, трымайся, я цябе пачакаю... І...вазьмі маю залікоўку, каб мне да яго не хадзіць... Ды не бойся, ён сам баіцца... Ну, ідзі... — Ваня падштурхнуў яе да дзвярэй.

Міхась Пятровіч павітаўся першым, ён выпрабавальна глядзеў на дачку, бо не мог адразу, па вы-

гляду, зразумець яе стаўленне да яго. Улляна раптам падумала, што яшчэ можна ўсё вярнуць назад, што можна зрабіць выгляд, нібыта нічога не адбылося. Міхась Пятровіч сеў насупраць і хацеў — ды не ведаў як — пачаць апраўдальную прамову, а Улляна працягнула яму залікоўкі. Міхась Пятровіч ухапіўся за такую магчымасць ні пра што не гаварыць.

— І Вані пастаўце залік, ён сёння не змог прыйсці, — Улляна сказала гэта так, як магла сказаць і некалькі тыдняў таму.

— Я думаю, ён зараз баіцца трапляцца мне на вочы, так? — Міхась Пятровіч па-змоўніцку зірнуў на дачку.

— Ён не змог прыйсці і прычыны мне не тлумачыў, — Улляна ўпарта трымалася абранай ролі, бо не ведала, што яна можа сказаць Міхасю Пятровічу. Яна баялася, што ён папросіць называць яго татам, ну не зараз, але праз пэўны тэрмін... Яна не магла папракаць яго, бо для яе Міхась Пятровіч быў і застаўся найперш Міхасём Пятровічам. Выяўляць штучную радасць таксама не выпадала. Калі б у такую сітуацыю трапіла якая-небудзь яе сяброўка альбо калі б гэта была гераіня яе твора, Улляна лёгка прыдумала б для яе і словы, і дзеянні. А калі гэта датычыцца яе, то ад хвалявання нічога нельга прыдумаць.

Міхась Пятровіч як бы незнарок дакрануўся да ўзмакрэлага лба насоўкай:

— Улляна, наша жыццё настолькі ўнармаванае, што для кожнага выпадку, для кожнай сітуацыі існуе набор дзяжурных фраз. Агульныя словы пра надвор'е, пра заробкі, пра палітыку, пра спорт... Мы ведаем, што трэба казаць, калі мы вітаемся і развітваемся. Мы звычайна ведаем, што казаў у пэўнай сітуацыі герой фільма ці кнігі... Усё ўжо недзе было... А вось такое, што адбылося ў нас, я нідзе не бачыў... Дакладней, сітуацыя вельмі прыдатная для

фільмавых хэпі-эндаў, для шчаслівага канца. Але ж насамрэч гэта не канец, нам трэба жыць далей... І таму я не ведаю, што сказаць, каб не прыпадабніцца да гэткага рамантычнага бацькі з галівудскай меладрамы. Але стэрэатып цісне, і я баюся сказаць штосьці недарэчнае...

Улляна згоднаківала галавой, але на бацьку не глядзела.

— Уля, я не ведаю, ці даруеце вы мне калі-небудзь, а вось хто мне ніколі не даруе, дык гэта ваша мама. Я не напрошваюся ў бацькі, Уля, я мушу пагадзіцца, калі вы захочаце пакінуць усё, як ёсць, — раней Міхась Пятровіч мог выпадкова звяртацца да Улі на «ты», а зараз ягонае «вы» было падкрэслена ветлівае.

— Я таксама нічога не ведаю... У мяне няма жадання забіць вас, гэтаксама як і жадання кінуцца вам на шыю, — прамовіла дзяўчына.

Міхась Пятровіч знянацку падскочыў і падышоў да акна, ён рыхтаваў такую грунтоўную прамову, каб Улляна запярэчыла яму, каб прыняла, каб пашкадавала. А яна проста згадзілася.

— У мяне быў час паразважаць... Я ваша дачка толькі генетычна, і я думала, якой я была б, калі б была вашай дачкой і па выхаванню... Я расла б у вашым ценю, я зачытвалася б вашымі кнігамі, кнігамі свайго бацькі, у мяне не было б выбару. А так я захапілася вамі шчыра, я выбрала ваш спецсемінар свядома. Ці ведаеце вы, што такое расчароўвацца ў кумірах?

Міхась Пятровіч павярнуўся ад акна, але Уля не магла разгледзець ягонага твару, бо яе сляпіла сонца.

— Я не ведала вашага ценю. Я вырасла як бы на пустым месцы! — Улляна раптам успомніла Антося і выпадак з вершам. — У мяне ёсць такі прынцып: калі добры чалавек зрабіў мне нешта непрыемнае,

ён праз гэта не губляе сваіх вартасцяў. Раней вы мне падабаліся, і я не хачу вас зараз ненавідзець і не буду, — Улляна змаўчала, што і любіць яго таксама не хоча.

— Улляна, мы ўсе робім памылкі, але не ведаем, чым усё можа скончыцца. Я заўсёды шчыра верыў, што ў мяне ўсё наперадзе, і толькі ў шэсцьдзесят зразумеў, што ўсё ззаду. Я заўсёды думаў, што не дарма пражыў жыццё, бо на маіх кнігах выхоўваліся людзі, бо творамі я ўпісаў сваё імя ў лік беларускіх класікаў. Таму я змірыўся з тым, што гэта мая вяршыня, што імкнуцца да нечага іншага не выпадае. — Каляда раптоўна адчуў сябе зусім старым, непатрэбным, выкінутым на сметнік без права на рэстаўрацыю: — І я не разумею, за якія заслугі я атрымаў такое шчасце. Мне важна ведаць, што вы недзе ёсць. Што за гэты семестр я меў магчымасць бліжэй пазнаёміцца з вамі.

Улляна ўспомніла разбор яе твораў, размовы і спрэчкі з Ванем на спецсемінары. Яна заўсёды была шчырай і не думала, што ў Каляды двайная цікавасць да яе.

— Улляна, дай Бог вам ніколі не адчуць марнасці ўсяго зробленага вамі. А ў мяне такое было... Найжахлівейшае адчуванне, што я прайшоў міма самага важнага ў жыцці. У мяне няма сям'і, я так і пражыў бабылём, проста думаў, што для мужчыны ніколі не позна. І таму я кожны дзень пытаюся, за што гэтае шчасце? І я пачаў верыць у сваю місію, у наканаванасць. Значыць, да вашага таленту нехта там, на небе, захацеў далучыць мой досвед. І... і я вас раскрытыкаваў, Улляна. У сваіх заўвагах я чапляўся нават да дробязяў... І вы з гонарам вытрымалі іспыт, вы не кінулі пісаць... вы па-алімпійску раззлаваліся... гэта заўжды на карысць...

Улляне было не зусім прыемна гэта слухаць.

— Улляна, дома я глядзеў на свае кнігі, на свае творы... І думаў, а які ж з іх лепшы? І я зразумеў, —

Каляда падышоў да Улляны. Яна падняла галаву, каб было зручна глядзець на яго. — Уллянка, мае лепшыя творы — гэта вашыя лепшыя творы, мая лепшая кніга — гэта вашая кніга, тая, што некалі выйдзе, — ён гаварыў так усхвалявана, што Улляна адчула, як падпадае пад ўплыў яго эмоцый.

Улляна апусціла вочы ў сшытак. Каляда стаяў у яе за спінай, ён паклаў ёй руку на плячо, і дзяўчына сцялася, а па яе твары каціліся непаслухмяныя слёзы. Каляда асцярожна пацалаваў дачку ў макаўку, у гэты самы момант на парозе ўзнікла лабарантка, ад абурэння твар яе стаў бурачкова-абражаным, і яна падумала: «Ну, усё, трэба сказаць дэкану!»

## СМЕРЦЬ НА РОЛІКАХ

Ёсць сяброўкі, з якімі дзелішся сваімі радасцямі, каб яны задушыліся ад зайздрасці. Ці сама прыдумляеш нешта экстравагантнае, каб твая «лепшая» сяброўка адчула сваю нягегласць, няздатнасць і развіла ў сябе комплекс непаўнацэннасці, нават калі яна Міс Сусвету. Так сябравалі Алена Белазёрава і Ала Агалецкая.

Ёсць сяброўкі, з якімі дзелішся сваім патаемным, сваімі расчараваннямі, сяброўкі, якія ўмеюць выслухоўваць і спачуваць. Перад імі не трэба іграць ролі і прымерваць маскі, трэба проста заставацца сабой. Так сябравалі Алена Белазёрава і я. Не, я зусім не «камізэлька», каб у мяне плакацца. Але часам так трэба мець чалавека, які выслухае. Найчасцей і не патрэбна ніякая парада — толькі выслухайце. Людзі звярнуліся са сваімі споведзямі да царквы, а вось Алена не саромелася турбаваць мяне.

Дробныя праблемы яна перажывала ціха і самастойна. Але зрэдку тэлефанавала мне, каб проста паскардзіцца на жыццё, часам без аніякай канкрэтыкі. У дзеях, але без асобаў. Ды ў яе чарговае тэлефанаванне за рыданнямі не было чутно голасу. Загінула Ала Агалецкая. Лепшая сяброўка. Разам з ёю зніклі і двукоссі.

Ала ўсё жыццё стварала некаму праблемы і, хоць грэх так казаць, нават загінуць не змагла, каб не падкінуць клопату. Усё адбылося каля ўвахода на Цэнтральны рынак будматэрыялаў. Час, калі ўжо ніхто не працаваў, Ала выбрала для катання на роліках. Па версіі міліцыі яна спатыкнулася, упала і

ўдарылася галавой аб бардзюр. Ці то бардзюр быў такі моцны, ці то Аліна галава занадта слабой...

Ды не ў гэтым справа. Само месца было нейкае заклятае: то самым неверагодным чынам машыны сутыкнуцца, то грузавічок са шпалерамі перакуліцца, упрыгожыўшы вуліцу rasch'аўскім серпантынам, то стомлены кіроўца пераедзе дзядзьку з унітазам. І таму зусім недарэчнай і непрымальнай для міліцыі была версія грамадзянкі Белазёравай. Алена была ўпэўненая, што ніякая гэта не выпадковасць, а наўмыснае забойства. Бо хоць у Алы і былі ролікі, але яна на іх ніколі не каталася. Дакладней, праехала толькі адзін раз і ўпала адзін раз, але так, што з тыдзень ляжала ў ложку, потым усё па мануальных тэрапеўтах бегала, і тыя дактары ролікі ёй увогуле забаранілі. На думку Алены, Ала, якая так сачыла за сваёй знешнасцю і сваім здароўем, не магла рызыкаваць правесці жыццё ў інвалідным крэсле. Для Алы самым галоўным была яна сама.

Урэшце, можна было забыцца на сваю хворую спіну і катацца, нахіляючыся наперад, падаць у выпадку чаго на калені і рукі. Ды Ала была апранута ў белыя джынсы за 200$, у свае любімыя белыя джынсы, якія ёй так пасавалі і якія яна берагла на самыя важныя сустрэчы. Яна была без аніякіх наколеннікаў-налакотнікаў. Але самае галоўнае — яна так і не паспела навучыцца катацца на роліках і не змагла б самастойна прыехаць на іх да рынку па такой дрэннай дарозе. Яна хутчэй бы прыйшла туды ў сваім абутку і ўжо на месцы надзела б ролікі. Нідзе побач не была знойдзена торбачка з абуткам, хоць, праўда, яе белыя басаножкі на высачэзных абцасах зніклі з кватэры.

На думку Алены, яе сяброўка прыйшла на спатканне з некім, і гэты нехта яе забіў. Алена не ведала, пры чым тут ролікі, але адчувала, што смерць Алы Агалецкай не была выпадковай. А раптам ёй за нешта адпомсцілі і ўсё гэта неяк звязана з яе пра-

цай у фірме? А можа, небяспека падсцерагае і іншых яе калег? Алена не збіралася пакідаць гэтую справу на міліцыю, чые супрацоўнікі паведамілі, што праверылі ўсе версіі, і параілі чакаць, пакуль будуць знойдзены новыя факты. Алена не збіралася чакаць, таму яна патэлефанавала мне:

— Прыязджай хутчэй у Мінск, калі ласка. Я цябе вельмі прашу!

— Хочаш, каб я дапамагла табе знайсці забойцу?

— У цябе сапраўдны нюх на такія справы. Ніколі не забуду, як ты вылічыла тую, што крала на фізры нашыя грошы і пальчаткі. А памятаеш, як у мяне прапаў канспект, а ты знайшла, хто яго прыхватызаваў? У цябе Божы дар, а ў мяне няма такіх схільнасцяў. Да таго ж, у мяне шмат кліентаў, ды яшчэ кліенты Алы дадаліся...

— Дзе будзе жыць Шэрлак Холмс?

— Калі не баішся, то ў кватэры Алы. Думаю, што там зручней будзе ва ўсім разабрацца. І ты не будзеш залежаць ад майго графіка.

Ала працавала ў фірме «РамСервіс» (назва расшыфроўвалася як «Рамонтны сервіс»). Уладальнікам фірмы быў Сяргей Аляксандравіч Белазёраў, бацька Алены. Калі ён пачынаў свой бізнес, канкурэнтаў у яго амаль не было. А калі яны з'явіліся, «РамСервіс» стаў такім гігантам, што ніякія супернікі яго не хвалявалі.

Сяргей Аляксандравіч марыў пакінуць фірму дзецям. Але дачка Алена захапілася літаратурай і пайшла на філалагічны факультэт. Малога ж Дзімку цацкі, натуральна, цікавілі больш, чым бацькава фірма. Ды мара бацькі, разбітая, здавалася, на кавалкі, ажыла з попелу і цыгарэтнага дыму. Алена, патусаваўшыся па розных літаб'яднаннях і рэдакцыях, хутка пераканалася, што ёсць больш таленавітыя за яе людзі, а роля школьнай настаўніцы яе не прываблівала. І яна прыйшла ў «РамСервіс»,

прыцягнуўшы туды за кампанію лепшую сяброўку Алу і лепшага сябра Андрэя Вараховіча.

Філалагічная адукацыя ім прыдалася. «Валадары словам» маглі ўгаварыць кліента на што заўгодна. Яны распрацавалі новую канцэпцыю фірмы: супердарагія еўрарамонты і звыштанныя нееўрарамонты. Канкурэнты маглі адпачываць! Ала кіравала рэкламай і прасоўвала ў народ фразачкі тыпу: «Мы робім старыя кватэры новымі», ці «Хай суседзі паміраюць ад зайздрасці», або «Паглядзі на свой дом па-іншаму». А для занадта адукаваных прапаноўваўся «экспартны варыянт»: «We make your flat better». Нават пяцікласнік мог перакласці , што «Мы робім вашу кватэру лепшай».

Рэклама ў газетах мільгала ці не кожны дзень:

*Робім рамонт за тры тыдні*
*«Ніхто, толькі мы: Працуем без выхадных*
*Створым новы імідж вашага дома».*

І ўсё ж самай лепшай і дзейснай рэкламай была сама Ала, з яе кідкай знешнасцю і выключнай абыходлівасцю. Кожны мужчына, нават жанаты, не супраць таго, каб адчуць сябе сапраўдным прадстаўніком моцнага полу. У Алы не было таннага какецтва, яна магла зірнуць у вочы — і рабіць з кліентам што заўгодна. Алена расказвала пра адзін выпадак, калі ў офіс уварваўся раз'юшаны мужчына. Гэта быў дужа прыдзірлівы кліент, бо заўважыў, што ў прэйскуранце цэн паклейка шпалераў 2$ за метр квадратны, адкуль жа тады ўзялася 1000$ на непрадбачаныя расходы?! Ён са злосці ледзь не забіў сакратарку, і тут з'явілася Ала. Кліент шчэ крыху пасупраціўляўся, потым палагаднеў, а затым папрасіў, каб адказнай за рамонт была Ала. І па кожнаму, нават самаму дробязнаму, пытанню ён прыбягаў раіцца з Алай. Часам здавалася, што ён спецыяльна выдумляе праблемы, каб сустрэцца з ёй. Быў нават

выпадак, калі ягоная закаханасць дапамагла выратаваць гонар фірмы. Гэты вар'ят купіў для ванны ўвагнутую плітку. Нашыя майстры ніяк не маглі роўна прымайстраваць разетку. Па ўсіх правілах трэба было ледзь ці не ў плане распісаць, дзе будзе гэтая разетка і як размеркаваць плітку, каб усё было бездакорна. Зараз нашыя спецыялісты з такой вытанчанай пліткай не лапухнуцца, а тады толькі Ала нас і выратавала сваімі ўгаворамі.

Галоўная мэта любой рамонтнай фірмы — выцягнуць паболей грошай з кліента. І розніца між фірмамі ў тым, што адна ўсё ж робіць добры рамонт, другая — такі-сякі, а трэцяя — уцякае з авансам. Ала была інструментам па выцягванню грошай. Мужчыны не шкадавалі сваіх кашалькоў, абы толькі Ала ў іх не расчаравалася. Для тых, хто усё ж жмотнічаў, у яе быў прыхаваны «позірк зневажальны» і «позірк пагардлівы». Розніцу між імі ведала толькі Ала і тыя, хто іх атрымліваў. Так што бацька Алены не пашкадаваў, што ўзяў Алу: яна несла фірме залатыя яйкі.

А вось Андрэй Вараховіч быў хлопец як хлопец, калі не лічыць, што ўзялі яго сюды як патэнцыяльнага зяця. Праўда, на першым годзе вучобы на філфаку Андрэй заляцаўся да Алы. Хлопцы, як пчолы, злятаюцца на больш яркую кветку, але Андрэй хутка зарыентаваўся, што ў гэтай кветкі атрутны нектар. Да таго ж, Ала не мінчанка, а ў яе сяброўкі Алены, акрамя ўсіх яе вартасцяў, антэна сотавага тырчыць з кішэні заплечніка.

Мяне здзіўляла, як можна сябраваць, падзяліўшы хлопца. А ў гады студэнцтва яны былі як адно цэлае: разам уцякалі з лекцый, сядзелі ў чыталцы ці сталоўцы. Але ў рэшце рэшт маральныя пакуты Алы акупіліся добрай кар'ерай, нядрэннымі перспектывамі (якія, на жаль, ёй не спатрэбіліся) і вось гэтай кватэрай, якую я зараз аглядала.

Усё дыхала свежасцю і навізной нядаўняга рамонту. Шафы з сістэмай рассоўных дзвярэй. Рыча-

говыя краны ў ванным пакоі. Вокны-шклопакеты. Галагенавыя лямпачкі ў пластыкавай столі. Шоўкаграфія шпалераў. Дзе можа ўзяць 27-гадовая пані грошы на такі рамонт? І паркет у яе быў не ламінатны, а дубовы!

Цяжка, трапіўшы ў такую прыгажосць, у такую сучаснасць, не разгубіцца. Ну, не ўмею я карыстацца такім кранам! Гэта потым я зразумела, што рычажок падняць трэба. Але пытацца ў Алены я саромелася: навалілася на мяне нешта невымоўнае, невытлумачальнае. Я магу, канешне, спытаць, як і чым карыстацца, але гэта тое самае, як хтось з мінулага стагоддзя спытае ў мяне, як карыстацца унітазам. Вось нашто патрэбны тыя мігцелкі ў кутах пакояў? Потым я ўжо вылічыла, што яны рэагуюць на мае рухі, і спачатку падумала, што гэта якая-небудзь мініяцюрная відэакамера шчыруе. Таму першыя два дні пераапраналася ў ванным пакоі (там гэтых віжоў не было) альбо рухалася так павольна, каб гэтыя апараты «не заўважалі» мяне. Праз пэўны час я зразумела, што гэта толькі сенсары руху, але навошта яны, я так і не даўмелася.

Усё яшчэ дыхала прысутнасцю Алы: і пеньюар на спінцы стула, і кніжка з закладкай, і прыгожыя басаножкі на высокіх абцасах, якія мне закарцела прымерыць, але здавалася: зараз з’явіцца Ала і здзівіцца, што я прымерваю ейны абутак. Без прымхаў не абышлося. Як доўга я мучылася, перш чым заснула на яе ложку — стыльным і зручным ложку замежнай вытворчасці. Мэблю Ала вышуквала, відаць, у лепшых салонах. Спачатку мне падалося, што ложак — драўляны, але аказалася, што гэта метал «пад дрэва». Матрацы, як рамкай, былі абкружаныя металічнай прыступкай, на якую Ала дзеля павелічэння экзотыкі ставіла бакал са сваім, бачна, улюбёным іспанскім віном Ribera del Ruecas, бутэлька якраз стаяла на тумбачцы.

Ноч была вусцішная. Паркет вяртаў мне мае крокі рэзкімі, узрывальнымі гукамі. Здавалася, нехта ходзіць па кватэры. Ала? У вокны біўся вецер, бо дом стаяў на ўскрайку мікрараёна.

Нягледзячы на шклопакеты і металічныя дзверы, па кватэры гулялі скразнякі, мабыць, гэта яны прынеслі аднекуль пах цыгарэт. Мне ўжо не было чым дыхаць, я адчыніла акно — і цыгарэтамі пацягнула мацней. Напэўна, нехта курыў на калектыўным балконе альбо ў тамбуры, але ніякія рацыянальныя тлумачэнні не маглі вярнуць мне спакой. Раніцай я ледзь не памерла са страху: у замку нехта калупаўся. Я ўжо збіралася набраць 02, як пачула за дзвярыма голас Алены:

— Адчыні, гэта я. Па звычцы свае ключы дастала. Як можна так доўга спаць, ну скажы?

За сняданкам Алена расказвала:

— Яе забіў чалавек, які дрэнна яе ведаў, але ведаў настолькі, каб яна паспела яму сказаць, што ўмее катацца на роліках. Разумееш, у яе была ... слабасць ці... хвароба... як бы сказаць... Карацей, яна хлусіла ва ўсім. Я гэта не адразу зразумела, а пасля ўжо было позна, бо мы былі ўжо вельмі блізкімі сяброўкамі. Альбо быць з ёй, альбо адной. Немагчыма ж не сябраваць ні з кім. А потым я прывыкла. Чалавек да ўсяго прывыкае. Не, яна не хлусіла кліентам, дакладней, спадзяюся, што не хлусіла. Ведаеш, я шчэ хвалююся, каб яе гібель не была неяк звязана з нашай фірмай. Але ўвогуле, мне здаецца, яна сваімі прыдумкамі ўпрыгожвала сваё ўласнае жыццё. І нават мая прысутнасць не магла яе стрымаць. Мабыць, ёй нечага не хапала ў жыцці? Не ведаю.

О, гэта мне было знаёма яшчэ з універсітэцкіх часоў. Эх, Ала, Ала! Яна кожны дзень грала розныя ролі. І ўсё было б добра, калі б яна мела выключную памяць. А без гэтага штодзённыя змены амплуа проста смяшылі. То яна хвалілася, што ў яе дома пад-

вясная столь з галагенавымі лямпачкамі (яна была з маленечкага гарадка, дзе прыбіральня не на двары лічылася шыкам), і на падколку дзяўчат, ці паляпшае такая столь гукаізаляцыю, адказвала ўпэўнена: «Так!» Але калі на наступны дзень нехта пачаў скардзіцца, што чуваць кожнае слова суседзяў зверху, Ала адразу склала ладную гісторыю пра тое, як яе суседка перад сексам здымае бранзалеты, і чуваць, як яны коцяцца па падлозе. І рэха жарсці таксама чуваць. Ніхто, вядома ж, не здолеў бы расказаць больш пікантную гісторыю.

— Карацей, ты хочаш сказаць, што яна некаму нахлусіла, як яна часта і добра катаецца на роліках. І гэты «нехта» скарыстаў ілжывую інфармацыю?

— Так, таму гэта не блізкія сябры і не члены яе сям'і.

— Альбо нехта з іх скарыстаў яе хваравітую ілжывасць.

— Я не падумала нават пра такое! Ну, тады кола патэнцыяльных злачынцаў разрастаецца, але і канкрэтызуецца.

— А чаму ты ўвогуле думаеш, што ролікі на яе надзеў забойца? Калі яму ўжо так трэба было яе забіць, дастаткова проста пераехаць машынай. Мільёны людзей так гінуць. А можа, ён нешта хацеў гэтым сказаць? Ці нейкі маньяк. Які атрымоўвае асалоду ад казытання нерваў, бо трэба ж час, каб надзець ролікі. А без практыкі ўвогуле не насунеш. Хаця...пры чым тут практыка? Ведаеш, як робяць у кіношных дэтэктывах? Яны апрацоўваюць спачатку спадкаемцаў, потым калег, потым сяброў, а вінаваты заўсёды звязаны з любоўнай лініяй. Ты мяне разумееш? Ці быў у яе хлопец?

Алена чамусьці пачырванела, збянтэжылася і спалохана сказала:

— Не... не думаю... Хоць розных прыгод хапала...

— Пачакай, на дверцы шафы вісіць гальштук! — спыніла я яе.

— Ага, і ты таксама купілася?! Вось табе найсвяжэйшы прыклад таго, што яна вытварала з людзьмі. Гэты гальштук купляла я, ён такі ... блакітны, пад колер шпалераў. А ў ванным стаяць сродкі для галення і дзве зубныя шчоткі. Калі б яна была жывая, я ўпэўнена: яна прадэманстравала б і што-небудзь з мужчынскай адзежы ці бялізны. Гэта ж Ала!!! — з незразумелым захапленнем вымавіла Алена.

— Яна імітавала ў кватэры мужчынскую прысутнасць? — жахнулася я.

— Ну што ты дзівішся, незнаёмых гэта ўражвала, — з іранічнай усмешкай адказала Аленка.

— Незнаёмых? — канчаткова перапужалася я.

— Лепш сказаць: не блізкіх сяброў. Ёсць такія мужчыны, якіх больш цікавяць несвабодныя жанчыны. І Але падабаліся менавіта такія мужчыны. Яна была майстра кінуць «неасцярожны» афарызм. Кшталту: «У літаратуры мяне раздражняе тэорыя, а ў сэксе — практыка». Усе смяяліся, і толькі Андрэй крыўдзіўся, — з сумнай усмешкай распавяла Алена.

— А ён чаго? — асцярожна спытала я, памятаючы пра цесныя стасункі Алы і Андрэя ў студэнцкія гады.

— Не ведаю, можа, абурэнне за мужчын, а можа, у іх на першым курсе было што-небудзь. У інтэрнаце ж жылі, — сказала Алена з лёгкай крыўдай.

— Ой, не трэба толькі казаць, што ў інтэрнаце панавалі блуд і распуста, — зараз пакрыўдзілася ўжо я.

— Прабач, прабач, — спешна прамовіла Алена.

— Ну, тады пойдзем па накатаным і зашмальцаваным кінасцэнарыстамі раскладзе. Спадкаемцы! Якая ў яе была сям'я? — мне падалося, што пачынаю пераймаць інтанацыю сапраўдных дэтэктываў.

— Бацькі, сястра... Але яна з усімі пасварылася і ніколі іх не наведвала, як і яны яе. Падазраваць іх не мае сэнсу: яны атручвалі адно аднаму жыццё, але хто з нас не перашкаджае жыць крэўным, га? Няма і матэрыяльнага інтарэсу: яны жывуць дастаткова заможна, — Алена распавядала, гледзячы ў столь, нібы там было нешта напісана, як урок адказвала.

— Чым больш маеш, тым больш хочацца! — я прыпляла да месца чужы афарызм.

— Магчыма, твая праўда... Мог быць у іх ... не матыў, а так — праблема. Увогуле па гісторыі яе сям'і можна фільм здымаць. Шматсерыйны. І, на жаль, без happy end'а. Яе родны бацька — алкаголік. Прычым з маладосці. А маці была такая моцная і рызыкоўная жанчына, што, хоць цяжарная была, але кінула яго. І ўсё яшчэ цяжарная недзе надыбала свайго цяперашняга мужа, — Алена гаварыла з такім захапленнем, што маці Алы здавалася ледзь ці не гераіняй.

— Калі яна выглядала, як Ала, то нічога дзіўнага, — не ўтрымалася я, каб не згадаць пра Алкіну прыгажосць, ды Алена зрабіла выгляд, што не пачула.

— Такім чынам, Алу выхоўваў няродны бацька. Таму ў яе прозвішча, імя і імя па айчыму, а не па бацьку. Яшчэ ў яе ёсць сястра Таня, маладзейшая на год ці два. Ды яны ніколі асабліва не сябравалі. Больш таго, Ала адбіла ў яе хлопца. І не таму, што сама закахалася, а проста так, дзеля гульні. Адбіла, каб адбіць, дзеля жарту. Разбіла жыццё і хлопцу, і сястры, бо каханне там было, асабліва з Таццянінага боку. Я дакладна гэтую гісторыю не ведаю, выцягнула з Алы па кавалачках. Але мне здаецца, што яна разумела, што нарабіла, і раскайвалася.

— А ці не магла нянавісць успыхнуць з новай сілай? Ды і хлопец той, мабыць, не забыў нічога? —

я задала «дзіцячае» пытанне, адкуль жа Алена магла ведаць пра рэакцыю таго хлопца.

— Такія гісторыі здараюцца. Гэта жыццё, і забойства тут нічога не зменіць, — па-філасофску зазначыла Аленка.

— А калі б яна твайго Андрэя адбіла? — напэўна, занадта жорстка спытала я.

— Ты што, забылася, гэта я ў яе Андрэя адбіла. Ну, не глядзі так! Не адбівала, ён сам адбіўся. Калі б яна... Гэта была б сітуацыя, якая не залежыць ад мяне. Я паставілася б па-філасофску: не яна, дык іншая. Значыць, нешта не так было ў нашых адносінах, — Алена прамовіла гэта, і яе вочы неяк востра бліснулі.

— Ну, проста па нотах разыграла, — зазначыла я.

— Не ўсё так проста: калі жывеш побач з Алай, чакаеш гэтага кожны дзень. Ды калі б што і здарылася, я не стала б нікога забіваць, магчыма таму я лічу, што іншыя таксама не забілі б з-за кахання. А родная сястра дакладна б гэтага рабіць не стала. Адбыўся звычайны «разрыў дыпламатычных адносінаў». Маці стала на бок малодшай дачкі, айчым, канешне, таксама. Слухай, у мяне праз паўгадзіны кліент, хочаш, давай са мной?

Алена так упэўнена кіравала сваім джыпам, што здавалася: яны створаны адзін для аднаго. Прыгожы і дагледжаны джып «гранд-чэрокі» і ягоная гаспадыня, нельга сказаць, што прыгажуня! Але гэтаксама як у ейны джып былі ўкладзеныя ідэі і праца лепшых майстроў аўтамабільнай індустрыі, так і да Алены дакрануліся рукі лепшых касметолагаў, візажыстаў, цырульнікаў. Калі з Алены яны зрабілі цукерку, то можаце сабе ўявіць, якім незямным цудам выходзіла ад іх Ала.

Джып быў чорны, як жартавала Алена, для таго, каб пасаваць уладальніцы (заўсёды што-небудзь

з яе адзення ці абутку было чорным). Але летам у ім было так спякотна! І, напэўна, я не змагла схаваць свае думкі на гэты конт. Алена засмяялася:

— Памятаеш анекдот пра двух «новых» рускіх, якія парыліся ў машыне, удаючы, што там ёсць кандыцыянер? Дык мы з табой — «новыя» беларусы, а гэта лепей, чым «новыя» рускія, таму мы маем кан-ды-цы-я-нер!

Астатнюю частку дарогі я мужна пакутвала ад «фінскай зімы».

«Мы з табой — «новыя» беларусы. Мы з табой! Яна нават не адчула, якую недарэчнасць сказала. Яны з Алай былі «новымі» беларусамі. Яна жыве і не ведае, што недзе людзі могуць жыць горш, а могуць не жыць, а існаваць. Яна сказала так і адчувала так не таму, што дрэнная ці сапсаваная грашыма, не, яна — наіўная! Але як лёгка быць наіўнай, калі ты багатая. І на нейкі момант я ёй пазайздросціла, але толькі на нейкі момант. Абсалютна шчаслівых людзей не бывае. Усё залежыць ад таго, як чалавек ставіцца да жыцця: нехта мужна прымае жахлівыя ўдары лёсу, а нехта застрэліцца з-за няўдалай формы носа ці новай зморшчынкі.

Кожнае шчасце мае неад'емны дадатак — страх не ўтрымаць яго. Вось ёсць у Алены джып. Дык калі яны не разам, яна толькі і думае, ці яго не ўгналі, ці не папсавалі ад зайздрасці, ці колы цэлыя. Шчасце шчасцем, але ж клопату колькі: і тэхагляд прайсці, і на зіму шукаць нейкія новыя сродкі ад карозіі, не кажучы ўжо пра якаснае паліва і нейкае рэдкае машыннае масла.

— Алена, адкуль у Алы кватэра? — з цікавасцю спытала я.

— Падарунак фірмы. Калі бацька прыняў на працу мяне, Алу і Андрэя, то купіў двухпакаёўкі кожнаму з нас, — сціпла патлумачыла Алена, выварочваючы руль джыпа пад чарговым светлафорам.

— Ну тады я разумею, чаму Ала з табой не сварылася, — я паспрабавала пакпіць.

— Калі б яна са мной пасварылася, то кватэру б не адабралі. Іншая справа, калі б яна пакінула фірму, тады канешне... — сумна ўсміхнулася Алена.

— А яна, канешне, пакінула б фірму, калі б пасварылася з табой, ці не так? — сказала я з непрыхаванай іроніяй.

...Рамонт у кватэры блізіўся да завяршэння. Гаспадар паспрабаваў сварыцца з-за шчыліны пад дзвярыма, што вялі на кухню. Алена запісала скаргу ў нататнік і ўпэўнена пачала тлумачыць, як будзе выпраўлены дэфект:

— Знізу наб'юць планку такога ж колеру. Нават вы не заўважыце, дзе была праблема, не кажучы ўжо пра гасцей. Можа, ёсць якіясьці іншыя пытанні?

Злосці ў гаспадара паменела. Наколькі я зразумела, Алена ніколі не спрачалася з кліентамі, на яе немагчыма было пакрыўдзіцца, бо яна не давала падстаў для гэтага.

— Я чуў, нешта пераблыталі з праводкай. І ў спальні нельга будзе павесіць нармальную люстру на два выключальнікі? — ветліва спытаў гаспадар кватэры.

— Так, праблема сапраўды была, але ўсё ўжо выпраўлена. О, і бойлер павесілі, — Алена перавяла гаворку на прыемную тэму.

— Павесіць павесілі, але ім жа яшчэ і карыстацца трэба, а інструкцыя на англійскай, — ахвотна падтрымаў размову гаспадар.

— Дык у вас ёсць стымул вывучыць мову, — пажартавала Алена. — А калі сур'ёзна, то ўсё цяжка толькі на першы погляд. Калі адключаць гарачую ваду, перакрываеце вентыль гарачай вады, адкрываеце гэтыя два на самім бойлеры, ставіце патрэбную тэмпературу, але лепш на пазнаку «е», рэжым эканоміі, і вада награваецца, і энергіі няшмат спа-

жываецца. Можаце не запамінаць, мы вам зробім пераклад інструкцыі.

— Ну, дзякуй вам, Аленачка. Не прымушаеце на старасці тлуміць мазгі. Замежныя мовы — гэта для маладых. Вось сын мой дасканала па-англійску шпрэхае...

Я не хацела перашкаджаць такім «інтымным» адносінам і прайшлася па кватэры. Калі б не гэтыя сцены, было б добрае футбольнае поле. Кухня, сталовая і зала былі адным вялікім пакоем, рамонт, здаецца, завершаны, бо пачалі прывозіць мэблю. Крэсламі вылучылі залу, а кухню ад сталовай адмяжоўвала стойка бара. Відаць, гаспадары вельмі спяшаліся засяліцца. Колькасць пакояў не паддавалася пералічэнню, бо была зроблена перапланіроўка з улікам запатрабаванняў сям'і гаспадара: кожны з чатырох дзяцей жадаў мець асобны пакой і да кожнага такога пакойчыка зрабілі прыбіральню, яшчэ была зроблена саўна і адведзены пакой пад трэнажорную залу. А каб прыбраць у такой кватэры, трэба альбо мець некалькі жонак, альбо наняць пакаёўку.

Шпалераў не было, замест іх на ўсіх сценах было нейкае рэчыва кшталту пабелкі. Канешне, яно мела назву, але я не спецыяліст, каб ведаць такія дакладнасці, ды нават маё неспрактыкаванае вока заўважыла, што кожнае дакрананне да сцяны пакідае адбітак. Калі ягоныя дзеці арганізуюць вечарынку альбо проста паспрачаюцца між сабой з біццём талерак, то прыйдзецца рабіць новы рамонт. Але што зробіш, відаць, гэта мода. Як нашчадак савецкага пралетарыяту я не разумела сутнасці еўрарамонту, бо цяжка жыць у палацы, дзе вакол стэрыльная чысціня і салонная прыгажосць. Мне бачылася ва ўсім нязручнасць і чамусьці здавалася, што ў еўрарамонту няма душы.

— У еўрарамонту ёсць душа, калі яго крыху недарабіць, — смяялася Алена, калі мы ўжо зноў ся-

дзелі ў машыне. — Калісьці, яшчэ пры Але, быў цікавы выпадак. Да нас звярнуўся малады мужчына, якому зусім не трэба было рабіць рамонт у кватэры. Ён прасіў — ты будзеш смяяцца — паставіць налічнікі на ўваходныя дзверы. Кватэра належала ягонай нявесце, а рамонт рабіла нейкая шарашкіна кантора. Усё зрабілі добра, і заставаліся толькі гэтыя налічнікі, гаспадары ж, акрыленыя завяршэннем рамонту (лічы, год пакутвалі), выплацілі ўсе грошы. Рабочыя хуценька пакінулі кватэру, на составы іхняга кіраўніка нельга было дазваніцца. Бацька дзяўчыны сказаў, што ён нікога шукаць больш не будзе, хай гэтую дробязь выпраўляе будучы зяць. Не ведаю, ці паўплывалі бацькавы словы на дачку, але будучы зяць быў тэрмінова знойдзены. Разумны хлопец — звярнуўся да нас. Вясёлая была гісторыя. І вясельная, бо я з Андрэем была запрошана на іхняе вяселле ў якасці ганаровых гасцей. — І прабач, зараз яшчэ адзін кліент, на паўгадзінкі прыблізна.

У голых цагляных сценах пяціпакаёвай кватэры нас чакалі высокі мужчына з вільготнымі вуснамі і ягоная пазбаўленая права голасу жонка. Рамонт яшчэ не пачынаўся, трэба было спачатку скласці праект, вырашыць, якія сцены знесці, якія — узвесці. Кухня і гасцёўня былі адзіным пакоем — разумная прапанова архітэктараў, калі каму трэба — няхай падзеляць сцяной. З гэтага пытання Алена і пачала:

— Кухню будзем адасабляць?

— Мы думаем, што не, — адказаў мужчына, але было відаць, што меркаванне жонкі не ўлічвалася.

— Чаму? — наіўна запытала Алена, відаць, вырашыўшы дапамагчы няшчаснай жанчыне.

— Ну... — ён не ведаў, што адказаць. Сорамна прызнавацца, што бяжыш услед за модай. Але іншага адказу не было. Алена перахапіла ініцыятыву:

— Па-першае, гэта нязручна. Усе пахі ад смажанага і варанага будуць насычаць вашу мэблю. Зга-

дзіцеся, мала прыемнага, калі ад фатэля пахне кухняй, — Алена бесклапотна рассмяялася, за ёй — я і жонка. Кліент вымушаны быў падтрымаць агульны смех.

— Па-другое, — Алена паглядзела на мужчыну такім позіркам, нібы яна зараз паведаміць страшэнную таямніцу, — гэта ўжо не модна. Самі ведаеце, якая ў нас бюракратыя: калі было модна рабіць кухню і залу адным пакоем, — будавалі асобна, а зараз наадварот. І наша фірма існуе якраз для таго, каб зрабіць вашу кватэру максімальна сучаснай, — Алена паглядзела на гаспадара, — і камфортнай, — цяпер Алена зірнула на гаспадыню, якая была ў захапленні ад рэакцыі мужа на сціплую прамову Алены. Ён стаяў абяззброены, але задаволены сабой: здолеў з мноства фірм выбраць, здаецца, лепшую.

Пасля кароткіх інтэлігентных спрэчак усё было збольшага вырашана: тут сцену зруйнуюць, там падоўжаць, вокны бяруць гэтай фірмы, а дзверы — той і гэтак далей, да бясконцасці. Пад канец мужчына ўжо проста згаджаўся з усімі Аленчынымі прапановамі.

Можа, я, канешне, нечага не разумею, але па мне: атрымаў кватэру — клей шпалеры, а не выдумляй сабе лабірынтаў. Відаць, усе думкі былі напісаны на маім твары, бо Алена, не адрываючы позірку ад дарогі, запытальна матлянула галавой, маўляў, што не так?

— Табе не здаецца, што людзі такімі рамонтамі гвалцяць сябе, так шмат нязручнага, але моднага. Прасцей жыць так, як прывыклі, — як мага асцярожней сказала я.

— А як мы прывыклі жыць? І ці жыццё гэта? Адны мае знаёмыя жывуць у двухпакаёвай кватэры з трыма дзецьмі. І яны ўжо прывыклі. Так жыць нармальна? Я жыву ў двухпакаёвай кватэры адна, але мне не хапае пакояў, мне яна малая. Мне патрэбны спальня, кабінет. Зрэдку да мяне прыходзяць госці. У кабінет я не магу іх запрасіць: там усе

мае паперы, камп'ютэр, нішто не павінна згубіцца ці сапсавацца. Загадаеш мне весці наведвальнікаў у спальню? Лажыцеся, дарагія госці, зараз калыханку спяваць буду! Так? — раззлавалася Алена.

— Ты мяне не зразумела. Я не пра колькасць квадратных метраў. Я мела на ўвазе, што гэта ўсё смешна выглядае, — я паспрабавала выказаць сваю думку больш карэктна.

— Магчыма, табе збоку лепш відаць. Нашы людзі застануцца нашымі людзьмі ў любой кватэры, з еўрарамонтам ці без. Я ўжо прывыкла, што амаль кожны гаспадар, які мае дарослага сына, нахвальвае мне яго. Вось калі ты заўважыла, сённяшні першы кліент ганарыўся, што ягоны сын дасканала ведае англійскую. Але я, напэўна, не маю права смяяцца, бо іхнія словы сведчаць толькі, што я добрая дзяўчына і яны былі б не супраць мець такую нявестку. Вось таму я буду ўспрымаць усё гэта як камплімент.

Нарэшце мы прыехалі ў офіс кампаніі. «Калі кампанія паважае сябе і сваіх кліентаў, яе офіс і нават будынак, дзе той офіс знаходзіцца, павінны выглядаць ідэальна, калі ж фірма займаецца рамонтам, то офіс і будынак павінны дыхаць свежасцю і ствараць уяўленне, быццам ён зроблены толькі ўчора» — лозунг Сяргея Аляксандравіча Белазёрава. А ён не прывык кідаць словы на вецер, таму здавалася, што будынак узведзены не ўчора, а толькі што. Пакуль Алена дамаўлялася пра нешта сваё, рамонтнае, я вырашыла наведаць Андрэя Вараховіча. Але ён адразу здзівіў мяне, адмовіўшыся гаварыць пра Алу.

— Яна ж была тваёй сяброўкай, Андрэй! — нагадала яму я.

— І не толькі сяброўкай, як ты, вядома, памятаеш! Мне пра гэта і яна кожны дзень напамінала, і нават Алена зрэдку папракае. І вось яна памерла, а мне зноў не даюць пра яе забыць, — Андрэй гаварыў так, што я адчула сябе амаль вінаватай.

— А ці трэба забываць? Даруй, калі я нешта не так сказала. Алена мяне...

— Я ведаю, што яна сама цябе запрасіла. Але гэта было яе ўласнае рашэнне, на прыняцце яго я не ўплываў. Я нават быў супраць, — цвёрда паведаміў хлопец.

— Супраць таго, каб знайсці забойцу? — удакладніла я.

— Зразумей, я не супраць таго, каб вы шукалі забойцу. Але без мяне. Я не магу марнаваць свой час на дарэмныя пошукі і пустыя ўспаміны, — сказаў Андрэй і раскрыў нейкую папку, паказваючы, што не хоча больш размаўляць са мной.

— Канешне, нашто марнаваць час, калі і так ведаеш, хто забойца! — чамусьці раззлавалася я.

— А-а, цяпер іншая размова. Паненку цікавіць маё алібі? У мяне яго няма. Я ехаў на машыне да Алены, таму і ў яе няма алібі. Невядома, ці была яна дома ў час смерці сяброўкі. А вось матыў у мяне, канешне, мог быць. Былая каханка, магла шантажыраваць якімі-небудзь эратычнымі фотаздымкамі ці маімі інтымнымі дзённікамі, але, на жаль, я не вяду дзённікаў і не маю звычкі фатаграфавацца агаленым. Але матыў мог быць і ў Алены: былая каханка яе жаніха дэкларуе на яго свае правы! Гучыць прынадна! Напэўна ж, Алена расказала табе гісторыю сямейных узаемаадносін Алы. Таму яе і сястрычка магла забіць. Тым больш што яна дагэтуль не замужам і не ведае, ці могуць быць у яе дзеці. Тады яна зрабіла аборт, бо будучы бацька перабег да будучай цёткі, Алы, значыць, — цынічна паведаміў Андрэй.

— Як ты можаш... — абурылася я.

— Я ўсё магу. Добрыя настаўнікі былі. Але я не скончыў расказ. Гэтаксама патэнцыяльны забойца той няўдалы будучы бацька. Адна са смехам кінула, а другая не прыняла. І ні туды, і ні сюды. Не думаю, што ён забыў, якіх-небудзь сем год прай-

шло. Што такое сем год для сапраўднага мужчыны? І мамаша, якая дзеля выратавання гонару дачку на аборт аддала, нічога не забыла. Можа, не сцярпела голасу сумлення? Яе магла забіць ты. Можа, яна табе каліс канспект перапісаць не дала ці кавалера перахапіла? Можа, яна камусьці на мазоль наступіла, га? Хаця... яна кожнаму, каму магла, наступала. Так можна кожнага чалавека падазраваць! Быў бы чалавек, а матыў знойдзецца, — ён нібыта бесклапотна рассмяяўся.

Я пераказала ўсё Алене і была ўпэўненая, што яна будзе на маім баку, на баку выхаванасці і маралі. Але яна зусім нармальна паставілася да ягонай рэакцыі:

— Зразумей ты яго, яму дрэнна, балюча. Я магу паплакаць — і плакала, а ён саромеецца, — апраўдвала хлопца Алена.

— Ад чаго яму балюча? Ён жа Алу ненавідзіць! І пасля смерці ненавідзіць мацней, чым пры жыцці! Ад чаго балюча?!

— Калі разбіраць фармальна яе словы, паводзіны, яна вымалёўваецца нейкай пачварай, але ж ты не ведала яе так блізка, як я. Ты не ўяўляеш сабе, што такое Ала! Гэта феерверк! Выбух эмоцый, жартаў, гумару! Гэта святло, дзень!

— Ты кажаш, што яна дзень, а ты змагла б жыць, калі б не было ночы? З такімі людзьмі добра сустракацца раз на тыдзень, але не кожны дзень!

— Ноч — гэта той, хто яе забіў! І я хачу зірнуць яму ў вочы! — амаль што загадала Алена.

Дурная думка з'явілася ў маёй галаве: зірнуць у вочы, каб падзякаваць? Мне трэба было падумаць, зразумець, што я тут раблю. Імя забойцы нікому не патрэбна, і я ўсім перашкаджаю жыць. Можа, Алена ўжо шкадуе, што паклікала мяне, і ейнае запрашэнне проста было першым поклічам душы, які не быў узважаны розумам. І я тут зусім не патрэбная, бо ўсё неістотна. Істотна толькі тое, што загінуў ча-

лавек, які не карыстаўся асаблівай прыхільнасцю ў знаёмых, сяброў, родных. І ўсё...

І тут мне здалося, што не ўсе вузлы звязваюцца... Нешта не так. Андрэй так падрабязна расказаў пра сястру Алы, Алена ж гаварыла, што Ала не хацела ёй расказваць, саромелася. Можа, яна спачатку расказала Андрэю, а ён не ўхваліў, і яна засаромелася толькі тады? Я ўспомніла наш першы курс. Ала з Аленай пасябравалі раней, чым да іх далучыўся Андрэй. Калі б яна каму і расказала першаму, дык Алене. Ды і не стала б яна расказваць аднаму хлопцу, як насміялася з другога. Андрэй адразу б зрабіў патрэбныя вывады і кінуў Алу. Праўда, ён яе кінуў, але іхні сяброўскі трохкутнік не разваліўся. І чаму Андрэй не расказаў Алене тую гісторыю ў дэталях? Калі яны жаніх і нявеста, у іх не павінна было быць аніякіх сакрэтаў. Цікава, адкуль ён гэта ведае? Нічога, я дакапаюся, але яшчэ не час казаць яму пра маю здагадку.

Я выйшла на балкон падыхаць свежым уручскім паветрам і паглядзець на Мінск з вышыні птушынага палёту. Было відаць адзін з карпусоў Політэхнічнай акадэміі, выяву якога змяшчалі калісь на канвертах, найсучаснейшы будынак бізнес-цэнтра з люстранымі сценамі, быў бачны праспект Скарыны з рэкламнымі шчытамі. І тут жа побач жыццярадасныя лясы Уручча.

Па ходніку дзеці каталіся на роліках. Маленькія фігуркі ў поўным узбраенні (адзін хлопчык нават у шлеме), здавалася, былі занесены сюды з іншага часу і іншага свету. Лес і вузел кальцавой дарогі жылі кожны ў сваім рытме, да якога мы прывыкаем з першых гадоў жыцця. Канешне, ролікі зараз не дзіва, але фігуры, якія рухаюцца ў іншым тэмпе, прыцягваюць увагу. У іншым тэмпе... Філолагам уласціва любую дробязь павялічваць да памераў сусветнага масштабу, і я падумала, што гэтыя дзеці і жыць будуць у іншым тэмпе, што гэта тое доўгача-

канае новае пакаленне. Я, напэўна б, у сваіх марах зрабіла іх іншапланетнікамі, але банальнае здарэнне прыцягнула маю ўвагу.

Дзяўчынка выгульвала сабаку і кідала палку, каб ён прыносіў. Чарговы раз палка вылецела на тратуар, звалілася перад хлопчыкам у шлеме, той спужаўся, згубіў раўнавагу і бразнуўся на асфальт. Праз секунду пачуўся гучны плач, мне, праўда, здаецца, што яму было не столькі балюча, колькі крыўдна. Спадарства на роліках з'ехалася да свайго «параненага» таварыша, падбегла дзяўчынка з сабакам. І праз некалькі хвілін гармонія была адноўлена. Як я ўжо казала, філолагам уласціва любую праблему ўзводзіць да маштабаў глабальнай катастрофы. І я адразу падумала, што прагрэс можа быць спынены палкай, прыладай працы каменнага веку. Так і ролікі існуюць толькі ў свеце адпрасаванага асфальту, а па-за ім на роліках можна толькі хадзіць як у ботах, не больш. Дзяўчынка ў жоўтым разагналася і саскочыла з бардзюра, і ўсе па чарзе паўтарылі ейны подзвіг. Нехта падаў, але сінякі і драпіны нікога ўжо не цікавілі, пераможаны ўставаў, каб перамагчы. І мае філалагічныя мазгі падумалі: прагрэс не спыніць.

Так захацелася жыць! І так захацелася прыгажосці! І ўвасабленнем прыгажосці, жыцця і прагрэсу быў для мяне Мінск! Я не магу змяніць свой горад, але я магу змяняць яго на Мінск. І недзе ўнутры з'явілася надзея. Месца Алы ўсё яшчэ вакантнае, а я тут, пад бокам. Як падвесці Алену да таго, каб яна ўладкавала мяне ў фірму? Канешне, па прафесіі я — настаўніца, але як жа я ненавіджу сваю працу! Кожны год адно і тое ж: адны і тыя ж класікі, адны і тыя ж крытыкі. Як выкладаць беларускую мову, калі большасць дзяцей упэўнена, што гэта ім не патрэбна, а толькі адбірае час?! Як правіць сачыненні, якія спачатку напісаны на рускай мове, а потым са слоўнікам перакладзены на беларускую?!

Мае сумныя развагі перарваў тэлефонны званок. Гэта была Жанна Кірылаўна Белазёрава, мама Алены. Яна хацела са мной сустрэцца і безапеляцыйным тонам паведаміла, што машына за мной ужо выехала. І ў гэты ж момант па дамафону прыемны мужчынскі голас паведаміў, што за мной прыехалі ад Белазёравай. Супраціўляцца было бессэнсоўна.

Дзіўна, мне чамусьці здавалася, што Алена не такая блізкая са сваёй маці, каб расказваць пра мяне і тым больш паведамляць, дзе я жыву. У Жанны Кірылаўны была цяжкая гіпертанія, і крэўныя берaглі яе нервы шляхам «нічоганерасказвання». Не думаю, што хворым на карысць такая інфармацыйная ізаляцыя, і ўпэўнена, што мела яна сваіх «шасцёрак» і ў фірме, і ў доме. Калі меркаваць па расказах Алены, то за кожным членам сям'і цягнуўся шлейф пакаёвак, якія гатовы былі з кожнага парушынкі здзьмуваць. Маленькі Дзімка марнеў у сваім стэрыльным пакоі з бездакорнымі цацкамі і паслужлівымі нянькамі, ачуняў ён толькі, калі кухарчына дачка, ягоная равесніца, прыцягнула пухкага зайца з адарванай лапай. Дзімка пасябраваў з дзяўчынкай, яны разам пяклі нешта з пяску і высмоктвалі сок з кветак канюшыны. Нянькі трацілі прытомнасць, калі Дзімка разам з сяброўкай лавіў жабак і вусеняў. У дзяўчынкі дома быў маленькі сабачка, зразумела, што Дзімка захацеў сабе такога ж. Але Жанна Кірылаўна выразна дала зразумець, што ніякай псіны ў яе доме не будзе, Сяргей Аляксандравіч вагаўся і прапаноўваў пасяліць сабаку ў будцы, адкуль ён не зможа псаваць каштоўную мэблю, але ён адразу змоўк пад цяжкім позіркам сваёй жонкі. І Дзімка пайшоў ва-банк: адмовіўся ад дэсерту і павесіў на шыю паперчыну з надпісам «Хачу сабаку». Дзімкіна выхавацелька-гувернантка захоўвала знешні нейтралітэт, хоць у душы, на думку Алены, падтрымлівала Дзімкава паўстанне.

Хлопчык перамог. Ён атрымаў шарпея, а разам з шарпеем і свабоду. Але шпіёнкі Жанны сачылі за сабачкам, і праз тыдзень познім вечарам Жанна Кірылаўна ўладарным крокам зайшла ў пакой сына і выцягнула з-пад коўдры соннага шарпея. Дзімка рыдаў, шарпей быў адпраўлены ў свой буданчык, Жанна Кірылаўна заснула цалкам задаволеная, а ўдалая падглядальніца хавала ў кашалёк 5 долараў. Так шарпей Патап даведаўся, хто ў хаце гаспадар, і праз месяц узорных паводзінаў ён ужо свабодна спаў на шлюбным ложку Белазёравых. Пакаёўкі і прыбіральшчыцы набіраліся па конкурсу: хто больш спадабаецца Патапу. Дзімка пакрыўдзіўся і больш з Патапам не сябраваў. Алена ж атрымала ганаровы абавязак: суправаджаць чатырохлапага падлізніка да ветэрынара і ў сабачую школку.

Дзімка не здаўся, я ўпэўнена, што гадоў у трынаццаць ён паспрабуе збегчы з дому. Алена праблему мамінага звышкантролю вырашыла проста: з’ехала ў асобную кватэру. Дзеля свабоды яна адмовілася ад усяго гатовага, сама гатавала ежу, мыла і прасавала. Жанна Кірылаўна ні разу не была ў кватэры дачкі, і ўсё ж Алена была ўпэўнена, што маці ў курсе ўсіх падзей яе жыцця. Бабка-суседка была звышуважлівай да яе, і калі Алена выходзіла ці заходзіла ў кватэру, яна адчувала, што за суседнімі дзвярыма нехта стаіўся і сочыць.

Яна скардзілася мне па тэлефоне, а я смяялася, мне такое віжаванне здавалася неверагодным. Але Жанна Кірылаўна без слоў здагадалася пра адносіны Алены і Андрэя. У той дзень, дакладней ноч, калі Андрэй упершыню застаўся ў Алены, шоргат за суседчынымі дзвярыма чулі яны абодва, ранкам Андрэй заклеіў вочка на дзвярах суседкі лейкапластырам. А калі яны сядалі ў машыну, каб ехаць на працу, у акне тырчаў бабульчын заспаны твар. Так што факт назірання быў засведчаны. Алена разумела, што бабульцы прыбаўка да пенсіі не зашкодзіць,

і гатова была сама плаціць бабцы, каб яна жыла спакойна, але дзе гарантыя, што бабка не пачне працаваць на абедзвюх, ды і Жанна Кірылаўна магла знайсці іншую цікаўніцу. А сваіх ворагаў лепш ведаць у твар.

І калі мама паведаміла Алене, што яе сяброўка Ала Агалецкая шлюха, якіх на свеце мала, Алена не сказала нічога, яна зразумела — гэта праўда, і яшчэ яна ведала, што ў пад'ездзе Алы ці на адной пляцоўцы з ёй жыве нехта, хто сочыць за невялікую ўзнагароду. Калі Ала даведалася пра гэта, яна тыдзень віравала, як кіпень у чайніку, паспрабавала вылічыць нахабніцу, яна была ўпэўнена, што гэта жанчына, але ў яе пад'ездзе людзі сачылі і віжавалі адзін за адным без аніякіх загадаў, па патрэбе душы. І аднойчы яна паехала да Жанны Кірылаўны, тая дзяўчыну, канешне, не прыняла, маўляў, ціск зноў падняўся. Ала доўга пінала колы свайго аўтамабіля перад домам Белазёравых.

Дзяўчаты вырашылі абдурыць усіх. Алена на пару тыдняў пераехала да Алы, Андрэй жа вёў размеранае жыццё (дзяўчаты былі ўпэўнены, што і за ім сочаць). Алена і Ала са смехам вылазілі з машыны, выцягваючы ёмістыя пакеты, і аднойчы ў ліфце Ала сказала нейкай бабульцы:

— Ён так любіць пад'есці, проста жах!

Бабка ледзь не асела на падлогу, Ала дэманстратыўна папправіла грудзі, і дзяўчаты выйшлі з ліфта. Усе бабкі вар'яцелі, высочваючы хлопца. Нарэшце Жанна Кірылаўна атрымала інфармацыю ад усіх сваіх агентаў: Ала і Алена жывуць з нейкім невядомым і нябачным мужчынам, Андрэй сумуе ў сваёй кватэры, нікуды не ходзіць.

Бабкі і падслухоўвалі, і варту паставілі, але супермужчыну, якому трэба столькі ежы і дзве дзяўчыны, так ніхто і не злавіў. І толькі Жанна Кірылаўна здагадалася пра сапраўдныя прычыны па-

водзін дзяўчат. Яна запрасіла дачку на вячэру і, скрабучы відэльцам па талерцы, паведаміла:

— Мяне ваша гульня не ўражвае!

Алена запытальна падняла брыво і, адправіўшы ў рот кавалачак рыбы, стрымана адказала маці:

— А мы і не гуляем, мы хамячка завялі. Разумееш, у мяне ў дзяцінстве не было хамячка!

Жанна Кірылаўна схапілася за таблеткі, правяла тыдзень пад наглядам доктара, і дзяўчаты змірыліся.

І вось да гэтай страшнай жанчыны я ехала па яе запрашэнню. Вялізны дом з чырвонай цэглы, пакрыты чарапіцай такога ж колеру, выклікаў зайздрасць і павагу: каб там прыбраць, трэба мець армію пакаёвак. На жаль, экскурсію па гэтым палацы мне, відаць, не прапануюць. Кіроўца машыны галантна адчыніў дзверцы. Я ішла па дарожцы, выкладзенай тратуарнай пліткай і абсаджанай акуратна падстрыжанымі кусцікамі. Мяне сустрэла невысокая дзяўчына ва уніформе. Яе твар быў абсалютна белы, вусны трэсліся, і яна, заікаючыся, прамовіла:

— Сюды, калі ласка! — і паказала рукой.

Па руцэ сцякала кроў. Я здрыганулася, а яна паспяшалася схаваць далонь за спіну. Спачатку я падумала, што даведзеная да адчаю пакаёўка забіла сваю гаспадыню, але дзяўчына, намагаючыся не заплакаць, патлумачыла:

— Не пужайцеся, калі ласка, я разбіла фужэр. Жанна Кірылаўна вас чакае.

Я асцярожна ішла па сцяжынцы, мне здавалася, што нешта зараз абрынецца. Па-над кустамі і дрэўцамі было відаць шкляны дах, а за паваротам мяне чакаў прыемны блакіт басейна. Жанна Кірылаўна лёгка вынесла з вады сваё стокілаграмовае цела. Мне здавалася, што купальнікі такіх памераў не вырабляюць. Але чорт з ім, з памерам, я такіх прыгожых купальнікаў ніколі не бачыла. Нейкія фантастычна яркія фарбы, складзеныя ў абстрактны малюнак.

Жанна Кірылаўна дачакалася, пакуль я адарву ад яе вочы, і павіталася. Я, здаецца, пачырванела. Яна прапанавала мне сесці, а сама села ў шэзлонг, ён нават не аўкнуў пад такой вагой, мабыць, спецыяльна на заказ рабілі. Я чакала ўбачыць стомленую, хворую жанчыну, абкладзеную падушкамі, з лекамі на тумбачцы. Жанна ж Кірылаўна здавалася абсалютна здаровай. Калі б яна была гэткай жа тоўстай, але не такой высокай, то не было б адчування, што ты побач з ёй нішто.

Яна падышла да дрэўца і падняла з зямлі некалькі спелых яблыкаў. На століку стаяла сокавыціскалка, Жанна Кірылаўна сама зрабіла нам сок, а дзяўчына ва уніформе якраз прынесла фужэры. І я зразумела, што перада мною была разыграна п'еса, прызначэння якой я пакуль не ведала. Жанна Кірылаўна магла прыняць мяне ў доме за кубачкам кавы, і гэта было б больш натуральна. Але яна выбрала басейн. Чаму?

Жанна Кірылаўна наліла сок, укінула ў фужэры лёд і села насупраць мяне. Я ўзяла свой фужэр і крыху адпіла.

— Вам, напэўна, цікава, чаму я захацела з вамі сустрэцца? — Яе нізкі голас адпавядаў камплекцыі, але быў надзіва прыемным.

Вядома ж, цікава, яна магла ведаць толькі пра мой прыезд, але не пра ягоную мэту! Я з суседкамі ўвогуле не размаўляла. Гэта ўжо з фірмы данеслі. Я сціпла кіўнула.

— Андрэй паведаміў мне, што вы прыехалі шукаць забойцу Алы Агалецкай, — яна вытрымала паўзу, каб я пацвердзіла, але я ўважліва слухала і для сябе адзначыла, што Андрэй карыстаецца аўтарытэтам Жанны Кірылаўны ў сваіх інтарэсах.

— Мне не падабалася, што мая дачка сябруе з Агалецкай. Мне не падабалася, што яна працуе з Агалецкай. Мне не падабалася сама Агалецкая! — Жанна Кірылаўна павольна адпіла з фужэра. Яна

поўнасцю валодала сабой, а з другога боку, чаго б ёй не валодаць сабой. Яна была занадта спакойнай і ўпэўненай.

— З чаго вы збіраецеся пачаць? — яна не міргаючы глядзела мне ў вочы.

— Н-ну... Распытаць сяброў, знаёмых... — я пачынала баяцца гэтую жанчыну. Хоць, можа, гэта яна мяне баіцца. Калі я прыйду да яе бабак-шпіёнак з міліцыяй, яны раскажуць усё і яшчэ прыдумаюць столькі ж. Мне здалося, яна зараз папросіць, каб я паведамляла пра кожны свой крок. Але я памылілася.

— Я магу вам чым-небудзь дапамагчы? — паслужліва спытала яна.

Да гэткага павароту я не была падрыхтавана.

— О... э... Пакуль не ведаю, — я была пераможана.

— Звяртайцеся да мяне, я спадзяюся яшчэ вас убачыць. Я добра ведала Алу, мы маглі б супаставіць сваю інфармацыю. Дарэчы, вы можаце з'ездзіць у яе родны горад, пагаварыць з яе бацькамі, заўсёды можна будзе даведацца пра нешта такое, вызначальнае. Калі яны не запрапануюць вам начаваць у іх, патэлефануйце мне, у мяне там ёсць знаёмыя. І калі ласка, не расказвайце Алене пра нашу сустрэчу, — Жанна Кірылаўна скінула прасціну і нырнула ў басейн. Маўляў, аўдыенцыя скончана. Вось мне і просьба паведамляць пра кожны свой крок. Толькі такая дыпламатычная, што хоць памірай. «Русалачка стокілаграмовая», — раззлавана падумала я. Але зараз было зразумела, чаму мы сустрэліся каля басейна. Яна была ў купальніку — гэта як падсвядомы знак, што ёй няма чаго хаваць. Вось яна перада мной як на далоні. Яна сама зрабіла мне сок. Мы былі нібы на роўных. Пасля такога прыёму я павінна была прыняць яе сяброўства і стаць яе «шасцёркай». Яна сама зрабіла мне сок, дарма Алена жартавала, што яе маці без сваіх дзяўчат ва уніформе на-

ват у прыбіральню не ходзіць. Здаецца, я ўсе яе прыёмы расшыфравала правільна.

Дома мяне чакала Алена, прыехала запрасіць на трэніроўку па тэнісу:

— Я падумала, што ты сядзіш тут адна, сумуеш, а ў мяне якраз заняткі. Хочаш дакрануц ца да сапраўднай асалоды? Памятай, гэта арыстакратычны і палітычна-папулярны від спорту.

Раптам нехта пазваніў у дзверы, я банальна спытала «хто там», а мне банальна адказалі «міліцыя». У кантэксце ўсяго, што са мной здарылася, гэта гучала як штосьці страшнае і непазбежнае. За мной прыйшлі... Алена глянула на мяне і ўсміхнулася, маўляў, які ж ты палахлівы дэтэктыў. Яна гучна спытала праз зачыненыя дзверы:

— А што здарылася?

— Кнопка спрацавала, — адказаў прыемны мужчынскі голас. Занадта шчыры і правільны, каб можна было яму паверыць.

Алена памкнулася адчыняць, я схапіла яе за руку:

— Ты што, вар'ятка? Якая кнопка?

На парозе стаялі дзве вялізныя, проста неверагодна высокія постаці. Калі туман страху перад маімі вачыма паступова знік, я ўбачыла двух хлопцаў з аўтаматамі і рацыяй, у якую адзін з іх гучна гаварыў:

— Тайга, Гарадзецкая, 70, усё нармальна, гэта пультысткі ступілі.

«Ступілі», відаць, ад слоў «тупіць, тупыя». Філалагічная загадка канчаткова вярнула мяне да рэчаіснасці. Алена паўтарала міліцыянерам:

— Мы ж не малыя з кнопкай забаўляцца. Дзяцей у нас няма. Мы сядзелі на кухні, а кнопка ў спальні.

Хлопцы развіталіся і пайшлі, Алена стомлена села на стул і сказала:

— Калі яшчэ будуць такія сюрпрызы, не пужайся. Мяне гэтая кнопка ўжо задзяўбла. Навошта яна? Ну... Сядзіш ты дома, раптам нехта ціхенька вырэз-

вае бензапілой дзірку ў дзвярах і акуратненька так залазіць у тваю кватэру альбо ты сама адчыніш злодзеям дзверы, націскаеш на кнопку — і праз хвіліну два гэткіх жа прыгажуна ва уніформе ля тваіх ног.

— А дзе гэтая кнопка? — зацікаўлена запытала я.

— Ляжыць на падваконні. Можаш пакласці ля тэлефона і ісці з ёй кожны раз адчыняць дзверы. На вось табе код, будзеш зараз кватэру пад ахову здаваць. Я яшчэ не паведаміла ім, што Ала загінула, можаш называць яе прозвішча, Агалецкая. Трэба так казаць: «Бусел-357, Агалецкая, пробная здача кватэры». Яна адкажа, што правярае, праз секунду паведаміць, што ўсё нармальна, назаве свой нумар, напрыклад, дваццаць трэці, і ты выходзіш з кватэры. І яшчэ наконт кнопкі. Будзе табе сумна, націскаеш кнопку, яны прыязджаюць, а ты ім кажаш: «Хлопцы, паміраю з нудоты. Можа, пасядзім за кавай ці гарбаткай?» А яны ахвотна пагодзяцца, паздымаюць бранявыя свае камізэлькі ды штонікі, таксама бранявыя. І з аўтаматамі на голае цела будуць піць з табой каву, — засмяялася Алена. — Ну што, размарылася? Збірайся, на трэніроўку паедзем. І вазьмі рэчы для саўны.

Гэта былі не спецыялізаваныя корты для тэнісу, а вялікі спартыўны комплекс, дзе былі корты, залы для футбола і баскетбола, пакоі з трэнажорамі, памяшканні для гімнастыкі і басейны. Звычайна Алена іграла з Алай, пасля яе смерці яна ні разу не выбіралася на корт. Яна вучылася іграць некалькі месяцаў і ўзроўню Уімблдона яшчэ не дасягнула, канешне, але пра мой узровень лепей памаўчаць.

Калі мне далі ракетку, я здзівілася:

— Такая лёгкая! Мне здавалася, яна павінна быць цяжэйшай!

— Паглядзім, што будзе праз паўгадзіны, — загадкава ўсміхнулася Алена.

Ужо праз пяць хвілін я не магла падняць руку ад стомы, і, здавалася, нішто не зможа прымусіць мяне іграць далей, ды сорамна было прызнацца, і, гвалтуючы сябе, я іграла. Але ўсё ж праз паўгадзіны я здалася: страшэнныя мазалі на далоні і пальцах не дазвалялі ўжо трымаць ракетку. Наступнай раніцай я высветліла, што з-за мазаля на вялікім пальцы апрананне джынсаў суправаджаецца страшэнным болем. Алена пасмяялася і зрабіла камплімент:

— Ты яшчэ доўга пратрымалася! — І яна сціпла прамаўчала пра колькасць неадбітых мною мячоў.

Разам з намі ў саўну пайшла адна з сяброўак Алы і Алены — Каця, якая папрасіла клікаць яе Кэці. Мы распрануліся, закруцілі ў ручнікі валасы, ды мы з Аленай узялі яшчэ ручнікі, каб падсцяліць. Кэці сабралася сядзець на дошках голым азадкам:

— Як уяўлю, што тут да мяне сядзелі хлопцы-футбалісты, жыць хочацца!

Але гарачыня была такая, што ёй прыйшлося сядзець на ўласных шортах, каб не пякло. Яшчэ яна не зняла залаты ланцужок, калі ж ён амаль адразу нагрэўся, і скура вакол яго пачырванела, Кэці з лямантам кінулася з парылкі. Праз якую хвіліну выйшлі і мы. Кэці ўжо выжлукціла амаль палову нашай мінералкі і сядзела, намазваючы на твар нейкі крэм. Я ўвогуле ніякіх крэмаў, акрамя крэму для рук, не прызнаю і лічу гэтую справу інтымнай. Ну, можна намазацца пры сяброўцы, але ж мяне яна першы раз бачыць! Мы зноў пайшлі ў парылку. Пякло нешта ў носе, хацелася часцей міргаць і дыхаць праз рот. Нашыя целы пакрываліся потам, Кэці расціральа сябе рукамі і несупынна гаварыла, але яе ніхто не слухаў. Здавалася, час спыніўся...

Калі мы ўжо апраналіся, Кэці выцягнула пакет з яблыкамі і сказала:

— Усё адно ж адразу на свежае паветра нельга. Трэба крыху пасядзець, дык пасядзім з яблыкамі!

Раптам на калідоры, за дзвярамі, пачуліся крокі. Кэці прыслухалася:

— Аленка, не забылася, як нас мінулы раз футбалісты выганялі? Алена памятае, а вось для цябе ўсё спачатку раскажу, — фамільярна звярнулася яна да мяне. — Ала папрасіла дырэктара даць ёй корт на іншы час, свабодных кортаў не было, і дырэктар загадаў прыбраць вароты з футбольнага поля і нацягнуць сетку. А футбалістаў, час якіх заняла Ала, перасунулі на гадзіну пазней. А ў іх жа таксама час — грошы, яны бізнесоўцы, усёй фірмай у футбол гуляюць. Яны вар'яцелі ад бездапаможнасці, нічога не дабіўшыся ад дырэктара, і вырашылі сварыцца з самой Алай. Яны прыйшлі... І ўбачылі Алу! У іх ад яе прыгажосці языкі паадсыхалі. І мазгоў хапіла толькі на тое, каб сказаць, што яны рады аддаць свой час такой прыгажуні.

Калі яны апрытомнелі, то запэўнілі: «Захочаце заняць наш час у саўне — не дазволім, будзем парыцца разам». Дык яны, гады, кожны раз з трэніроўкі прыходзяць крыху раней, каб крыкнуць: «Дзяўчаты, выходзьце!» Так усё жартам, жартам, а як успомню, якія яны былі раз'юшаныя, яны яе забіць былі гатовыя! Вой, дзяўчаты, даруйце... Ох я дурная, язык як памяло... Даруйце...

Божа мой, нават нейкіх спартоўцаў-бізнесоўцоў, якіх яна ніколі не бачыла, Ала здолела давесці да таго, што яны праглі яе смерці. Як можна пасля гэтага дзівіцца, што пра яе не хочуць гаварыць сябры, што ад яе адмовілася сям'я.

Ды гэта толькі пры жыцці ў Алы як бы і не было родзічаў, а не паспела памерці — па яе кватэру прыехала сястра. Не, я яе не асуджаю. Ёй бы самой такое і ў страшным сне не ўбачылася б: прыехаць да сястры, якая разбіла ёй усё жыццё. Але маці, іхняя ўладарная маці, загадала малодшай дачцэ даведацца, ці не маюць родныя якіх-небудзь правоў на кватэру Алы. Правоў яны не мелі.

Як бы там ні было, у мяне з'явілася магчымасць пагаварыць з Таццянай Агалецкай.

— Я нічога не страціла з яе смерцю, бо ўжо нічога не мела. Зусім нічога. Ні сястры, ні каханага чалавека, ні маці, бо яна пазбавіла мяне самага дарагога, што я магла мець. Вы, напэўна, не ведаеце, у мяне магло быць дзіця. Ад чалавека, якога я кахала. А я проста цацка ў матчыных руках, бязвольная амёба. Я нават узненавідзець Ігара не змагла. Сапраўднае каханне можна разбіць, але чарапкі застануцца назаўжды.

— Я спрабую знайсці яе забойцу... — толькі пачала я.

— Не знойдзеце! — Таццяна перапыніла мяне так рэзка, што аж сама спужалася ўласнай нахабнасці.

— ???

— Калі ён не пакінуў ніякіх слядоў, то вы яго не знойдзеце. Вы даведаецеся, хто ён, толькі ў тым выпадку, калі ён сам раскажа. Чакайце... — Мне падалося, што ў яе вачах бліснуў агеньчык зларадства.

— І буду чакаць, я не з міліцыі, справу за даўнасцю дзён не закрыю. Мне ўжо для сябе трэба ведаць, хто забіў Алу, — я ўжо крыху раззлавалася.

— А вы эгаістка. Ала таксама была эгаісткай, — Таня прамовіла гэта з нейкім невыносным сумам.

— Не раўняйце нас, калі ласка! — абурылася я.

— Нават калі гэта было наўмыснае забойства, не шукайце злачынцу. Гэта ж як яна яго дапякла! — раптам не стрымалася Таня.

— Хто забіў раз, можа забіць і яшчэ, — тонам дасведчанага следчага запярэчыла я.

— Так можа зрабіць толькі маньяк! І не з-за беспакаранасці, а таму, што ён маньяк. А нармальны чалавек будзе ўсё жыццё жыць з гэтым цяжарам, усё жыццё пакутваць, усё жыццё памятаць пра гэта. Ён ужо ніколі не будзе шчаслівы. Бо ў найшчаслі-

вейшыя моманты свайго жыцця ён будзе ўспамінаць, што ён — забойца, — задумліва вымавіла Таня.

— Вы так... з веданнем справы...—асцярожна кінула я.

— Я Алу забіла. Даўно забіла. У той самы дзень, калі яна забрала майго Ігара. І пахавала я яе ў той дзень, калі зразумела, што яна гэта проста так зрабіла, каб руку набіць, папрактыкавацца. О-о, вы не ўяўляеце, колькі разоў я забівала яе ў думках! Ігару сумленне не дазволіла да мяне вярнуцца, а я прыняла б яго... я сама б да яго пабегла... калі б не маці! Яна, як Ала, жорсткая, мэтанакіраваная, ламае чужыя жыцці без аніякіх пакут сумлення, — цвёрда, як завучанае, прамовіла Таня.

— Можа б, вы якую версію прапанавалі? — са слабой надзеяй запытала я.

— Вы не зразумелі? Я вам сказала, што трэба чакаць, пакуль ён сам прызнаецца. Гэта мог быць хто заўгодна! Кожны, хто яе ведаў! — у эмацыянальным парыве Таня трэсла рукой перад маім носам.

— Ну, калі так, то, можа б, вы дапамаглі мне сустрэцца з Ігарам? — папрасіла я.

— Вы думаеце... Гэта не мог быць Ігар! Не... Толькі не ён! — На яе твары адбілася спачатку задуменне, потым страх.

— Я на яго і не думала. Я разумею, вам хацелася б ведаць, што ён пакутуе гэтак жа, як і вы, што ён усё памятае і не дараваў Але, ды я не думаю, што праз столькі год... Самі разумееце... Мне трэба з ім толькі сустрэцца, пагаварыць пра Алу, — супакоіла я Таню.

— Канешне, прабачце. Відавочна, гэта не ён. Столькі год прайшло...—яна дарма спрабавала схаваць сваю нервовасць.

— Запрасіце яго ў Мінск, калі ласка.

— У гэтым няма патрэбы. Ён даўно жыве ў Мінску. Калі Ала яго кінула, ён паехаў за ёй. Ці

то прасіць вярнуцца да яго, ці то адпомсціць. Ён займаецца бізнесам, у яго крама, гандлюе іспанскай пліткай.

— А вы добра інфармаваны, — з лёгкай іроніяй сказала я.

— Так атрымалася, — сціпла адказала Таня.

Мне здаецца, што гэта ўжо не каханне, а нейкае паталагічнае пачуццё, нейкая незразумелая ўпартасць. Нашто прымушаць сябе бясконца перажываць усё гэта? Відавочна, што кожны сам выбірае, мабыць, Таццяне падабаецца штодня калупацца ў сваім параненым сэрцы.

Мы дамовіліся, што праз тыдзень я сустрэнуся з Ігарам. А за гэты час я планавала з'ездзіць у родныя мясціны Алы, мне падалося, што Жанна Кірылаўна хоча мне нешта паведаміць, але такім чынам, каб я сама знайшла гэтае «нешта».

І я выправілася ў падарожжа. У вагоне насупраць мяне сядзеў вясёлы дзядзька, але мне зусім не хацелася з кімсьці размаўляць. Як толькі цягнік крануўся, дзядзька расклаў сваю торбачку на ўвесь стол, патыхнула катлетамі, якія ён прапанаваў і мне. Але я ў спёку асабліва рэагую на пахі, таму адмовілася і пачала абмахвацца білетам, абы толькі адагнаць гэты смурод ад свайго носа. Праз хвілін дзесяць дзядзька выцягнуў цыгарэты і пайшоў паліць. Калі ён вярнуўся, вакол яго ўсё было насычана гэтым невыносным пахам. Правадніца забрала мой білет, таму я дастала з заплечніка тонкую кніжачку. Дзядзька як бы чакаў магчымасці загаварыць, таму, дыхнуўшы на мяне, спытаў:

— А гэта што за ксёнжка?

— «Людзі на балоце»! — злосна адказала я. Дзядзька відавочна не меў уяўлення пра сапраўдны памер гэтага твора, але па інтанацыі зразумеў, што я здзекуюся з яго. Пяць хвілін ён цярпеў маўчанне і паглядаў у акно. Потым не вытрымаў і дастаў бутэльку піва. Я зразумела, што калі вакол мяне пач-

не віраваць пах піва, перастраўленага дзядзькавым арганізмам, я запэцкаю купэ змесцівам свайго страўніка.

— Калі ласка, не піце зараз піва, мне ад пахаў — дрэнна, — як мага спакойней папрасіла я.

Дзядзька незвычайна абрадаваўся, запхнуў бутэльку ў торбу і жыццярадасна паведаміў:

— Разумею, у маёй жонкі таксама алергія! Паскудная хвароба, — ён з задавальненнем расцягнуў словы.

— У мяне не алергія! — запярэчыла я і зразумела, што ад трохгадзіннай размовы мне не адкруціцца.

Дзядзька Юзік расказваў пра жонку, пра дачку, пра ўнучку, і калі ён перайшоў на суседзяў, высветлілася, што мы едзем у адзін горад. І тады я шчыра зацікавілася гутаркай, навяла размову на Алу Агалецкую. Дзядзька, відаць, быў не майстар расказваць плёткі, таму запрасіў мяне ў госці пагаварыць з яго дачкой Валянцінай, якая вучылася з Алай у адной школе, дакладней, у адзінай школе горада.

Валянціна аказалася жанчынай вельмі гасціннай, яна адразу прапанавала мне застацца ў іх на патрэбны тэрмін. Было, канешне ж, прыемна, але ўсё адно дзіўна, як гэта абсалютна незнаёмаму чалавеку можна так даверыцца. Пасля абеду, пад каву і абаранкі, яна пачала расказваць мне пра Алу.

— Шкада, што яна загінула. Не, я разумею, кожнага шкада. І хоць Алка была апошняй паскудніцай... — Валянціна пакуль што шукала словы.

— Вы добра яе ведалі? — я паспрабавала дапамагчы.

— Мы ж з табой на «ты»! Я з Алкай у адной школе вучылася, толькі на чатыры класы пазней. Ледзь давучылася я да адзінаццатага класа. А потым замуж выйшла, дзіця нарадзіла, сама разумееш, якая тут вучоба. Я вось толькі што сяброўцы сваёй патэлефанавала, Наташы, яна Алку ведала, як змесціва

сваёй касметычкі. Наташа, канешне, Алку ненавідзела і ненавідзіць. Ала, вядома ж, адбіла ў яе хлопца. Перад самым вяселлем, — Валянціна нервова засмяялася. — Якія ж мужыкі ідыёты, увесь горад ужо ведаў Алкіну натуру, але як толькі яна каму міргне, той імчаў ледзь не ногі ламаючы. А Наташкін хлопец не промах быў. Ён і з адной, і з другой. І тут, і там, — Валянціна ўздыхнула і крыху памаўчала. — А жаніцца збіраўся ўсё адно з Наташкай. І перад вяселлем забегла да іх Алка, збялела-счырванелая, перапужаная, кажа: «Я цяжарная... здаецца». Здаецца! Абы сапсаваць усё. Наталля, канешне, казлу гэтаму аплявуху ўляпіла, выгнала і сукенку вясельную ўслед кінула. Алка ўсім шчыра ўсміхнулася і пайшла. Фантастыка! У нас такіх дзевак больш няма. Здаецца, шлюха шлюхай, але хадзіла ганарлівая, як прынцэса. Не, няма такіх дзевак зараз, каб так усё спалучаць. Эх, Ала вытанчана помсціла, — працягвала Валянціна, не даючы мне ўставіць слова. — Матка Наташкіна з'ездзіла ў Польшчу, тады многія ездзілі, і прывезла вельмі прыгожы світэр. Алка, калі трапіла ў Мінск, на рынку ўбачыла такі ж самы світэр. Грошаў было мала, дык яна галадала, але свінню Наташы падклала. Алка той світэрок даслала Наташкінай лепшай сяброўцы. І якая яна ні сяброўка, але насіла, бо хто ж тут утрымаецца ад такой спакусы. Наталка звярэла, але не адбярэш жа чужое адзенне.

— А гэта нармальна, што вы ёй патэлефанавалі... Ты... патэлефанавала, — выправілася я.

— Дык мы з ёй лепшыя сяброўкі, нягледзячы ні на што, — не да месца дадала Валянціна. — Ты Наташку ў Мінску сваім, у Італіі ці нават у Індыі сустрэнеш — і адразу пазнаеш. Скура заўсёды загарэлая, вочы чорныя, і нос, як парогі на рацэ Ніл, двума прыступкамі.

— Парогі на рацэ Ніл? Якое цікавае параўнанне! — заўважыла я.

— А гэта дачка ў школе праходзіла, а я з ёй урокі вучыла, — засмяялася Валянціна. — Дык малая і кажа, у цёці Наташы нос, як рака Ніл з парогамі. Добрая яна баба, толькі заскокі і ў яе бываюць. На малую маю накрычала, маўляў, не перапыняй ты мяне, я забываюся, што хачу сказаць. Склерозніца старая. Гэта ж дзіця, няўжо можна так. Няма сваіх дзетак, вось і вар'яцее баба.

— А чаму няма? — ціха запыталася я, прагнучы якой-небудзь крывавай гісторыі — спецыфіка маёй новай работы..

— А ад каго? — зарагатала Валянціна.

У дзверы пазванілі і праз секунду ў гасцёўні з'явілася паўнаватая фігурка з незвычайным профілем. Наташа адкінула густыя светлыя валасы з твару, пакруцілася па пакоі і спытала:

— Як вам ?

Я, канешне ж, не зразумела, што трэба хваліць. А Валянціна, да Наташыных выбрыкаў прывучаная, стомлена адказала:

— Новая спадніца? Ну, нічога, нічога. Толькі якая ж ты, Наташа, эгаістка. У мяне госця!

— Эгаістка! Ты думай, што ты кажаш! Ты, дура, думай, калі гаворыш! — аж захліпнулася Наташа, а гук «р» віскнуў амаль па-французску.

Мне стала непрыемна, што з-за мяне сварацца сяброўкі, і я паспрабавала накіраваць размову ў патрэбнае мне рэчышча:

— Я хацела з вамі пагаварыць...

Ната павольна павярнулася да мяне, тарганулася і выразна спытала:

— Я не разумею — што ты хочаш!

Я нават не знайшлася, што адказаць. О, такіх Наташачак нічым не выправіш, толькі які-небудзь не вельмі інтэлігентны мужык аднойчы як падыме кулак ды як раструшчыць і раку Ніл і піраміды Хеопса, то-бок вочы. Найлепшы аргумент. А я нічога зрабіць не магла.

І ўсё-такі мы селі піць гарбату (мне ўжо дрэнна станавілася ад бясконцасці піцця кавы). Ната ў мяне з-пад носа выхапіла цукарніцу і пачала распавядаць штосьці вельмі філасофскае, трымаючы яе ў руцэ. Яна відавочна выпрабоўвала маё цярпенне.

— Э-э-э... Можна цукар... — толькі пачала я. Ната, не даючы мне часу аформіць думку ў ветлівую форму, зазначыла са шляхетнай пакрыўджанасцю:

— Я заўважыла, ты не кажаш «калі ласка».

Унутры мяне быў ужо вулкан эмоцый, але Ната чакала выверджэння. Я пусціла энергію ў іншае рэчышча і пачала моцна разбоўтваць гарбату, грукаючы лыжкай аб філіжанку.

У пакой забегла маленькая дзяўчынка, яна заўважыла Наталлю і адразу схавалася за маму. Потым, асмялеўшы, выкрыкнула: «Цёць Наташа, ты як Баба Яга!» і выбегла з пакою.

— Калі б у мяне была такая дачка, не ведаю, як бы я жыла. А ў мяне дачка была б менавіта такая, — паведаміла Наташа.

Яна так нічога і не расказала пра Алу, і я, узрадаваная добрым пачаткам, крыху расчаравалася. Потым успомніла пра Наталчынага жаніха і пасля адыходу Наташы запытала ў Валянціны, ці не з'ехаў ён з горада.

— А ты не зразумела? Ната ж казала пра дзіця... Любая мая, я ж была там, калі Ала вяселле сапсавала. Застаўся ён адзін, я слёзкі яму павыцірала і... Затое ў мяне дом, сям'я, дачушка бегае. А Наташка ў адпачынак дадому прыехала і няма чым пахваліцца. Праўда, з заручальным пярсцёнкам ходзіць і фотаздымак паказвала, але нешта не прывозіць яго. А фотку прыгожага мужыка можна нават з долара адрэзаць, — зласліва прамовіла Валянціна. — Ты можаш здзівіцца, чаму мы з ёй сябруем. Але ўяві сабе, калі ў цябе ўсё добра, калі ў цябе новая сукенка ці спадніца, калі ты прыгожая і зусім сталічная пані, перад кім ты будзеш хваліцца? Наташа атрым-

лівае асалоду ад красавання перада мной. Ну, фігура ў мяне пасля мяшка на другім месцы, але ж у мяне ёсць дзіця!

Яна пасцяліла мне ў зале, я прыйшла, каб нарэшце легчы, але ў крэсле сядзела дзяўчынка і з павагай перагортвала цвёрдыя старонкі альбома пра Адраджэнне.

— Глядзі! — яна здзіўлена тыцнула пальчыкам у постаць голага мужчыны.

— Тады так было модна рабіць, — я паспрабавала растлумачыць гэтае дзіва.

На наступнай старонцы пачынаўся артыкул пра Мікеланджэла. Над загалоўкам цяжка навісаў фотаздымак з выявай генія. Вочкі малой павялічыліся, яна скамянела і, не датыкаючыся паперы рукамі, сказала шэптам: «Нос, як у цёткі Наташы».

Наступным ранкам я дамовілася пра сустрэчу з бацькамі Алы. Валянціна смяялася:

— Куркулі гэтыя цябе, мабыць, і не пачастуюць нічым. Калі што дрэннае скажуць, не хвалюйся. Калі бацька яе...

— Ты хочаш сказаць айчым... — спыніла я яе парады.

— Якая розніца! Карацей, калі будзе рукі распускаць, не хвалюйся, ён бясшкодны, — Валянціна шматзначна засмяялася.

— Ну, я ж у штанах! Якія рукі, калі нават у сябе самой я не выклікаю ніякіх пачуццяў, — я ўзяла са стала кубачак з кавай і глытнула. У гэты момант у пакой ўбегла малая і тыцнула мне лялькай пад нос. Лялька была прыгожая, але кава апынулася на маіх светлых штанах. Валянціна замест таго каб папрасіць за дачку прабачэння, засмяялася сваім мужчынскім смехам і сказала:

— Ну, гэткія штаны Піліпу Казіміравічу дакладна не спадабаюцца. Ён у нас эстэт.

Я вырашыла не крыўдзіцца і папрасіла якую-небудзь вопратку. Валянціна, кабета самалётных га-

барытаў, падрагочваючы, пачала калупацца ў шафе і выцягваць сваё мешкаватае адзенне. Мне стала сумна. Але Валянціна раптам дастала з палічкі маленькую спаднічку:

— Малой маёй падарылі навырост... Але на тваю курыную дупку якраз насунецца.

Курыную дупку? Ну, дзякуй за камплімент. Але выбару не было. Стоячы перад нязручным люстэркам, я ўсё ж зразумела, што мне лепш не нахіляцца і не рабіць вялікіх крокаў, калі я не хачу прадэманстраваць усяму гораду сваю бялізну.

У такім нязвыклым выглядзе я даклыпала да дома, дзе жылі Агалецкія. Можна нават сказаць, што я пабыла ў скуры Алы, бо менавіта такія спаднічкі складалі яе гардэроб. Хлопцы нязмушана сачылі за мной позіркамі, а жанчыны няўхвальна хіталі галовамі.

Дзверы мне адчыніў Піліп Казіміравіч. Ён спрактыкаваным позіркам прайшоўся па маіх нагах і задумліва пашкроб падбароддзе. Аліна маці, Валерыя Генадзеўна, незадаволена акінула мяне позіркам і разгублена прамовіла:

— Я вас уяўляла крыху іншай...

Я паспрабавала патлумачыць сітуацыю, але Піліп Казіміравіч пяшчотна ўзяў мяне за руку і салодка загадаў:

— Не апраўдвайся, мілая! Лерачка, калі ласка, давай нам гарбату!

Валерыя Генадзеўна кінула на мужа спапяляльны позірк, прасіпела: «Пшэк юрлівы» і паслухмяна пайшла на кухню...

І хоць бацькі Алы мне нічога асаблівага не расказалі, яны мне вельмі спадабаліся. Прыгнечаныя смерцю дачкі, яны ўсё ж намагаліся быць гасціннымі і прыемнымі. Піліп Казіміравіч зусім не заляцаўся, толькі на развітанне пацалаваў руку, магчыма таму Валерыя Генадзеўна не нервавалася і нармальна са мной пагаварыла. Яны не закраналі даўняй гісто-

рыі з Ігарам і Таццянай, не сказалі пра Алу нічога дрэннага. Яны мала што ведалі пра яе жыццё, але мне падалося, што Ала ўсё ж падтрымлівала адносіны з маці. Валерыя Генадзеўна лічыла Алу сваім увасабленнем, таму не толькі не змагла ад яе адмовіцца, але нават ганарылася дачкой. Мне паказалі пакой Алы, дакладней, агульны пакой Алы і Тані. Аднолькавыя ложкі былі ўпрыгожаны цацкамі, на стале стаялі фотаздымкі ў рамках, на сцяне вісеў каляндар з выявамі кветак. «Разбураная ідылія, такая непадобная да сучаснай кватэры Алы», — чамусьці падумалася мне.

Відавочна адно: Ала любіла сваіх бацькоў. І тым больш недарэчнай выглядала гэтая прыкрая гісторыя з Ігарам. І толькі калі Піліп Казіміравіч, апавядаючы нешта пра Таню, сказаў: «Гонар і ўцеха мая, Танечка», а потым праз некалькі хвілін: «Прыгажуня Таццянка», я зразумела, што ўсё жыццё Алы было пакладзена на сцвярджэнне ўласнай прыгажосці і запатрабаванасці. І таму хлопца трэба было адбіць найперш ва ўласнай сястры, якая шмат гадоў была міжвольным інквізітарам.

А Валерыя Генадзеўна не хацела запешчваць старэйшую дачку, намагалася ставіцца да дзяцей аднолькава. Значыць, Але нават псіхалагічна патрабавалася шмат любові і захаплення ў дарослым жыцці. І гэтая прага прызнання і кахання загубіла яе жыццё. Цікава, якой была б Ала, калі б ёй штодня гаварылі, якая яна прыгожая? На дзіцячых фотаздымках Ала — брыдкае качаня, а Таня — анёльчык. Ды як гэта часта бывае, праз некалькі год яны памяняліся месцамі.

Агалецкія правялі мяне да ліфта, і Валерыя Генадзеўна, стоячы на парозе, папрасіла прабачэння:

— Мы, напэўна, вам ніяк не дапамаглі... І ведаеце, я нават сумняваюся, ці было забойства. У маім жыцці гэта ўжо нічога не зменіць...

Піліп Казіміравіч адчуў сябе лішнім і пайшоў у кватэру, і Валерыя Генадзеўна загаварыла вальней:

— Мне як крылы адрэзалі... Я, магчыма, была занадта строгай да яе... І ўжо нічога не змяніць... Нават прабачэння не папрасіць... — мне падалося, што зараз яна заплача, але яна ўтрымалася, крыху павярнула галаву і ўтаропілася позіркам у пустую сцяну.

З суседняй кватэры выйшаў малады мужчына. Ён павітаўся і націснуў кнопку выкліку ліфта. Валерыя Генадзеўна развіталася і зачыніла дзверы. Ужо ў ліфце сусед спытаў:

— Даруйце мой цынізм, Ала і на тым свеце нешта ўчыніла?

Я, расчуленая пакутамі Валерыі Генадзеўны, няветліва адказала:

— Прыберажыце свой цынізм да ўласнага гора.

— Прабачце мяне, мабыць, я нешта не так зразумеў, — засмуціўся ён.

— А як вы гэта не так зразумелі? — зацікавілася я.

— Я палічыў сябе за Шэрлака Холмса, але мой дэдуктыўны метад не апраўдаў сябе, — ён засмяяўся, заўважыўшы здзіўленне на маім твары. — Я добра ведаў Алу, таму палічыў... — ён узяў маю правую руку і тонам вопытнай цыганкі паведаміў: — Пярсцёнка заручальнага няма. А я ведаю толькі адну дзяўчыну, якая ўмела хутка і якасна здымаць такія ўпрыгожанні.

— Вы падумалі, што яна ў мяне адбіла хлопца? — засмяялася я. — Што вы! Маім хлопцам яна б пагрэбавала.

— Для Алы не было дрэнных хлопцаў! І Ала для ўсіх была марай. Майму сынку пяць гадкоў, і калі мы спыталі яго, з кім ён хацеў бы ажаніцца, ён упэўнена адказаў: «З цёткай Алай!» Ну, а вуснамі дзіцяці самі ведаеце, што гаворыць... Цяпер яму прыйдзецца шукаць іншую кандыдатку на ганаровую пасаду

жонкі. Дзякуй Богу, на Беларусі шмат прыгожых дзяўчат, — сказаў ён, абдымаючы мяне позіркам.

Трэба ж было зусім забыць, што я ўсё яшчэ ў гэтай ненавіснай спадніччы.

...Алена прасіла мяне, каб я ёй патэлефанавала з вакзала, як толькі вярнуся. Я пазваніла, і па мяне прыехаў Андрэй. Я здзівілася:

— Чаму ты, а не Алена?

— Ведаеш, ёсць такі лозунг пра Алу Агалецкую: жыла, жыве і будзе жыць, — зларадна ўсміхнуўся Андрэй.

— І што зараз? — абыякава спытала я.

— А зараз скандал! Прыбег кліент Алы, яна яму набыла ў прыбіральню не тую плітку, якую ён замаўляў. І фрызу да пліткі не купіла... І фугу блакітную, а ён хацеў белую... Бачу, што ты не разумееш, пра што гаворка, але гэта і неістотна. Галоўнае, што ён уляцеў з крыкам: «Я яе прыб'ю!» А я кажу: «Дык, можа, гэта вы яе і прыбілі. Загінула Ала». Ён Агалецкай так даверыўся, што на час рамонту з'ехаў у адпачынак. Я такога лопуха першы раз бачу. А з боку Алы гэта, няйнакш, гіпноз быў.

Алена бегала па кабінеце, як загнаны воўк, рукі ў яе трэсліся, і яна размаўляла сама з сабой.

— Алена, што з табой? — я нават перапужалася.

— Як можна было так зрабіць? — дзяўчына было проста ў шоку. — Я патэлефанавала ў магазін: Ала сапраўды купіла не тую плітку. Той, якая спадабалася гаспадару, не хапала. І Ала на сваю рызыку купіла іншую. Нават не папярэдзіла кліента.

— Ён сам вінаваты, што з'ехаў немаведама куды, — я паспрабавала апраўдаць Алу.

— Пляваць мне і на Алу, і на кліента, але гонар фірмы! — Алена села за стол і апусціла галаву на перакрыжаваныя рукі.

Праз паўгадзіны ў кабінет, падскокваючы і вальсуючы, увайшоў Андрэй:

— Ведаеце, ёсць такія мужчыны...

— Не да жартаў зараз, Андрэй! — перапыніла яго Алена.

— А я і не жартую. Я проста патэлефанаваў жонцы нашага паважанага кліента. Мой прыемны голас, які закранае самыя патаемныя струны жаночай душы і... хмм... цела, прымусіў яе прызнацца, што Ала атрымала дазвол выбраць любую плітку, якая ёй спадабаецца. Проста жонцы кліента цяпер плітка не спадабалася. І шаноўны спадар кліент вырашыў зрабіць пераробку за кошт фірмы, але сітуацыя пасля гэтай тэлефоннай размовы, як бачыце, крыху змянілася. Думаю, уласныя грошы ён пашкадуе...

— І... — задумліва працягнула Алена.

— І заўтра гэтая добрая жанчына, што не здолела супраціўляцца сексапільнаму тэмбру майго голасу, будзе сядзець перад люстэркам і зафарбоўваць сінякі, — засмяяўся Вараховіч.

— Муж быў дома! — здагадалася Алена і кінулася да Андрэя. — Як жа я цябе кахаю. Ты проста золата!

— О-о, колькі кампліментаў! — заўважыла я.

— Гэта не кампліменты! Гэта канстатацыя факта: валасы ў мяне залатыя, — Андрэй паказаў на сваю рудую галаву, — гадзіннік з золата, асадка з залатым пяром, а на падэшве золатам напісана фірма! Я залаты з ног да галавы!

— А з фугай што? — спытала Алена.

— Успомні, ён спачатку казаў толькі пра плітку. Калі яму паведамілі, што Ала загінула, ён і фугу прыплёў. Успомніла? Фугу ён выбіраў сам з нейкім сябрам! Алы няма, нічога даказаць нібыта немагчыма, вось ён і фугу вырашыў замяніць.

— І гэта табе жонка расказала? — нібыта раўніва здзівілася Алена.

— Я не настолькі ўсемагутны, каб прымусіць чалавека расказаць пра тое, чаго ён не ведае. Я толькі

што з кватэры. Паважаны таварыш узяў свайго сябра ў якасці групы падтрымкі. А сябар, чалавек просты, спытаў: «А дзе тая фуга, што я з табой выбіраў?!» Кліент ледзь не памёр. Ас-са, ас-са! — развесяліўшыся, Андрэй пачаў скакаць па кабінеце.

— По-о-олька беларуская... — заспявала зусім іншы матыў Алена, далучаючыся да д'ябальскіх скокаў.

— Аргентынскае танга-а-а! — я пачала таньчыць з уяўным партнёрам.

Дзверы ціхенька расчыніліся, у кабінет зазірнуў маленькі жаночы тварык і адразу ж знік, але мы не звярнулі на гэта ўвагі. Калі праз некалькі хвілін я прыадчыніла дзверы, каб выйсці ў прыбіральню, з кабінета насупраць (а гэта быў кабінет Алы) выйшла тая жанчына з маленькім тварыкам, абцягнула сукенку, зрабіла некаму знак, і за ёй з кабінета выйшаў малады мужчына. Я хуценька схапіла за рукаў Андрэя і паказала на іх.

— Сакратарка Сяргея Аляксандравіча і ягоны кіроўца, — сказаў ён мне і, павярнуўшыся да Алены, спытаў: — Спадарыня Белазёрава, што агульнага ў Мішкі і грымзы Віялеты?

— Ім абодвум мама даплачвае за «падрыўную» дзейнасць, ты ж у курсе, — спакойна адказала Алена.

— Ну, гэта я ведаю, а што яны рабілі ў кабінеце Алы? Спадарыня дэтэктыў іх засекла. Так што твае звесткі састарэлі, трэба наймаць свайго віжа — з'едліва прамовіў Андрэй і пацалаваў мне руку.

— Гэтая, як ты кажаш, Віялета паправіла сукенку. Можа, у іх каханне, — прапанавала я гіпотэзу.

— Не з Мішкіным шчасцем. Каб растапіць гэтую лядоўню, спатрэбіцца не адна дывізія гарачых іспанцаў. Мабыць, ім заробак павялічылі, калі так шчыруюць. А калі сур'ёзна, Віялета бачыла цябе і спадніцу для цябе абцягвала. Ты ў нас чалавек новы, недасведчаны, а Віялета добры псіхолаг, калі б ты

не паклікала мяне, то праз дзень бы ўжо казала, што бачыла, як яны займаюцца сексам, — вельмі сур'ёзна прамовіў Андрэй.

— Ды мне і зараз ужо здаецца, што я гэта бачыла, — пажартавала я.

— Думаеш, нешта шукалі? — спужана спытала Алена, прытуляючыся да Андрэя.

— Мяркую, што твая мама сваім шкодзіць не будзе, — сказаў хлопец, абдымаючы Алену.

На наступны дзень, як мы і дамаўляліся, Таццяна Агалецкая арганізавала мне сустрэчу са «сваім» Ігарам у невялічкім кафэ, насупраць офіса «РамСервісу». Мы аднойчы абедалі там з Аленай, і я прызначыла для сустрэчы менавіта гэтае месца. Ігар прыйшоў раней за мяне, і ў гэтым было нешта вельмі прыемнае, нібы гэта не сухая прымусовая сустрэча, а доўгачаканае спатканне. Калі мы вучыліся на першым курсе, Ігар неаднойчы прыходзіў да Алы, таму я яго крыху памятала. А вось ён мяне не пазнаў.

Мы наноў пазнаёміліся. Ён прайшоўся па мне вострым позіркам, які нібыта разрэзаў вопратку і скуру, і зараз Ігар ведаў пра мяне ўсё, нават тое, чаго не ведала я. Божа мой, як я не люблю такіх дасведчаных мужчын! Ён сеў, сплёў свае доўгія дагледжаныя пальцы, задумліва правёў языком па вуснах і нарэшце ўскінуў галаву, як бы дазваляючы мне гаварыць.

— Ты, напэўна, ведаеш, я хачу пагаварыць з табой пра Алу...

— Так. Калі б мог, забіў бы сябе за тую здраду.

— Але-е...

—Ведаю, ведаю, хочаш спытаць, чаму ж я гэта зрабіў. Ты ж Алу ведала! Яркая, прывабная, ніводзін мужчына не ўстаяў бы перад ёй. І я таксама. Ты не ўяўляеш, як добра, што яна загінула! Як быццам бы з мяне ўсе грахі змыліся, — адухоўлена прамовіў ён.

— Цікавая думка. Са святарамі не думаў падзяліцца? — паіранізавала я.

— Я думаў з усім светам падзяліцца! Калі б Таня мне даравала, я быў бы найлепшым мужам. Цяпер нам няма з-за каго варагаваць.

— Ты ведаеш якіх-небудзь ворагаў Алы? — Усё-такі мы сабраліся не для таго, каб абмяркоўваць іхнія адносіны.

— Смяешся? Вось ты ў гады студэнцтва яе любіла? Толькі шчыра! Можаш не адказваць. Сто працэнтаў, яна прываблівала ўсіх хлопцаў факультэта і перацягвала. Ад вас, шэрых мышак.

— Дзякуй, умееш рабіць кампліменты, — крыху пакрыўдзілася я.

— Няма за што. Таму, упэўнены, усе дзяўчаты без выключэння яе ненавідзелі. Так? Далей хлопцы. Усе ад яе вар'яцеюць. Яна да ўсіх уважлівая, і яны адзінокімі начамі цешаць сябе надзеямі. Ведаеш, яе не цікавілі плейбоі. А вось цнатліўчыкі — іншая справа, — абвясціў ён. — Як гэта цікава адкрыць дзіцятку сапраўднае жыццё! І ўсе наступныя гады яны хадзілі з адчуваннем, што іх брудна скарысталі. Мужчыны, нават самыя жанчынападобныя, любяць самі перамагаць, — павучаў Ігар.

— Бачу, ты нядрэнна ведаеш жаночую псіхалогію, — заўважыла я.

— Хлопцы вымушаны станавіцца добрымі псіхолагамі, каб заўсёды падтрымліваць форму, гэта як быць паляўнічым, — пахваліўся Ігар.

— Твой паляўнічы азарт разбіў жыццё столькім людзям, і пасля гэтага табе не сорамна пра яго разважаць? — пакпіла я.

— У тыя часы, калі мяне так танна прадалі, я яшчэ не ведаў такіх жанчын. А вось ты, разумніца, паўтараеш памылку Таццяны. Як звычайна кажуць у такіх выпадках: я кахаў яе ўсёй душой, — летуценна прамовіў Ігар.

— Наколькі я ведаю, і целам, — нахабна ўдакладніла я.

— І целам, — Ігар усміхнуўся. — Хочаш, адкрыю табе маленькі сакрэт? Каб не рабіла памылак. Уяві, мы з Таццянай у інтымнай абстаноўцы. Цемра, ложак і ўсё такое. Яна ў джынсах. Я пачынаю расшпільваць рамень на ёй, потым самі джынсы. А потым як ўдар маланкі: як быццам бы я з хлопцам. Кожны дзень на сабе расшпільваю гэткі ж рамень. І ніякага жадання займацца «гомасексуалізмам» не ўзнікае. Ну, што ты смяешся? Уяві, што ў цябе ёсць сябар-шатландзец. У спадніцы, канешне. І ты здымаеш з яго спадніцу. Табе б на нейкі момант здалося, што ты лесбіянка. Вось, а мне здавалася, што я «блакітны». Ала ж ў самыя моцныя маразы — у спадніцы. Ала ў самыя моцныя маразы — жанчына. Во сцерва! Яна нас ведала як аблупленых. Гэта зараз я на такое не куплюся. Ды час ужо, хутка трыццаць будзе.

— І тут ты зразумеў, што лепшай жонкі, чым Таня, не знойдзеш? І ўсе гэтыя сем год ты гэта ведаў, але так і не паспрабаваў прызнацца? — бязлітасна спытала я.

— А ты лічыш, можна дараваць тое, што я зрабіў? Калі б не Ала, калі б не я, мой сын ужо пайшоў бы ў школу. Ты разумееш, што я страціў, што Таня страціла? Хіба гэта можна дараваць? — ён нібы гаварыў на судзе абвінаваўчую прамову супраць сябе.

— Я хутчэй за ўсё не даравала б. Але Таня кахае цябе неяк па-вар'яцку. Дзякуй табе за размову і за адкрыццё. А то ўсё жыццё хадзіла б непісьменнай і ў джынсах, — жартаўліва падзякавала я.

— Няма за што, шаноўная! — у тон мне адказаў Ігар.

Мы ўжо збіраліся ўставаць з-за століка, як падышоў Андрэй:

— Добры дзень! Дазволіце да вас далучыцца?

Мне падалося нясціплым ягонае запытанне, ды раптам я заўважыла, як ён глядзеў на Ігара, а Ігар на яго. Нібы яны былі калісь знаёмымі, а зараз вырашаюць, прызнацца ў гэтым ці не. У нейкія сотыя долі секунды яны ўсё ўзважылі (прафесійная звычка хутка прымаць рашэнні!) і... не прызналіся. Андрэй мог, канешне, бачыць Ігара ў студэнцкім інтэрнаце. Але гэта было нешта большае за звычайнае прыпамінанне. Інтуіцыя падказвала мне, што яны добра знаёмыя. Можа, нейкія прафесійныя інтарэсы? Але чаму яны не захацелі прызнацца? І ўвогуле, што іх можа аб'ядноўваць, акрамя старога кахання да Алы? Што?

Асабістае жыццё ў Алы было на «выдатна». А наконт грамадскага я вырашыла пацікавіцца ў яе непасрэднага начальніка Сяргея Аляксандравіча Белазёрава, які толькі сёння вярнуўся з замежнай камандзіроўкі.

Але ж гэта не Ігар і не Андрэй, каб проста спытаць: а вы за што яе не любілі?

Таму Алена сама пайшла да бацькі, каб патлумачыць сітуацыю. Праз хвіліну яна выйшла і сказала:

— Я ж казала, мой бацька — самы найлепшы бацька ў свеце. — І яна паказала рукой, што можна зайсці.

Сяргей Аляксандравіч пачаў гаварыць першым:

— Алена расказала мне пра вашае агульнае расследаванне, я ўражаны яе ініцыятыўнасцю. І калі вы так сур'ёзна заняліся гэтай праблемай, вам не лішне будзе даведацца пра пэўныя нюансы. Але гэта зробіць вашу работу бессэнсоўнай.

— Для пачатку ўсё ж раскажыце, — холадна папрасіла я.

— Ала была амаль прафесійнай шантажысткай. Дарэчы, усё, што яна рабіла, яна рабіла бездакорна. І калі працавала, і калі помсціла, вы ўжо мне паверце, — ён неверагодна шчыра ўсміхнуўся.

— А-а... Адкуль вы пра шантаж ведаеце? — я ўжо асмялела.

— Я — адна з яе апошніх ахвяр. Алена, вядома ж, нічога не ведала пра гэткае экзатычнае хобі сяброўкі. — Ён так паглядзеў на мяне, што я зразумела: Алена ніколі не павінна даведацца пра гэта. — А найапошняя ахвяра, як я разумею, яе забіла. І, магчыма, не варта нікога шукаць. Гэта, калі можна так сказаць, абарона. А вам, зразумела, цікава, чым яна мне пагражала.

— Ну, вядома ... — я ўся пераўтварылася ў вушы, а фантазія мая прыгатавалася ўзнаўляць каляровыя малюнкі шантажу.

— А вось і не скажу, — ён гучна разрагатаўся, але пакрыўдзіцца на яго чамусьці было немагчыма. Ён нарэшце супакоіўся, нармальны колер вярнуўся на ягоны твар, Сяргей Аляксандравіч паправіў гальштук і прымірэнча прамовіў: — Прабач, але не змог устрымацца, каб не пажартаваць. Неяк Ала затрацавалася, дзесяць гадзін, а яна ў сваім кабінеце. Я якраз збіраўся ехаць ужо дадому, яна зайшла да мяне з маім жа кіроўцам Мішам, трэба адзначыць, хлопцам звышнаіўным. Ды і я таксама добры дурань. Яна сказала, што да Новага года рыхтуе сценгазету, і прапанавала: «Давайце зробім смешныя фатаграфіі». І трэба ж мне быць такім ідыётам, каб згадзіцца. Не хачу нават расказваць, у якіх пастаВах мы сфатаграфаваліся... І праз пару дзён яна зайшла ў мой кабінет і кінула на стол фотаздымкі.

— І няўжо вы нічога не маглі зрабіць? — пакпіла я з яго.

— Нічога ты не разумееш. Гэтая дзяўчына — проста майстар фальсіфікацый. Зразумела, я ні ў чым не вінаваты. Але! У Жанны Кірылаўны — гіпертанія, яна ўвесь час жыве пад пагрозай інсульту. Мая жонка цярпець не магла Алу і была супраць таго, каб Алена з ёй сябравала. І ўяві, што Ала прыходзіць да маёй Жанны Кірылаўны з гэткімі фотаздымкамі.

Ці, лепш, не прыходзіць — проста дасылае па пошце. Калі б яна сама прыйшла, жонка б ёй ніколі не паверыла, а вось нейкаму добраахвотніку! Гэтая навіна забіла б яе. Не проста здрадзіў, а з Алай!!! І не было б сэнсу апраўдвацца. А праз якую б хвіліну апраўданні і не спатрэбіліся б. Вы зараз скажаце, што я мог бы і сам расказаць у сваёй інтэрпрэтацыі. Мог, але не расказаў. Баяўся? Саромеўся? Не ведаю. А можа, цешыў сябе думкай, што не залежу ад Алы, што магу адкрыцца ў любы момант.

— Ала патрабавала грошай?

— Не, ёй было дастаткова ўсведамлення сваёй улады. Але я дакладна ведаю: я не адзіная яе ахвяра. Гэта было яе хобі. Нехта збірае манеты, нехта рэдкія кнігі. Яна збірала дасье на людзей з дэфектамі біяграфіі.

— Значыць, знайсці забойцу немагчыма?

— А навошта? Ала была д'яблам у плоці. А вы... вы — нядрэнная дзяўчына. Кіньце ўсё гэта. Нашто марнаваць свой час? А? Я толькі хацеў папрасіць вас, можа б, вы знайшлі тыя фотаздымкі. У яе кабінеце іх няма, магчыма, яны — у кватэры. Пашукайце, калі ласка!

Тут нехта да яго зайшоў, і Сяргей Аляксандравіч адразу пачаў гаварыць па-руску, кінуўшы мне на развітанне «да пабачэння!». Будучыня за людзьмі, якія імкнуцца рабіць іншым прыемнае, і гэта не прыстасоўванне. Сяргей Аляксандравіч ведаў, што мне будзе прыемна чуць беларускую мову, і ён зрабіў мне гэтую ласку. Яму ж сапраўды гэта нічога не каштавала.

Мне ўжо пачынала надакучваць, што ўсе адгаворваюць мяне ад расследавання. Я не стала турбаваць Алену і паехала дахаты на метро. Я стаяла на пероне, калі да мяне падкацілася тоўсценькая бабка і пачала соваць мне ў рукі «рэкламку» нейкай царквы. Я адмовілася. Яна стала ў паставу тыгра

перад скачком, наколькі гэта было магчыма пры яе вазе.

— Ты ў Бога не верыш? — строга запытала яна.

— Веру, — шчыра адказала я.

— Дык ты, можа, была ўжо ў гэтай царкве? — палагаднела бабка.

— Я не хаджу ў цэрквы, — катэгарычна прамовіла я.

— Чаму? — аж разгубілася апалагетка царквы.

— Проста так, — ціха, але цвёрда адказала я.

— Беражы цябе Бог, даражэнькая! — яна адступіла ад мяне як ад пракажонай і перахрысціла паветра.

І я раптам адчула, як даўно я не трымала ў руках Біблію, якая я ўся грэшная і брудная. І стала сорамна перад сабой і перад Богам. Я сапраўды даўно не хадзіла ў царкву. Асабліва пасля таго, як у час цяжкай хваробы майго дзядзькі ў цёткі Марыі ў Божым храме запатрабавалі грошы за маральную падтрымку. Калі б той поп толькі пагаварыў з ёй, яна ўдвая болей аддзячыла б. Яе ж да папа нават не дапусцілі. Маўляў, давай спачатку грошы, пакутніца. Дзядзька надзіва ўсім дактарам акрыяў. І потым жартаваў, што гэта Бог прасіў прабачэння за сваіх «старанных» служак. У царкву я не хадзіла, але Біблію мела. Зрэдку я яе чытала, калі было асабліва цяжка. У лепшыя ж часы мне было дастаткова проста патрымаць яе ў руках. Яна супакойвала і дазваляла як бы дакрануцца да Бога.

Я ведала, што Біблія ў Алы павінна быць дакладна. На першым курсе мы ўсе купілі гэтую самую разумную ў свеце кнігу, праўда, не для штодзённага чытання, а для міфалагічнага аналізу. Мая суседка па інтэрнацкім пакойчыку так натхнілася, што кінулася ў рэлігію і хлопца свайго пацягнула. Бацькі ледзьве адгаварылі іх ад пострыгу. І зараз яны поп і пападдзя. Ды Ала ніколі не думала пра манастыр, хоць у яе было нават дзве Біблії. Адна, сціплая, якую

яна купіла разам з намі, а другая, у шыкоўнай вокладцы, толькі што не ў золаце, — падарунак чарговага кавалера.

Біблію ў кватэры Алы я знайшла адразу. Ха, няўжо яна часта ёю карысталася? Грахі замольвала? Кніжка сама раскрылася на дзесяці запаветах. Насупраць кожнага сказу было напісана алоўкам: «Ёсць!» А насупраць «не пажадай жонкі бліжняга свайго» было дапісана: «З папраўкай на мой жаночы пол — не пажадай мужа бліжняй сваёй». І замест «ёсць» было напісана: «Аблом».

Яна што, адбіла чужога мужа? Але ж я памятала пра гальштук і дзве зубныя шчоткі і падумала, што гэта таксама для паказухі, тым больш што кніга сама адкрылася на гэтых старонках.

Я разумела, што трэба абшукаць кватэру, раней мне здавалася, што анёл Ала недзе зверху глядзіць на гэты свет, але зараз я адчувала, што з пекла ёй не будзе відаць яе кватэры. Ужо не было ніякага шкадавання, ды і кватэра, якую я абжыла, не памятала больш Алу.

Нарэшце прыйшоў час пераглядзець яе паперы. Павінны ж быць недзе дзённікі, фотаздымкі, нешта, што дапаможа праясніць сітуацыю. І даказаць, што яна сапраўды была шантажысткай.

Ніякіх дзённікаў я не знайшла, а вось фотаздымкаў было навалам. Ала была то Каралевай Жахлівых Ільдоў, то Прынцэсай Паўднёвага Мора. Калі ж забыць, што яна загінула, што пры жыцці была лгунняй і шантажысткай, калі пра ўсё гэта забыць, то можна было ўбачыць, што яна была сапраўды прыгожай. Прыгожай нейкай лабараторнай, стэрыльнай прыгажосцю. Калі б я не вучылася з ёй на адным курсе, я не паверыла б, што гэты цуд, гэты ідэал мог існаваць.

Але ў наступным альбоме фатаграфіі былі зусім іншага плану. Аголеная, яна ляжала ў ложку, сядзела на стале, ела вішні. У мяне быў адзін нясціп-

лы фотаздымак: я ў расшпіленай кашулі на голае цела. Але там нічога не было бачна, усё патрэбнае павінна была дамаляваць фантазія гледача. Увогуле, я саромелася свайго цела, не лічыла яго нечым надзвычай прыгожым. Але нават калі б у мяне была такая бездакорная, як у Алы, фігура, я пасаромелася хаця б фатографа.

На самым сціплым фотаздымку яна голая па пояс, у адных джынсах, прасавала сабе кашулю. На наступным фота яна апранала джынсы так, каб было бачна, што апранае іх на голае цела. На яе выдатнае, бездакорнае голае цела. Мне здавалася, я разумею Ігара, які пакінуў ціхмяную Таню дзеля вось гэтай багіні. Пра самыя нясціплыя фоткі не буду нічога казаць. Ад сарамлівай эротыкі да жорсткага порна. Ну, проста знаходка для «Плейбоя».

Але я, наіўная, дарма так моцна ўразілася, бо калі я пачала праглядаць яе відэакасеты, мне ўвогуле стала млосна. Тым больш што прыйшла з працы Алена. Не скажаш, што нармальна глядзець порнафоткі і порнакасеты, а глядзець гэта ўсё ўдзвюх — проста нейкая анамалія. Ды ў пошуках злачынцы мы былі гатовыя нават на гэта. Калі б у нас не было такой высокай мэты, мы знайшлі б іншую прычыну, каб прагледзець відэаархіў Алы.

Здавалася, нехта забаўляўся з відэакамерай. Здымаў, відавочна, мужчына: камера няспешна праходзіла па неапранутаму целу Алы. Яна мяняла паставы і спакушала аператара. Яна то рыхтавала ложак, нясціпла нахіляючыся, то прымервала бялізну для інтымных ігрышчаў. Раптам на экране з'явілася дата. У гэтым годзе мы вучыліся на другім курсе, значыць, здымаў Андрэй. Божа мой, я нават памятаю тыя дні! Стрыечны брат Андрэя пазычыў яму на тыдзень камеру, і Андрэй здымаў нас усіх падрад. З таго часу й скончылася каханне Алы і Андрэя. Стрыечнік параіў з такой лярвай больш не сустракацца, а звярнуць увагу на каго-небудзь інша-

га. І Андрэй пераключыўся на Алену. Я падзякавала Богу, што якраз у гэты момант Алена пайшла на кухню паглядзець, як там бульба.

Я хацела выключыць тэлевізар, сказаўшы, што не магу я больш глядзець. Адчуванне, нібы падглядаеш. Але Алена пасмяялася і пажадала глядзець далей. Мне падалося, што яна павінна была б ведаць, што гэта з Алай Андрэй. Але яна ні пра што не здагадвалася.

Ала ўсё спакушала аператара. Нарэшце яна ляпнула рукой побач з сабой, камеру асцярожна паклалі на стол, але не выключылі. Калі ў кадры побач з Алай з'явіўся голы мужчына, я падумала, што ў Алены зараз будзе нервовы зрыў. Але твару мужчыны не было бачна. Затое было відаць усё астатняе. І гэта «ўсё астатняе» ўражвала.

Смелыя рухі, нястрымныя жаданні. Яны займаліся сексам як прафесійныя акцёры, такі секс можна пабачыць толькі ў кіно. У жыцці ўсё больш празаічна і хутка. Магчыма, канешне, яны працавалі на камеру, але нехта б і хацеў папрацаваць на камеру, ды не атрымалася б. Вось, напрыклад, у майго хлопца. У яго б ніколі так не атрымалася. Мяне захлынула зайздрасць да Алы. Канешне, зараз Андрэй з Аленай жаніхаюцца. Але я ўпэўненая, з ёй ён звычайны хлопец, а ніякі не супергігант. З Алай, мабыць, усе хлопцы былі сексуальнымі монстрамі, нават пачынальнікі.

Гэта было як штуршок. Нейкая Ала ў сваёй нахабнасці і смеласці атрымоўвала ў жыцці самае лепшае. Дакладней — не атрымоўвала, усё побач з ёй станавілася іншым. Які ціхмяны Андрэй з Аленай, і вось які ён з Алай.

«Што было ў яе такога, чаго няма ў мяне?» — падумала я. Алена, мабыць, адчувала тое самае. Мне хацелася сказаць: «У цябе ёсць гэткі супермужчына!» Але тады яна гэтага звышмужчыну выкрэсліла б са свайго жыцця. Дарэчы, Ала не магла б шанта-

жыравяць Андрэя гэтай касетай. Твару не было бачна. А дату можна падрабіць. Мы дагледзелі фільм як дармовае порна.

Ала запісвала на відэа ўсе знамянальныя падзеі свайго жыцця, не было там толькі сцэны яе смерці. А шкада, бо назаўтра я ад'язджала. Мяне чакаў мой родны радыяактыўны гарадок і мой неактыўны хлопец. Я выйшла на балкон апошні раз паглядзець на Уручча з яго кальцавой дарогай і урбанізаванымі лясамі. На суседнім незашклёным балконе стаяў хлопец гадоў шаснаццаці:

— Ты будзеш тут жыць замест Алы?

— Не, я сёння ад'язджаю. А ты ведаў Алу? — ухапілася я за магчымасць дазнацца пра што-небудзь новае.

— Я з ёй сябраваў, — з гонарам паведаміў хлапчына.

— Я прыехала сюды, каб знайсці яе забойцу, але нічога не атрымалася. Ніхто нічога не расказвае, усе толькі адгаворваюць, — паскардзілася я.

— Я магу табе пра яе расказаць. Толькі я не магу да цябе прыйсці: я нагу зламаў. Таму давай ты да мяне, — запрасіў хлопец.

Ён сустрэў мяне на мыліцах і з нагой у гіпсавым кокане:

— Пастаў басаножкі ў шафу, бо абутак — любімая страва майго спаніэля. Хадзем на кухню. О, я не сказаў, я — Віця. Праўда, Ала была вельмі прыгожай?

— Праўда, Віця, — згадзілася я.

— Яна была такой добрай, шчырай, — здавалася, ён мог хваліць яе бясконца.

У кантэксце ўсяго, што я пра яе ведала, гэта гучала як здзек.

— Добрай? Шчырай? — здзівілася я.

— Памятаю, я згубіў быў ключы ад кватэры і сядзеў пад дзвярыма, чакаў маму. Мы жывём з ёй удваіх. А бацька жыве з нейкай пятнаццацігадовай.

Ну, дык сяджу я. І тут прыйшла Ала з працы. Пажартавала наконт таго, што я ахоўваю кватэры. І запрасіла да сябе. Я, вядома ж, адмовіўся. Яна мяне сілай зацягнула. Прыгатавала вячэру, спытала пра школу. І я неяк узяў і расказаў пра адносіны з дзяўчатамі, пра нянавісць да мяне нашай беларусіцы. У мяне і па белмове, і па белліту траякі стаялі, а ўсе іншыя адзнакі — пяцёркі і чацвёркі. Крыўдна было. І тут аказалася, што Ала філфак скончыла, — адчувалася, што Віця не ўпершыню расказвае гэтую гісторыю, бо гаварыў ён хутка, нібыта я ўсё гэта ведаю, і зараз толькі аднаўляю ў памяці.

— Так, яна скончыла філфак.

— І яна пачала мяне вучыць. Бясплатна! Кніжкі добрыя давала, правілы тлумачыла. Я зараз у 11-ты перайшоў. Сярэбраны медаль будзе. І ўсё дзякуючы ёй.

— Ты так апантана пра яе расказваеш! Я не ведала яе такой.

— Яна магла быць рознай. Я ведаў яе такой, ты — іншай. Але яе светлы вобраз назаўсёды застанецца ў маёй памяці і маім сэрцы. Хочаш мінералкі?

Ала, мабыць, успомніўшы сваё басаногае дзяцінства, карміла яго, вучыла, не здзіўлюся, калі і апранала. Вось і ўся любоў. Ну дзякуй Богу, хоць адзін чалавек нешта добрае пра Алу сказаў.

І тут мяне як працяла. «Ведаеш, яе не цікавілі плейбоі. А вось цнатліўчыкі — іншая справа». Божа, няўжо яна і дзіця не пашкадавала? І я адразу адчула, што мяне ў ім здзівіла. Адна мая сяброўка кажа: хлопцы, набыўшы такі-сякі сексуальны вопыт, адразу мяняюцца ў паводзінах. Больш смелыя, больш нахабныя. Не баяцца жанчын, а наадварот, даюць ім зразумець, што іх нічым не здзівіш. І Віця паказваў, што яго нічым не ўразіш. Узнікала пачуццё, якое не патлумачыш словамі. Быццам бы перад табой сталы мужчына, а між тым усё яшчэ дзіця.

Ён быў даволі тоўстым для сваіх метра сямідзесяці. Джынсы цесна абцягвалі ягоную фігуру, і я не ведаю, як можна сумясціць нагу ў гіпсе і джынсы. Чорная майка не хавала тоўстых рук і жывата, але ягоны «тлушч» не выклікаў гідлівасці, наадварот, у гэтым было нешта прыемнае, прыцягальнае і... даступнае. Віця як бы ставіў за мэту спакушаць і падабацца. Гэта ў яго атрымоўвалася. Хацелася яго абняць. Побач з ім лёгка было быць жанчынай, бо ён успрымаў цябе найперш як жанчыну, а толькі потым як асобу. Але ж ён усяго толькі семнаццацігадовае дзіця. Калі ў яго з Алай нешта было, то я ўжо не ведаю, хто каго спакусіў. Ён глядзеў на мяне з цікавасцю: ці падзейнічае на мяне ягоная сексапільнасць. Я зразумела сэнс ягонага запрашэння: яму зусім нецікава было гаварыць пра Алу, ён проста хацеў паэксперыментаваць. Займець яшчэ адну ахвяру? Віця сам ахвяра ранняга сексуальнага вопыту. У кожным разе ён павінен ведаць пра яе жыццё больш, чым няўдалыя сяброўкі і сябры.

— Віця, у Алы быў хлопец?

Ён як быццам бы чакаў гэтага пытання, бо занадта хутка вымавіў:

— Андрэй Вараховіч.

— О, не. Ён проста сябар, — расчаравана адказала я.

— Я гэта *ведаю*, — запэўніў хлопец.

— Ала гаварыла? — недаверліва спытала я.

— Не. Вы ж бачылі, у нас балкон незашклёны. І калі крыху высунуцца, можна ўгледзець, што адбываецца ў спальні. Так што я бачыў, як яны «сябравалі». Я чаму падумаў, што вы тут жыць будзеце, я бачыў — вы спалі на яе ложку.

Калі я вярнулася ў кватэру Алы, першае, што я зрабіла, гэта зашторыла акно ў спальні, потым села на камод і пачала ўспамінаць размову з Віцем. Та-ак, а што тут у шуфлядках? Сапраўдны вышукальнік з гэтага б пачынаў, а я ўсё саромелася і вось заглянд-

ваю ў апошні момант. У адной шуфлядцы — шыкоўная бялізна, некаторыя рэчы шчэ з этыкеткамі. Нядаўна купляла. Для каго ж яна старалася? Для Андрэя? У другой шуфлядцы — усё для таго, каб Агалецкія-старэйшыя не сталі дзедам і бабай. Нават у прэзерватываў ёсць тэрмін захоўвання, значыць, усім гэтым яна планавала скарыстацца.

Так гэта Андрэй. Быў каханкам, мог стаць і забойцам. Але наколькі можна верыць у гэту інфармацыю? Віця — хлопец дзіўны. Андрэй мог яго нечым пакрыўдзіць, нават выпадкова. І тут Віця атрымоўвае магчымасць яму шыкоўна адпомсціць. Ужо занадта падрыхтаваным выглядаў ягоны адказ на пытанне пра хлопца Алы. А можа, ён толькі і ведаў пра Алу, што яна філфак скончыла і што сябравала з Андрэем і Аленай? Мяне ж можна дурыць. Я пра яе ведаю так шмат, што, можна сказаць, нічога не ведаю. Можа, усё прыдумаў, можа, ён увогуле вар'ят. Што, я ў яго даведку з псіхбальніцы буду патрабаваць?!

Але ў мяне ўжо было адчуванне, што я на патрэбным шляху. Што я трымаю ў руках нітку, якая прывядзе да забойцы. Ці проста дапаможа зразумець сітуацыю, і ніякага забойцы шукаць не спатрэбіцца. Але пачуццё гэтае панавала ў падсвядомасці, і выцягнуць яго адтуль не было ніякай магчымасці. У такія моманты працей забыцца на ўсё, і яно само вернецца. Ці не вернецца? Мне ўжо ўсё адно: білеты набыла. Алу мог забіць хто заўгодна, любы яе знаёмы. І Андрэй, і Сяргей Аляксандравіч, і Ігар, і гэты вар'ят Віця. Урэшце сама Алена. У Алы быў талент перашкаджаць другім жыць. А з магілы яна мне жыць не дае.

Лепш пра ўсё забыць і пачаць нарэшце збіраць рэчы. Я адкрыла шафу ў калідоры і ўзяла свае басаножкі, каб запакаваць. І мне падалося, быццам бы я гэта ўжо недзе бачыла.

Канешне, бачыла! У суседа Віці. Гэта былі аднолькавыя двухпакаёўкі з аднолькавымі шафамі, умайстраванымі ў нішу. Толькі ў час рамонту Ала заклеіла белыя непрывабныя дзверы каляровай (пад бук) плёнкай. А ўнутры шафы аднолькавыя.

Не, не аднолькавыя. У Віці басаножкі ад сабакі я ставіла на палічку такую знізу. У Алы такой палічкі не было. Я стала наўколенцы і пачала разглядаць шафу.

Канешне! Палічка была. Але калі Ала рабіла рамонт, то не перасцілала паркет. І тыя пятнаццаць сантыметраў паркету, які гадоў пяць таму клалі на бітум, проста параўнялі падлогу і палічку. Гэта значыць, што калі выняць палічку, то ўнізе будзе нешта кшталту сховішча...

Так і ёсць! Там ляжала папка, у якой былі фотаздымкі з Сяргеем Аляксандравічам. Як усё проста і геніяльна. Не пойдзеш жа ў міліцыю з-за нейкіх жартоўных фотаздымкаў. Там толькі пасмяюцца і параяць болей так не рабіць. Ну, скажыце, чаго гэтай дзяўчыне не хапала?! Вострых пачуццяў? Канфлікту з законам? Чаго яшчэ? Увогуле, мне падалося, што дарма Сяргей Аляксандравіч так хаваў гэтую гісторыю ад жонкі, відавочна, яна ўжо ўсё ведала, таму і загадала Віялеце і Мішку абшукаць кабінет Алы.

А побач з папкай ляжаў дзённік Алы. Я адгарнула яго на апошняй спісанай старонцы: «Андрэй сабраўся зрабіць афіцыйную прапанову Алене. Я ж застануся... як кінуты сабака. Я расказала яму, як зруйнавала жыццё сваёй сястры і яе жаніху. Маю вопыт таптання па чужым шчасці. Я яго папярэдзіла, хай толькі паспрабуе. Ён сказаў, што я, як наркотык, але кахае ён яе. І што я лгуння. І што ён не баіцца мяне, бо сапраўднае каханне не заб'еш нават здрадай. Але гэта ён так сам сябе супакойвае. Паглядзім, што будзе, калі я раскажу ўсё Алене. Сто працэнтаў, яна шчэ будзе ўдзячнай, што я раскры-

ла ёй вочкі. І дзвесце працэнтаў, што мы застанемся сяброўкамі. Ён можа пазбавіць мяне толькі *мужчыны*. Знайду іншага (ужо знайшла). Я ж пазбаўлю яго жанчыны, працы, кватэры, грошай, прэстыжу — *усяго*! Гэтага шлюбу не будзе...»

І я пайшла распакоўваць чамадан. Ну, што тут незразумелага? Усё відавочна. Але пры чым тут ролікі? У любым выпадку трэба тэрмінова сустрэцца з Андрэем. Як кажуць, выслухаць абодва бакі. Але калі забойца ён, то трэба неяк забяспечыць маю ўласную бяспеку. Не, паклікаць Алену я таксама не магу, бо гэта значыць ажыццявіць мару Алы. Зброі ў мяне не было. І заставалася толькі спадзявацца, што Андрэй не захоча сядзець за два забойствы. Я прылегла на ложак, узяла паперчыну, каб усё яшчэ раз праверыць, малявала схемы, супастаўляла факты. Я, прабачце, усяго толькі філолаг. І гэткая «матэматычная» праблема выклікала максімальнае напружанне маіх гуманітарных мазгоў.

І тут загучала музыка. Яна не проста загучала, яна ўзарвала паветра. Суседзям зверху зусім неабавязкова было рабіць мне такое «шчасце». Я адчувала, што вар'яцею. Я стаю на мяжы жыцця і смерці, а нехта яшчэ ў дадатак здзекуецца з мяне. Я наведала б суседзяў і ў ніжняй бялізне, але нейкія аскепкі розуму прымусілі мяне накінуць пеньюар Алы. І гэткай фурыяй я ўзляцела на наступны паверх. Ах, уявіце сабе, яны нават не здагадваліся, што ствараюць некаму невыносныя ўмовы! І на мае пагрозы маленькая штучная бландынка гадоў за 30 стрымана адказала:

— No problems! Валерра-а! — У апошнім слове «р» прагучала таксама па-англійску. Гэта выглядала смешна і крыху недарэчна.

Ейны Валера зразумеў усё з паўслова, і вушы ўзарвала на гэты раз цішыня. Цётка назвалася Ларысай, і пацікавілася, адкуль я такая ўзялася. Калі ж даведалася, што знізу, то яе гэта моцна ўразіла. Ейны

Валера таксама ўразіўся, пусціўшы свае вочы гуляць па аголеных частках майго цела. Маё «паходжанне» яго дакладна не цікавіла. Ён так на мяне глядзеў, ледзь у дэкальтэ не зазіраў, быццам бы ніколі жанчыну ў пеньюары не бачыў. Бо і адзенне ён такімі вачамі разглядаў, што калі б я прыйшла голай, ён меней бы здзівіўся. Ну як суседзі падбіраюцца! Знізу жыла звышсексуальная Ала, а зверху яе процілегласць — кавалачак мяса Ларыса.

Андрэй адразу здагадаўся, пра што я збіраюся пагаварыць. І мне здалося, што яму так нават лягчэй. Я паказала яму дзённік, відэакасету. І ён усё сам расказаў:

— Я не ведаю, чаму я быў і з ёй, і з Аленай. Я не мог нічога з сабой зрабіць. Цяпер гэта здаецца жахлівым. З Алай займаешся нейкім феерычным сексам, але праз хвіліну саромеешся гэтага. Я сказаў ёй, што яна наркотык. І ад гэтай залежнасці хочацца пазбавіцца. Яна крычала, што Алена не жанчына, а бляклы цень і мне ніколі не будзе з ёй добра. Я крычаў, што Алена — сапраўдны чалавек, а не падманка, што мне з ёй хораша, што яна чыстая і адкрытая. Што Ала — апошняя лгуння. Я не ведаю, чаму яна так за мяне чаплялася, яна лёгка знайшла б іншага. Яна разрыдалася і спытала, калі яна лгала.

Магчыма, трэба было яе пашкадаваць. Але мне здавалася, што я зраблю апошні крок — і назаўжды разарву гэтую сувязь. І я сказаў: ну, хаця б тыя ж ролікі. Яна проста павалілася ў ложак і рыдала, рыдала. І я пайшоў ад яе. Мне нават падалося, што яна кахае мяне. Разумееш, так не сыграла б нават Ала. Яна магла зымітаваць гонар, пагарду, закаханасць, але толькі не прыніжэнне, толькі не слёзы. Я ніколі не бачыў, каб яна плакала. Толькі ад смеху, магчыма. У той жа вечар яна патэлефанавала і папрасіла аб сустрэчы. Менавіта папрасіла. Але яна

памылілася, даўшы мне час падумаць. Я не хацеў яе бачыць. І ўсё ж нешта ў яе інтанацыі прымусіла мяне згадзіцца. Я ведаў пра магчымасць правакацыі. Ды не баяўся. Бо сапраўды кахаў Алену і кахаю зараз. І калі б яна ад мяне адмовілася, то я так і жыў бы адзін, не шукаючы больш кахання, — пафасна прамовіў Андрэй. — Сустрэчу, як ты разумееш, яна прызначыла ля ўвахода на Цэнтральны рынак будаўнічых матэрыялаў. Я пад'язджаў на машыне і яшчэ здалёк ўбачыў яе. Яна была ў роліках, як заўсёды кідка апранутая, але зараз гэта быў такі дысананс. Я павольна пад'язджаў — і тут яна кінулася пад машыну. Я чакаў нейкай пазаштатнай сітуацыі і паспеў крутануць руль. Яна нават не дакранулася да маёй машыны, я бачыў у люстэрка, як яна неяк паўсядзела-паўляжала, і плечы яе трэсліся ў рыданнях. І я з'ехаў адтуль. Яна была *жывая*, калі я ад'язджаў. Разумееш? Я не ведаю, як яна магла загінуць. Яе не мог выпадкова пераехаць нехта іншы. Яе было відаць нават пры выключаных фарах. Белыя джынсы і белая кашуля. І ўсяго толькі восем гадзін вечара, шчэ было светла. Едучы па той дарозе, можна было бачыць не толькі, што там нехта ў белым ляжыць. Можна было пры жаданні разгледзець, што там ляжыць Ала.

— Добра, Андрэй, я табе веру, але хацелася б пабыць там з табой.

Ён на момант задумаўся і спытаў:

— Можа, усё ж не трэба туды ездзіць? Што мы адкрыем? Я не вытрымаю. Калі я пачынаю думаць, што я, можа, забіў чалавека... Не, я не магу. Не хачу ўспамінаць.

— Ты збіраешся ўсё жыццё жыць з гэтым сумненнем? А раптам ты зможаш ад яго пазбавіцца? Горш ужо не будзе. Мы можам пагаварыць з кімнебудзь. Толькі, калі ты не супраць, не паедзем на тваёй машыне. Пройдземся пехатой, тут жа блізка.

Праз некалькі хвілін пазваніла Алена і сказала, што едзе да мяне ў госці. Я прыдумала, што мы з Андрэем якраз збіраліся зрабіць ёй сюрпрыз і запрасіць куды-небудзь. Яна шчыра абрадавалася.

Мы з Андрэем нерухома стаялі, пакуль яна здымала куртку. І сэнсары руху насупраць уваходных дзярэй зрэагавалі на Алену, яна памахала ім рукой і засмяялася:

— Слухай, ты ж, напэўна, не ведаеш, што гэта такое?

Я вымушана была кіўнуць.

— Гэта ўсё для аховы кватэры. Заходзіць у кватэру нехта, хто тут не жыве і хоча вынесці, напрыклад, тэлевізар. Аж аблом, яго ўжо заўважылі. Праўда, ён можа рухацца як у балеце: павольненька і з пачуццём. У міліцыі гэта ацэняць. А ўвогуле... трэба табе сказаць пра гэта... Калі забудзеш зняць кватэру з аховы, трэба плаціць штраф. А ты заўважыла, як розняцца аператары, якім тэлефануеш, калі здаеш кватэру? У мяне любімы — трынаццаты нумар — яна заўсёды кажа: «Усё нармальна, выходзьце, калі ласка» або: «Трынаццаты прыняў, усё ў парадку, дабранач». І цярпець не магу восьмы нумар, ёй нават «дзякуй» казаць не хочацца. Ала не любіла чацвёрты нумар. Я памятаю гэта, — сумна сказала Алена, седзячы ў крэсле і абдымаючы маленькую падушку.

— А мне чацвёрты яшчэ не трапляўся, — паспяшалася паведаміць я.

— Добра, мы з Андрэем чакаем цябе ў машыне, а ты пераапранаешся, здаеш кватэру і далучаешся да нас, — загадала Алена, цягнучы Андрэя да дзвярэй.

Я шмат рэчаў з сабой у Мінск не везла, таму звычайнай жаночай праблемы «што апрануць» не мела. Праз хвіліну я ўжо званіла на ахову:

— Бусел-357, Агалецкая, пробная здача кватэры.

— Агалецкая? — здзіўлена запытала аператарка пульта аховы.

— Агалецкая! А што не так? — адказала я нахабна.

— Правяраю... Можаце выходзіць. Чацвёрты, — сказала пультыстка страшэнна знаёмым голасам.

І калі я зайшла ў кватэру амаль у адзінаццаць гадзін, то зусім забыла, што трэба зняць кватэру з аховы. Праз хвілін дзесяць успомніла, дрыготкімі рукамі выцягнула з кішэні паперку з тэлефонам і кодам. Я пазваніла, але мне адказалі, што нарад ужо выехаў. Я адчыніла дзверы і стала чакаць на парозе. І чамусьці падумала, што зараз на мяне будуць крычаць, таму прыняла паставу закатаванага жыццём чалавека, апусціла галаву, абаперлася спінай аб сцяну.

Ліфт адчыніўся, а я ўсё яшчэ стаяла, удаючы Міс Стомленасць. Я не паспела падняць галаву, нечыя моцныя рукі падхапілі мяне. Ён увайшоў у кватэру са мной на руках, кінуў мяне на ложак і пацягнуў руку да штаноў, каб пачаць расшпільвацца.

Мова нарэшце вярнулася да мяне, і я іранічна запытала:

— Гэта абавязкова? Я ўсяго толькі забылася зняць кватэру з аховы!

Ён проста аслупянеў:

— П-прабачце... Я... Пераблытаў... Даруйце... Я думаў, гэта...

— Вы думалі, гэта Ала Агалецкая! Так? — я не чакала пацвярджэння маёй гіпотэзы, а даволі жорстка паведаміла праўду: — Ала загінула некалькі тыдняў таму.

Ён сеў побач са мной на ложак і слабым голасам запытаў:

— Як гэта загінула? Ала? А чаму ніхто не сказаў?

— Вы не пакінулі свайго нумара тэлефона! — зазлавала я.

Ніякага здзеку ён не адчуў. Ён смешна мыкнуў і абхапіў галаву. А потым усхапіўся, націснуў кнопку

на сваёй рацыі і выразна прамовіў: «Я тайга... Я тайга... Гарадзецкая, 70. Адбой. Разбіраюся з кліентам». Голас у яго быў сумны і стомлены. «Няўжо гэты яе сапраўды кахаў?» — я шчыра здзівілася.

— Можа, зрабіць вам кавы?

Ён моўчкі падняўся і пайшоў на кухню, я — за ім. Ён сеў на табурэтку, а я паставіла джэзву.

— Я ж думаў, што пакрыўдзіў яе мінулы раз, і таму яна не хоча са мной убачыцца. Як яна загінула? — нарэшце ён запытаўся пра галоўнае.

— Дакладна невядома. Памерла яна ад удару галавой аб каменне перад уваходам на Цэнтральны рынак будматэрыялаў. Можа, яе штурхнулі... Можа, нечым далі па галаве. А магла проста скроняй аб нешта ўдарыцца, напрыклад, аб машыну. Знайшлі сляды... як гэта... тармазны шлях... Ды варыянт міліцыі самы просты: ехала на роліках, звалілася і забілася, — зрыфмавала я.

— На роліках? Ала? Немагчыма! Ала ўмела катацца на роліках? Гэта нейкая лухта! Гэта... Я жыву якраз насупраць рынку. Я... мог бы бачыць! Якое глупства гэтае жыццё... Ала на роліках... — ён не знаходзіў слоў.

— І ўсё-такі яна была на роліках. Дазвольце мне задаць вам некалькі пытанняў, — афіцыйным тонам прамовіла я.

— Пытанняў? — ён спужаўся. — Якіх пытанняў?

— Я шукаю забойцу Алы, яе сяброўка ўпэўнена, што Алу забілі. Падстава так думаць — ролікі. Ала сапраўды не ўмела катацца на роліках. — Я ўжо ведала, што Ала надзела ролікі для Андрэя, але навошта міліцыянеру пра гэта казаць. — Я павінна ведаць пра яе ўсё. Я ўжо здагадваюся, якім чынам вы сустракаліся...

— Так. Яна аднойчы забылася зняць кватэру з аховы, і прыехаў я з напарнікам. Тады ўсё і пачалося. Мы дамовіліся, што кожны чацвер, ці не кож-

ны, як ёй захочацца, яна будзе забываць здымаць кватэру, і я буду прыязджаць да яе. Сябра чакае мяне ў машыне.

— А вы не маглі сустракацца проста па вечарах? Абавязкова трэба было ў экстрэмальных умовах? — я хацела выцягнуць з яго аповед пра эксцэнтрычнасць Алы.

— Разумееш... Тут такая справа... — ён пашкроб правай рукой падбароддзе, і я заўважыла на ягонай загарэлай руцэ белы след ад заручальнага пярсцёнка.

— Цяпер разумею. Дакладней, разумею, чаму так сустракаліся. Не разумею, навошта? — мае эмоцыі прарвалі маску дэтэктыва.

— О-о, ты не ведала Алы, — пачаў ён упэўнена...

Калі ён пайшоў, я падумала, што сапраўднага кахання ў Алы не было. Пра якія шчырыя пачуцці можна казаць, калі твой каханы хапае цябе на рукі і кідае на ложак, а ў твар не глядзіць і не размаўляе з табой. Не, яна ўсё ж такі была няшчаснай жанчынай. Ды ўсе вакол няшчасныя. Вось гэты міліцыянер, напрыклад. Загінула Ала, ён знойдзе сабе другую. Бо праблема сядзіць у ім самім. Ён не можа мець дзяцей. Ах, іх з жонкай нішто не аб'ядноўвае. Калі ён не можа мець дзяцей, ён не зможа «аб'яднацца» ні з кім. Абы толькі прыдумаць сабе апраўданне. Мабыць, калі жонка зловіць яго пад час чарговага «аб'яднання», ён стане ў позу і будзе плакацца. І яна застанецца вінаватай. А шкада ўсіх траіх.

Калі я ноччу клалася спаць, на розум прыйшла цынічная думка: а нашто я яго спыняла, калі ён шпурлянуў мяне ў ложак, ён бы пасля ўсяго пайшоў не развітваючыся і не заўважыў бы, што я не Ала. Мяркую, Андрэй быў больш уважлівы.

Рынак жыў сваім жыццём: прыязджалі машыны, прыходзілі людзі, гула рэклама. Маленькія прыгожыя домікі клікалі да сябе, і так хацелася забыц-

ца на мэту нашага візіту. Андрэй паказваў месца, дзе ўжо не захавалася ніякіх слядоў.

Не, не мог Бог так памыліцца. Калі яму так трэба было забіць Алу, няўжо ён не мог знайсці некага іншага? Андрэй быў апошняй ахвярай Алы. Яна не магла ніяк раз'яднаць Андрэя і Алену. І знайшла унікальнае выйсце. Як магла самаўлюбёная Ала ахвяраваць сабой? Можа, хацела проста папужаць. Ці, можа, сапраўды кахала Андрэя? Хто яе ведае? Пра гэта яна ў дзённіку не напісала.

Мы стаялі з Андрэем моўчкі. Кожны думаў пра сваё.

Ля ўваходу на рынак пачалося нейкае ажыўленне. Хлопцы, якія прымалі плату на аўтастаянцы, цягнулі п'янаватага дзеда. Стары ўпіраўся. Нарэшце, паддаўшы яму каленам, хлопцы выкінулі яго за вароты. Дзед падняўся, абцёрся і неразборліва крыкнуў у адно слова:

— Тут жа дзеўку задавілі.

На што хлопцы яму з рогатам адказалі:

— Цябе самога якая хочаш дзеўка задавіць. Валі, алкаш!

Сказаць, што нас з Андрэем здарэнне зацікавіла, значыць нічога не сказаць. Мы падбеглі да дзеда, быццам бы дапамагчы. А ён усё бурчаў:

— Дзеўку задавілі.

— Якую дзеўку? — спыталі мы дзеда.

— Тут адна такая бегала, часта была, — дзед абрадаваўся ўдзячным слухачам.

— А хто яе задавіў? — дапытваўся Андрэй

— Шкада, дзеўку задавілі, — задумліва паўтарыў стары.

— А хто яе задавіў? — Андрэй не пагрэбаваў тыцнуць дзеда ў плячо.

— Я толькі падумаў, міліцыя панаедзе, нашто мне лішнія праблемы. І два дні не прыходзіў. Шчэ здагадаліся б, што я бачыў, хто яе задавіў.

— А хто? — спрабавалі мы выцягнуць з прапітай галавы дзеда.

— А вам, дзеткі, што за інтарэс? — канчаткова дабіў нас дзед.

— Сяброўка яна наша, — безнадзейна паведамілі мы.

— Добра, што так за сяброўку перажываеце. А мае дзеткі хату маю ў Негарэлым прадалі. У горад, курвы, паклікалі. А нашто, калі я ім непатрэбны? Яны ў тым вунь доме жывуць, на трэцім паверсе, дзеткі мае. А я тут прыжыўся. Ноччу ж тут ні душы. Ну, бывае, вечарком прывязуць што-небудзь, і адразу ж дадому. Жыві-гуляй, Вася. Аж бачу, дзеўка прыйшла. Разбулася. У мяшок запіхала, схавала там, чарцяка. Адзела нейкія боты з калёсамі. Такія і ў маіх унучкаў ёсць. І стаіць дзеўка тая. Хлопца чакала, ці што? Аж едзе ён, мілок. І тут яна як кінецца. А ён хітры, чарцяка. Руль крутануў. І яна проста на зямлю ўпала. Ляжыць, галосіць.

— А вы хлопца не разгледзелі? — асцярожна спытала я.

— У мяне ж ужо вочы слабыя. Так і не прыгледзеў. А ў тую ноч Лорачка тавар прывезла. І ўжо дамоў руліла. Пад'ехала да дзеўкі, спынілася і як газане. Прама па дзеўцы. А я тады падумаў, ну нашто ёй, нежывой ужо, басаножкі? Я тую торбачку знайшоў у кустах, а басаножкі прадаў. У мяне яшчэ і грошай крыху засталося.

Тут дзед пачаў шукаць па кішэнях, даставаць брудныя паперкі. Андрэй з такой удзячнасцю глядзеў на гэтага дзеда, здавалася, расцалуе зараз. А я падумала, Андрэя дзед не разгледзеў, дык як ён мог пазнаць тую Лорачку? І спытала пра гэта.

— Дык толькі ж адна Лорачка на рынку і была, усе раз'ехаліся. А я ж во толькі што пайшоў да яе, кажу: «А я, Лорачка, усё ведаю!» А яна спакойна так: «No problems! Валера-а!» А той Валера пазваў казлоў гэтых.

Дзед павярнуўся да хлопцаў з аўтастаянкі, крыкнуў: «Казлы!» і павольна пайшоў прэч. І ніхто яго не затрымліваў.

Мы прыляцелі дадому як на крылах. Андрэй усё ірваўся патэлефанаваць Алене. Ды я сказала:

— Табе Бог дае другі шанс. Жаніся хутчэй. А калі праз дваццаць год сумеснага жыцця табе надакучыць жонка і ты захочаш ад яе пазбавіцца — раскажы ёй гэтую гісторыю.

Алена патэлефанавала сама. Шчаслівая да згубы прытомнасці. Цяжарная да мозга касцей! А мне стала страшна, што на сумленні Алы магла быць яшчэ адна загубленая дзіцячая душа. Мы цэлы дзень насіліся з цяжарнасцю Алены як з пісанай торбай. Цалаваліся, абдымаліся. Яны былі такімі шчаслівымі, што я не магла ім расказаць пра свае падазрэнні. Алена змянілася на вачах і ўся свяцілася сваім шчасцем. Яна, гэтая бізнес-лэдзі, была ўзрушана да такой ступені, што забыла ў мяне свой сотавы, які быў патрэбны ёй, як яе уласныя рукі.

Мне не цярпелася наведаць маіх суседзяў зверху. Я іх не баялася, але раптам у стрэсавай сітуацыі забойца не здолее пракантраляваць свае эмоцыі. Менавіта таму я патэлефанавала бацьку Алены і папрасіла, каб кожныя 15 хвілін ён тэлефанаваў на сотавы Алены, і, канешне, папярэдзіла яго, што адказваць яму буду я. Перад выхадам я пакінула на стале запіску: «Мне здаецца, што забойца — суседка зверху, Лорачка».

Ларыса, яна ж Лорачка, і яе Валера былі непрыемна ўражаныя маёй дасведчанасцю. Ці, хутчэй, вельмі напужаныя. Прыкмет агрэсіі не назіралася, і калі праз 15 хвілін патэлефанаваў Сяргей Аляксандравіч, я сказала: «Усё нармальна, можаце больш не тэлефанаваць». Лорачка зварыла кавы, запаліла цыгарэту і пачала расказваць.

...Недзе два гады таму яны самі рабілі рамонт у кватэры. Зразумела, вечарамі. І вось аднойчы да іх заявілася раз'юшаная Ала. Пасмяялася з рамонту. Сказала, што можа ім дапамагчы, і Лорачка млела ад такой увагі. Зараз гэта гучыць смешна, але яны сталі сяброўкамі. І Лорачка скардзілася на мужа-беспрацоўнага. Маўляў, калі не працуеш, дык хоць шпалеры новыя паклей. І Ала прапанавала ім працу ў адным з павільёнаў «РамСервісу» на рынку. У Валеры, канешне, не было вопыту работы з будаўнічымі матэрыяламі, ды Ала запэўніла, што ў яго ўсё атрымаецца. Ад такога прызнання ягоных вартасцяў Ларысін муж закруціў з ёй раман. Хоць на самай справе гэта Ала закруціла той раман. І канешне, Валера не змог выкруціцца. Таму ўсё расказаў жонцы. Гэтага Ала не чакала. Яна пагражала звольніць іх. І Валера хадзіў да Алы начамі адпрацоўваць сваё працаўладкаванне. Жонка вар'яцела ад бездапаможнасці і ўсё ніяк не магла вырашыць, што даражэй: муж ці праца.

Усё скончылася, калі Але надакучылі і Валера, і Лорачка. Яе імклівая натура патрабавала новых пачуццяў. І яна смела пераступала цераз усё. З любых сітуацый яна выходзіла пераможцай. А Валера і Лорачка адчувалі сябе згвалтаванымі, ды так яно і было. Кожны раз, сустракаючы іх у ліфце, Ала нагадвала пра тую гісторыю, не давала яе забыць. І магла сціпла спытацца, ці Валера ўсё яшчэ пачынае любоўныя ігрышчы з пацалункаў у спіну? Ці не заеў іх побыт? Можа, ім патрэбна дапамога ў інтымным жыцці?

Не, Ларыса не збіралася яе забіваць. Гэта збег абставінаў. Яна бачыла Алу, калі прывозіла тавар. Тая некага чакала. І калі Ларыса вярталася, то бачыла няўдалую спробу Алы скончыць жыццё. Яна ўпала, відаць, заплакала, але пачуўшы шоргат шынаў Лорынай машыны, яна падняла галаву. І куды падзеліся ейныя слёзы! Яна пазнала машыну Лорачкі

і ганарліва (наколькі гэта было магчыма) усміхнулася. І Лора ўспомніла ўсе здзекі, якія яны з Валерам цярпелі ад Алы. Яна не магла яе не забіць!

Праўда, калі б можна было ўсё вярнуць, яна б не задавіла Алу. Калі Ала ўбачыла, што машына едзе проста на яе, ейны твар скамянеў. Далей Лора нічога не памятавала. Ёй здавалася, што яна чамусьці тармазіла... Але навошта яна гэта рабіла і як яна даехала дадому, ёй невядома. Жахліва — адчуваць сябе забойцам, памятаць пра гэта кожны дзень, з гэтым прачынацца і класціся спаць. Трэсціся, што нехта бачыў. Вось той дзед, здавалася б, не вельмі страшны, бо хто алкашу паверыць, а яна па начах не спіць, баіцца. Лора ўздыхнула і амаль шэптам сказала:

— Можаш рабіць са мной, што захочаш. Горш мне ўжо не будзе...

У мяне было ўсё: і прызнанне забойцы, і паказанні сведкі, і матыў... Не было ўпэўненасці. Гэты голас з пульта аховы, што так спакойна вымавіў: «Чацвёрты». Ала не любіла гэты голас, бо ведала яго. Мне ён здаецца такім знаёмым. Дык дзе ж я чула яго?

Я патэлефанавала дзяжурнаму, даведалася, дзе знаходзіцца пульт аховы, і прыехала туды. На ганку паліў цыгарэту малады міліцыянер. Я запыталася ў яго, як мне прайсці на пульт аховы. Ён пажартаваў, зрабіў мне камплімент і пачаў гучна тлумачыць, як знайсці патрэбнае памяшканне. Я стаяла спінай да ўваходу і не звярнула ўвагі, што за мной нехта прайшоў. Мяне занадта паглынулі заляцанні вясёлага хлопца. Раптам ён павярнуўся, паглядзеў на нейкую пару і сказаў:

— Ніколі не жанюся! Вось што Жорык выйграў ад сваёй жаніцьбы?

Я глянула і адразу яго пазнала: міліцыянер Жорык — каханак Алы, які мяне з ёй пераблытаў. Яны

сварыліся з жонкай. Яна крычала, так знаёма захліпаючыся:

— Я больш не магу! Тvae бабы мяне ўжо задзяўблі!!! Ты, можа, думаеш, што я пра Агалецкую не ведаю?! Дык я ведаю! Дзякуй Богу, лісты ананімныя чытаць ўмею! Ты ж як прастытутка! Яна ж штраф плаціла за кожнае тваё наведванне! Лепей бы ты з ёй проста сустракаўся і грошы браў, хоць прыбытак бы ў хату быў! — істэрычна крычала Наташка, жанчына з носам, падобным да парогаў ракі Ніл, нумар чацвёрты на пульце аховы.

Я ішла дадому і думала: «А можа, гэта не Лорачка забойца? Алу знайшлі крыху ўбаку ад слядоў, што пакінулі сцёртыя колы, як я разумею, Лорчынай машыны. І ўвогуле, ці магчыма разблытаць гэты вузел?»

Я стомлена адчыніла дзверы, зняла кватэру з аховы і збіралася адпачыць у крэсле, выцягнуўшы ногі. Раптам зазваніў тэлефон. Гэта была Жанна Кірылаўна:

— Вы ўжо ўсё разблыталі?

— Здаецца, усё яшчэ больш заблыталася, — шчыра паскардзілася я.

— А мне здаецца, — ледзяным голасам адказала Жанна Кірылаўна, — што сёння вы якраз ездзілі паглядзець на забойцу! І калі гэта не так, то мне вельмі шкада! Я спадзявалася, што вы будзеце больш здагадлівай... — сказала яна і паклала трубку.

Больш здагадлівай? Гэтыя словы склалі ўсё ў маёй галаве. Жанна Кірылаўна і Ала, дзве моцныя і валявыя жанчыны, падсвядома змагаліся за ўплыў на Алену. І таму ўзаемна ненавідзелі адна адну. І ўсё ж у такіх справах досвед перамагае. Жанна Кірылаўна добра ведала пра адносіны Алы і з Андрэем, і з міліцыянерам. Андрэй ёй падабаўся, толькі таму яна нічога не сказала дачцэ. А калі яна пацягнула за міліцыянера Жорыка, то адкрыліся цікавыя рэчы: ён аказаўся мужам Наталлі, даўняга ворага Алы.

Не трэба было шмат фантазіі, каб напісаць ананімны ліст, у якім паведамлялася, што Ала не супакоілася і зноў прагне Наталлінай крыві. Заставалася толькі чакаць. І тут Ала дамаўляецца з Андрэем пра сустрэчу. А Жорык жа мне казаў, што ягоныя вокны выходзяць на рынак, а ягоныя вокны — гэта вокны Наташы. Адтуль, канешне, не відаць увахода. Ды Ала ішла якраз пад вокнамі Наталлі, якая магла, напрыклад, паліваць кветкі і заўважыць ненавісную прыгажуню. Заставалася толькі выйсці на вуліцу, прасачыць за Алай. Наташа, канешне, бачыла, як выкруціў руль Андрэй, як Лорачка паспрабавала наехаць на Алу і як тая выкацілася з-пад колаў аўтамабіля. Дзед-бомж сцягнуў торбачку з абуткам і пайшоў. Наташа ж засталася. Ала, перапужаная гэтым замахам на жыццё, напэўна, паспрабавала ўстаць, а без звычкі гэта даволі цяжка зрабіць на роліках. Наташа ўсё чакала. Ала ўстала, уся дрыжучы ад жаху, і тут да яе падыходзіць Наталля, магчыма, нешта гаворыць ёй, а потым лёгкім рухам рукі штурхае. А такому «спрактыкаванаму» ролеру, як Ала, шмат не трэба, каб упасці.

Гэта было ідэальнае забойства, якое немагчыма было раскрыць, бо яно цалкам грунтавалася на верагоднасці. Не паспрачалася б Ала з Андрэем, не надзела б ролікі — так бы проста не звалілася, не трапіла б яна галавой на камень — засталася б жывой. Дакладным было толькі адно — яна рана ці позна загінула б. Не пайшла б яна да рынку — Наталля, даведзеная ананімкай Жанны Кірылаўны да адчаю, сустрэла б яе ў пад’ездзе. Працу гэтай ладнай сістэмы паляпшала самадзейнасць Алы — у той дзень яна магла загінуць пад коламі Андрэевай ці Лорынай машыны. А каб Жанна Кірылаўна дакладна ведала, хто ж забойца, за Алай пільна сачыў, відаць, шафёр Міша. Таму магу меркаваць, што ў той вечар каля ўвахода на рынак там была процьма народу:

Ала, Андрэй, Лорачка, бомж, Наталля і Мішка. Яго шэф якраз у той час з'ехаў за мяжу на некалькі тыдняў, а Жанна Кірылаўна, відаць, вельмі Мішку давярала, калі так наблізіла яго да свайго мужа.

Так, за Алай сачылі, а за мной? Вядома ж, Жанна Кірылаўна не магла пакінуць мяне без анёла-целаахоўніка. На вакзале ў горадзе, дзе нарадзілася Ала, Валянціна сустракала мяне, а не свайго бацьку, гэта звычайнае супадзенне, што мы з ім апынуліся спадарожнікамі.

Няўжо мне так імгненна далі б адрас пульта аховы, калі б не дапамога Жанны Кірылаўны? І я, напэўна, прапусціла б сварку Жорыка з Наташай, калі б не занадта своечасовая заўвага маладога міліцыянера, які чакаў мяне на ганку.

Чаму яна вырашыла дапамагчы мне ўсё разблытаць? Ёй, як і ў свой час Але, не хапала адрэналіну? Яна была ўпэўнена ў сваёй беспакаранасці? Але як ні разблытвай, у забойстве вінаваты хто заўгодна, толькі не яна!

Зноў зазваніў тэлефон, я ў задуменні паднесла трубку да вуха і не адразу пазнала голас майго каханага:

— Прывітанне, малпачка! Я тут сумую без цябе. Ты дадому збіраешся?

— А, Дзіма? К-канешне! — заікаючыся адказала я.

— Можаш не збірацца! — ён вытрымаў доўгую паўзу, каб я паспела падумаць самае горшае. — Я еду ў Мінск. Мне сябра работу знайшоў.

— Ты кінеш сваю фірму? Ты ж столькі надзей на яе ўскладаў! Дзіма, ты што, без мяне звар'яцеў там адзін? — раззлавалася я.

— Малпачка!

— Не называй мяне малпачкай!

— Тады слухай мяне ўважліва! Я тэлефаную табе з вакзала, праз дзесяць хвілін мой цягнік. І калі ты не хочаш, каб у Мінску я начаваў на вакзале, то

паведаміш мне свой новы адрас, — дыпламатычна загадаў Дзіма.

Я ніколі не ведала, што ён можа быць такім катэгарычным. Мой мяккі, абыякавы да ўсяго, акрамя работы, рэкламшчык Дзіма заўсёды быў цалкам задаволены жыццём. І кожны мой намёк, маўляў, трэба нешта мяняць, сыпаўся пылам на падлогу. А тут такая незвычайная актыўнасць!..

Ён прыехаў ноччу, і калі я ўбачыла яго стомлены сумненькі тварык і ягоную неверагодную абыякавасць да шыкоўнай кватэры Агалецкай, я зразумела: нішто ў свеце не зменіць майго каханага. Пасля позняй вячэры ён пайшоў шукаць, дзе тут можна паспаць. Ён не браў мяне на рукі і не кідаў у ложак. Ён проста пагайдаўся на матрацы і гулліва сказаў: «Не рыпіць!» Я сядзела на камодзе і ніяк не рэагавала на ягоныя празрыстыя намёкі.

— На камодзе, дык на камодзе! — рашуча сказаў ён і зняў акуляры...

Андрэй адкрыта расказаў Алене пра свае адносіны з Алай, а яна ўсё яму даравала. І правільна зрабіла: для іх самае галоўнае зараз — іх будучае дзіця. Дактары кажуць, што будзе дзяўчынка. І я дакладна ведаю, Алай яны яе не назавуць.

Таццяна выходзіць замуж за Ігара. Яна, на жаль, больш не можа мець дзяцей з-за аборту, таму яны збіраюцца ўзяць прыёмных.

Фірма «РамСервіс» па-ранейшаму квітнее. Сяргей Аляксандравіч плануе ў будучым (гадоў праз 20) перадаць свае паўнамоцтвы Андрэю Вараховічу. Жанна Кірылаўна ў адзіноце пакутуе ад сваёй гіпертаніі, і я не маю жадання наведаць яе залатую клетку з басейнам. Яна больш не можа сачыць за Аленай і мной, бо мы купілі кватэры ў такім доме, дзе дастаткова заможныя людзі не стануць за грошы прыніжацца да высочвання суседзяў.

Я так і не ўзяла білет дадому, працую ў «РамСервісе». Мяне ўзялі як бы на месца Алы, хоць я не магу і не хачу яе замяніць. Тым загадкавым Дзімкавым сябрам, які прапанаваў яму работу ў Мінску, аказалася Алена, таму зараз Дзіма таксама працуе ў «РамСервісе». І зараз наша кампанія мае прафесійнага рэкламіста. Менавіта яго намаганнямі з'явілася наша рэклама на тэлебачанні, Сяргей Аляксандравіч лічыў, што дастаткова газет і радыё, але даў сябе ўгаварыць.

Мне здаецца, я зразумела, чаму Дзіма быў нейкі сумны апошнія месяцы: ён меў сапраўдны талент, але не было дзе разгарнуцца. Яму не хапала паветра, а я думала, што ён зануда. Зараз я закаханая ў яго па-новаму і мацней. На наступным тыдні я выйду за яго замуж.

З майго акна відаць, як дзесяцігадовая дзяўчынка ў шырачэзных штанах, перацягнутых накаленнікамі, катаецца па двары на роліках.

— Алачка, сонейка, ідзі есці! — гучыць з акна другога паверха.

І дзяўчынка паслухмяна коціцца да пад'езда.

## НЯСТРЫМНАЕ ЖАДАННЕ

*Жартаўлівы дэтэктыўчык*

### 1

Невысокі хлопец у строгім касцюме цырымонна крочыў па тратуары і гэтак жа паважна завярнуў у пад'езд доўгага шэрага дома. Дзед-алкаш, што сядзеў на лаўцы каля пад'езда, затуманенай свядомасцю змог адзначыць толькі сам факт уваходу хлопца ў пад'езд.

Юнак выклікаў ліфт і аўтаматычна паглядзеў на гадзіннік. Без дваццаці пяць. Зноў прыехаў занадта рана. А ўсё гэтая боязь спазніцца. Ужо год сустракаюцца, а ён хвалюецца, як першы раз.

Ён увайшоў у ліфт, засцаны тым самым дзедамалкашом і абмаляваны хлопчыкамі з сёмага паверха, пра гэта хлопец ведаў гэтак жа дакладна, як і пра тое, што яго звалі Кірыл Андруховіч.

Кірыл сумна глянуў на столь ліфта, потым паправіў трусы, што намулялі яму. «Толькі ў ліфце можна не баяцца, што нехта цябе ўбачыць», — падумаў сарамлівы Кірыл. Ён выйшаў на восьмым паверсе і ўладкаваўся чакаць дваццаць хвілін. За суседнімі дзвярыма зазвінелі ключамі, і з кватэры выйшла суседка, цётка Наташа, маленькая таўстуха з грудзямі наперавес і дзвюма велізарнымі торбамі, адкуль патыхала катлетамі і піражкамі.

— Што, Кірыл, зноў чакаеш? — заўважыла яна сваім высокім металічным голасам.

— Так, а вы, цётка Наташа, мабыць, да ўнука? — паказаў Кірыл на яе торбы.

— Кірылка, а хто ж яго яшчэ дагледзіць? Ох, рана мой сынок ажаніўся! Але ты, відаць, таксама

збіраешся? — цётка зарагатала баском. Яе пытанне было рытарычным, яна зачыніла дзверы і моцным салдацкім крокам рушыла да ліфта.

2

Баба Люся выключыла пультам тэлевізар. Чырвоная кнопка на пульце была адзінай, чыю функцыю баба Люся здолела запомніць. Яна паглядзела ў акно, потым прыслухалася да ўнутраных органаў, цяжка ўздыхнула і, цягнучы ногі па падлозе, паклыпала ў прыбіральню. Перад дзвярыма бабка спынілася, зноў прыслухалася — і рашуча ўвайшла ў пакойчык, адкуль праз секунду пачуліся гукі, якія сведчылі пра актыўную працу арганізма.

Вера круцілася перад люстэркам у новым бюстгальтары, а яе малодшая сястра давала парады:

— Верка, надзень іншы, у гэтым у цябе нейкія цыцкі абвіслыя.

— А так? — запытала Вера і выгнула спіну.

— А так спіна абвіслая! Апранай іншы! — безапеляцыйна загадала сястра.

— А раптам Кірыл... ну... ты разумееш, — Вера, якая са смехам магла абмяркоўваць чужыя адносіны, пра сваё інтымнае жыццё словамі гаварыць не магла.

— Думаеш, ён цябе лапаць будзе? І не спадзявайся! Ды ў любым выпадку ён жа не будзе цябе пры людзях распранаць, а праз кофту — дык любы станік падыдзе, лепш нават без станіка! — яна разрагаталася і плюхнулася на ложак.

— Каця! Не камячы! — Вера выхапіла з-пад сястры чырвоную спаднічку.

— Верка! Без пяці хвілін, Кіра твой ужо, мабыць, пад дзвярыма стаіць. Я пабягу паглядзець у «вочка»! — Каця пацерла рукі ад задавальнення.

— Стой! Ён жа пачуе, што нехта за дзвярыма! Сядзі! — Вера схапіла сястру за руку і штурхнула на ложак.

— Сцерва! — закрычала Каця і дала сястры добрага выспятка.

— Ты мне проста зайздросціш! — Вера крыкнула так гучна, што аж сарвала голас.

— Было б чаму зайздросціць! Знайшла сабе не то бабу не то хлопца і ганарыцца! — Каця зымітавала смех і села на стол, пасунуўшы азадкам лямпу.

Сёстры яшчэ шмат чаго прыпомнілі б адна адной, але пачуўся званок. Перапужаная Вера дала сястры інструктаж:

— Адчыняй дзверы і вядзі яго ў залу, чуеш, у залу! Я — у туалет.

— Угу! — хітра бліснула маленькімі вочкамі Каця. — Толькі там баба Люся, на яе зноў дрысня напала! — зарагатала яна ўслед сястры.

Вера пабегла да прыбіральні, паторгала за ручку, а ў гэты момант Каця адчыняла дзверы Кірылу. Вера нырнула ў ванны пакой, села на край ванны і ліхаманкава вырашала, што ж рабіць далей: «Баба Люся з прыбіральні выйдзе не скора, і Кірыла прымушаць чакаць непрыгожа, ну што... можа... у ванну?»

Лёгенькай хадой шчаслівага чалавека Вера выйшла з ваннага і ўвайшла ў свой пакой, каб апрануцца. Яна адчыніла дзверы — і ўбачыла Кірыла, які сядзеў на яе ложку побач з Кацяй і трымаў на каленях альбом з фотаздымкамі. Ён глядзеў на яе, амаль голую, і не мог адвесці вачэй, не яе надзвычайная прыгажосць пазбавіла яго волі, а сама сітуацыя. Вера ж застыла і не магла ступіць ні кроку.

Першым апрытомнеў Кірыл, ён падняў фотаальбом, закрыў ім твар і выйшаў з пакоя, услед за ім рушыла Каця, якая, праходзячы міма Веры, паказала сястры язык.

Пакуль Вера апраналася, Кацька сядзела з Кірылам у зале і паказвала яму фатаграфіі. А ён быў такі задуменны, што Каця выкарыстала шокавую тэрапію:

— А гэта Верчын першы мужчына! — сказала яна, тыцнуўшы пальцам у твар стрыечнага брата, які на здымку абдымаў Веру.

Кірыл угледзеўся ў фота, неяк разгублена паглядзеў на Кацю: «Першы мужчына? Дык яна... А я думаў... Каця, а мне яна казала, што гэта ваш стрыечны брат Жэня!»

— Так сказала?! Мабыць, гэта зараз так называецца. Кірыл, а як яна павінна была табе сказаць, га? — Каця баялася, што праз хвіліну не вытрымае і рассмяецца.

— Вядома, вядома, — Кірыл сам не ведаў, да чаго гэтае «вядома». Тут у пакой увайшла Вера, уся такая прыгожая, але Кірыл паглядзеў на яе неяк незвычайна, яна заўважыла гэта і спужана зірнула на Кацю. Сястра ж падняла на яе па-дзіцячы чыстыя вочкі.

3

Калі парачка выйшла з кватэры, Кірылава рука занадта нахабна спусцілася ніжэй Верынай таліі, і дзяўчына спачатку не паверыла сама сабе. Раней Кірыл такога сабе не дазваляў, яна не забараняла, але ў іх нават размовы пра гэта не было. І таму Вера не ведала, як сябе паводзіць: папрасіць прыбраць руку ці зрабіць выгляд, што нічога не здарылася. Лепш другое. А Кірылава рука ўжо палезла пад майку. «Нічога, мы ўсё адно збіраеся пажаніцца».

У Кірыла дрыжэлі рукі, раней ён не зрабіў бы так. «Божа! Іншыя яго сябры ўжо колькі дзяўчат «пакаштавалі», а ён цэлы год з адной валаводзўся, цнатліва і чыста. Ён жа думаў, што яна... А так заўсёды! Калі адзін святы, другі — абавязкова грэшны. Ну, можа, ён і не святы, дык хлопец і не павінен быць святым. А для дзяўчыны гэта абавязкова. Калі зараз яна скажа «прымі руку», я не вытрымаю і выкажу ёй усё. Што мне рабіць? Што мне рабіць? Кінуць яе? Але я кахаю яе, мы ж збіраемся пажа-

ніцца. Застацца з ёй? Але я не першы яе мужчына! Так не павінна быць! Мне патрэбна шлюбная ноч з усімі наступствамі. А з другога боку, галоўнае, каб яна не здраджвала, а Вера не будзе, я ведаю, ведаю...»

А рука ўсё ляжала на тым самым месцы. У Кірыла ўжо змакрэла спіна, яму здавалася, што для прыстойнай дзяўчыны такія паводзіны павінны быць абразай, што чыстая дзяўчына павінна пляснуць яму па твары, накрычаць і кінуць. Але нічога не адбылося. Яму хацелася справакаваць яе. «Ну, добра, пакуль счакаю. Завяду куды-небудзь, і паглядзім, хто каго».

4

У бары было мала людзей. Ціхая музыка разнявольвала, давала адчуванне калі не палёту, дык абсалютнай свабоды. Але Кірылу было мала гэтай свабоды. Усе жанчыны дзяліліся для яго на дзве катэгорыі: адны — для кахання, другія — для жаніцьбы. І Вера ў яго ўяўленні была раней дзяўчынай для жаніцьбы, якую трэба паставіць на п'едэстал, далей ад бруду жыцця. А зараз яна, аказваецца, і ёсць той бруд жыцця.

Яны селі за столік у цёмным кутку. Вера заняла месца насупраць Кірыла, павесіла парасон і маленькую сумку на крэсла, раптам Кірыл перасеў да яе. Дзяўчына, здаецца, зразумела яго намеры. Кірыл лічыў, што па ўсіх законах прыстойнасці яна павінна была б пасунуцца ад яго, але Вера так даўно марыла пра цнатлівую блізкасць, так хацела адчуць сябе каханай, што ёй у галаву нават не прыходзіла такая думка.

Кірыл піў піва і вар'яцеў ад бездапаможнасці. Хацелася абазваць яе шлюндрай, паказаць ёй яе месца і... жаніцца. Куфаль запацеў ад халоднага піва, таму правая рука была халоднай і мокрай. І вось такую руку Кірыл паклаў ёй на калена. Вера

уздрыгнула ад холаду, не ад жарсці, але ці растлумачыш гэта мужчыну. Кірыл глядзеў на свой куфаль, а рукой рушыў далей. Вера стуліла ногі, дастала яго руку з-пад спадніцы і паклала на стол.

«Жанюся!» — вырашыў Кірыл.

5

Каця сядзела ў крэсле ў святочнай сукенцы. Залітая лакам прычоска магла б зрабіць яе гадоў на пяць старэйшай, але зялёная пасмачка на скроні адназначна паказвала і на сапраўдны ўзрост дзяўчыны, і на яе несфармаваны густ. Побач мама прасавала бацьку кашулю. Каця сядзела моўчкі і нерухома, Вікторыя Іванаўна паглядзела на дачку і запытала:

— Кацечка, ты рада, што Вера замуж выходзіць? А што ж ты такая сумная сядзіш? Кацечка!

— Мам, а мяне хто-небудзь замуж возьме? — дзяўчына ўяўляла сабой стопрацэнтную ахвяру комплексу непаўнацэннасці.

Мама засмяялася, паставіла прас і падышла да дачкі:

— Знойдзеш і ты свайго Кірыла!

— Не хачу Кірыла, мне такі непатрэбны! Слабак!

— Каця, нельга так казаць пра жаніха сваёй сястры. Праз дзве гадзіны мы будзем адной сям'ёй, — Вікторыя Іванаўна пацалавала Кацю ў лоб і зноў ўзялася за прас.

У пакой віхорчыкам уляцеў маленькі мужчына, бацька сваіх дачок і муж сваёй жонкі. Ён пляснуў Вікторыю Іванаўну па азадку, пацалаваў яе ў глыбокі выраз, праз шыю дабраўся да вуснаў, а потым гучна цмокнуў у нос. Ён пацягнуўся да дачкі і са смяшком сказаў:

— Прабач, Кацечка, не стрымаўся.

— Цалуйцеся на здароўе, Фёдар Дзянісавіч! Зусім ужо ты, бацька, разбэсціўся. Нават дачкі не саромеешся! — Каця ўстала і выйшла з пакоя.

— Што з ёй, Віка? — спытаў Фёдар Дзянісавіч, прыціскаючы жонку да сябе.

— Ёй цікава, ці возьмуць яе замуж. Федзя! Федзя! О-ой! А калі хто загляне?

— Ну хто сюды загляне! — абачлівы Фёдар Дзянісавіч зачыніў дзверы на замок.

6

Праз дзве гадзіны вясельны картэж пад'ехаў да рэстарана. Фёдар Дзянісавіч дапамог жонцы выйсці з машыны і прашаптаў ёй на вуха:

— Забыўся табе сказаць, я Галавачова з жонкай запрасіў. Разумееш, нам яшчэ наконт банка трэба пагаварыць. Я тут і паперку прыхапіў, — Фёдар Дзянісавіч дастаў з кішэні лісток з надрукаванымі лічбамі і разлікамі.

— Федзя, ты вяселле дачкі пераўтвараеш у офіснае пасяджэнне, — бясстрасна прамовіла Вікторыя Іванаўна.

Фёдар Дзянісавіч удзячна паглядзеў на жонку, і кінуўся адчыняць дзверы бабе Люсі, сваёй маці. Баба Люся ў яркай хустцы, новай кофце, квяцістай спадніцы і зручных шлёпках свяцілася гонарам за сваю ўнучку. Вось, да вяселля дажыла, а там можна і праўнукаў прычакаць. Адчуванне поўнага шчасця асвятляла яе шырокі твар, доўгі нос падкараціўся, слязлівыя вочкі свяціліся, і нават хворыя калені не балелі.

Фёдар Дзянісавіч пакінуў бабу Люсю на жонку, а сам пабег да машыны, якая толькі што пад'ехала. «Галавачоў!» — паспеў крыкнуць ён Вікторыі Іванаўне. А з «таёты-каролы» ўжо вылазіў зграбны мужчына з выразнымі вачамі і цвёрдым падбароддзем. Ён павітаўся за руку з Фёдарам Дзянісавічам і пазнаёміў яго з жонкай, маленькай жанчынай з мяккімі вуснамі:

— А гэта мая Марына Канстанцінаўна.

— Вялікі гонар для нас, што Вы прыехалі, — па голасу Фёдара Дзянісавіча адчувалася, што «Вы» сапраўды з вялікай літары. Ён схіліў галаву і пацалаваў Марыне Канстанцінаўне руку. — Дазвольце пазнаёміць вас з маёй жонкай. Ёй будзе вельмі прыемна. Вікто-о-рыя-а!

Вікторыя Іванаўна пакінула бабу Люсю на Кацю, а сама накіравалася да гасцей і яшчэ здаля заўважыла, як дзіўна Марына Канстанцінаўна глядзіць на яе мужа. І нейкая непрыхільнасць да мужа захліснула яе. «Гэтыя справы з банкам можна было вырашыць у іншы дзень, навошта было цягнуць сюды гэтую бабу з тоўстымі вуснамі, кабыла размаляваная, што яна да Фёдара клеіцца? І пры мужу... Ці гэта спецыяльна... у кожнага ж свой стыль весці справы...»

7

Зала рэстарана складалася з дзвюх частак: адна з П-падобным сталом, другая — танцпляцоўка. Насупраць была гэткая ж зала, толькі, відаць, ніхто не замовіў яе на той дзень. Доўгі хвост віншавальнікаў пацягнуўся да маладых, якія сталі каля невялікага століка, куды сведкі пачалі складваць кветкі і падарункі. Мішка Мігно, найлепшы сябра Кірыла і сведка на вяселлі, звычайна вясёлы і гаваркі, безуважна прымаў букеты. Кірыл штурхануў яго локцем і шэптам спытаўся:

— Мішка, ты чаго?

— І ўсё-ткі, ты дзе такую «прыгажуню» адшукаў? — кіўнуў Мішка на Вольгу, сведку з боку маладой. — І мне з ёй што, цалавацца прыйдзецца? — з жахам прамовіў хлопец, які ў свой час перацалаваў палову аднакурсніц.

Нельга сказаць, што Вольга была непрыгожай, зусім не. Стройная, з прыемным тварыкам і доўгімі чорнымі валасамі, яна была вельмі эфектнай. Пагарэла яна на акулярах... якія пакінула дома. Ёй так

хацелася быць прыгажэйшай, што яна была гатова ахвяраваць уласнымі ўражаннямі. Ну што ўбачыць чалавек са зрокам «мінус шэсць»? А вось пакінуць дома з акулярамі сваю цікаўнасць Вольга не здолела: калі хтосьці з гасцей клаў канверт з доларамі на столік, дзяўчына ледзь не нахілялася, нібыта там можна было нешта ўгледзець.

Ейны залаты ланцужок з крыжыкам увесь час правальваўся ў занадта глыбокі выраз цёмна-блакітнай сукенкі. Вольга выцягвала крыжык і ўважліва разглядала сваё дэкальтэ. А Мішку зусім не здавалася прывабнай дзяўчына, што так пільна ўглядаецца ва ўласныя грудзі. Пасля кожнай акцыі па выцягванню ланцужка Вольга крадком паглядала на Мішку.

— Божа мой, Кірыл, дзе ты яе адкапаў!!! — застагнаў хлопец.

У гэты момант Кірылаў дзед Іларыён падышоў да маладых. Ён ціха, азіраючыся на сваю жонку бабу Просю, пажадаў унукам шчасця. Нязграбнымі сялянскімі рукамі ён абняў Кірыла, а потым абхапіў галаву Веры, крыху сцягнуўшы вэлюм набок.

Пакуль маладыя прымалі віншаванні, Фёдар Дзянісавіч завёў Галавачова ў суседнюю залу, разгарнуў свой лісток і толькі пачаў гаварыць, як Галавачоў паблажліва рассмяяўся:

— Фёдар Дзянісавіч, дазвольце мне павіншаваць вашу дачку. А справы нікуды ад нас не ўцякуць, — дадаў ён. Фёдар Дзянісавіч захітаў галавой, згаджаючыся, хоць было відаць, як яму карціць запярэчыць. Але ён толькі моўчкі глядзеў у свой лісток.

Раптам у залу зазірнула рыжавалосая жанчына з хітраватымі вочкамі, яе ад прыроды выразна акрэсленыя вусны расплыліся ў прыязнай усмешцы. Яна лёгка падышла да мужчын і ўзяла Фёдара Дзянісавіча пад руку, ён неахвотна прамовіў:

— Інга Іванаўна, сястра маёй жонкі.

Незамужняя Інга Іванаўна з цікавасцю паглядзела на Галавачова і з меншай увагай глянула ў паперку. Фёдар Дзянісавіч міжволі перавярнуў лісток другім бокам. Інга Іванаўна амаль што праспявала ў адказ:

— Усё сакрэты, Фёдар? Не буду вам перашкаджаць! Толькі хутчэй да нас далучайцеся!

Яны дачакаліся, пакуль жанчына выйдзе, і Фёдар Дзянісавіч зноў хацеў паўтарыць сваю прапанову. Галавачоў здагадаўся без слоў і зноў рассмяяўся, узяў паперку з рук Фёдара Дзянісавіча, паклаў яе на столік і прыціснуў далоняй:

— Фёдар Дзянісавіч, я не менш за вас хачу пагаварыць пра банк, але ў гэтай сітуацыі прыстойнасць важнейшая за жаданне, нават самае нястрымнае. Сёння ж свята! У час першага перапынку мы зможам усё абмеркаваць! Згода?

— Згода! — уздыхнуў Фёдар Дзянісавіч.

Галавачоў па-сяброўску паклаў руку яму на плячо, і яны накіраваліся ў «сваю» залу. На выхадзе яны сутыкнуліся з высачэзным хлопцам. Фёдар Дзянісавіч перасмыкнуў плячыма і даволі няветліва запытаў:

— А вы што тут робіце?

— Я — аператар! — з годнасцю адказаў хлопец.

Толькі тут Фёдар Дзянісавіч заўважыў камеру, і ягонай галаве ўзнавіліся падзеі сённяшняй раніцы, калі замоўлены аператар трапіў у аварыю (як спецыяльна!) і тэрмінова прыйшлося шукаць яму замену. Фёдар Дзянісавіч са шкадаваннем падумаў, што з загса застануцца толькі фотаздымкі, а тут яшчэ гэты незнаёмы аператар. Фёдар Дзянісавіч нахмурыў лоб і строга запытаў:

— А ваша імя...

— Ваня! — неяк па-дзіцячы адказаў хлопец.

— Ваня, — паўтарыў Фёдар Дзянісавіч. — А тут што вы шукаеце?

— Я аглядаў тэрыторыю, дзе мне прыйдзецца здымаць, — здзіўлена апраўдваўся аператар.

— Не думаю, што вам прыйдзецца тут здымаць, — раздражнёна прасіпеў Фёдар Дзянісавіч.

А лісток з лічбамі і разлікамі застаўся ляжаць на століку ў пустой зале.

8

Сяргей Іларыёнавіч, бацька жаніха, зацягнуў сваю жонку Валянціну Пятроўну ў залу насупраць, адкуль толькі што выйшлі Фёдар Дзянісавіч і Галавачоў. Сяргей Іларыёнавіч кіпеў, як чайнік са свістулькай. Паветра цяжка выходзіла праз яго зламаны калісьці нос. Твар быў чырвоны, а рукі без патрэбы сноўдалі па патыліцы. Па гэтых прыкметах Валянціна Пятроўна здагадалася, што мужа нешта вельмі непакоіць:

— Сяргей, ну што здарылася?

— Я быў упэўнены, я вас папярэджваў! О-ох, папомніце вы мае словы! А я ж казаў! Казаў! — выпускаў пару Сяргей Іларыёнавіч.

— Сяргей, — тонам маці супакойвала мужа Валянціна Пятроўна. — Сяргей, пра што ты папярэджваў?

— Ты ведаеш, што я падслухаў? Выпадкова, вядома ж. Верчын бацька, куркуль гэты недабіты... — Сяргей Іларыёнавіч аж захліпнуўся ад злосці.

— Сяргей, як ты свайго свата называеш?! — Валянціна Пятроўна спужана азірнулася на дзверы і адцягнула мужа ўглыб залы. — Ну, што ты там пачуў?

— Куркуль гэты недабіты, — знарок паўтарыў Сяргей Іларыёнавіч, — размаўляў з нейкай рыжай бабай.

— Рыжая? У сінім касцюме? Інга Іванаўна. Сястра жонкі Фёдара Дзянісавіча. І што ты такое важнае змог падслухаць? — намагалася не паказваць сваёй зацікаўленасці Валянціна Пятроўна.

— Дзеўцы кватэру купілі, а Кіру нашага туды прапісваць не збіраюцца!!! — выдаў таямніцу Сяргей Іларыёнавіч.

— Фу ты! І праз нейкую дробязь ты так распыхкаўся? — засмяялася Валянціна Пятроўна.

— Баба — дура! Слухай далей. А калі наш Кіра захоча да яе прапісацца, ён павінен падпісаць шлюбную дамову, маўляў, пры разводзе на жылплошчу не прэтэндую! — узвіваўся Сяргей Іларыёнавіч.

— А ты, ведама, спаў і марыў пра гэтую жылплошчу! — раззлавалася Валянціна Пятроўна. — А калі б гэта ты сыну кватэру купіў, ты б не шкадаваў? Сяргей, толькі жабракі не сквапныя. Гэта ж натуральнае жаданне бацькоў абараніць сваё дзіця.

— А тваё дзіця хто абароніць? Валя! Ты мяне дзівіш! Трэба спыніць вяселле! — амаль ускрыкнуў Сяргей Іларыёнавіч.

— Ідыёт! — яна заціснула мужу рот. — Ты разумееш, што кажаш? Яны ж ужо пажаніліся. Яны ўжо муж і жонка. Навошта псаваць усім свята? Падумай урэшце пра сваіх бацькоў. У дзеда Іларыёна адна мара была: да Кірылавага вяселля дажыць. Баба Прося сядзіць і плача ад шчасця. Хочаш бацькам жыццё падкараціць? — Валянціна Пятроўна выкарыстала апошні аргумент.

— Мужыка ў хаце павінны паважаць! А ці будзе жонка гэтая нашага Кіру паважаць пры такіх умовах?! — стаў у ваяўнічую паставу Сяргей Іларыёнавіч.

— Думай, што хочаш! Гавары, што хочаш! Але толькі не сёння! Не псуй дзецям свята! — Валянціна Пятроўна апусцілася на крэсла і закрыла твар рукамі, бо яна ведала, што толькі так можна паўплываць на мужа.

— Валя! Валечка! Толькі не плач! Я не буду, не буду! — ён прысеў каля жонкі. І дадаў аднымі вуснамі, каб яна не пачула: — Я знайду, як іх паставіць на месца.

9

Вера была ў прыгожай вясельнай сукенцы: шырокія белыя шлейкі ярка кантраставалі з загарэлымі плячамі і шыяй, доўгія пальчаткі надавалі туалету закончаны выгляд. Веры вельмі пасавала высокая прычоска з выпушчанымі пасмачкамі і доўгім вэлюмам. Мінімум касметыкі і ўпрыгожанняў.

А Веры і не трэба было ніякіх упрыгожанняў, яна проста свяцілася радасцю. Кожным крокам, кожнай усмешкай яна паказвала сваё нечалавечае шчасце. Некаторыя госці спадылба касіліся на Веру: ну шлюб, ну вяселле, але так выстаўляць свае пачуцці проста непрыстойна.

Кірылу ж уся мітусня з гасцямі была непатрэбная. Эх, каб пасля рэгістрацыі адразу шлюбная ноч! Але ён трымаўся, ветліва адказваў на пытанні і воклічы шматлікіх цётак, цвёрда паціскаў рукі мужчынам.

Усе селі за стол, і тамада, высокі прыгожы мужчына са знешнасцю кінаакцёра, па чарзе даваў слова бацькам, сябрам, крэўным.

Валянціна Пятроўна, маці Кірыла, выйшла віншаваць дзяцей з насовачкай. Было відаць, што яна вельмі перажывае за маладых. Дзед Іларыён не вытрымаў:

— Валюха, ты што, сына замуж аддаеш? Гэта хай Верчына мамка плача!

Вікторыя Іванаўна, мама Веры, ветліва ўсміхнулася.

Сведка з боку маладой Вольга ўсе гэтыя прамовы не слухала, яна пільна ўглядалася ў талерку з салатай, якая стаяла занадта далёка ад яе падслепаватых вочак. Мішка заўважыў, як яна выцягвае шыю, каб лепей разгледзець страву, і пхнуў Кірыла. Вольга падцяла вусны, сціснула ў руцэ відэлец і ўжо сабралася пакласці сабе трохі, але ўсё ж не наважылася. Кірыл з іранічнай усмешкай запытаў:

— Вольця, праблемы?

— Э-э. Не... Ммм... Дарэчы, што гэта за салата? — спытала яна, не гледзячы на Кірыла.

— Смачная, напэўна, ты не глядзі, што так паскудна выглядае, — пажартаваў Кірыл. — Я ж не повар, каб ведаць кожны інгрэдыент, — адкруціўся хлопец ад прамога адказу і паслужліва перадаў Вользе талерку. Дзяўчыне не было куды адступаць.

Баба Прося сказала тост і ад свайго імя, і ад імя дзеда Іларыёна, сам жа дзед выявіў жаданне паспяваць:

Я любіў спяваць прыпеўкі,
І любілі мяне дзеўкі,
Ажаніўся з бабай Просяй,
А яна не песень просіць.

## 10

Калі пачаўся перапынак, Фёдар Дзянісавіч адразу накіраваўся да Галавачова, але той з першымі акордамі музыкі нечакана падхапіў жонку ды рвануў на танцавальную пляцоўку. Марына Канстанцінаўна прыгожа выгінала спіну, яе рукі былі счэплены за шыяй мужа. Іхнія ногі рухаліся выверана і лёгка, целы плылі нібы склееныя. Марына Канстанцінаўна шчыра ўсміхалася мужу, ягоны ж выраз твару заставаўся нязменным. Галавачоў не любіў выяўляць свае пачуцці. Ён кінуў на Фёдара Дзянісавіча толькі адзін позірк, і няўрымслівы камерсант адразу зразумеў, што совацца з паперкай было б верхам недыпламатычнасці. Пляменнік Жэнька пацягнуў Фёдара Дзянісавіча за рукаво:

— Дзядзя Фёдар!

— Жэнька! Як справы, хлапчына? Як мама, як Танька, як мой любімы брат? Шкада, што яны не змаглі прыехаць! Дзякуй, што хоць ты сёння з намі! — Фёдар Дзянісавіч ляпаў хлопца па плячы, трос яго і тармасіў за патыліцу. — Ах, які ты ўжо кавалер! Муж-жык! Мужык! А сам жаніцца не збіраешся?

— Дзядзя Фёдар! Я? Жаніцца? Вось выйшла Танька замуж, то яны сварацца, то разыходзяцца, а зараз вось уся сям'я сядзіць над ёй у раддоме. Гэта шчасце? Нервы! — скончыў свае хлапечыя развагі Жэнька.

— Не хочаш мець пляменніка? — жартаўліва запытаў Фёдар Дзянісавіч.

— Пляменніцу, дзядзя Фёдар, пляменніцу, — уздыхнуў Жэнька.

Тут да іх падскочыла Каця, пацалавала бацьку і пацягнула ад яго стрыечнага брата. Фёдар Дзянісавіч абраў наступную ахвяру сваёй увагі — Ігара Леанідавіча, свайго намесніка. Хлопцу было 28 год, ён быў усё яшчэ нежанаты і, як жартавалі на фірме, мабыць, ніколі ўжо не зменіць свайго грамадзянскага статусу.

У адносінах з людзьмі Ігар Леанідавіч быў надзвычай неэмацыянальны, халодны, флегматычны, але ён паводзіў сябе так, нібы яго́ная ўраўнаважанасць — норма і, хутчэй, гэта ты перад ім блазан: тлумачыш яму нешта, а ён гэта і без цябе ведае. Ідзеш побач з ім і мусіш сінхранізавацца з яго няспешнай хадой. А паходзіш маленькімі, амаль дзіцячымі крокамі — і адчуеш сябе бясплатным дадаткам да гэтага заўжды спакойнага волата.

Фёдар Дзянісавіч заўважыў, якім здзіўленым стаў твар Ігара, калі той заўважыў Галавачова. Хлопец, мабыць, адразу здагадаўся пра ўсё. «Не хапала толькі, каб ён рот ад нечаканасці раскрыў», — падумаў Фёдар Дзянісавіч. Раптам у Ігара Леанідавіча зазваніў сотавы. Пачуўшы голас суразмоўцы, ён спуджана азірнуўся на гасцей. «Ого, — заўважыў Фёдар Дзянісавіч, — за адзін дзень дзве бурныя эмацыянальныя рэакцыі. Цуд!» Але потым ён уважлівей прыгледзеўся: відавочна было, што Ігар Леанідавіч кагосьці аб чымсьці прасіў, ён выціраў пот з ілба, а бакавым зрокам сачыў за Фёдарам Дзянісавічам.

Нечакана фігуру Ігара Леанідавіча засланіла дзяўчына. Яна хісталася на высокіх абцасах і набліжалася да Фёдара Дзянісавіча.

— Я Веранічка! Універсітэцкая сяброўка Веры! — сказала яна, аблізваючы вусны.

— Вельмі прыемна! — аўтаматычна вырвалася ў Фёдара Дзянісавіча, ягоны позірк перабягаў з Веранічкі на Ігара Леанідавіча.

— Вам сапраўды вельмі прыемна? — запытала Веранічка, кладучы руку з доўгімі яркімі пазногцямі на плячо Фёдару Дзянісавічу. — Можа, патанчым? — яна пацягнула яго на танцпляцоўку, не чакаючы адказу. Усё яшчэ не зводзячы позірку з Ігара Леанідавіча, Фёдар Дзянісавіч механічна паклаў руку на Веранічыну талію.

— Ніжэй, калі ласка! Мне так больш зручна! — прашаптала яму на вуха Веранічка ды апусціла ягоныя рукі крыху ніжэй, і Фёдар Дзянісавіч нарэшце адарваў позірк ад Ігара Леанідавіча. Ён адчуваў, як пад доўгай сукенкай яе цела рухалася, нібы хацела выслізнуць з непатрэбнай абалонкі. Далоні чамусьці ўзмакрэлі. Да таго ж дзяўчына маўчала і толькі зрэдку пакусвала свае вусны.

А тамада, адпрацоўваючы свой заробак, ладзіў конкурсы. Ён паставіў пяць крэслаў і запрасіў прысесці ахвотнікаў: жаніха, Мішку Мігно, Жэньку, Ігара Леанідавіча і суседа дзядзьку Жору. Вера, мацаючы іхнія вушы, павінна была з завязанымі вачамі пазнаць свайго мужа. Тамада, ведучы дзяўчыну першы раз, жаніховы вушы абмінуў. Вера пагнула Мішкавы «лакатары» і адмоўна пахітала галавой.

— Не твае вушы? — перапытаў тамада.

Вера нічога не адказала, толькі рукамі паказала, што не.

Даўгаватыя Жэнькавы валасы, пасмачкамі закладзеныя за вушы, адразу выдалі ягоную асобу. Вера паказала рукамі «наступны». Наступным ся-

дзеў Ігар Леанідавіч. Вера доўга круціла ягоныя класічныя вушы і паспрабавала памацаць падбароддзе. «Стоп!» — перахапіў тамада яе руку.

Калі Вера дакранулася да валасатых вушэй дзядзькі Жоры, адразу сказала: «Гэта не Кірыл! Вушы валасатыя».

— Паглядзім, якія вушы будуць у твайго Кірыла ў маім узросце, — пакрыўджана падаў голас дзядзька Жора.

Вера ніяк не магла выбраць між Ігарам Леанідавічам і Кірылам. І тамада прапанаваў:

— Выбірай, якія табе больш падабаюцца!

І Вера паказала на Ігара Леанідавіча. Калі з ейных вачэй знялі хустачку і дзяўчына ўбачыла, што гэта не Кірыл, яна асцярожна зірнула на мужа. Кірыл амаль не засмуціўся.

Калі тамада запрасіў на гэтыя пяць крэслаў дзяўчат, першай уселася цётка Наташа. Выганяць яе не мела сэнсу, і тамада сумна завязаў вочы Кірылу. Веру трэба было пазнаць па нагах. Цётка Наташа параўнала свае слупападобныя ножкі з нагамі дзяўчат, цішком злезла з крэсла і пасадзіла на сваё месца Вікторыю Іванаўну. Кірыл доўга мацаў прыгожыя ногі сваёй цешчы, дайшоў ад пальцаў да калена, і тамада быў вымушаны спыніць хлопца. Потым Кірыл узяў тонкую ножку Каці, дзяўчына назірала, як моцнымі мужчынскімі рукамі Кірыл амаль што масажыраваў яе нагу і раптам заўважыла на калготках дарожку спушчаных вочкаў.

— Ой, калготкі паехалі! — выгукнула Каця, і Кірыл, пазнаўшы яе па голасу, перайшоў да Веранічкі. Малады муж можа б і хацеў пакратаць доўгія ногі жончынай сяброўкі, але, у адрозненне ад Веры, Веранічка была ўвогуле без калготак, і Кірыл перайшоў да Вольгі. Каб лепей разгледзець, як будуць мацаць яе нагу, падслепаватая паненка нахілілася наперад. Па гэтым характэрным руху Кірыл здагадаўся, што гэта таксама не жонка. Калі ён пай-

шоў другі раз і памацаў нагу Веры, яна падалася яму вельмі знаёмай. Ён ляпнуў рукой па вясельнай сукенцы і радасна выгукнуў:

— Гэта Вера!

11

Фёдар Дзянісавіч сеў на сваё месца, выцер сурвэткай лоб і глытнуў мінералкі. Побач села жонка і паклала на стол мужаў сотавы тэлефон.

— Я брала твой сотавы. Ты не супраць? — задала Вікторыя Іванаўна рытарычнае пытанне. — Ну, пагаварыў ты са сваім Галавачовым? — дадала яна з іроніяй.

— Віка! Хоць ты памаўчы! — рука Фёдара Дзянісавіча звычна пацягнулася да ўнутранай кішэні і, вядома ж, не адшукала ліст, ён памацаў яшчэ раз і рэзка павярнуўся да жонкі:

— Вікторыя, не жартуй! Паперку ўзяла ты?

— Яна знікла? — занепакоілася Вікторыя Іванаўна. — Фёдар, я не магу жартаваць тым, што для цябе вельмі важна.

— Божа мой! — ён закрыў твар рукамі. — Лепш бы яе ўзяла ты! Фёдар Дзянісавіч успомніў, дзе ён мог пакінуць каштоўны ліст. У суседняй зале! «Як я мог яе там пакінуць?! А калі хто-небудзь возьме!» І раптам праз адчыненыя дзверы ён заўважыў, як у тую залу ўвайшла Веранічка. Хутчэй туды! Ён падхапіўся і пабег. Люстры там былі выключаныя, але месяцавага святла было дастаткова, каб Фёдар Дзянісавіч адразу адшукаў той столік, каля якога ён размаўляў з Галавачовым. Але ліста там не было!

12

Фёдар Дзянісавіч ведаў, што Веранічка недзе тут. Ён нахіліўся, каб яго нельга было заўважыць, і перасоўваўся прысеўшы. Між столікамі ён заўважыў камеру. «Ох, нездарма мне так не спадабаўся гэты

аператар. Што ён тут робіць? Хаваецца, ці што?» — са злосцю падумаў Фёдар Дзянісавіч.

Але Ваня не хаваўся, ён даволі недвухсэнсоўна ляжаў на Веранічцы. Перш чым убачыць гэтую карціну, Фёдар Дзянісавіч паспеў паслізнуцца на яе сукенцы. Ён падняў тканіну да святла, пазнаў, чыя гэта рэч, сумная здагадка працяла яго: «Дык яна ўсё ж такі выслізнула са сваёй абалонкі!»

Фёдар Дзянісавіч бязвольна апусціўся на падлогу і выцер лоб абрусам, які звісаў з суседняга століка. Падмануты нечаканай развязкай, Фёдар Дзянісавіч стомлена глядзеў на парачку. Аператар Ваня быў апрануты, толькі крыху прыспусціў джынсы, а вось Веранічка была поўнасцю голая. Фёдар Дзянісавіч падумаў, што прасцей было б задраць сукенку, а не здымаць яе.

Веранічка выгіналася і, напэўна б, гучна стагнала, але Ваня заціснуў ёй рот рукой. Раптам Веранічка адвяла ягоную руку і нахабна запытала:

— Падабаецца глядзець, Фёдар Дзянісавіч?

Фёдар Дзянісавіч нібы прачнуўся, сумеўся і хуценька папоўз да выхада. Веранічка бязгучна рассмяялася і спіхнула з сябе Ваню:

— Хопіць! Ён ужо адпоўз, хоць навошта паўзці, можна было ўжо не хавацца. Смешны ён. Як ты думаеш, паверыў?

— Ды я сам паверыў! — крыху незадаволена адказаў Ваня, зазіраючы ў свае джынсы.

— Эх, Ваня, лежачы на голай дзяўчыне, часам трэба стрымліваць сябе, — яна выцягнула з-пад спіны нешта светлае, паклала ў сваю сумачку і адразу ўстала.

А Ваня ўсё сядзеў і не зашпільваў джынсаў. Раптам ён схапіў дзяўчыну за руку і пацягнуў да сябе, але яна вырвалася. Ваня злосна прашаптаў:

— Паслуга за паслугу! Я дапамог табе, цяпер твая чарга. Давай кладзіся!

— Мілы мой Ваня, ты не быў асабліва пяшчотным, калі імітаваў секс. Сумняваюся, што ў рэальнасці ты будзеш лепшым! — сказала Вераніка, нацягваючы на сябе сукенку.

— Думаю, што зараз пайду да гэтага Фёдара Дзянісавіча і патлумачу яму сітуацыю... — стрымана паведаміў Ваня, зашпільваючы джынсы.

— Ваня, хлопчык ты мой маленькі, а што ты сам ведаеш пра гэта? Ты ведаеш толькі тое, што я табе сказала. Ты быў так захоплены маёй просьбай, што нават не звяртаў ніякай увагі на мае словы. Ты так хацеў паляжаць на мне, што ў цябе мазгі адключыліся. Ты хворы! Ты думаеш толькі пра секс. Але менавіта таму з усіх гасцей я выбрала цябе, — кінула на развітанне Вераніка.

— А я думаў, ты абрала мяне таму, што я апынуўся ў гэтай зале! — Ваня знайшоў у сабе сілы паіранізаваць.

— Фёдару Дзянісавічу будзе вельмі карысна ведаць, што ты тут вышукваў адзін. А вось што ты рабіў са мной, ён сам бачыў. Мне цікава, ты штонебудзь паспеў зняць, апаратар? — падкузьміла Веранічка.

— Ты шлюха! — выдаў свой апошні аргумент Ваня.

## 13

На ўваходзе ў залу Фёдара Дзянісавіча чакала ўсхваляваная Вікторыя Іванаўна, яна тут жа запрасіла мужа танцаваць. Ён быў такім разгубленым, што калі б яго запрасілі скокнуць з парашутам, ён згадзіўся б. Сваімі чуллівымі рукамі ён трымаў цела жонкі, але яно не хацела выслізваць з сукенкі. Фёдар Дзянісавіч не ўяўляў сваёй Вікторыі Іванаўны голай на халоднай падлозе ў пустой зале.

Але жонка — гэта найперш сябар і паплечнік. Фёдар Дзянісавіч прыхінуўся да сваёй Вікторыі і

расказаў ёй на вуха пра здарэнне ў суседняй зале, абмінаючы некаторыя дэталі.

Раптам ён заўважыў зусім побач Веранічку, якая закруціла пляменніка Жэньку ў ашаламляльным танцы. Жэнькавыя рукі ляжалі на яе клубах, ды ён проста ўчапіўся ў цела дзяўчыны. Веранічка была аднолькавага росту з Жэнькам, але абцасы зрабілі сваю эратычную справу, і Жэнька не міргаючы глядзеў у глыбокае дэкальтэ партнёркі.

Знаёмая Фёдару Дзянісавічу рука з доўгімі пазногцямі лашчыла Жэнькаву шчаку і вуха. Потым указальным пальцам Веранічка правяла па вуснах хлопца і пацягнула яго да выхада. Каля самых дзвярэй яны спыніліся, дзяўчына дастала з сумачкі нешта светлае, і пакуль Жэнька здагадваўся, што ж гэта такое, Веранічка паспела перахапіць погляд Фёдара Дзянісавіча і паказаць Жэньку на пільнага дзядзьку. Пляменнік спужаўся, адвёў вочы і схаваў светлае ў сваю кішэню. І парачка знікла ў цемрадзі суседняй залы.

Фёдар Дзянісавіч не змог больш нічога заўважыць, і толькі потым усе сутыкнуліся з апошняй помстай аператара Вані. Ён цішком прашмыгнуў услед. Прамень святла ад камеры на некалькі секунд выхапіў з цемры ненавісныя постаці. І потым усе змаглі ўбачыць на касеце распранутую Веранічку і спужанага Жэньку з голай дупай.

Але пра такую несур'ёзнасць іхніх адносінаў Фёдар Дзянісавіч даведаўся праз два дні, а пакуль што ён ледзь дачакаўся вяртання Жэнькі і адразу палез да хлопца ў кішэню без аніякіх тлумачэнняў. Пяшчотна-бялюткая рэч аказалася зусім не паперкай, як чакаў Фёдар Дзянісавіч, а ўсяго толькі трусікамі Веранічкі. Фёдар Дзянісавіч разгублена разглядаў трусікі (паперкі ў іх не было), пакуль да яго не падышла Вікторыя Іванаўна. Яна здзіўлена паглядзела на мужа і спытала:

— Гэта чые?

— Жэнькавы! — упэўнена адказаў Фёдар Дзянісавіч і спяшаючыся запхаў бялюткае павуцінне ў Жэнькаву кішэню. Для Вікторыі Іванаўны было відавочна, што ўсё Жэнькава гаспадарства не ўлезла б у такія трусяняты.

— А Жэня заўсёды трусы ў кішэні носіць? — стрымліваючыся, спыталася Вікторыя Іванаўна, паглядзела на мужа, павярнулася і пайшла.

Фёдар Дзянісавіч пабег услед, спрабуючы ўсё растлумачыць, але Вікторыя не разумела, як можна пераблытаць трусы з паперкай. Гэта меўся быць самы страшны дзень у жыцці Фёдара Дзянісавіча: згубіў паперку, аддаў дачку і вось-вось страціць жонку. А тут яшчэ пляменнік нейкі перапужаны стаіць, слова не можа сказаць у абарону дзядзькі.

Фёдар Дзянісавіч сеў на крэсла і ліхаманкава аналізаваў сітуацыю. Праблему з жонкай ён пакінуў на заўтра, у яго ўсё жыццё наперадзе, каб апраўдацца. А вось што рабіць з Галавачовым? Фёдар Дзянісавіч адшукаў у натоўпе гасцей знаёмую фігуру.

Заўсёды стрыманы, Галавачоў гучна смяяўся разам з Інгай Іванаўнай. Яны танчылі і размаўлялі. Іх целы зліваліся, і Фёдар Дзянісавіч у чарговы раз падзівіўся камунікабельнасці Галавачова, той размаўляў з Інгай, нібы яны знаёмыя сто год. Цікава, як да такой гармоніі ставіцца Марына Канстанцінаўна? Фёдар Дзянісавіч пашукаў яе вачыма і не знайшоў. Толькі побач знаёмы голас запытаў:

— Вы некага шукаеце?

— Марына Канстанцінаўна?! Вы не паверыце, я вас шукаў! — з захапленнем усклікнуў Фёдар Дзянісавіч.

— Калі так... Можа, вы мяне запросіце? — з нейкім болем у голасе папрасіла Марына Канстанцінаўна. Жанчына перабірала рукамі тонкі бліскучы шалік і відавочна нервавалася. Яна з такой надзеяй глядзела ў вочы Фёдару Дзянісавічу, што яму аж няёмка стала. Ён імпэтна ўскочыў і галантна прапа-

наваў жанчыне руку. Яна не чакала такой абыходлівасці і нават збянтэжылася.

14

Пачаўся вальс. Марына Канстанцінаўна трапятала, як хваля, у такт музыкі. «Такую жанчыну прыемна нават проста ў руках патрымаць», — падумаў Фёдар Дзянісавіч. Яна не была тоненькай ці кволай з выгляду, але яе лёгкія крокі рабілі яе падобнай да ветрыку.

Марына Канстанцінаўна даволі шчыльна прыціскалася да Фёдара Дзянісавіча, але не глядзела яму ў вочы. Крыху ўсхваляваная танцам, Марына Канстанцінаўна нібыта не заўважала, што з кожным уздыхам яна дакранаецца грудзямі да Фёдара Дзянісавіча, які, нягледзячы на заклапочанасць, гэтыя рытмічныя дотыкі адчуваў.

Здавалася, што Марына Канстанцінаўна нешта хоча сказаць, але баіцца ці саромеецца. Яна расцягвала мяккія, крыху бясформенныя вусны ў вінаватай усмешцы. «Калі б яна яшчэ хвастом віляла — была б як пабіты сабака», — адзначыў Фёдар Дзянісавіч.

— Я непрыгожа зрабіла, — жанчына нарэшце асмелілася. — Пад уздзеяннем нейкіх імгненных пачуццяў! Як васьмікласніца!

Фёдар Дзянісавіч насцярожыўся. Канешне! Яна ж ведала пра паперку! Гэта яна ўзяла, але пра якія імгненныя пачуцці яна гаворыць?

— Вы бачыце, які ў мяне муж, — працягвала Марына Канстанцінаўна, — усё справы, справы. І ні хвіліны для мяне.

О, дык нездарма спрактыкаваныя рукі Фёдара Дзянісавіча адчувалі, што перад ім няворанае поле.

— Жанчыну, як кветку, трэба паліваць, — непрыстойна пажартаваў Фёдар Дзянісавіч. Але Марына Канстанцінаўна не чула ягоных слоў.

— Я не патрабую каштоўнасцей і ўпрыгожанняў. Мне прыемней увага, ласкавае слова, пацалунак! — спавядалася яна далей. Ейны кавалер спагадліва хітаў галавой, лацвей абдымаючы яе талію. «Птушка ў клетцы! Можна і слёзы яе паслухаць!» — звінела ў галаве Фёдара Дзянісавіча.

— Вы так добра слухаеце! Такі ўважлівы да мяне толькі мой псіхатэрапеўт! — засмяялася Марына Канстанцінаўна.

«Цікава, куды яна схавала паперку? У сумку? Ці ў бялізну? Кішэняў жа няма!»

— Ой, тут так тлумна! Можа, выйдзем на свежае паветра? — прашаптала Марына Канстанцінаўна.

Яны спускаліся па лесвіцы, і яна трымала яго за руку.

«Ах, якую прычыну зручную прыдумала! Зараз аддасць мне маю паперку! Хоць у такой просьбе ёсць нешта інтымнае!»

Раптам на апошняй прыступцы жанчыну падвярнула нагу, пахіснулася, і Фёдар Дзянісавіч быў вымушаны падхапіць яе. Марына Канстанцінаўна сціснула пальцы ў яго на плячы, а яе мяккія вусны аказаліся так блізка...

Фёдар Дзянісавіч хуценька нахіліўся, каб паглядзець яе нагу. А яна занадта высока падняла сукенку. І зараз Фёдар Дзянісавіч быў упэўнены, што ў панчохах і ніжняй бялізне паперкі няма. Заставаўся бюстгальтар. Фёдар Дзянісавіч падняўся і, намагаючыся не глядзець ёй у вочы, прапанаваў:

— Я давяду вас да крэсла. Здаецца, гэта не вывіх!

«Канешне, не вывіх!» — пасмяялася ў думках сімулянтка.

Ён падхапіў яе за талію і паступова дасягнуў бюстгальтара. «Так, злева паперкі няма» — «Неяк дзіўна ён мацае. Пад пахамі!» — здзівілася жанчына.

Галава Фёдара Дзянісавіча працавала не горш за камп'ютэр: «Сама яна не аддасць. А то даўно б ужо

сказала. Яна проста хоча задаволіць свае інстынкты. Але дзе ж паперка?»

Марына Канстанцінаўна схапілася за галаву:

— Прабачце, мне неяк млосна! Не хапае паветра! Расшпіліце мне замок! — і яна вокамгненна павярнулася да Фёдара Дзянісавіча спінай. Дрыготкімі рукамі ён расшпіліў замок на сукенцы і таропка прапанаваў: «Збегаю, валідол прынясу!» — і, пакуль яна не паспела запярэчыць, ірвануў у залу.

У зале ён хуценька адшукаў яе месца (як ганаровыя госці Галавачовы сядзелі каля бацькоў маладых), з трыумфам схапіў яе сумку, адчыніў і толькі запусціў руку, як пачуў нізкі недаўменны голас Галавачова:

— Фёдар Дзянісавіч?

Злодзея-небараку ажно кінула ў пот. На ватных нагах ён павярнуўся і заклапочана прамармытаў:

— Там Марыне Канстанцінаўне дрэнна стала. Яна спачатку нагу падвярнула, а потым задыхацца пачала.

— Нагу падвярнула? — разрагатаўся Галавачоў. — Задыхалася? А расшпіліць замок не прасіла?

Сумка выпала з рук Фёдара Дзянісавіча. І толькі тут ён заўважыў, што за Галавачовым стаіць Інга. Рука Галавачова павольна спусцілася з яе таліі. Сама Інга загадкава паглядзела на Фёдара Дзянісавіча, а ў яго толькі і хапіла моцы, каб падумаць: «Садом і Гамора! Распуснікі!»

Ён паклаў сумку на месца, паперкі там не было. «Яна сказала, што нешта дрэннае зрабіла. Што яна мела на ўвазе?» — губляўся ў здагадках Фёдар Дзянісавіч.

## 15

Аператар Ваня павольна падышоў да Марыны Канстанцінаўны. Ён уключыў камеру і гучна спытаў:

— Можа, вы хочаце яшчэ нешта пажадаць маладым?

Яна зрабіла яму знак, каб ён выключыў камеру, і папрасіла:

— Дайце хвілінку падумаць!

Яна паправіла прычоску, усміхнулася і ўзяла чужы бакал з шампанскім, які стаяў на століку каля крэсла.

— Вера і Кірыл! Гэта вялікая ўдача, што вы здолелі адшукаць адзін аднаго ў гэтым мітуслівым натоўпе. Хай ваша шчасце расце з кожным днём, хай ваша каханне мацнее з кожным пацалункам!

Марына Канстанцінаўна шчыра гаварыла ў камеру, а Ваня адчуў, як яе нага дакранаецца да яго, ідзе ўверх і нарэшце дасягае таго месца, дзе сшываюцца чатыры часткі джынсаў. Ваня сціснуў свае ногі, каб не пусціць далей (хоць куды ўжо далей!), а Марына Канстанцінаўна асцярожна выняла нагу, пакінуўшы туфлік на высокім абцасе між ног абамлелага аператара. Так яму і прыйшлося стаяць, звёўшы ногі, бо інакш бы туфлік выпаў і на відэакасеце гэта было б чутно.

Марына Канстанцінаўна з мацярынскай слязой працягвала:

— Будзьце цярплівымі адно да аднаго. Памятайце, муж і жонка не проста каханкі, яны найперш сябры! Горка! — узмахнула яна чужым бакалам.

Яна нахілілася, каб забраць свой чаравік, і Ваня заўважыў, што ў яе сукенка расшпілена. Яна надзела туфлік і падняла галаву. Яны паразумеліся з першага позірку, і Ваня кіўнуў галавой на дзверы з надпісам «Службовы ўваход»...

Фёдар Дзянісавіч стаяў на лесвіцы і бачыў, як хлопец паказаў на дзверы і як нязмушанай хадой Марына Канстанцінаўна прадэфілявала да «Службовага ўвахода». «Ахвотна веру, што ў яе ёсць уласны псіхатэрапеўт. Дзіўлюся, што няма ўласнага венеролага!» — падумаў Фёдар Дзянісавіч, апускаючыся на прыступкі. Ён прыціснуў гарачы лоб да халодных парэнчаў.

Бакавым зрокам Фёдар Дзянісавіч заўважыў, як з прыбіральні выходзіла Інга, нешта хаваючы ў бюстгальтар. Інстынкт паляўнічага прымусіў мабілізаваць усю энергію. Такім чынам, энергія яшчэ была, а далікатнасці ўжо не хапала.

— Інга, што ў цябе там? — амаль выкрыкнуў Фёдар Дзянісавіч.

— Федзя! Нешта здарылася? — ёй відавочна хацелася перавесці размову на іншую тэму. Але Фёдар Дзянісавіч ужо схапіў яе за рукі і быў гатовы забіць за любое прамаруджванне.

— Фёдар! Адпусці! Я ўсё растлумачу! — ціха папрасіла Інга. А калі ён адпусціў, яна з усіх ног кінулася ў залу да гасцей.

— Ку-ды, ссссс... — недагаварыў Фёдар Дзянісавіч, кінуўся за ёй, але паслізнуўся і ўпаў на мармуровую падлогу. Ён бяссільна ўдарыў кулакамі па падлозе і ўзвыў ад болю:

— А-а-а-а! Сцервы!!! Не магу больш!

Вікторыя Іванаўна схапіла мужа за рукі і прысела побач:

— Фёдар! Федзечка! Ды што ж гэта такое! Федзя!

Фёдар Дзянісавіч амаль плакаў:

— Паперку маю Інга ўзяла!

— Ну што ты такое вярзеш! Навошта ёй? Фё-одар! — Вікторыя, абураная за сястру, трэсла мужа за плечы.

## 16

Цётка Наташа ціхенька сабрала вакол сябе невялікую купку гасцей і пачала падбухторваць:

— Ну што гэта за вяселле без выкрадання маладой, без выкупу?! Верку за шкірку — і хаваем кудынебудзь. Вось толькі куды?

Веранічка прапанавала вывесці маладую на двор. Жэнька — у гардэроб, Кацька — на кухню. І калі госці, не дамовіўшыся, заціхлі пасля доўгай спрэчкі, з-за відэакамеры высунуў галаву аператар Ваня і

прапанаваў памяшканне з таблічкай на дзвярах: «Службовы ўваход». І пакуль Кірыл танчыў з сябрамі нешта джыгіцкае, Жэнька схапіў Веру за талію і выцягнуў з кола танцораў. Кола крыху звузілася, ды ніхто не заўважыў знікнення маладой. Кірыл скакаў, паклаўшы руку на плячо Мішкі Мігно. Мішка выкрыкваў «ас-са, ас-са» і выпісваў нагамі несусветныя фігуры. Кірыл намагаўся не адставаць ад сябра. Падгавораныя цёткай Наташай госці заахвочвальна ляпалі ў далоні. Раптам Міша заўважыў, як каля ўвахода ў залу мільганула нешта ярка-белае, ён не ўпершыню быў на вяселлі, і таму адразу здагадаўся, што да чаго.

— Трыма-ай! Кіра-а-а! Нявесту скралі!!! — не кантраляваў сябе Мішка.

Хлопцы выбеглі з кола і праз секунду імчалі па калідоры, у канцы якога свяцілася вясельная сукенка. Але дзяўчына на высокіх абцасах не магла ды і не хацела бегчы так хутка, як два раз'юшаныя хлопцы, якія падганялі сябе індзейскімі воклічамі. Міша выхапіў Веру з Жэнькавых рук, нібы гэта была не дзяўчына, а лялька. Кірыл жа ўтаропіўся на Жэньку і злосна запытаўся ў Веры:

— А ён тут што робіць?

— Мяне крадзе! — засмяялася Вера і абняла Жэньку за шыю. — Кірыл, памятаеш, я табе фотку паказвала. Гэта ж мой стрыечны брат, Жэнька!

— Стрыечны брат? Гэта зараз так называецца? — пырскаў слінай Кірыл. Мішка на ўсялякі выпадак трымаў яго за руку. Кірыл намагаўся нешта спытаць, але саромеўся і Мішкі, і самога Жэнькі. Пытанне, якое яго так даўно хвалявала, трэба было вырашыць раней, а не ўсчынаць сварку на вяселлі. Яму хацелася, каб зараз усе разышліся, нібы нічога не было, але ўсе стаялі і чакалі, што ён скажа. А што гаварыць? Што нельга прыцягваць на сваё веселле былога хлопца?

Маўчанне зацягнулася, Мішка супакоіўся і адпусціў руку Кірыла. Да іх падышла Веранічка:

— Прывітанне, народ! Хоць мы ўжо віталіся! Нешта здарылася? — яна адчула нацягнутасць і прыхаваную буру эмоцый. Яна бачыла, што Кірыл невядома за што вызверыўся на Жэньку. — Хлопцы, трэба быць прасцей! — засмяялася Веранічка і ўшчыкнула Кірыла за ягадзіцу. Кірыл здзіўлена павярнуўся да яе, яна ж цмокнула языком і казытнула Кірыла за чэлес. «Ну, блін! І Веркі не саромеецца!» — падумаў Кірыл і паглядзеў на жонку. Але Вера так прызвычаілася да выбрыкаў сваёй сяброўкі, што не звярнула ўвагі і зараз. А Веранічка ўжо падышла да Жэнькі, абхапіла шчодра нафарбаванымі вуснамі ягоныя вусны. Калі яна нарэшце ад яго адляпілася, то ўсе заўважылі, што Жэнькаў твар ад носа да падбароддзя запэцкаўся памадай.

— Які ты, Жэнька, парсючок! Пойдзем, зліжу з цябе памаду, брудненькі ты мой! — Веранічка абхапіла Жэньку за талію, і яны пакінулі анямелых маладых.

У іншай сітуацыі Вера запытала б, што гэта Веранічка збіраецца рабіць з яе братам, але беспадстаўная рэўнасць Кірыла прымушала стрымлівацца.

— У цябе не сяброўка, а секс-бомба! — пакрыўджана сказаў Мішка. — Толькі чаму яна мяне не заўважае? Жанатага — памацала, брата твайго даўганогага-даўгарогага — пацалавала, а мяне, прыгажуна халастога, абмінула! Ну не курва, га?

Кірылу ад гэтых слоў стала непрыемна: даўганогі-даўгарогі не Жэнька, а ён сам, Кірыл. Трэба было прыцягнуць сваіх «стрыечных сясцёр», каб не выглядаць так па-дурному. Хопіць нервавацца, усё можна будзе высветліць потым! — падумаў Кірыл, а ўголас сказаў:

— Пойдзем да гасцей! І ўвогуле, давай дамовімся не псаваць сённяшняга свята!

— Канешне, я і не збіралася нічога псаваць! — пакрыўджана адказала Вера.

## 17

Галавачоў танчыў з Інгай. Яна разумела, што такія мужчыны сваіх жонак не кідаюць, але не магла адмовіцца ад гэтага шчаслівага імгнення. Вечарам яна будзе сядзець у любімым крэсле, без касметыкі, з толькі што памытымі валасамі. Такая самотная і няшчасная. І дзеля вось гэтага танца, дзеля таго, што яшчэ магло між імі адбыцца, яна была гатовая выціснуць з сябе апошнія кроплі абаяльнасці, грацыёзнасці, жаночай вабнасці.

Узрост не мог сапсаваць прыгажосці гэтага мужчыны. Упэўнены, стрыманы, з тонкім пачуццём гумару — такія заўсёды падабаюцца жанчынам. Дай яму ў рукі меч ці калькулятар — ён застанецца Мужчынам.

Галавачоў не заўважаў пакут сумлення сваёй партнёркі. Раптам ён злавіў яе позірк, змоўк і мацней прыціснуў да сябе, нібы гаворачы: «Не бойся! Я абараню цябе!» Ці не зашмат для людзей, якія бачыліся першы раз?

Марына Канстанцінаўна крыху паназірала за мужам і, узяўшы сумачку, рашуча выйшла з залы. Яна спусцілася на першы паверх, паазіралася, стала каля люстэрка і дастала з футарала сотавы тэлефон. З гэтага ж футарала выпала паперка, складзеная ў восем столак. Марына Канстанцінаўна разгарнула паперку, доўга глядзела ў яе, потым зірнула на сваё адлюстраванне, прашаптала: «Ён сам вінаваты!» — і набрала нумар:

— Алё! Макс? Гэта я!.. Нам трэба сустрэцца!.. Шмат работы? Макс! Гэта будзе бомба! І гэтую інфармацыю я аддаю тваёй газеце, ты разумееш. У рэшце рэшт ты зможаш сказаць сабе, што недарма спаў са мной... Не перапыняй. Я ведаю, ты шкадуеш. Толькі ёсць адна праблема... О-о, ты здагадлівы. Сустрэнемся заўтра ў дванаццаць на нашым месцы.

18

Цётка Наташа вельмі засмуцілася, што выкраданне маладой не адбылося. Але можна было яшчэ сцягнуць туфлік з нагі маладой. І цётка Наташа жвава накіравалася да Веранічкі, каб дамовіцца пра новую спробу вясельнага злачынства. Самой цётцы Наташы да Веры нельга было падыходзіць: у Кірыла была на цётку «алергія». Як толькі ён бачыў недзе паблізу яе ярка-ружовы пінжак, рэфлексійна мацаў, ці побач жонка. А вось Веранічка магла хадзіць, дзе захоча. Яна прашаптала ўсё Веры на вуха і хацела хуценька зняць туфлік. Але той маленькім раменьчыкам прымацоўваўся да шчыкалаткі. І замочак не паддаваўся. Веранічка прысела, каб было зручней расшпіліць. Раптам падышоў Кірыл і спакойным тонам запытаўся:

— Дапамагчы?

Веранічка, не паднімаючы галавы, адказала:

— Ага, тут нешта не атрымоўваецца. Ой, Кірыл!.. Э-э-э, прабач... Я тут...

Кірыл нічога не сказаў, толькі прыязна ўсміхнуўся і адвёў жонку ад сяброўкі. Кампанія выкрадальнікаў зразумела, што маладая ахоўваецца надзейна. Але «генератар ідэй», цётка Наташа, знайшла выйсце і тут. Яна прапанавала падаслаць свайго ўнука Алежку. Ён залез бы пад сукенку і зняў чаравік, ніхто б не заўважыў, што там хтосьці сядзіць.

Малы Алежка з радасцю залез пад сукенку маладой. А цётка Наташа займала ўвагу Кірыла. Хлопец нешта западозрыў і азірнуўся, ці няма паблізу выкрадальнікаў. Раптам Вера пачырванела і даволі гучна запытала:

— Цётка Наташа, колькі год вашаму ўнуку?

— Шэсць! — з гонарам адказала шчаслівая бабуля.

— Шэсць?! — закрычала Вера. — Забярыце гэтага маленькага маньяка.

— Сапраўды, а я думаю, што ён там так доўга сядзіць? — Цётка Наташа выцягнула хлопчыка з-пад сукенкі.

Кірыл проста разрагатаўся, назіраючы за гэтай сітуацыяй. Вера стаяла ўся чырвоная і механічна папраўляла прычоску. У кутку залы цётка Наташа сварылася на свайго любімага ўнука. Да маладых падбег Фёдар Дзянісавіч і пацікавіўся пра здарэнне. Кірыл усё вельмі смешна пераказаў, і Фёдар Дзянісавіч слухаў з усмешкай і ўжо збіраўся разрагатацца ад душы, як за спінамі маладых узнікла Веранічка і падміргнула Фёдару Дзянісавічу. Яму адразу расхацелася смяяцца. Ён успомніў пра Ваню і здарэнне ў суседняй зале, адразу прыдумаў нейкія справы і пакінуў маладых. Кірыл з недаверам паглядзеў на таропкую хаду свайго цесця, але, убачыўшы Веранічку, зразумеў, хто Фёдара Дзянісавіча справакаваў.

Ад няўдалых выкраданняў стаміліся ўсе: і «злачынцы», і назіральнікі, і сама нявеста. Кірыл прашаптаў Веры за сталом:

— Што занадта, то не добра! Хопіць выкраданняў. Гэта ўжо не смешна. Ты са мной згодная, любая?

Вера кіўнула галавой, але пакуль Кірыл дзякаваў гасцям за чарговае пажаданне, высунула з-пад сукенкі нагу і расшпіліла замочак. Калі ўсе зноў выйшлі з-за сталоў, Вера папрасіла Кірыла суправаджаць яе на першы паверх. Кірыл на секунду задумаўся і незадаволена запытаў:

— Гэта абавязкова?

Вера здзіўлена паглядзела на мужа, абедзвюма рукамі адтапырыла яму вушы і ўсміхнулася:

— Я магу пайсці адна, калі ты мне давяраеш.

Каб пазбегнуць розных правакацый, Кірыл зрабіў знак Мішку, і той прывязаўся да іх як хвосцік.

Цётка Наташа стаяла з мужам на першым паверсе. Дзядзька Жора кахаў сваю жонку гэтак жа моц-

на, як і ў першы год сумеснага жыцця. У яе тады яшчэ не было такіх неабдымных грудзей, яна была мініяцюрнай і безабароннай. Дзядзька Жора паклаў руку жонцы на плячо і запытаў:

— Наташа, а ты памятаеш, як жаніліся мы?

Твар цёткі Наташы пасвятлеў і памаладзеў, яна паправіла завушніцу і какетліва зірнула на мужа:

— Ты быў такі смешны, з доўгай шыяй. І страшэнна баяўся першай ночы.

— Хто? Я? — жартоўна абурыўся дзядзька Жора. — Галоўнае, што ў мяне ўсё атрымалася, нягледзячы на тое, што пад дзвярыма сядзела твая мама і прыслухоўвалася.

У гэты момант міма пажылай парачкі прайшла тройца: Кірыл, Вера і Мішка. Яны крыху пастаялі, Вера ў гэты час асцярожна выняла нагу з туфліка і пакінула яго. Цётка Наташа і дзядзька Жора былі так захоплены сваімі ўспамінамі і пачуццямі, што не заўважылі паваленага набок белага туфліка. А вось інтуіцыя прымусіла Мішку азірнуцца, з дзікім крыкам хлопец кінуўся да туфліка і, вядома ж, паспеў першым. Кірыл з дакорам паглядзеў на Веру, яна вінавата ўсміхалася. Мішка з трыумфам прынёс туфлік і пяшчотна сказаў:

— Яшчэ што-небудзь падобнае зробіш — шыю зламаю.

І Вера ўжо не супраціўлялася, калі ён задраў сукенку і пачаў насоўваць туфлік. Але Кірыл спыніў яго, узяў за абцас ненавісную рэч і пайшоў да цёткі Наташы.

— Бярыце і рабіце, што трэба. Інакш гэта ніколі не скончыцца, — ветліва сказаў Кірыл. — А мяне гэта ўжо за-дзяў-бло!!! — дадаў ён крыкам.

Ён падхапіў Веру і панёс у рэстаранную залу, за імі дробным крокам бегла цётка Наташа. У зале яна напоўніла чарку Кірыла, паставіла яе ў Верын туфлік і працягнула Кірылу. Ён выняў чарку, а цётка Наташа з віскам спыніла яго:

— Трэба з чаравіка.

— Я ведаю, што раблю, — Кірыл падняў на цётку цяжкі позірк. Цётка замоўкла на паўслове, а Кірыл выліў змесціва чаркі ў чаравік. Усе ахнулі. А Вера адразу ўявіла, як яна будзе хадзіць у мокрым абутку.

Кірыл абвёў позіркам усіх прысутных і сказаў выразна, амаль па складах:

— Гэта мая жонка. І я буду піць з яе туфліка.

І выпіў.

## 19

Ігар Леанідавіч, намеснік Фёдара Дзянісавіча, стаяў на першым паверсе. Ён відавочна нерваваўся. Раз-пораз ён даставаў сотавы і глядзеў на яго з надзеяй. Ён мераў крокамі падлогу, лічыў пліткі, з падазрэннем азіраўся на людзей.

Нарэшце ён не вытрымаў, сеў у крэсла і ўзяў са століка рэкламныя праспекты. Да яго падсела дзяўчына:

— Вы некага чакаеце?

Ігар Леанідавіч падскочыў ад нечаканасці, рэкламкі выпалі ў яго з рук, і ён з нянавісцю паглядзеў на дзяўчыну. Тая скрывілася і, ганарліва перасмыкнуўшы вуснамі, пайшла знаёміцца з іншымі. Ігар Леанідавіч абхапіў твар рукамі і ўткнуўся ў калені. Калі ён падняў галаву, перад ім стаяла Каця.

— Ты з мяне параноіка зробіш! — жаласна прамовіў Ігар Леанідавіч.

— Я? А можа, тая прастытутка, што да цябе лезла? — пажартавала Каця і села побач.

— Прастытутка? Ды не? — Ігар Леанідавіч пашукаў вачыма тую дзеўку. — А ты што, тут сядзець збіраешся? А калі бацька твой убачыць? Фёдар Дзянісавіч мяне заб'е!

— Ігар, я не веру, што табе няма чаго яму адказаць! — безапеляцыйна адказала Каця і пасунулася, каб яго пацалаваць.

— О-о-о, толькі не тут!!! Хто-небудзь убачыць! — спыніў яе Ігар.

— Ах, так? — раззлавалася дзяўчына, схапіла Ігара за руку і пацягнула яго ў дальні кут, адкуль нават лесвіцы не было відаць.

— Стой! Ты вар'ятка! — выдыхнуў Ігар. — Мне ўсё гэта непрыемна з-за таго, што ты дачка майго шэфа. Ты патэлефанавала мне ў пачатку вечара і прызначыла спатканне на 21.00. І званіла менавіта ў той момант, калі твой бацька накіроўваўся да мяне. Я ўвесь вечар ад яго, як заяц, бегаю. Жах!

— Добра, што ён яшчэ не ведае, што я з яго сотавага званіла. Я сама ўзяць тэлефон пабаялася, я маму папрасіла. І прабач, я занадта позна ўбачыла, што бацька якраз ідзе да цябе. Але я падаслала да яго Вераніку. Яна яго нават у суседнюю залу заманіла. Уяўляеш, ён туды прыйшоў, а яна з апаратарам нібыта сексам займаюцца. Во смех! — Каця па-дзіцячы разрагаталася.

Ігар глядзеў, як яна смяецца, і ўсё, акрамя яе, проста сцёрлася з ягонай памяці! Існавала толькі дзяўчына, якая смяецца. Яна заўважыла дзіўны выраз яго твару і паторгала яго за рукаў:

— Ігар, што? Што такое?

— Я цябе кахаю! — прашаптаў ён.

Яна нічога не адказала, а толькі падышла і пачала цалаваць яго. Спачатку павольна і пяшчотна, а потым усё агрэсіўней і мацней.

— Гэй, што вы тут робіце? — матэрыялізаваўся з паветра Фёдар Дзянісавіч. Ігар і Каця спыніліся і павольна павярнулі галовы ў яго бок. Ад такога палкага пацалунку паміж іх вуснамі працягнулася нітачка сліны, яна лопнула каля Каці і апала на Ігараў твар. Каця ўсміхнулася бацьку і злізнула з Ігара сліну. Бацька ўскіпеў:

— Каця, ідзі да мамы! Нам трэба з Ігарам Леанідавічам па-мужчынску пагаварыць.

Каця моўчкі пайшла, за спінай бацькі яна павярнулася і зрабіла непрыстойны жэст. Ігар заўважыў і ледзь не рассмяяўся.

— Што ж ты, паскуднік, робіш? — перарывістым голасам спытаў Фёдар Дзянісавіч. — Ёй толькі 18 год. А табе, кабялю, хутка 29!

— У мяне ў дачыненні да вашай дачкі сур'ёзныя намеры, — цвёрда адказаў Ігар Леанідавіч.

— Толькі што прыдумаў? — іранічна запытаў Фёдар Дзянісавіч.

— Так, — шчыра прызнаўся Ігар. — Я яе кахаю.

— Кахай каго-небудзь іншага! З сённяшняга дня мы ўжо толькі калегі, не сябры, — раз'юшыўся Фёдар Дзянісавіч, павярнуўся і пайшоў.

— У адрозненне ад Галавачова! — крыкнуў яму ўслед Ігар.

Фёдар Дзянісавіч спыніўся, секунду пастаяў спінай да Ігара, і, калі павярнуўся, на яго твары свяцілася найпрыемнейшая ўсмешка:

— Дык гэта ты, Ігар Леанідавіч? — спытаў пра згубленую паперку Фёдар Дзянісавіч.

— Гэта, — паказаў на сябе рукамі Ігар, — я! А што, ёсць сумненні?

— Ты ведаеш, пра што я! — ледзь трываў Фёдар Дзянісавіч. Яго проста запаўняла нястрымнае жаданне максімальна зблізіць твар Ігара і мармуровую сцяну.

— Я не разумею, пра што вы кажаце. Але вашых слоў дастаткова, каб я ў агульных рысах пра ўсё здагадаўся. Кінуць нас хочаце, як апошніх... — не дагаварыў Ігар.

— Ігар, Ігар, як ты можаш такое нават падумаць! — даволі натуральна абурыўся Фёдар Дзянісавіч.

— У мяне толькі адна просьба! Калі будзеце гаварыць з Галавачовым, не забывайце пра свайго будучага зяця! — цвёрда прамовіў Ігар яму ўслед.

Маленькі Алежка пацягнуў Ігара за штаніну:

— Ты самалёцікі рабіць умееш? А то мае дрэнна лятаюць.

Ігар усміхнуўся хлопчыку, і малы выцягнуў з кішэні безліч матэрыялу: папяровыя сурвэткі, аркуш з віншаваннем цёткі Наташы і нават візітоўку Фёдара Дзянісавіча...

## 20

Інга Іванаўна і Галавачоў сядзелі ў суседняй зале. Уключаная люстра давала цьмянае святло. Яны дакрануліся каленямі, ён узяў яе руку, калі іх інтымную адасобленасць парушыў Фёдар Дзянісавіч. Інга ўздрыгнула, ускочыла, падбегла да Фёдара Дзянісавіча і адвяла яго ўбок:

— Федзя! Толькі зараз не ўсчынай вэрхал. Прабач, што я ад цябе збегла там, ля прыбіральні, — Інга азірнулася на Галавачова, які ў гэты ж момант адвёў зацікаўлены позірк. — Федзя, у мяне алергія на ўсялякія антыперспіранты, ты ж ведаеш. Я проста пот сурвэткай выцірала, — мітусліва спраўдалася Інга.

— Інга! Я не да цябе! А да твайго кавалера! — Фёдар Дзянісавіч амаль што адпіхнуў жанчыну. Галавачоў падняўся і падышоў да іх.

— Я больш не магу, — лапатаў Фёдар Дзянісавіч. — Гэта проста навала нейкая. Маю паперку... тую, з якой я да вас падыходзіў... яе сцягнулі... у самым пачатку! І я ўвесь вечар ганяюся за нейкім фантомам, чапляюся да ні ў чым не вінаватых людзей. Я вар'яцею. А зараз у мяне і акуляры зніклі. Я так рыхтаваўся да вяселля, знаёмаму паэту верш замовіў — і нехта сцягнуў акуляры. Я зараз як з жыцця выкрэслены, ні чытаць, ні пісаць не змагу. Гэта зрабіла тая ж самая асоба, што скрала паперку, я ўпэўнены.

— Пачакайце! — спыніў яго Галавачоў. — Знікла паперка і акуляры? У мяне ёсць ідэя.

Фёдар Дзянісавіч паглядзеў на яго з надзеяй. На твары Галавачова не адбілася ніводная эмоцыя, і толькі было відаць, як ён зрэдку сціскае сківіцы. Фёдар Дзянісавіч у чаканні памацаў позіркам вуглы і завуголлі.

— Ёсць ідэя, — паўтарыў Галавачоў. — Але вы пачакайце мяне тут. Я зараз буду.

Ён выйшаў з залы і на калідоры, дзе яго ніхто не бачыў, моцна заплюшчыў вочы. Калі ён адкрыў іх, гэта быў іншы чалавек, чалавек-камень. З выпрацаванай усмешкай ён прайшоў скрозь натоўп вясёлых гасцей да сваёй жонкі.

Марына Канстанцінаўна з іроніяй запытала:

— Сумуеш без мяне?

— А ты? — ён шматзначна паглядзеў ёй у вочы. — Марына, дай мне твой сотавы, я свой перазарадзіць забыў, — схлусіў Галавачоў.

— І ўсё? Толькі з-за сотавага? — яна нібы знайшла пацверджанне нейкім сваім патаемным думкам. — Бяры! — з болем сказала яна.

Галавачоў узяў сотавы, уважліва паглядзеў на жонку і націснуў кнопку паўторнага выкліку. Марына Канстанцінаўна кінулася, каб выхапіць сотавы. Муж глянуў на нумар і сам аддаў жонцы тэлефон. Яна хутка націснула любую кнопку, каб збіць нумар, хоць гэта ўжо нічога не змяніла б.

— Зноў сустракаешся са сваім папарацы? — стрымана спытаў ён. — Мне здавалася, што вы пасварыліся? Ці зараз у яго да цябе прафесійная цікавасць?

— Не твой клопат! — з выклікам прамовіла жанчына.

— Усё, што датычыць майго банка, — мой клопат! Хочаш пра гэта пагаварыць? — з езуіцкай клапатлівасцю запытаў Галавачоў і вывеў жонку з залы ў калідор.

— Я цябе ненавіджу! — плакала Марына Канстанцінаўна. — Я толькі падумаю, а ты ўжо ведаеш. Я ў цябе як на далоні! Ты не лічыш мяне за чалавека!

Божа мой, я не ведаю, за што я цябе кахаю! — яна прыціснулася тварам да халоднай сцяны.

Галавачоў выглядаў як доктар, які спакойна назірае за пакутамі пацыента.

— Аддай паперу! — ён працягнуў руку.

— Якую паперу? — спужана павярнулася Марына Канстанцінаўна. — Я нічога не брала! Я папярэдзіла Макса, што ў мяне пакуль няма доказаў. А яму і не патрэбны твае паперкі. Макс даў бы намёк, падняў хвалю, вы не звярталіся б у суд. Я ведаю. Макс верыць мне! — шчыра выгукнула Марына Канстанцінаўна.

— Не сумняваюся, — скрывіў вусны яе муж. — Ты калі-небудзь думала, што такая здрада страшнейшая за фізічную? — спытаў ён, гледзячы ёй у вочы.

— А ты калі-небудзь думаў, што гэта ты ва ўсім вінаваты? — плачучы, адказала яна.

## 21

Галавачоў прынёс дзве бутэлькі гарэлкі і тры чаркі ў суседнюю залу, дзе яго чакалі Фёдар Дзянісавіч і Інга Іванаўна.

— Яна сказала, што гэта я ва ўсім вінаваты! — прашаптаў Галавачоў, наліваючы сабе першую чарку.

— Хто «яна»? Ваша жонка? — спытала Інга Іванаўна, але Галавачоў не звярнуў на яе пытанне ніякай увагі.

— Няўжо я вінаваты? — ён паглядзеў на Фёдара Дзянісавіча і наліў яшчэ па адной чарцы ўсім. — А можа, я і вінаваты, — ён выпіў чарку. — Я калісьці прапанаваў свабодныя адносіны: яе не цікавяць мае каханкі, мяне — яе палюбоўнікі. Яна ж згадзілася. Што я не так зрабіў? Наша жыццё было пазбаўлена непатрэбных скандалаў. Усё шчыра і адкрыта. А зараз яна збіраецца здаць мяне свайму сябру-журналісту. Ну, хай не мяне персанальна. Я ва ўсім гэ-

тым не першая скрыпка. Але адчуванне паскуднае. Так падставіць роднага мужа! — шчыра абураўся Галавачоў, інтэлігентна куляючы наступную чарку.

— Але ты сапраўды вінаваты! — Інгу Іванаўну ахапіла нястрымнае жаданне абараніць няшчасную жанчыну. — Ты сам падштурхнуў яе да розных інтрыжак і здрадаў. А ты спытаў, ці хацела гэтага яна? Не падумай, я не абараняю яе, я проста кажу, што яе можна зразумець.

І пакуль яны гаварылі, Фёдар Дзянісавіч піў, не звяртаючы на іх увагі. І калі Інга сказала, што Марыну Канстанцінаўну можна зразумець, ён шморгнуў носам і загаварыў:

— Не слухайце нікога. Яна вас нявартая!!! Я ўпершыню сустракаю такога чалавека, як вы. Чалавека з вялікай літары!

— Узаемна, Фёдар Дзянісавіч! На брудэршафт? — Галавачоў выцягнуў руку з чаркай.

— На брудэршафт! — падскочыў да яго зусім ужо п'яны Фёдар Дзянісавіч.

Яны пацалаваліся, абняліся, зацягнулі нейкую песню з часоў іх камсамольскай маладосці. Потым спявалі адзін аднаму дыфірамбы і млелі ад гэтай няшчырай пахвальбы, як малыя дзеці. Інга Іванаўна не ведала, што рабіць: ці пакінуць іх сам-насам, ці яшчэ застацца. Раптам у залу зазірнула Вікторыя Іванаўна:

— О, Фёдар! А я цябе ўсюды шукала. Госці цікавяцца, а дзе бацька нявесты. Божа мой, у якім ты стане! І ўсё з-за нейкай паперкі. Фёдар! Мне здаецца, што ўсё вырашыцца проста і лёгка. Так што больш не пі, га? — угаворвала мужа Вікторыя Іванаўна.

— А ты вядзі Галавачова! — загадала яна сястры.

— А можа, лепш жонку яго паклікаць? — няўпэўнена запытала Інга.

— Марына Канстанцінаўна развіталася, узяла таксі і паехала дадому. Так што давай цягні! — рассмяялася Вікторыя Іванаўна.

Фёдара Дзянісавіча пасадзілі на ягонае месца за сталом. Маладая збіралася кідаць букет. Інга Іванаўна спачатку завяла Галавачова ў залу, але вырашыла, што лепш яго пасадзіць у таксі, пакуль ён яшчэ памятае свой адрас. Незамужнія дзяўчаты прыгатаваліся лавіць букет. Каця стала апошняй і крыкнула сястры:

— Кідай далей!

Маладая павярнулася спінай, размахнулася і шпурнула кветкі. Букет куляўся ў паветры, абмінаючы мноства рук. Каця падскочыла, як баскетбалістка, каб злавіць букет, але ён выслізнуў з яе рук і павіс на залакіраванай галаве Інгі Іванаўны, зачапіўшыся моцнай зялёнай сцяблінкай. Галавачоў кінуўся выблытваць букет, але зрабіў яшчэ горш. Інга Іванаўна сама адчапіла букет і сунула яго ў рукі Галавачову. Яна так і пасадзіла яго ў таксі з гэтым букетам. «Жонцы падорыце», — хацела пажартаваць Інга Іванаўна, але стрымалася.

## 22

Каці было крыху крыўдна, што яна не злавіла букета, але ў рэшце рэшт яго не атрымаў ніхто, і гэта радавала. Заставалася яшчэ адна справа. Каця адшукала Вераніку, тая размаўляла з Жэнькам.

— Веранічка, дай мне свае трусікі! — папрасіла Каця.

Жэнька здзіўлена падняў бровы, а Вераніка спытала:

— Якія трусікі?

— Твае! Твае! Ну не прыкідвайся! Ты ж заўсёды носіш у сумцы маленькія, амаль лялечныя трусікі, яны ні на якую нармальную жанчыну не налезуць. Ты ж іх хлопцу ў кішэню кладзеш — і ён твой. Ну, дай мне!

Вераніка стаяла з каменным тварам. А Жэнька разрагатаўся, выцягнуў з кішэні бялюткае павуцінне і працягнуў Каці. Дзяўчына ўсё зразумела, ёй

было крыху сорамна, што яна так падставіла сяброўку сястры, але трусікі ўзяла.

На вуліцы стаяў Ігар Леанідавіч у чаканні таксі. Каця выбегла з будынка і кінулася ў ягоныя абдымкі. Яны стаялі каля вулічнага ліхтара, і Ігар добра бачыў, што Каця паклала яму ў кішэню. Яна ўсміхнулася і паабяцала:

— Я прыеду да цябе сёння! Чакай!

У таксі ён цішком дастаў бялюткае павуцінне, насычанае тонкім водарам распусты. Ігар прыціснуў бязважкую рэч да твару, удыхнуў, як яму падалося, Кацін пах і расцягнуў вусны ў шматзначнай усмешцы.

## 23

Фёдар Дзянісавіч самастойна падаўся ў прыбіральню. На ўсялякі выпадак ён ішоў каля сценкі, разпораз дакранаючыся да яе рукой. Дзверы жаночай і мужчынскай прыбіральняў былі адчыненыя, і Фёдар Дзянісавіч зайшоў у тую, што бліжэй. Ён зачыніўся ў кабінцы, дачакаўся раўнавагі і расшпіліў штаны. Занятак быў прывычны, і Фёдар Дзянісавіч тупа глядзеў у падлогу. Каля сметніцы ляжаў кавалачак ЯГО паперкі. Фёдар Дзянісавіч так і застыў з занятымі рукамі. Праз пэўны час ён ачомаўся, прыродная гідлівасць не дазволіла яму калупацца ў сметніцы, але шчасце ад таго, што паперка не трапіла ў чужыя рукі, захлынула яго. Ён, радасны, выскачыў з прыбіральні і ледзь не паваліў цётку Наташу.

— І-і-і-к, Фёдар Дзянісавіч! —ікнула яна ўслед суседу. Яна секунду пастаяла, потым на дыбачках выйшла з прыбіральні і ўважліва паглядзела на намаляваную на дзвярах жаночую фігуру.

А Фёдар Дзянісавіч хутчэй пабег шукаць жонку, хмель як рукой зняло, і ён быў у стане больш-менш нармальна перасоўвацца.

— Віка! Ты ж казала, што ўсё вырашыцца вельмі проста! Так і ёсць! — толькі што не падскокваў ад

прыемных перажыванняў Фёдар Дзянісавіч. — А што можа быць прасцей? Паперкай проста нехта падцёрся!!! — трыумфаваў Фёдар Дзянісавіч.

Вікторыя Іванаўна доўга глядзела на мужа, потым штурхнула яго ў крэсла і села побач:

— Нешта я не разумею, Фёдар! Ты казаў, што паперка вельмі важная, а зараз радуешся, што ёю нехта падцёрся?

Фёдар Дзянісавіч у знак згоды міргнуў вачыма, спачатку левым, потым правым.

— Фёдар! Я чакаю тлумачэнняў! — пакуль яшчэ спакойна запатрабавала Вікторыя Іванаўна. — З-за гэтай паперкі цябе, можна сказаць, не было на вяселлі дачкі. Калі б не бацькі Кірыла, я не ведаю, што рабіла б. Такім чынам, я слухаю!

— Банк надаваў крэдытаў са стопрацэнтнай рызыкай. Ну, разумееш, ты ім пяць штук баксаў на лапу, яны табе ў крэдыт сто штук баксаў. Але ты не хвалюйся, Галавачоў тут ні пры чым. — Фёдар Дзянісавіч няўдала паспрабаваў супакоіць жонку.

— Пляваць мне на Галавачова, якое дачыненне да гэтага маеш ты? — не вытрымала перапужаная жонка.

— Ніякага! — усміхнуўся ў два рады зубоў муж. — Вічка! Я спаць хачу.

— Фёдар! — Вікторыя схапіла мужа за гальштук. — Я цябе ўважліва слухаю!

— Ох, Віка, дзіцяці зразумела, што пасля такіх крэдытаў банк гакнецца, як варона аб самалёт. А там жа ўсе грошы нашай фірмы. Галавачоў з-за нашага шчырага сяброўства і невялічкай матэрыяльнай дапамогі згадзіўся выцягнуць грошы, мае, фірмы, пакуль банк яшчэ не аб'яўлены банкрутам. Ну, і зараз прыйдзецца ратаваць грошы Ігара Леанідавіча, бо ён шантажыст! — прашаптаў Фёдар Дзянісавіч і заснуў.

— Вар'яцкі дом, я вам кажу... — сказала сама сабе Вікторыя Іванаўна.

24

Бацькі Кірыла чакалі таксі. Сяргей Іларыёнавіч круціў у руках акуляры. Валянціна Пятроўна адразу здагадалася, чые яны:

— Сяргей, што ж ты нарабіў?

— Нічога я не нарабіў! Сцягнуў у індыка гэтага акуляры. Хай ён не хоча Кіру нашага прапісваць! Нам і не трэба! Затое ён, як моладзь кажа, абламаўся сёння з гэтым вершам. Усё на відэакасеце будзе! А ўсяго толькі ручкамі трэба было папрацаваць.

— Але ж трэба аддаць! Вунь яны ўжо ідуць! — прашаптала Валянціна Пятроўна, беручы акуляры. — Вікторыя Іванаўна, якое ў нас добрае вяселле атрымалася. А столькі хваляванняў было.

— У Фёдара адна паперчына важная знікла, — хлусіла, апраўдваючы мужа, Вікторыя Іванаўна. — Ён разнерваваўся — і вось вынік.

Валянціна Пятроўна дапамагла пакласці Фёдара Дзянісавіча ў таксі і ціхенька ўкінула акуляры ў адкрытую сумку Вікторыі Іванаўны. Таксі паехала. Валянціна Пятроўна падышла да мужа і сказала:

— А ўсяго толькі трэба было ручкамі папрацаваць!

І яны разам разрагаталіся.

25

Калі Кірыл зайшоў у спальню, Вера сядзела на ложку ў прыгожым новым пеньюары і адрывала этыкетку. Кірыл зняў пінжак і сеў на сваю палову ложка.

— Я зусім не баюся! — дрыготкім голасам прашаптала Вера.

— А чаго табе баяцца, я не кусаюся! — сказаў Кірыл, здымаючы шкарпэткі.

Вера ўстала, падышла да акна, панюхала герань. Кірыл распранаўся, педантычна складаючы вопратку на стуле. А яго жонка збегала ў ванны, наліла вады ў лейку, каб паліць падсохлую кветку. Вера

ішла міма ложка, калі Кірыл раптоўна паклікаў яе, дзяўчына ўздрыгнула і выліла крыху вады з лейкі. Вера пераступіла цераз лужыну і пайшла да герані.

— Верка! Кідай сваю герань! — незадаволена загадаў Кірыл.

Вера павярнулася да яго. Ёй здавалася, што ён павінен быць больш пяшчотным. Яна безумоўна яго кахала, яна безумоўна хацела пражыць з ім усё жыццё, але зараз хацелася кінуць у яго чым-небудзь. Урэшце, злосць — гэта таксама элемент жарсці. Але злосць не спатрэбілася. Кірыл сам устаў і нецярпліва рушыў да Веры. Калі ён ступіў босай нагой у лужыну, то з усёй сваёй нецярплівасцю грымнуўся на падлогу. За непяшчоту Вера адпомсціла — яна разрагаталася.

— Ну, трымайся, Вера! — сказаў Кірыл, паціраючы калена.

Вера наліла вады з лейкі ў далоньку і пырснула на мужа. Кірыл падскочыў і падхапіў Веру, паказытаў ёй носам жывот, Вера пачала вырывацца, Кірыл яе не ўтрымаў, і дзяўчына цюкнулася галавой аб тумбачку. Яна села на ложак, трымаючыся за патыліцу. Кірыл сеў побач, узяў яе руку і, гледзячы ў падлогу перад сабой, прамовіў:

— Вера, яшчэ дваццаць хвілін такіх змаганняў — і мы станем інвалідамі! Ты хочаш сустрэць наш першы ранак у гіпсе?

Жонка павярнулася да Кірыла і абхапіла рукамі за шыю...

## 26

У дванаццаць гадзін Каця сядзела ў скураным крэсле ў кватэры Ігара Леанідавіча і піла моцную каву. Было горача, сукенка прыліпла да азадка, і Каця думала, як бы не забыцца адляпіць сукенку, калі яна ўстане.

— Бацька што-небудзь пра мяне казаў? — як бы між іншым запытаў Ігар.

— Канешне! Хрр-хррр-хррр! — дзяўчына зымітавала бацькаў храп.

Ігар дастаў цыгарэты і пачаў шукаць запальнічку. Ён высоўваў шуфляды, выварочваў кішэні.

— Ігар, ты ж кінуў паліць! — сказала Каця, аблізваючы лыжку. Ёй здавалася, што гэта вельмі эратычна, але Ігар не звярнуў ніякай увагі на такое спакушэнне. Ён згадзіўся, што кінуў паліць і схаваў цыгарэты ў пінжак.

— Нервуешся? — засмяялася Каця.

— Я проста павінен табе нешта сказаць. Мы крыху паспрачаліся з Фёдарам Дзянісавічам. Ён сказаў, што не ўхваляе нашых адносін. І я сказаў твайму бацьку, што збіраюся з табой ажаніцца. — Ігар зноў пачаў шукаць запальнічку.

— А я думала, чаго ён так напіўся! — Каця, смеючыся, узмахнула рукой і перакуліла на сябе каву. Для прыстойнасці яна ўзвізгнула, а потым зняла сукенку. Ігар нерухома сядзеў на падлакотніку крэсла і глядзеў на яе без аніякай страсці.

— Я спецыяльна для цябе прыняла дома ванну і пераапранулася. Што табе не падабаецца? Ці я нешта павінна сказаць? Як у фільмах? Вазьмі мяне? — нервова выгукнула Каця.

— Я чакаю адказу на сваё пытанне! Ты станеш маёй жонкай? — абсалютна спакойна запытаў Ігар.

— Канешне, стану, — умомант супакоілася дзяўчына, — мы закажам такі ж торт, добра? — яна абняла яго. — І ўвогуле меню можна поўнасцю пакінуць, — яна зноў села на крэсла, — толькі не будзем такой рыбы замаўляць. Ты яе каштаваў? З душком! Ад яе ў мяне нейкі панос пачаўся. Ледзь паперку знайшла, — па-дзіцячы шчыра паведаміла Каця і засмяялася. А потым з надзеяй запытала: — Дык я ў цябе застаюся?

Менавіта за гэтую шакіруючую непасрэднасць Ігар Леанідавіч, чалавек гальштукаў і строгіх касцюмаў, закахаўся ў Кацю. Намаганнямі сваёй жалезнай волі

ён душыў гэтае кволае пачуццё, і толькі калі два гады таму Фёдар Дзянісавіч спрабаваў звесці свайго намесніка са старэйшай дачкой Верай, Ігар Леанідавіч нарэшце з жахам прызнаўся сам сабе, што кахае Кацечку, гэтае малое нахабнае дзяўчо.

Распісанае па секундах жыццё ўпартага халасцяка Каця штодзённа разбурала сваімі непатрэбнымі, нават бруднымі прызнаннямі. Здавалася, яна проста не ведала сораму і нормаў паводзінаў.

Каця падняла сваю сукенку, узяла сумачку і пайшла ў спальню, Ігар паклыпаў за ёй. Яна села на ложак і пазяхнула:

— Так спаць хочацца, нават кава не дапамагае.

Ігар рассцяліў ложак, Каця калупнула пальчыкам кветачку на зялёнай прасціне і засмяялася:

— Ты такі сур’ёзны, а бялізна — такая вясёленькая.

Яна выцягнула з сумкі блакітнага зайчыка, залезла пад коўдру і скруцілася ў колца. Ігар глянуў на яе зайчыка, і ўсё ягонае мужчынскае жаданне перарасло ў бацькоўскую пяшчоту.

— Каця, я так сёння стаміўся... — толькі пачаў Ігар.

— Стаміўся! — радасна выгукнула Каця. — Я таксама. Так спаць хочацца, — вінавата сказала яна і пацёрла кулачком вока.

Ігар хутка распрануўся і лёг побач з дзяўчынай, яна даверліва паклала сваю галаву яму на грудзі, запіхнула між сваім і Ігаравым целам блакітнага зайчыка і сцішана засапла.

## ЗАБОЙСТВА Ў СТУДЭНЦКІМ ІНТЭРНАЦЕ

Пажылы міліцыянер стомлена ішоў да машыны, калі яго схапіла за рукаў дзяўчына:

— Скажыце, калі ласка, як гэта здарылася... на вашу думку?

— Піць трэба меней і пад ногі глядзець!

— Ён не мог сам!

— Мог, даражэнькая, мог! У мяне вы, студэнты, во дзе сядзіце! — свае словы ён суправадзіў красамоўным жэстам. — На мінулым тыдні аднаго з ракі выцягнулі, з моста зваліўся п'яны. А ўчора вось тут студэнтка пад машыну трапіла, я не ведаю, як у яе стане ўвогуле можна было ногі перасоўваць. А ці даўно ў вашым жа інтэрнаце шчэ адзін з балкона выпаў, абкураны? А вы кажаце — не мог ён сам зваліцца ў люк! У мяне сын-студэнт на платным, я з апошніх грошай яго вучу, а як гэтыя алкаголікі самі паступілі, я не разумею! Ды адпусці ты маю руку! — міліцыянер узлаваўся да такой ступені, што, сядаючы ў машыну, забыўся пра фуражку, якая, вядома ж, зляцела з галавы. Мужчына высунуўся і падняў яе. Гэтая недарэчнасць, як яму здалося, пахіснула ягоны аўтарытэт, таму ён злосна ляпнуў дзверцамі «форда».

Дзяўчына, як аглушаная, глядзела ўслед машыне, у вачах яе стаялі слёзы.

Таццяна вярталася ў інтэрнат як у тумане. Яна нічога ўжо не адчувала, не разумела, не думала. Хацелася прачнуцца ад гэтага жахлівага сну. І ўсведамленне, што гэта не сон, забівала яе. Вярнуцца б у дзяцінства, да мамы на ручкі! Але яна сама хутка стане мамай, і таму павінна быць моцнай, вельмі моцнай.

Яна заўсёды была моцнай, менавіта таму плейбою філфакаўскага інтэрната Стасу Зварыну закарцела авалодаць ёю. Моцны цягнуўся да моцнага? Усе сяброўкі казалі ёй: «Што ты робіш, ён жа кіне цябе праз тыдзень». «Тыдзень» зацягнуўся на адзінаццаць з паловай месяцаў страснага і пакутлівага кахання. Яны так і не адсвяткавалі гадавіну сваіх адносінаў. Стас банальна здрадзіў па п'янцы, а Таня банальна гэтага не даравала.

Яны былі зусім розныя. Стас з дзіўнай рэгулярнасцю напіваўся да бяспамяцтва, і ў такія моманты займаўся сексам з любой асобай процілеглага полу. Праўда, з часам ён стаў налізвацца так, што ні на што ўжо не быў здатны. Было б натуральна абвінаваціць яго ў алкагалізме, але ва ўмовах студэнцкага жыцця гэта была з'ява дастаткова нармальная, і ніхто не зважаў на гэта.

Таня да блізкага знаёмства са Стасам вяла амаль святое жыццё: пасля заняткаў, якія яна акуратна наведвала, дзяўчына гадзінамі праседжвала ў чыталцы, нешта вывучаючы і канспектуючы. Таня ні разу не напілася, што неаднойчы рабіла Веранічка, яе суседка па пакою.

Усе лічылі ненатуральным каханне Тані і Стаса. Але яны прыцягнуліся не толькі як моцны да моцнага, тут сутыкнуліся процілегласці. Стаса пасля кожнай сесіі намагаліся выкінуць з універсітэта, а Таня атрымоўвала максімальную стыпендыю.

Пасля той п'янай здрады Таня сабрала моцны характар у кулак і паставіла тлусты крыж на сваім каханні да Стаса. Потым, ужо на цвярозую галаву, Стас на каленях стаяў перад ёй, вымольваў дараванне. Ды не вымаліў. Пайшоў у запой (з якога ён не паспеў выйсці, бо загінуў) і пачаў жыць з Веранічкай, якая і піла, і курыла, і спала ледзь не з усім інтэрнатам. У яго пакоі гулі дзень і ноч: усе паэтыпразаікі збіраліся там, зачытвалі свае мроіва, бля-

валі ў прыбіральні, а ўвогуле, былі цалкам задаволеныя сабой і жыццём.

Таня даведалася пра сваю цяжарнасць яшчэ да Стасавай здрады. Менавіта таму яна яму не даравала: з яго быў нядрэнны каханак, але бацькам яна яго не ўяўляла.

Для Тані каханне было нечаканым, як маланка, і гэткім жа разбуральным. Усё радзей яна наведвала бібліятэкі і ўсё часцей трапляла ў кампаніі, куды яе запрашалі разам са Стасам.

І аднойчы яна зразумела, што ягоная прысутнасць стала для яе неабходнай. Так сорамна і прыемна было прызнацца, што яна закахалася ў Стаса Зварына, прыгажуна і донжуана. А раней жа яна любіла жартаваць, што яе крэда «цнатлівая назаўсёды». Неяк у размове з Ірынай, суседкай па пакою, Таня выдала жалезабетонныя аргументы:

— Ці вартая асалода ад 10-хвіліннага сексу таго, каб потым паўгода лячыцца ад венерычнай хваробы ці нарадзіць дзіця ад выпадковага чалавека? А ўвогуле, дзе мяжа паміж каханнем і закаханасцю? Падхопіш ад яго СНІД, а потым зразумееш, што не кахала яго, што прафукала сваё жыццё дзеля невядома каго. Я зусім не для таго захоўваю дзявоцкасць, каб муж з замілаваннем разглядаў прасціну пасля першай шлюбнай ночы. Проста цнатлівай жыць прасцей, мне хапае іншых клопатаў. Ёсць больш цікавыя рэчы, чым трывожнае чаканне крытычных дзён.

Калі Таня і Стас высветлілі, што кахаюць адно аднаго, яна яшчэ доўга адмаўлялася займацца з ім сексам. А Стас і не прыспешваў. І калі пачуццё дасягнула сваёй кульмінацыі, пачало спапяляць іхнія цнатлівыя адносіны, калі яны штохвіліны думалі пра адно і тое ж, яны зблізіліся. Усё гэта адбылося, калі Таня забылася на свае страхі падхапіць якуюнебудзь хваробу або зацяжарыць. Канешне, яны за-

сцерагаліся. Здаровы сэнс і рэклама зрабілі сваю справу: яны не ўяўлялі секс без прэзерватыва.

Яна памятала тую паслянавагоднюю раніцу. Усё было яшчэ добра. То быў, як яны думалі, першы, а як сталася — адзіны безалкагольны Новы год Стаса. Іх адносіны станавіліся ўсё больш сур'ёзнымі. Без аніякіх намёкаў з боку Тані Стас падумваў пра жаніцьбу. У тую раніцу яна прачнулася ад адчування, што на яе нехта глядзіць. І Стас глядзеў. Ён спачатку пацалаваў яе мяккімі вуснамі ў шыю, злёгку ўкусіў яе за вуха, палажыў яе на спіну і пачаў, задыхваючыся, цалаваць у вусны, падбародак, шыю, грудзі, жывот... Цалаваць ненатолена, як быццам у апошні раз. Ён быў такім пяшчотным, ласкавым, чуллівым. Іхнія целы рухаліся ў прасторы, дзе былі толькі яны, і нікога, акрамя іх...

Той раніцай яны не засцерагаліся. І вось яна цяжарная, а Стас па-дурному загінуў. Яе маленькі Нехта Станіслававіч Зварын ці Зварына ніколі не пабачыць бацькі.

Пад дзвярыма пакоя яе чакаў Данік, паэт і сябар. Яму першаму Таня расказала пра сваю цяжарнасць. Ён выслухоўваў яе скаргі, яна — яго вершы.

— Данік, яны думаюць, што гэта ён сам зваліўся.

— А ты так упэўнена, што гэта забойства? Я ведаю, як ты яго кахала і, магчыма, кахаеш зараз. Даруй, але ён атрымаў тое, чаго заслугоўваў. Ён быў гаўном і ў гаўне ўтапіўся. Таня, ты абстрагуйся ад асоб. У час рамонту дарог адкрылі два люкі: каналізацыі і цепласетак. Калі ён ужо так павінен быў загінуць, дык мог бы зваліцца ў люк цепласетак і шчасліва зварыцца, ушанаваўшы такім чынам сваё прозвішча — Зварын. Дык не, ён захлынуўся ў каналізацыі. Ну хто мог яго забіць? Нават ты яго не ненавідзіш, а каго ён мог пакрыўдзіць больш, чым цябе?

— Данік, ён жа ніколі не хадзіў той дарогай!

— А ты не думала, што з той пары Стас крыху змяніў свае звычкі?

— За два тыдні?! ... магчыма... але чаму ў мяне адчуванне, што нехта яго забіў, што ён не сам? У цяжарных ёсць інтуіцыя!

— Інтуіцыя ці беспрычынныя жахі? — Данік спачувальна зазірнуў Тані ў вочы.

— Не ведаю, Данік, я ўжо нічога не ведаю, я толькі адчуваю... але гэтага мала, — яна ўткнулася яму ў плячо і заплакала. А мужчыны ж так баяцца жаночых слёз, хлопец разгубіўся і толькі моўчкі гладзіў яе па спіне.

Спаслаўшыся на тэрміновыя справы, ён выйшаў, і толькі зараз Таня пачула музыку і ўспомніла пра дыскатэку. Значыць, Ірына са сваім Аспірантам, а Веранічка пераначуе ў якога-небудзь хлопца, прыйдзе пад раніцу, а потым будзе залівацца слязьмі, вяртаючыся ад гінеколага...

Але Веранічка прыйшла ў дванаццаць, дакладней, яе прывёў хлопец. Сама дзяўчына не магла ні ісці, ні стаяць. Выгляд у яе быў экзатычны: джынсавы камбінезон па баках быў расшпілены і ледзь трымаўся на плячах, світэр пад ім быў задраны і было відаць голыя грудзі, бюстгальтар ужо недзе згубіўся, калі ўвогуле быў. Хлопец спытаў, ці тут жыве Вераніка, і, атрымаўшы станоўчы адказ, палажыў яе на ложак настолькі асцярожна, наколькі гэта дазваляў ягоны стан. Дзяўчыне было дрэнна, і Таня пайшла ў суседні пакой па якія-небудзь лекі. Як толькі яна выйшла, хлопец падхапіў Вераніку пад пахі, пацягнуў у прыбіральню і зачыніўся...

Калі Тацяна вярнулася, то знайшла Веранічку на падлозе ў прыбіральне абсалютна голай. Хлопца, канешне, не было. Вераніку званітавала, і яна ляжала ў лужыне. Таня перацягнула яе ў пакой і пабегла па Даніка. Праўда, апрануць сяброўку яна не даўмелася.

Данік быў спецыялістам па вывядзенню чалавека са стану алкагольнага ап'янення і часта дапамагаў свайму сябру Саньку, паэту Божай міласцю. Ён

змог прымусіць яе выпіць два літры вады, ён змог спакойна глядзець, як Вераніка адрыгвае ў таз, але бачыць так блізка голую дзяўчыну было вышэй ягоных сіл. Па ўласным жаданні дзяўчаты перад ім не распраналіся, бо за хлопца не лічылі. Таму ён пісаў вершы па матывах таго, што яму расказваў ягоны сябар Санька, паспяховы паэт і каханак.

А тут голая! Побач! Данік углядаўся як мог, каб запомніць і ўзнавіць у вершах. Калі ж Веранічку званітавала міма тазіка, які трымаў хлопец, захоплены сваімі назіраннямі, Таня накінула на Веранічку коўдру. Але першы смяротны грэх ужо адбыўся: Данік зведаў спакусу.

Той ноччу ён спаў дрэнна. Раз-пораз ускокваў, уключаў лямпу і запісваў радкі, што спускаліся ў яго ўжо грэшную галаву. Ён быў так уражаны, што нават забыў расказаць пра здарэнне Саньку, ад якога ў яго раней не было сакрэтаў. Санька, пабыўшы на дыскатэцы, прыйшоў дамоў п'яны і з нейкай дзяўчынай, нават не з іхняга інтэрната. Упершыню ў сваім жыцці Данік парушыў правілы гасціннасці, выставіўшы дзяўчыну. Ён, захоплены завірухай уласных пачуццяў, не мог бачыць яе адсутнасці ў іншых: як можна кахацца з дзяўчынай, якую бачыш першы і апошні раз у жыцці, як можна пасля гэтага пісаць вершы пра сапраўднае каханне?! Якое каханне? Няўжо гадоў праз пяцьдзесят нашчадкі ацэняць Санькавы вершы і пачнуць шукаць ягоную Лауру і Дульцынею?! Прафанацыя мастацтва! Успрыманне жанчыны як сродку для натхнення, а не чароўнейшага стварэння ў свеце!!!

...Данік безнадзейна закахаўся. Веранічка ж вяла ранейшы лад жыцця, і няшчаснае каханне да яе было ёй нецікава. Праўда, яна пачала ставіцца да Даніка з невялічкай, але павагай: ён вельмі дапамог ёй пасля таго перапою.

«Лаура» Санькі больш не наведвала іхны інтэрнат, таму ён часова быў пазбаўлены музы. Гледзя-

чы, як Данік не адрывае азадка ад крэсла, пішучы вершы, Санька захлынаўся ад зайздрасці і вінавацiў сябра ў сваім бяздзеянні.

На наступны дзень Таня не пайшла ва універсітэт: быў пачатак семестра, практычных яшчэ не ставілі, а сама яна ўпершыню за тры гады мела справу, важнейшую за вучобу. Яна пайшла да таго люка, дзе захлынуўся Стас, накрыўка люка ўжо была на месцы. «Божа мой, чаму ж яны не закрылі яго хаця б на дзень раней!» Гледзячы на пухкі снег паабапал пратаптанай студэнтамі сцяжынкі, хацелася жыць, марыць пра лепшае, але Таня ўсведамляла, што яе «лепшае» ўжо незваротна прайшло. І калі б Стас быў жывым, яна калі-небудзь яму даравала б, а да таго часу жыла б надзеямі, ды ягоная смерць забрала ўсе мары, усе надзеі, усё шчасце. Яна вінавацiла сябе ў тым, што здарылася: калі б яна даравала яму, Стас не піў бы, не ішоў бы гэтай дарогай, не загінуў бы.

У дзень смерці Стаса быў моцны снегапад, сляды людзей і машын знікалі, ледзь з'явіўшыся. Снег ішоў і ўсю ноч.

«Учора ў гэты час ён быў жывы! Жывы! Жывы!» — пульсавала ў думках.

Гэтай раніцай ніхто з жыхароў інтэрната не пайшоў гэтай сцяжынай: нашто напамінаць пра тое, што і так нельга забыць. Але сляды ўсё ж былі. Чалавек, які прайшоў там, не быў выпадковым прахожым. Нехта хадзіў вакол люка, спыняўся. Зноў хадзіў, пакрываючы снег ланцужкамі слядоў.

«Па падэшве сучасных ботаў немагчыма вызначыць полавую прыналежнасць іх гаспадароў. На жаль», — са шкадаваннем падумала Таня. Яна вярнулася ў інтэрнат, зайшла ў Стасаў пакой, былы Стасаў пакой. Папрасіла хлопцаў пакінуць яе на хвіліначку адну. Яна лягла на яго ложак і абняла падушку. Яна ўжо не плакала і не ўспамінала, гэтыя плач і ўспаміны былі недзе глыбока ў ёй самой.

Не хацелася думаць, ці, дакладней, хацелася не думаць.

Вочы яе спыніліся на Стасавым заплечніку, які ляжаў на крэсле побач з ложкам. Стас і ягоны заплечнік здаваліся непадзельнымі, заўсёды разам ва ўніверсітэт, дадому, на дыскатэку. І зноў жа заўсёды ў патаемнай кішэні заплечніка ляжаў яе фотаздымак. Яе! Такіх фотаздымкаў было толькі два: адзін у яе, адзін у Стаса. Таня пацягнулася рукой, расшпіліла «маланку», пашукала і... не знайшла.

Ёй успомнілася адно здарэнне. Веранічка прыцягнула п'янага Стаса ў іх агульны з Таняй пакой. Пакуль дзяўчына паіла яго гарбатай, Таня ціхенька намацала свой фотаздымак у кішэньцы заплечніка і выйшла з пакоя з горда ўзнятай галавой, упэўненая, што Стас усё яшчэ яе кахае.

Так што Таня ведала, што і ў той дзень Стас меў фота пры сабе. Фатаграфія не магла вываліцца выпадкова. Стас мог выняць яе сам, у пакоі ён не пакідаў гэта фота (яго рэчы былі ўжо складзены, і там не было Танінага фотаздымка). Значыць, ён выняў фатаграфію там, каля люка. І не проста выцягнуў, каб палюбавацца, нехта вельмі раззлаваў яго, калі ён асмеліўся паказаць сваё патаемнае.

Хісткае падазрэнне Тані расло і мацнела. Калі б не гэты фотаздымак, можна было б паверыць, што Стас загінуў па п'янцы, але цяжка зрабіць гэта зараз, калі відавочна, што там быў нехта яшчэ.

І перад вачыма Тані нібы паўстаў той дзень: Стас сварыцца з некім з-за яе, выцягвае з заплечніка яе фота і выкідае. Той «нехта», мабыць, угаворваў Стаса вярнуцца да Тані ці наадварот — не тлуміць ёй галавы. Стас раз'юшыўся, выкінуў фотаздымак, магчыма, пачаў лаяцца, нечым абразіў, за што і быў скінуты ў люк. Дык, значыць, яе падазрэнні не дарэмныя?

Да іхняга разрыву адмоўна паставіўся ўвесь інтэрнат, ва ўсім вінавацілі Стаса, а шкадавалі яе. Але

найбольш перажывалі іхнія агульныя сябры, хлопцы смела выказалі Стасу сваё стаўленне да здарэння, і сяброўства іх стала менш шчырым. Стас, які тры гады быў каралём, не мог аддаць свой трон без барацьбы. Яму патрэбна была світа, акружэнне, якое захаплялася б яго жартамі і ім самім. І вось кола гэтых людзей пачало паволі распадацца. Але нават не з-за здрады, здрада была толькі штуршком. Хлопцам проста надакучыла, што Стас пачаў штоночы прыводзіць Веранічку, а іх вымушаў начаваць дзе прыйдзецца. Ім надакучыў пах гарэлкі і перагару ў іхнім пакоі, абрыдлі чужыя людзі (новая світа Стаса), што панавалі днём у іх пакоі. Яны стаміліся ад ягоных выбрыкаў. У гарэлачнай ліхаманцы Стас гэтага не адчуваў, але нават у цвярозым стане ён не зразумеў бы гэтага з-за свайго беспрасветнага эгаізму.

З усіх былых сяброў Стаса Таня найбольш давярала таўсцяку Валіку. Ён заўсёды мог паспачуваць, зразумець і дапамагчы.

Валік уважліва выслухаў гісторыю пра нязнойдзены фотаздымак, на яго бязбровым твары намалявалася здзіўленне, і ён, пяшчотна зазірнуўшы Тані ў вочы, спытаў сваім паўжаночым голасам:

— Танюля, што ты хочаш гэтым сказаць?

Яна расказала хлопцу, як ёй уяўлялася сцэна смерці Стаса. Але Валік паспяшаўся выказаць сваё меркаванне:

— Танюля, ён апошнім часам моцна перажываў, можа, ён напаследак зірнуў на любімы твар і скінуўся сам?

— Валік, не смяшы! Стас? З-за мяне? Гэты эгаіст? Ты хоць сам у такое верыш? І куды ён падзеў фота? Па кавалках утапіў у каналізацыі? Ты кажаш, ён сам! А ты хацеў бы сабе такой «геройскай» смерці? У каналізацыі!

— Я толькі версію прапанаваў, — заспяшаўся выправіцца Валік. — Але ж ты не будзеш звяртацца ў міліцыю?

— Не буду! Як я ім патлумачу? Хочаш, каб з мяне вар'ятку зрабілі? — пакрыўдзілася Таццяна. — Я сама, Валік, я сама ўсё знайду і зразумею.

Начамі яна глядзела ў столь, дзе адбівалася святло ад фараў машын і думала пра Стаса, на лекцыях яна пісала канспект, не зважаючы на яго змест. Яна не думала пра Стаса столькі, нават калі яны сустракаліся. Ёй здавалася, што, загінуўшы, ён засяліўся ў яе цела, пацясніўшы яе душу. Ён запаўняў яе, а яна не магла і не хацела змагацца.

Таня прыйшла да высновы, што Стаса магла спіхнуць нават дзяўчына. Ён жа не быў джэнтльменам і мог дазволіць сабе брудна лаяцца ці біцца з дзяўчатамі. Колькі разоў Веранічка прыходзіла з сінякамі! Ён усведамляў, што так нельга паводзіць сябе, і ад гэтага яшчэ болей вар'яцеў. Калі ён злаваўся, то не падпарадкоўваўся ўжо свайму розуму. А потым саромеўся сваёй слабасці і хаваў яе за выключнай нахабнасцю.

Таня ж была заўсёды мяккай і добрай. Яна не магла крыўдзіцца на Веранічку, якая пачала сустракацца са Стасам пасля ўсяго. Наадварот, Таня яе шкадавала, бо ўсе, нават сама Веранічка, разумелі, што Стас ёю карыстаецца без аніякага кахання ці хаця б сімпатыі. Ён хацеў зрабіць Тані балюча і інструментам абраў Веранічку. Іра, што таксама жыла з імі ў пакоі, абуралася і не магла зразумець ні Веранічку (маўляў, нічога сабе сяброўка), ні Таню. А Стас хацеў мець фармальнае права прыходзіць у іх пакой, нібыта да Веранічкі, ён хацеў увесь час напамінаць пра сябе, бачыць Таню, але гэтым толькі вярэдзіў рану і сабе, і ёй. Яны ведалі, што кахаюць адно аднаго, але разумелі, што ўжо перайшлі тую мяжу, калі шчэ можна было нешта аднавіць. І калі Веранічка сказала Ірыне, што Стас «у час гэтага, ну, ты разумееш, гэтага» назваў яе Таняй, Іра абурылася: «Заглохні!»

Вераніка, такая павярхоўная, легкадумная, жыла сённяшнім днём і намагалася не думаць пра Стаса, каб не сасніць яго ноччу. Дзяўчына і без таго мела вялікія праблемы. Амаль штоночы яна хадзіла па пакоі і размаўляла, але раніцай нічога не памятала. Дзяўчаты для смеху запісвалі за ёй, таму Веранічка яшчэ больш хвалявалася перад сном, баючыся выдаць штосьці вельмі асабістае. І таму вечарам, каб прыцягнуць добрыя сны, яна ўспамінала сваю адзіную ўцеху, сваё адзінае захапленне — тэатр. Ён быў для яе нейкім паралельным жыццём. Праўда, не тэатр у звычайным разуменні гэтага слова, хоць яна сапраўды хадзіла на ўсе новыя спектаклі, на памяць ведала ўсе старыя пастаноўкі. Галоўнае ў тэатры для яе — акцёры, мужчыны. Яна заходзіла да іх у грымёркі, і веданне рэпертуару было ёй патрэбна, толькі каб падтрымаць дыялог.

Ах, якія цудоўныя асобы трапляліся сярод непрызнаных геніяў тэатра! Аднойчы Таня мела магчымасць назіраць цудоўную карціну: на Веранічччыным ложку сядзеў п'яны барадаты мужык, ён трымаў у адной руцэ кубачак кавы, а другой актыўна жэстыкуляваў у такт сваім выказванням. Веранічка сядзела ля яго на падлозе, як Магдалена ля Хрыста, гатовая сваімі валасамі выціраць яму ногі.

Таня толькі адкрыла рот, каб «выказацца па праблеме», як Веранічка падхапілася, трымаючы ўказальны палец ля вуснаў.

— Цішэй! Ён гаворыць! Ах, Божа мой, Таня, ты нічога не разумееш. Ён — геній! Ты бачыла б яго ў ролі...

Далей ішоў бясконцы пералік усіх ягоных выключна эпізадычных роляў, уключаючы ягоныя ўвасабленні ў мяшок з падарункамі на нейкім дзіцячым свяце. І ў кожнай ролі, па яе меркаванню, ён іграў бліскуча. Таня не ведала, ці сапраўды ён бліскуча выконваў ролю мяшка з падарункамі, але роля мяшка з бульбай у яго дакладна атрымалася (мена-

віта на гэтую празаічную рэч ён паходзіў, калі сядзеў на ложку, падкурчыўшы ногі).

— Ох, Таня, не гані яго! А сёмай гадзіне будзе спектакль, хай ён трохі адпачне! Ну калі ласка!

— Чым ты захапляешся?! Гэтай брудная жывёлінай?!

— У чалавеку галоўнае — не знешні выгляд, а унутраны змест.

— І няўжо ты не можаш здагадацца, што ёсць унутраным зместам ягоных кішак? Ён не чалавек, а прыстасаванне для перапрацоўкі ежы і піва ў сама ведаеш што.

— Ты не чула, як ён разважае пра жыццё!

— Гэта ў маналогу Гамлета?

— Таня! Ён ніколі не граў Гамлета. Гэтая роля яшчэ чакае яго!

— Вераніка! Ты звар'яцела? Ты не разумееш, што я здзекуюся?!

— Здзекуешся? А... А навошта ты здзекуешся? Садыстка!

— Вераніка, выйдзі на хвілiначку, трэба пагаварыць.

Вераніка даліла кавы ў кубачак акцёру і папрасіла дазволу выйсці, гледзячы на яго вачыма вернага сабакі. Акцёр доўга вагаўся, ці варта дазволіць ёй. Нарэшце ён кіўнуў, але занадта энергічна, таму кульнуўся з ложка на падлогу разам з кубачкам, ужо пустым. Веранічка падняла свайго «генія» і паспяшалася да Тані, якая заўважыла, што сяброўка п'яная не больш і не менш, чым звычайна. Таму яшчэ больш дзівілі ейныя паводзіны.

— Вераніка, як ён у такім стане будзе працаваць, засталося толькі паўгадзіны!

— Я зараз душ яму арганізую.

Пры гэтых словах у калідор выпаўзлі суседкі па блоку:

— У наш душ?! Гэтага бамжа?!

— Ён не бомж! — крычала са слязьмі Веранічка, але было ўжо позна. Дзяўчаты сцягнулі яго з ложка і выкінулі ў калідор. Ледзь паспеўшы прабубнець «дзякуй за гасціннасць!», ён умазаўся ў супрацьлеглую сцяну, дзе яго падхапіла Вераніка.

Яна падставіла яму сваё моцнае жаночае плячо, і ён пачаў павольна пераастаўляць ногі.

— І пайшлі яны, сонцам спалёныя! — прадэкламавала Ірына. — Трэба ёй неяк патлумачыць, што мы не хочам цярпець ейных геніяў! Асабліва ў такім стане.

— Ды і сама яна не ў лепшым, — з жалем заўважыла Таня.

— Ну, да яе мы ўжо прывыклі! — засмяяліся дзяўчаты.

Выгнаным ісці не было куды. І хоць было холадна, яны вымушаны былі зазірнуць у сквер каля тэатра. Ён гаварыў, яна слухала — ідылія! Потым ён замаўчаў, уважлівей зірнуў на дзяўчыну і пачаў філасофстваваць:

— Разумееш... Прырода — гэта... Не... лепей так... У прыродзе існуе кругазварот! Во!

Яна ківала галавой, цалкам згодная, што кругазварот існуе. Ён працягваў:

— Кругазварот... рэчываў... вады...

І ён зірнуў на яе, як бы нечага чакаючы. Не дачакаўшыся, хацеў распавядаць далей, але яна млява спыніла:

— Якой вады? Кажы канкрэтна!

— Не вады, піва! Я ў прыбіральню хачу!!!

— Так бы адразу і казаў, а то кру-га-зва-рот! Схадзі. Ці ты мяне саромеешся?

Ужо дастаткова сцямнела, каб схадзіць адразу ў сквэры. Хоць можна было зайсці ў тэатр, куды яны накіраваліся праз дзесяць хвілін. Яна, выглядаючы, каб не сустрэць рэжысёра ці яшчэ каго ўплывовага, прывяла «генія» ў грымёрку. Пераапранула, прычасала, тым больш што з-за шпацыру па све-

жым паветры ён ужо акрыяў ды ірваўся на сцэну. Яго вочы блішчэлі, ён засяродзіўся на сваёй ролі маўклівага слугі і не зважаў на Вераніку. Потым яна праседзела дзве гадзіны ў грымёрцы, чакаючы яго. Калі спектакль скончыўся, яна правяла яго дадому. Па дарозе дамоў яны пілі піва ў тралейбусе, потым у пад'ездзе. Выцягнуўшы з ліфта свайго акцёра, знясіленага півам і эмоцыямі, дзяўчына прыхіліла яго да дзвярэй і пазваніла, а сама збегла па лесвіцы паверхам ніжэй. Яна чула, як ён павольна з'ехаў на падлогу, а жонка, адчыніўшы дзверы, сказала:

— Ну што, зноў? Шчэ дзіўлюся, як ты змог пазваніць! Упаўзай, я цябе цягнуць не буду!

Веранічка сумна ішла па начным горадзе. А ў гэты момант дзяўчаты за вячэрай абмяркоўвалі падзеі дня:

— Ужо дзесяць, а Веранікі няма. Мабыць, пайшла праважаць.

— Як можа ставіцца мужчына да жанчыны, якая яго праважае?

— Як да грамадскага транспарту!

— І ведаеце, што самае дзіўнае? Яна з сваімі акцёрамі не спіць, платанічныя адносіны ў чыстым выглядзе.

— Даруйце, але з такімі бамжамі нават яна грэбуе!

— Закрылі тэму! Лепей уключыце тэлевізар!

Па тэлебачанні ішоў нейкі фільм, слязлівы, жаночы, які пад гучнае незадавальненне дзяўчат перарываўся рэкламай.

— Я люблю рэкламу! Але якасную! Прыгожую! А нашы як зацягнуць, заснуць можна.

— Глядзіце, глядзіце! Бомж Веранічын, сённяшні! У рэкламе!

— Дык ён сапраўды акцёр?! Ну, калі яго пагаліць, як ён тут, апрануць, закадзіраваць...

— Дзяўчаты! А ён прыгажун, аказваецца! Ха-ха! Што ж, Вераніка заўсёды выбірала прыгажуноў...

...Так непрыемна, так сорамна было падазраваць усіх навокал. Таню супакойвала толькі, што забойцамі не маглі быць яе сяброўкі. Веранічка зусім не патрабавала Стасавай душы, ёй хапала цела. Яна не прэтэндавала заняць Таніна месца. І нішто ў свеце не магло яе давесці да такой ступені гневу, каб яна некага забіла. У правакацыйных выпадках яна лічыла за лепшае саступіць, адысці ўбок. Для яе зусім не было праблемай знайсці сабе іншага хлопца. Ірына ж Стаса проста ігнаравала: не віталася, не размаўляла з ім, гаварыла пра яго ў трэцяй асобе нават у ягонай прысутнасці. Так што ў гэтых дзяўчат натуральна не магло ўзнікнуць ніякай сваркі са Стасам.

З хлопцамі было цяжэй, амаль кожны з іх меў у стасунках са Стасам падводныя камяні. Зварын быў неабходны ў кампаніі, у застоллі, але жыць з ім было нясцерпна. А будзённых дзён было больш, чым святочных...

Развагі Тані перарваў Марэк, хлопец-паляк, што прыехаў на Беларусь вывучаць беларускую літаратуру XX стагоддзя. Калі ён нешта не разумеў, то заўсёды прасіў Таню перакласці яму. Марэк не рызыкаваў ісці да іншых дзяўчат, бо на яго было абвешчана неафіцыйнае паляванне, надта шмат паненак марылі пераехаць у Польшчу. Спачатку Марэк радаваўся, што карыстаецца вялікай папулярнасцю, і беспакарана карыстаўся ёю, пакуль адна з дзяўчат, з якімі ён кахаўся, не паведаміла Марэку пра сваю цяжарнасць. Вядома ж, ад яго. Марэк ад шчасця ўсё расказаў Стасу, ды той патлумачыў наіўнаму паляку, што ягоная шаноўная паненка даўно ўжо шукае, на каго б павесіць сваю незапланаваную цяжарнасць. Стас потым смяяўся, паказваючы Тані, якім стаў твар расчараванага, зняважанага Марэка. Стас жа гісторыю з няпэўным бацькоўствам проста прыдумаў, сваім жартам вымусіўшы дзяўчыну зрабіць аборт. Магчыма, Марэк сапраўды не быў

бацькам таго дзіцяці, але калі ён даведаўся, як Стас пажартаваў, іхняе сяброўства адразу ж скончылася. Паляк казаў, што ён ужо дарослы, каб самастойна прымаць рашэнні, і дастаткова багаты, каб у выпадку чаго выхаваць чужых і сваіх дзяцей. Стас апраўдваўся, што Марэка як замежніка дзяўчаты трымаюць за лопуха і паспрабуюць навесіць на яго шчэ не адно «аўтарства». Марэк іранічна падзякаваў за клопат, але стаў пазбягаць Стасавага апекавання і перастаў прыводзіць дзяўчат, дакладней, перастаў прыводзіць іх масава, затаварыўся прэзерватывамі і болей ужо не баяўся нічога.

Хоць Марэк спыніў усялякія стасункі з Таніным хлопцам, ён па-ранейшаму сябраваў з ёй. Бо яна не прагла польскага жыцця і дужа добра перакладала і тлумачыла беларускія тэксты. Ёй жа падабалася дапамагаць яму, бо яна вывучала польскую мову і любіла яе, кожная сустрэча з Марэкам нешта дадавала да яе ведаў.

Паляк стаяў на парозе, трымаючы ў руцэ кнігу і сшытак, ён не ведаў, як сябе трэба паводзіць у новых абставінах. Ці трэба спачуваць Тані ў сувязі са смерцю Стаса? Яна ж кахала яго. А можа, не? Яны ж разышліся. Ніхто не лічыў патрэбным патлумачыць яму сітуацыю, а сам ён не мог зразумець іх адносінаў.

— Цо хцэш, Марэк? Тшэба цось пшэтвумачычь? — ветліва запытала Таня.

— Так! — Марэк быў удзячны, што Таня пачала размову першай, узяўшы ініцыятыву на сябе і тым пазбавіўшы яго неабходнасці закранаць сумную тэму.

З таго часу, як загінуў Стас, Таня лічыла сябе вінаватай ва ўсіх ягоных грахах і, бачачы перад сабой Марэка, успаміналa тую жахлівую гісторыю з цяжарнасцю і абортам і саромелася, нібыта сама ўсё ўтварыла. Але атмасфера няёмкасці хутка прайшла, і Марэк прыклаў усе намаганні, каб развесяліць

дзяўчыну, яна недаравальна гучна і шчыра смяялася, калі ў пакой зазірнула суседка па блоку (кожныя два пакоі аб'ядноўваліся ў блок з агульнымі ванным і прыбіральняй). Алена павольна падышла да стала і, вітаючыся, зазірнула ў кнігу і сшытак, не знайшоўшы там нічога смешнага, недаверліва паглядзела на Марэка і Таню.

Яе погляд абразіў Таню, і яна груба запытала:

— Алена, я спадзяюся, табе нешта тэрмінова патрэбна і ты прыйшла не проста так.

— Канешне, канешне, а Веранічкі няма?

— Ёсць, яна ад цябе пад сваім ложкам хаваецца! — іранічна адказала Таццяна.

— Я хацела ўзяць яе спадніцу, ружовую.

— Калі яна табе дазволіла, бяры!

— А... Дазволіла! — пераможна дагаварыла Алена і нахабна схапіла з крэсла спадніцу. Таня, канешне, разумела, што Веранічка нічога не ведае пра спадніцу, але чамусьці не хацелася бараніць чужое. Трэба мець такіх сяброўак, якія не папросяць тваіх рэчаў.

У тую ноч Веранічка не прыйшла начаваць, Ірына з Аспірантам бавіліся ў пакоі хлопцаў, а Марэк, атрымаўшы дасканалы пераклад, шчэ трохі пасядзеў з Таняй і пайшоў, бо дамовіўся з Ірай і Аспірантам пайсці разам на дыскатэку. Таня засталася адна, але зараз яна і не прагла кампаніі. Хацелася ў адзіноце падумаць пра сябе, пра дзіця, пра жыццё. Бацькі нармальна паставіліся да яе цяжарнасці, хоць нельга сказаць, што жахліва абрадаваліся. Ім болей спадабалася б спачатку пазнаёміцца з зяцем, але, у рэшце, яны не збіраліся выганяць дачку з дому ці схіляць да аборту. Так што надзейныя тылы ёй былі забяспечаны, бацька нават абяцаў зняць ёй кватэру ў Мінску, пакуль дзіця будзе малое, бо Таня не збіралася кідаць вучобу. Нараджэнне дзіцяці планавалася недзе ў верасні, так што можна было лета жыць пад маміным наглядам, пару месяцаў не

хадзіць на заняткі, а потым усё як-небудзь само сабой усталюецца.

Іра і Аспірант былі ўпэўненыя, што Марэку цяжка будзе на дыскатэцы, бо ён не ведае ніводнай з тутэйшых моў: ні беларускай, ні рускай, ні трасянкі. Марэк жа лічыў, што каму трэба, той зразумее і па-польску. Ён хутка знайшоў сабе дзяўчыну, якая была п'янай да такой ступені, што зразумела б і арабскую мову. На хвіліну яны зніклі з поля зроку Іры і Аспіранта, а калі з'явіліся зноў, то ўжо і Марэк быў пад добрым кайфам. Выхаванасць Марэка некуды знікла, рухаючыся ў такт музыцы, ён бессаромна задзіраў дзяўчыне спадніцу. Аспірант з нейкім недаверам назіраў за ім, і калі яны з Ірынай пабачылі белыя трусы дзеўкі, спытаў:

— Яны што, абкурыліся?

— Максім, на гэтай дыскатэцы нюхаюць.

А Марэк ужо падсадзіў дзеўку сабе на шыю. Яе спадніца задралася недаравальна высока, панчохі (гэта былі менавіла панчохі, як заўважыў Аспірант) спаўзалі. Нейкі хлопец, падышоўшы, скатаў іх да пятак і са смехам адбег.

— Можа, іх трэба спыніць? Марэку заўтра будзе непрыемна ўспамінаць, — Аспірант хваляваўся, бы Марэк быў ягоным сынам.

— Па-першае, Марэк ужо дарослы, а па-другое, заўтра ён нічога не будзе памятаць. І па-трэцяе, можаш ты глядзець на мяне, а не на яго? — раззлавалася Іра і адцягнула Аспіранта падалей ад вясёлай парачкі. Менавіта таму яны не чулі, як Марэк галантна запытаў сваю паненку:

— Хцэш кохачь се зэ мнон?

Дзяўчына адказала на польска-беларускай трасянцы:

— Хцу!..

І яны тэрмінова пакінулі танцавальную залу.

З дыскатэкі Іра і Аспірант вярталіся позна. У вушах гудзела, целы наліваліся стомай, і калі

ў ліфце ён націснуў кнопку свайго паверха, яна не стала пярэчыць. Ён прыціснуў яе да сценкі і пачаў цалаваць у шыю, залез пад майку, яна смяялася і не супраціўлялася. Калі зайшлі ў пакой, ён зачыніўся і пачаў распранацца. Яна адступіла да акна і паглядала на яго так, як лічыла патрэбным паглядаць: ганарліва, але запрашальна, нібы выпрабоўваючы. Ён еў яе позіркам, бо ведаў, што гэта ёй падабаецца, самому ж яму хацелася хутчэй апынуцца з ёй у ложку.

Яна ўпёрлася спінай ў падаконнік. Ён падыходзіў усё бліжэй і бліжэй. Нарэшце сустрэліся іхнія рукі, потым вусны. Ён расшпіліў на ёй станік, але не зняў, падняў яе, яна абхапіла нагамі ягоную талію. Ён цалаваў грудзі, шчэ крыху прыхаваныя, але ўжо свабодныя. Як быццам бы ўжо можна, але яшчэ нельга. І раптам яна спытала:

— А твае хлопцы не здзіўяцца, што дзверы зачынены, не пачнуць ламацца?

— Яны сёння не начуюць тут, — на секунду адарваўся ён ад грудзей.

Яна пачала вырывацца:

— Ты з самага пачатку планаваў прывесці мяне сюды?! Гад!

— Іра, Іра! Я нічога не планаваў! Так само атрымалася, Валера сёння з вашай Аленай, Валік паехаў дадому, а Марэк да ранку на дыскатэцы. І я падумаў... Прабач...

— Ты правільна ўсё падумаў, адным словам — Аспірант!

— Ты можаш хаця б зараз называць мяне па імені?

— Не магу! Ас-пі-рант! Ас-пі-рант! — яна ўскочыла на чыйсьці ложак, завалены кнігамі, параўнялася з ім ростам і кінулася на яго. Ён ледзь устаяў:

— Ну што ты скачаш, як малпа!

Яна была ў ягоных руках, і ён не збіраўся губляць такі шанс, а то праз хвіліну ёй стрэльне штонебудзь у галаву і яна збяжыць.

Не было часу расшпільваць ейную спаднічку, ды і навошта, але калготкі трэба было зняць, не будзеш жа займацца сексам праз іх. Іра завішчала:

— Не нарабі зацяжак, Аспірант!

— Як ты можаш думаць пра зацяжкі ў такі момант?! Сама здымай!

Яна хуценька зняла калготкі і нават расшпіліла цяжкую засцёжку спадніцы, пра якую ён казаў:

— У цябе не спадніца, а пояс вернасці!

Яна, абсалютна голая, стала пасярод пакоя і загадала:

— Распранайся, Аспірант! Поўнасцю!!!

Пад ягонымі штанамі аказаліся даволі прыстойныя трусы і тонкія валасатыя ногі, якія псавалі ўсё відовішча.

— Далей! — амаль што крыкнула яна.

— Далей? — ён чамусьці спужаўся. Калі б яна не глядзела на ягоныя ногі з такой пагардай, ён зняў бы трусы без разваг. Ён адчуў, што калі яна гэтак жа гляне на яго аголенае «гаспадарства» — знікне ўсякае жаданне, у яго нічога не атрымаецца, і тады яна будзе так зняважальна глядзець на яго кожны дзень. Ён намаляваў на сваім твары ўсмешку, хутка (пакуль яна не паспела ачомацца) схапіў яе за руку і зваліўся разам з ёй у ложак, дзе пад коўдрай ён распрануўся поўнасцю, не баючыся асаромецца.

— У цябе ногі халодныя, Асс-пі-рант! — прашыпела яна.

— Сагрэй! — ён прашаптаў ёй на вуха, а сам незаўважна падціснуў іх, каб не дакранацца да яе халоднымі ступакамі.

Яна падсоўвалася да сцяны, ён — за ёй. І раптам яна застагнала. Максім сеў на ложку і незадаволена спытаў:

— Ну, што яшчэ? Іра, колькі можна цягнуць? Не хочаш — так і скажы. Я ж не прымушаю!

Яна вінавата выцягнула з-пад сябе тлумачальны слоўнік беларускай мовы, на якім скотчам была прыклеена запіска — «Не перашкодзілі?».

— Я іх заб'ю!!!

— Максім, гэта ж класна! Толькі вось на спіне сіняк застанецца.

Ён пачаў цалаваць той будучы сіняк.

— Максім! Максім!..

... Яны ляжалі моўчкі, абняўшыся, бо ложак быў вузкі. Іра прыціснулася галавой да ягоных грудзей, яшчэ ўзрушаная, поўная эмоцый. Ёй было прыемна, што ён не спіць, адчувае яе перажыванні, разумее яе. Прыблізна так яна ўсё малявала сабе ў думках і вельмі баялася расчаравання. А ён аказаўся яшчэ больш пяшчотным, мяккім, блізкім. Яна ляжала і старанна гнала ўспаміны пра іншы вечар у гэтым жа пакоі.

Ён глядзеў у столь і раптам запытаў:

— Хочаш, верш пачытаю? — і прадэкламаваў, не чакаючы адказу: «Арцюр Рэмбо «П'яны карабель». У арыгінале выконвае Аспірант».

І яна пачула гэтую боскую мову, якая заўсёды была і будзе мовай кахання, нават калі на ёй гучаць вар'яцкія трызненні Рэмбо. Своеасаблівае французскае «р», якое павінна было б казытаць і лашчыць слых, гырчэла і раздражняла Іру.

Яна даслухала дасканалы твор сусветнай класікі, але падумала: «Божа мой, нават у ложку ён не можа забыцца пра свой паганы сімвалізм і сваю паганую французскую мову! Як жа я яе ненавіджу!!!»

— Табе спадабалася? — спытаў ён, патрабуючы станоўчага адказу.

— Канешне! — іранічна ўсміхнулася ў цемры Ірына. — Я так люблю слухаць французскую мову! А можна і я табе пачытаю?

Я крочыла павольна і няспешна,
Табе ўжо не патрэбная зусім.
А памятаеш, я казала: «Вечна
З табою будзем разам мы, Максім!»

Забудзь, Максім, што я казала тое,
Я іншую знайду сабе мішэнь.
З твайго цішком выходжу я пакоя,
Засунуўшы бюстгальтар у кішэнь.

— Не Рэмбо, канешне, але няблага, — засмяяўся ён. — Сама сачыніла?

— Гэта Данік напісаў для цябе ад мяне.

— Данік? Іра, я прашу цябе больш ніколі не называць пры мне імені гэтай бясполай істоты і не чытаць ягоных «геніяльных» вершаў. Я не прашу цябе перакрэсліць вашае сяброўства, але чуць пра яго не хачу!

Настрой быў сапсаваны, ён адчуў, што яна свядома гэта зрабіла, значыць, ён недзе памыліўся ці зрабіў ёй нешта непрыемнае, а сам не заўважыў. Спытаць было няёмка, і ён устаў з ложка, апрануўся, узяў джэзву і пайшоў на кухню рабіць каву. Іра яшчэ хвілінку паляжала, потым завярнулася ў коўдру і прайшлася па пакоі, чытаючы наклееныя на сцяну паперкі.

Над ложкам Валеры, зацятага футбаліста і найапошняга студэнта, вісеў аркуш «Сеанс самаўнушэння»:

1. Я вельмі люблю вучыцца! (Што?)

2. Я абажаю сесію! (У час семестра.)

3. Я атрымоўваю асалоду ад наведвання лекцый і практычных заняткаў! (Як і ад мыцця падлогі.)

4. Нашы выкладчыкі — цудоўныя людзі! (Толькі не ў час сесіі.)

5. Вучоба — гэта лепш, чым секс! (Кажуць тыя, хто ніколі не займаўся сексам.)

6. Я — геніяльны! (Трэба сказаць гэта выкладчыкам.)

7. Я люблю рыхтавацца да экзаменаў! (Трэба сказаць гэта мне.)

8. Што можа быць прыемней рыхтавання да экзаменаў?! (З'есці жабу прыемней!!!)

9. Заўтра я прачнуся і пайду на заняткі. (А як жа!!! Канешне!!!)

10. Я люблю атрымоўваць стыпендыю! (Дык чаму ж я яе не атрымоўваю?!)

Іра засмяялася, уявіўшы, як кожную раніцу ці вечар Валера чытае гэта і ўсё адно не ходзіць на лекцыі, з рыпам здае сесію і з першага курса не атрымлівае стыпендыі.

Над ложкам таўсцяка Валіка вісеў фотаздымак, дзе яго вялікая галава была дапасавана да цела нейкага культурыста. Знізу быў прышпілены «Спіс маіх каханых жанчын». Да вялікага спісу з дванаццаці кіназорак і спявачак почыркам Стаса Зварына было дапісана трынаццатае прозвішча — Дэвід Духоўны.

Валік увогуле быў незвычайным, калі не ўдакладніць, што дзіўным, хлопцам. Ягоная нестандартная знешнасць кідалася ў вочы: высачэзны, крыху паўнаваты, з доўгімі светлымі валасамі, ён так быў падобны да дзяўчыны. Стас быў прыблізна аднаго з ім росту, але нашмат худзейшы, побач з ім Валік быў сапраўды таўсцяком, чым Стас не прамінуў скарыстацца. На Валіка была пастаўлена «пячатка бегемота», а з часам ён пачаў адпавядаць сваёй мянушцы. Паходка ў яго была павольная і пяшчотная, калі так можна сказаць пра хаду. Густыя светлыя валасы, нібы сцяг, вянчалі ягоную постаць.

Калі прыгледзецца, можна было заўважыць, што адно вока ў яго было блакітным, другое — зялёным, і хоць гэтая яго асаблівасць была малазаўважнай, хлопец насіў акуляры са звычайнымі шкельцамі. І выгляд быў разумнейшы, і Валік пачуваў сябе ўпэўнена.

Ён павінен быў бы нарадзіцца дзяўчынай. Хлапечы пакой стаў такім утульным менавіта яго намаганнямі: на падаконніку кветкі, якія ён ніколі не забываўся паліваць, на тумбачках вышываныя сурвэткі, заўсёды чыстая падлога, якую Валік мыў двойчы на тыдзень. А вечарамі ён цыраваў сабе і сябрам

шкарпэткі — занятак даволі дзіўны для хлопца. І зноў жа ніхто не звярнуў бы на гэта ўвагі, калі б не Стас. А горш за ўсё — Валікаў дзявочы твар са слабай расліннасцю. Але нават вусы ці барада не ўратавалі б яго — яшчэ недарэчней глядзеліся б бясколерна-саламяныя вусы на яго пяшчотным твары.

Калі хлопцы яшчэ вучыліся на першым курсе, да іх у госці завітала Валерава мама. Стасу ў тыя часы не далі яшчэ месца ў інтэрнаце, і ён жыў «зайцам» і начаваў у адным ложку з добрым Валікам. Жанчына, увайшоўшы раніцой у пакой, была непрыемна здзіўлена распуснымі норавамі. Як можна прыводзіць дзяўчыну ў пакой, дзе спяць яшчэ два хлопцы?! А Валік бесклапотна спаў, уткнуўшы ў падушку вузкі твар з далікатнай скурай. Пасля таго выпадку Стас, якога пашкадаваў Валік, павёў сябе нахабна і жорстка, дазваляючы і правакуючы жарты наконт іхніх адносінаў. Тады ён і дапісаў у спіс Дэвіда Духоўнага.

Іра гучна разрагаталася, уявіўшы разам пяшчотнага Дэвіда і Валіка з гомасексуальнымі замашкамі. У гэты момант у пакой увайшоў Аспірант, несучы паднос з кубачкамі кавы. Іра вінавата сціхла.

— З чаго смяешся?

— З Валікавага «Спіса»! Гэта Стас дапісаў?

— Стас. Мы ўсе заўважалі незвычайную пяшчоту Валіка, але толькі Стас не пасаромеўся выказацца ўголас. А далей ведаеш жа: на каго Бог, на таго і людзі. Вось Стас і быў такім богам.

— А ён быў жорсткім, ваш Стас!

— Іра, ты сама зараз смяялася! Стас ведаў людзей, ён ведаў, з чаго яны будуць смяяцца. І калі ён ведаў, што смяяцца будзе шмат людзей, то ён не баяўся пакрыўдзіць аднаго. І гора таму, каго ён абіраў сваёй ахвярай.

— А ты яго баяўся?

— Ну што значыць баяўся? Я асцерагаўся! Але ён усё ж здолеў згуляць са мной.

— Раскажы, — папрасіла Іра і паклала цукар у каву.

— Табе гэта будзе непрыемна. Але калі ты хочаш... Аднойчы, два гады таму, у інтэрнаце з'явілася ваша Таня, такая сціплая, ціхая, і я закахаўся ўмомант. Ды меў неасцярожнасць сказаць пра гэта Стасу. Ох, як ён яе ганіў: і завучка, і дура, і апранецца, як было модна ў беларускай вёсцы мінулага стагоддзя... Ну, ты ж ведала Стаса. Я раскахаўся гэтаксама ўмомант. Я не ведаю, чаму. Магчыма, гэта не было сапраўдным каханнем, таму яно так хутка растала. А Стас закахаўся сам. Канешне, Таня моцна змянілася, папрыгажэла, а язык які востры мае! Мне ж да гэтага часу сорамна за сваю тагачасную слабасць.

— Ты так закахана пра яе расказваеш!

— Да ну цябе! Я кахаю іншую дзяўчыну!

— Я яе ведаю?

— Магчыма! — выразна прагаварыў ён, набліжаючыся да Ірыны.

І яны зноў бухнуліся ў ложак...

Праўда, не надоўга, бо было ўжо шэсць гадзін раніцы, а ў сем ў дзверы гучна пагрукалі. Гэта быў Валера:

— Шчэ спіце?! А надвор'е зараз такое, што чэлес сам стаіць!

— Ты што, з вуліцы? — Максім трымаў Валерку ў калідоры, каб даць Ірыне час апрануцца.

— Загуляліся мы з Аленкай. Інтэрнат быў ужо закрыты. Ну мы і пасядзелі па-студэнцку ў скверы.

— Па-студэнцку гэта як? — цягнуў час Аспірант.

— Па-студэнцку — гэта лежачы! — зарагатаў хлопец. — Хутка твая апранецца? А то ноччу ў інтэрнат не пускаюць, днём — ва ўласны пакой.

У гэты момант выйшла Ірына з такім выглядам, нібыта яна забягала толькі на хвіліну. І кінула на развітанне:

— Да пабачэння, Ас-пі-рант! Кава была дужа смачнай!

— Во гадаўка! — вымавіў у захапленні Валера.

— А зараз ты мне скажаш, чыя гэта была ідэя — падкінуць у мой ложак слоўнік, га?

— Мы разлічылі так, што іншым спосабам нам не даведацца, ці не будзеце вы валяцца ў нашых ложках. Можа, табе ў тваім кахацца сумна, га?

— Ну, то вы ўсё зрабілі, каб было смешна!

— Спадзяюся, што самай адказнай часткай ты на яго не напароўся? — зацікаўлена спытаў Валера.

— Калі будзе твая чарга начаваць, я табе ў ложак вожыка вашывага падкладу. Будзеш з Аленай усю ноч вошак давіць! — раззлаваўся Аспірант.

— З-за чаго, хлопцы, сварыцеся? — матэрыялізаваўся з паветра сусед па блоку Юра-Трасянка. — Паненку не падзялілі? Ці пана?

— Йдзі, як ішоў, — Аспірант не мог настроіцца на жартаўлівы лад веселуна.

— Стоп, стоп, Аспірант! Ноч была няўдалая?

Хлопец зразумеў, што ягоныя сум і злосць могуць сапсаваць ягоную мужчынскую рэпутацыю, і як мага гучней адказаў:

— Так, ноч была няўдалая... у Валеры. І не таму, што Аленка кастлявая, а таму, што лаўка рабрыстая.

Хлопцы разрагаталіся і пачалі жартаўліва апісваць ноч і пакуты Валеры, які бессаромна дадаваў падрабязнасці.

Ірына хуценька збегла паверхам ніжэй і ўляцела ў свой пакой. Таня заўважыла:

— Бачу, дыскатэка атрымалася, калі прыходзіш раніцой.

— Таня, я сёння ў яго ноч правяла, у яго пакоі. Божа мой, як ён падобны да твайго Стаса!

— Да Стаса? — Таня не змагла схаваць здзіўлення.

Ірыніна заўвага была нечаканай, асабліва калі памятаць, як халодна ставілася яна да Стаса пры

жыцці. Адкуль жа такое незвычайнае ўзрушэнне ад падобнасці Стаса і Аспіранта? Іра зразумела, што ляпнула нешта не тое, і крыху змяніла тэму:

— Ведаеш, я зноў не змагла прызнацца Максіму, што не цярплю французскую мову.

— Трэба альбо сказаць пра такое сваё стаўленне, альбо прымусіць сябе палюбіць тое, што любіць ён, — тонам вопытнага псіхолага параіла Таня.

— Я ніколі не змагу прызнацца, бо для яго гэта вельмі істотна. Я нават думаю, што мая нянавісць з-за таго, што ён трызніць Францыяй, а не мной.

— А табе мала кахання, табе абавязкова патрэбна трызненне?

— Хацелася б.

Калі б Таня распытвала, цікавілася падзеямі мінулай ночы, Іра дыпламатычна выкруцілася б, але знешняя Тацяніна абыякавасць падштурхнула дзяўчыну да падрабязнасцяў, а можа, яна расказвала менавіта таму, што хацела сваім нібыта шчасцем падкрэсліць становішча і стан сяброўкі.

Іра са смехам пераказала эпізод з Данікавым вершам, але Таня такі жарт не ўхваліла:

— Нашто ты зводзіш іх, і без гэтага хлопцы цкуюць Данілу. А яму самому не абараніцца. Яны жорсткія, а ён чуйны, ён занадта адчувае жыццё, і тое, што не пакрыўдзіць футбаліста Валеру ці твайго Аспіранта, можа давесці Даніка да дэпрэсіі.

— Данік твой прызвычаіўся, што ты яго абараняеш, і выяўляе з сябе Шклянога-Прынца-Ткні-Разаб'юся. А ягоны Санька штоночы новую дзеўку цягне, каб паэтычныя пачуцці былі заўсёды свежымі, а дзяўчат сваіх ён так і называе — свежына. А ты кажаш: чуйны! паэт!

Таня не сказала Ірыне пра фотаздымак, ды і не збіралася гаварыць, сама для сябе яна дзяўчат апраўдала. Гэты сакрэт ведалі толькі яна, Валік і, магчыма, забойца. Але Таня забылася, што пяшчотны і

ласкавы Валік языком менціць не горш за любую дзяўчыну.

Валік прыпёр з дому дзве вялізныя торбы з бульбай, салёнымі агуркамі, морквай, капустай. Валера і Юра-Трасянка з радасцю кінуліся разбіраць прывезенае. А Валік як бы між іншым спытаў, ці не знайшла Таня забойцу. Калі хлопцы здзіўлена паднялі галовы, Валік уздыхнуў з палёгкай: не ведаюць, значыць, можна даваць сваю інтэрпрэтацыю. Але як ён ні намагаўся выставіць Таніна падазрэнне як прымхі цяжарнай, хлопцы зразумелі, што нешта не так у гэтай выпадковай смерці. Валік пакрыўджана змоўк, калі зразумеў, што хлопцы не падтрымліваюць ягонай пазіцыі.

Валера, стоячы пасярод пакоя з банкай салёных гуркоў, якую ён нават забыўся паставіць, ціха сказаў:

— Але ўсё будуецца на нейкіх фантазіях, хісткіх уліках. Стас мог з тыдзень таму выкінуць той фotaздымак... А магчыма, мы, як звычайна ў такіх выпадках, не верым у смерць сябра, не хочам яго адпускаць і таму чапляемся за розную дробязь. Хутчэй за ўсё так.

Юра-Трасянка свайго меркавання не меў, але ён заўсёды адчуваў, што трэба сказаць у пэўнай сітуацыі, таму ён сказаў Валіку:

— Канешне, ты нікому, акрамя нас, гэта не расказваў і не раскажаш?

Валік баязліва пасунуўся ад яго і спытаў сваім высокім голасам:

— Як жа так, хлопцы... І Аспіранту не скажам?

— Я бачыў, як ён да люка таго на наступны дзень хадзіў. Ён начэй не спіць з-за Стасавай смерці, ды я і сам, калі вочы заплюшчу, Стаса бачу, жывога. А здавалася б, што мне Стас? Ні брат, ні сябра, ні сваяк, — дадаў Валера.

Жартаўлівы, няпэўны, неканкрэтны ў кожным штодзённым слове, Валера ў цяжкіх сітуацыях пе-

ратвараўся ў камень, валодаў сітуацыяй і заўсёды быў упэўнены, што ўсё робіць правільна. І зараз ён разумеў, што Аспірант, як і Таццяна, кінецца шукаць забойцу. Гэта толькі ў кіно ўсе дэтэктыўныя гісторыі маюць happy-end. А ў жыцці забойца часта бывае разумнейшым за іншых, — і Валера хітра ўсміхнуўся сваім думкам.

— Не, хлопцы, Таня, калі трэба, сама Аспіранту скажа. Мы тут ні пры чым. Мне здаецца, Таня зразумее, што ўсё гэта лухта... Валік, а яна не збіралася пайсці ў міліцыю і расказаць пра фотку?— як бы між іншым спытаў Валера.

— Не, яна сказала, што не хоча, каб з яе рабілі вар'ятку, — паслужліва паведаміў Валік.

— Першая прыкмета розуму! Яна сама бачыць, што міліцыя наплюе на такую ўліку, і збіраецца паціху вар'яцець у адзіноце. Бо Аспіранта мы ёй не аддадзім. А Тане трэба прапанаваць культурную праграму прыкладна на пару тыдняў, а потым пачнуцца практычныя заняткі, і наша любімая «завучка» будзе больш улягаць у навуку, чым у свае фантазіі.

Юра-Трасянка быў уражаны гэтым маналогам да такой ступені, што нават выказаў уласнае меркаванне:

— Валера, а калі там сапраўды нешта было? Можа, хай шукае?

— Ці шмат адшукае цяжарная дзяўчына, якая цяжка перажывае смерць свайго каханага? А калі забойца даведаецца, заб'е і Таню таксама? Стас загінуў, дык давайце хоць выратуем яго дзіця! Згодны, Юрык?

— Ну...

— Што «ну», Юрык? Я ж цябе не прымушаю, ідзі і скажы Аспіранту! Ён спачатку дасць табе добра за тое, што адразу яму не расказаў. А потым будзе кожнага з нас падазраваць! Вось глядзі, ты ўчора казаў, што калі Данік пра цябе яшчэ адзін верш напіша, ты яго заб'еш.

— Казаў, але ж я не меў на ўвазе... — пачаў апраўдвацца Юра.

— Гэта ў міліцыі раскажаш, што менавіта ты не меў на ўвазе, калі паэт выпадкам паслізнецца і загіне! — пераможна выдаў Валера.

Юра-Трасянка вырашыў у гэтыя справы больш не мяшацца, спаслаўся на нейкае спатканне і выйшаў з пакоя. Валіку не хацелася заставацца там з Валерам, і ён выйшаў, адзначыўшы, што хоць сам ён паводзіць сябе дзіўна, але паводзіны Валеры насцярожваюць яшчэ болей.

Агульная тайна, якую незразумела чаму яны вырашылі захаваць, раз'яднала іх. Хлопцы баяліся, што застаўшыся сам-насам, яны зноў пачнуць закранаць тую балючую тэму. Разважыўшы, кожны вырашыў, што сапраўды, лепш трымаць язык за зубамі. Гэты цяжар ціснуў, і хлопцы стрымліваліся з апошніх сіл. Нават Юра-Трасянка, які не змог бы не тое што чалавека забіць, а нават слова супраць сказаць, і той адчуваў сябе забойцам.

Але яны не маглі пазбягаць адзін аднаго: жылі разам, наведвалі адныя і тыя ж лекцыі, хадзілі на адныя і тыя ж дыскатэкі.

Валік, нягледзячы на сваю фігуру, вельмі любіў танчыць, вага не дазваляла яму рухацца па вертыкалі, і таму ўсю душу ён укладаў у гарызантальнае перамяшчэнне. Цела яго калыхалася, усё на ім уздрыгвала, але хлопец нічога не заўважаў і не саромеўся. Ірына заўсёды станавілася ў кола насупраць яго, каб потым вечарам у сваім пакоі перадражніваць ягоныя скокі. Вераніка нават у лютым апранала на дыскатэкі самы мінімум адзення. Валера жартаваў, маўляў, што ж ты на факультэцкую дыскатэку адзяваешся, як на працу? На што Веранічка агрызалася:

— Вось кіне цябе Аленка, я шчэ пагляжу, у чый ложак ты прасіцца будзеш!

І Валера больш дзяўчыну не чапляў, бо гэткую сітуацыю яму было страшна ўявіць. Такім ульты-

матумам Веранічка паставіла б яго на адзін узровень з Данікам. Увесь інтэрнат ведаў, што толькі Данік — персона non grata ў яе ложку. Валера не спадзяваўся ўсе студэнцкія гады пражыць з Аленкай, таму раней ці пазней прыйшлося б пасябраваць з Веранічкай ізноў.

Рознакаляровыя агеньчыкі выхоплівалі з цемры твары, фігуры, і ў гэтай мітусні Веранічка выпадкова заўважыла Даніка і паказала на яго Ірыне. Данік не танцаваў, ён прыхіліўся да сцяны і моўчкі назіраў. Дзяўчаты пачалі шаптацца:

— Іра, я яго запрашу на наступны танец!

— Веранічка, не трэба!

— Можа, й не трэба, бо ён адразу скончыць.

— Таня цябе заб'е, калі даведаецца.

— Яна ж у нас абаронца братоў нашых меншых.

— А ў рэшце рэшт, запрашай, ён закахаецца, ажэніцца з табой. І ты станеш жонкай вядомага паэта! Ён не будзе табе здраджваць, бо вольны час будзе ахвяраваць вершам.

— Іра, ён мне і так здраджваць не будзе, але і са мной спаць не зможа. Так што лепей я запрашу твайго Аспіранта.

— Ну! Рызыкні здароўем! — адначасова ваяўніча і жартаўліва прамовіла Іра.

Яны забыліся на Даніка, а ён, адшукаўшы вачамі Вераніку, пільна ўглядаўся ў яе фігуру. Пасля таго выпадку, калі ён ратаваў яе ад перапою і пабачыў яе голай, ён нібы захварэў. І нельга, канешне, сказаць, што ў той момант яна была дужа эратычнай, але Данік зацыкліўся і нічога не мог з сабой зрабіць. Санька смяяўся з гэтага сляпога кахання і спрабаваў расказваць пра Веранічку брудныя гісторыі. Але дарма, бо Данік сам ведаў іх на памяць. Яму нават падабалася, калі ён чуў пра яе ўсё горшыя і непрыстойнейшыя аповеды. І Санька, каб не падтрымліваць ягоны мазахізм, вырашыў больш Вераніку не ўспамінаць.

У апошняй спробе задушыць гэтае ненармальнае пачуццё Санька усё расказаў Таццяне, каб яна неяк паўплывала. Яна паназірала і заўважыла, што Даніку проста патрэбна дзяўчына, якой ён будзе прысвячаць вершы, якую ён будзе нібыта кахаць. Але ў вершах найбольш прывабна выглядае няшчаснае каханне, і Данік, мабыць, быў упэўнены, што пачуццё да Веранічкі, якая грэбавала ім, будзе дакладна няшчасным. Паспрабуй зразумей гэтых паэтаў!

Калі дзяўчаты ўжо ішлі дадому, Ірына заўважыла, што Данік быў на дыскатэцы п'яны. Наступнай раніцай Веранічка зазірнула ў пакой да хлопцаў. Данік спаў, а Санька і Юра-Трасянка ўжо гралі ў карты. Дзяўчына падміргнула хлопцам, села на Данікаў ложак і пяшчотна разбудзіла яго пацалункам у шчаку. Убачыўшы Веранічку, Данік аж падскочыў у ложку. Яна шчыра ўсміхнулася, правяла рукой па яго валасах і ласкава запытала:

— Данік, памятаеш, як ты да мяне ўчора чапляўся?

— Я?! — жахнуўся Данік і азірнуўся на хлопцаў у пошуках падтрымкі.

— Болей не рабі так, пакуль я сама не дазволю, — кажучы гэта, Вераніка нахілілася так, што Данік меў магчымасць зазірнуць у ейнае дэкальтэ. Малады ўразлівы паэт быў у паўпрытомным стане, калі Вераніка, віхляючы клубамі, выйшла з пакою.

— Данік, няўжо ты думаеш, што мы не заўважаем тваіх «сардэчных» пакут?! — сыграў заклапочанасць Санька.

Ён выняў нешта са сваёй шуфлядкі, схаваў за спінай і ўрачыстым крокам падышоў да сябравага ложка.

— Я для цябе кніжачку набыў. «Майстэрства сексу». У цябе ж ніколі нічога не атрымаецца, — нібы гіпнатызаваў Санька. — Ніколі й нічога! Таму я табе заклаў параграф «Аральны секс». Парадуеш Веранічку. Языком ты добра мянціць ўмееш!

Хлопцы разрагаталіся. Юра-Трасянка ад смеху захлынуўся ўласнай слінай, і Санька доўга ляпаў яго па спіне. Данік, нацягнуўшы коўдру па самую шыю, абурана назіраў за іх рэакцыяй. А потым яму стала ўсё адно. Хай смяюцца. Галоўнае, што яна прыйшла да яго. Прыйшла сама. Ён дакладна памятаў, што ўчора нават не гаварыў з ёй, не тое што прыставаў. Значыць, яна прыйшла пажартаваць. А гэта ўжо добрая прыкмета, ён не ведаў для каго добрая, але было жахліва прыемна, і нават хлопцы не змаглі сапсаваць яму настрой.

Данік нацягнуў спартовыя штаны і сеў за пісьмовы стол.

— І не паснедаеш, паэт? — зайздросна вымавіў над Данікавым вухам Санька.

— Адзін толькі верш, пачакай, — папрасіў хлопец. І Санька са шкадаваннем зразумеў, што ад паперы Даніка не адцягнеш.

А Юра-Трасянка адзначыў сабе: «Паэты, як жанчыны, гатовы псаваць настрой адзін аднаму дзеля якой-небудзь дробязі, гатовы ганіць выдатны верш толькі за тое, што яго напісаў лепшы сябар, і гатовы плакаць з-за крывога позірка і сваёй недаацэненасці». Але, як заўсёды, разумныя думкі Юра пакідаў сабе, а лухту з задавальненнем агучваў. І самае дзіўнае, што два тонкіх, адчувальных паэта, што жылі з ім у адным пакоі, не раскусілі суседа, а захлыналіся ў сваім суперніцтве і сваім эгаізме.

Чуйныя? Якія ж яны чуйныя? — Ірына ўсё ўспамінала словы Таццяны наконт паэтаў, — Стас загінуў, а Санька нейкі галімы верш яму прысвяціў, які ён напісаў толькі таму, што ведаў: усе прачытаюць. Данік хоць не кан'юнктурыў. Мала хто любіў Стаса да згубы прытомнасці, можа, адна толькі Таня, але нармальная рэакцыя на яго смерць павінна быць у кожнага, хто яго ведаў. Кожны павінен быў падумаць, што на месцы Стаса мог апынуцца ён сам. Людзі эгаісты, ім шкада сябе больш, чым іншых,

свая дробязь прыносіць больш перажыванняў, чым чужое гора. І плакаць павінны былі ўсе, шкадуючы сябе, успамінаючы самае лепшае, што было звязана са Стасам. А Санька паспрабаваў узняцца на хвалі гэтага жаху.

Ірына ўспомніла сваю рэакцыю на смерць аднакласніка, з якім у яе была «халодная вайна». Першае, што яна падумала, было адчуванне свабоды ад яго надакучлівых чапляння ў, ад крыўд. А потым яна зразумела, што гэта такое, і была б гатова цярпець яго абразы ўсё жыццё, абы ён толькі быў жывы. Як заўважыла Ірына, такой жа была першая рэакцыя Даніка: спачатку ён уздыхнуў з палёгкай, што не дакранецца больш да яго атрутнае джала Стасавай іроніі, а потым зразумеў, якое гора гэта для Тані, для таго ж Аспіранта і хлопцаў. І ўжо ніколі дзяўчаты не чулі, каб ён сказаў нешта дрэннае пра Стаса, ды ён ужо і не памятаў нічога дрэннага.

За такімі думкамі застала Ірыну Веранічка, вяртаючыся з чарговага спаткання. Яна плюхнулася на свой не прыбраны з раніцы ложак і задаволена пацягнулася да трэску касцей.

— Ну, што? Пазбавіла цнатлівасці чарговага хлопца? — іранічна запытала Іра.

— Мне здаецца, што я ў яго не першая... Але хацелася б! — летуценна прамовіла Веранічка.

— Хацелася б ёй! Вераніка, прыбяры на ложку і на палічцы. А то прыйдзе твой «цнатліўчык», пабачыць гэткі развал і ...

— Знайду новага! — спыніла яе дзяўчына.

— Ага! А потым яшчэ аднаго, а потым яшчэ... Чым гэта ўсё скончыцца, га? — не стрывала Ірына.

— Ты што, мая мама? Што хачу, тое й раблю! — раззлавалася Вераніка.

— Ніка, а ты сапраўды гэтага хочаш? Гэтага? Знайдзі сабе нармальнага хлопца, а не гэтых...

— Абавязкова! Як мяркуеш, Аспірант мне падыдзе? Ці пакінуць табе?

— Прабач, канешне, але калі Аспірант захоча з табой сустракацца, сам захоча, то я не буду перашкаджаць. Бо ён ужо не будзе Аспірантам, а стане, як усе твае хлопцы. І пасля цябе, зноў прабач, з пункту гледжання гігіены і ўсяго астатняга, ён не будзе вабіць ніякую дзяўчыну...

— Усё сказала? — кпліва прамовіла Вераніка і ўстала, каб выйсці з пакоя.

У гэты момант у пакой зазірнуў Валера, ён заўважыў непрыбраны ложак і грэбліва прамовіў:

— Ну й бардак у вас!

— Ідзі й прыбяры! — агрызнулася Вераніка і выйшла, ляпнуўшы дзвярыма.

— Яна звар'яцела? — Валера сеў на ложак Ірыны і глянуў на яе знізу ўверх.

— У яе, як звычайна, праблемы з хлопцамі.

— Іра, у яе ніколі не было праблем з хлопцамі, — засмяяўся Валера.

— Валерка, ты прыйшоў, каб гэта сказаць? — заўважыла Ірына, як заўсёды, іранічна.

— Не, я прыйшоў паведаміць, што сёння ты можаш пераначаваць у нашым пакоі.

— Ведаеш, мне мінулы раз было так сорамна перад Таняй, яна пра Стаса ўспомніла, — з падкрэсленым сумам прамовіла дзяўчына і села побач з Валерам.

— І ты гатова ахвяраваць сваімі адносінамі з Аспірантам з-за гэтага?

— Не, канешне... Бедная Таня, — уздыхнула Іра.

— Бедная Таня, — паспяшаўся згадзіцца Валера. — Дык ты пойдзеш сёння да Аспіранта?

— А ён сам не можа пра гэта спытаць?

— Ён рыхтуецца! Слухай, упершыню такога хлопца бачу. Звычайна дзяўчаты ладзяць вячэры са свечкамі, а твой Аспірант або дурак, або вельмі цябе кахае.

— Эх, Валерка, Валерка... — уздыхнула Іра і выгнала яго, каб апрануцца для спаткання.

... Яна павольна ўвайшла ў пакой хлопцаў. Пачуўшы крокі, Аспірант азірнуўся і амаль што спалохаўся:

— Іра?! Я не падрыхтаваўся яшчэ! Гэта ўсё Валерка наблытаў з часам! Я на кухню за «шарлоткай». Пачакаеш?

— Канешне, — засмяялася яна з яго спалоху і падышла да акна. І адразу ўспомніўся іншы вечар, што знік у нябыт паўгода таму. Яна і Стас у гэтым жа пакоі.

Светлым жнівеньскім вечарам яна зайшла сюды. Стас толькі што прыехаў і раскладаў свае рэчы. Іра падышла да яго ззаду і абняла. Ён развёў яе рукі і азірнуўся.

— Іра, — ён амаль не здзівіўся, — не думаў, што прывітаеш мяне такім чынам.

— Кінь яе! — прашаптала яна.

Фраза павісла ў паветры, не дачакаўшыся адказу. Іра са злосці села на кашулі, што былі раскладзены па ўсім ложку.

— Я кахаю яе, — сказаў хлопец з націскам на апошнім слове. І ўсміхнуўся тонкай і прыемнай усмешкай, якая не пакрыўдзіла Ірыну. Яна глядзела ў яго чорныя вочы, прыгожыя да такой ступені, што было балюча ў іх глядзець.

— Табе гэта толькі здаецца! — страсна сказала Ірына і кінулася да яго, каб абняць. Ён спыніў яе, схапіўшы за рукі:

— Іра, табе не сорамна? Таня твая сяброўка.

— У каханні няма сяброў! — выгукнула яна, спрабуючы выблытацца з яго рук. Ён адпусціў яе і зноў пачаў распакоўваць сваё адзенне. Яна хадзіла па пакоі, раздражнёная. Стас краем вока назіраў за ёй. На нейкі момант у галаве мільганула думка: зараз распрану яе і... Але ўспомніў Таню, яе закаханыя шчаслівыя вочы, і стала сорамна.

— Паглядзі на мяне, — амаль крыкнула Іра, ведаючы, што жыхары суседніх пакояў яшчэ не з’ехаліся. — Я прыгажэйшая за яе. Хочаш параўнаць?

І яна пачала расшпільваць блузку. Стас толькі пакруціў галавой, маўляў, не трэба. Яна, абражаная гэтым рухам, кінулася на яго ложак, абняла падушку, але не заплакала, як чакаў Стас. Яму здавалася, што трэба неяк яе супакоіць, так, каб яна зразумела, што ён нікому нічога не раскажа. Ён падышоў і сеў на ложак. Яна рэзка павярнулася і запытальна паглядзела на яго. Ён міжволі глянуў у расшпіленую блузку, і яна, перахапіўшы позірк, прашаптала, нібы малітву:

— Я кахаю цябе, толькі цябе, я сапраўды цябе кахаю. Навошта табе яна? Яна не цэніць тое, што мае! — і дзяўчына пацалавала яго, ён не стрымаўся і адказаў на пацалунак, і закапаўся з галавой у выраз блузкі, а яна, шчаслівая, высока і пераможна падняла галаву. Яна ж ведала Стаса, які не мог прапусціць паўз сябе ніводнай спадніцы. І цяпер Стас будзе належаць ёй!!!

Але праз секунду Стас падняў галаву і са шкадаваннем, паглынаючы вачыма яе грудзі, дрыжачымі пальцамі зашпільваў яе блузку.

— Я заб'ю яе! — са слязамі ў голасе прашаптала Іра.

— І нават тады я буду кахаць яе. Я буду ўспамінаць яе. Я буду дставаць яе фотаздымак, — ён узяў свой заплечнік і дастаў яе фота. — Такіх фатаграфій толькі дзве: адна ў мяне, другая — у яе. І я буду глядзець... глядзець... І гэтага будзе дастаткова.

— Тады я заб'ю цябе! — выбухнула Іра.

— А казала, што кахаеш. Ці ж забіваюць у такіх выпадках? — Стас уважліва глядзеў ёй у вочы і зрэдку дакранаўся пальцамі да свайго тонкага носа.

— Я дачакаюся... Стас! Я адпомшчу! Не смейся, шчэ плакаць будзеш! Нават калі міне 20 год, я адпомшчу табе. А фотаздымак гэты можаш выкінуць зараз, каб праз 20 год мне не прыйшлося ірваць яго на кавалкі!

Вось з таго часу Ірына Стаса проста ігнаравала: не віталася, не размаўляла з ім, гаварыла пра яго

ў трэцяй асобе нават у ягонай прысутнасці, а Таня-дурніца думала, што Стас нечым Іру пакрыўдзіў, і ўсё спрабавала памірыць іх.

Ірына задуменна глядзела ў акно, калі над яе вухам зашаптаў Аспірант:

— Я кахаю цябе, Ірка! Я сапраўды цябе кахаю! — ён глядзеў на яе сваімі чорнымі вачыма, прыгожымі да такой ступені, што было балюча глядзець. Не дачакаўшыся адказу, ён няўпэўнена дакрануўся да свайго тонкага носа, і толькі тады заўважыў слёзы, што стаялі ў вачах Іры.

— Я таксама кахаю цябе, ты проста не ўяўляеш, як я цябе кахаю.

— Ірка, дурная, што ж ты плачаш? — засмяяўся ён, а яна сцялася як ад удара і прашаптала:

— Табе ніколі не зразумець...

— Ір, давай вячэраць, няўжо я дарма стараўся? — запрасіў Аспірант. І яна паслухмяна села за стол...

Раніцой Вераніка ўчыніла скандал, маўляў, дзе мая ружовая спаднічка. Таня шчыра прызналася, што яе ўзяла Аленка, і згадзілася пайсці забраць яе. Зайшоўшы ў суседні пакой, яна аслупянела: на двух састаўленых ложках спалі Аленка і Валера, і ў гэтым не было б нічога дзіўнага, калі б на суседнім ложку не спала дзіцячым сном Ліля-першакурсніца. Таня ад здзіўлення гучна пракаўтнула сліну і ўжо збіралася выйсці, як падняў галаву Валера і падміргнуў Тані. Яна кіўнула галавой на Лілю, маўляў, не саромеешся? Ён толькі бязгучна засмяяўся.

Таня вырашыла забраць спадніцу ў другі раз. А на кухні, калі прыйшла гатаваць снеданне Ліля, спытала яе:

— Як вы так спіце? А яны, нахабнікі, не саромеюцца!

— Дык я лягла і заснула, — спакойна адказала Ліля.

— Як заснула? Ну, Ліля, я ў такой сітуацыі прынцыпова б не заснула! — засмяялася Таня, зразумеў-

шы Валеру. Неэмацыянальная, павольная і нетаропкая, як чарапаха, Ліля сапраўды спала, не звяртаючы ўвагу на шум.

Валера потым прыйшоў да Тані, каб пасмяяцца з Лілі.

— Я саромеўся, хоць гэта не мая ўласцівасць. Думаю, групавуха нейкая атрымоўваецца: двое робяць, трэцяя глядзіць ці слухае. Я пачаў сумнявацца, можа, яны скажэнкі якіясь. Шчэ прымусяць з дзвюма... — Валерка задаволена засмяяўся. — А яна спіць, Аленка нават кніжку спецыяльна на падлогу ўраніла, а Ліля сапе, як сапла. А можа, мне яе спакусіць? А то як ні знайду сабе дзеўку, а вяршкі ўжо Стас зняў...

Валера развіваў далей гэту тэму, не заўважаючы, як пачалі дрыжэць Таніны вусны і ў вачах пачаў адлюстроўвацца пакой.

Раптам расчыніліся дзверы і, як бы ад некага хаваючыся, уціснуўся Валік, ён толькі паспеў сказаць сваё адвечнае: «Танюля!», як заўважыў Валеру, які запытальна на яго паглядзеў. І Валік са словамі: «А... не буду вам перашкаджаць» падаўся назад.

Таня памкнулася за Валікам, але Валера пяшчотна ўзяў яе за руку: «Танечка, ты цяжарная, што ж ты скачаш, як каза? Калі б было нешта тэрміновае, ён бы сказаў. З драбязой нейкай прыцёгся, як заўсёды». А пра сябе адзначыў: «Шасцёрка Валік!»

— Эх, Таня, як было б добра, калі б ты прыйшла на спаборніцтва заўтра. Табе нельга хвалявацца, але заўтра ты і не будзеш хвалявацца. Мы стопудова пераможам! А станоўчыя эмоцыі табе не пашкодзяць, можа, у тваім жываце расце футбаліст. Таня, футбол для мяне — усё. Сама бачыш, як я вучуся. Калі б не футбол, я памёр бы. Не думай, што я ідыёт, які не можа асвоіць праграмы і таму ўлягае ў спорт. Проста адчуванне ад забітага гола, ды нават ад знаходжання на пляцоўцы — гэта нешта боскае. Тое,

дзеля чаго варта жыць і мучыцца. Я жыву толькі на пляцоўцы, а ўсё астатняе — нерэальна, у іншым вымярэнні, — ён гаварыў гэта так узнёсла, так шчыра, а потым як бы прачнуўся, адчуў, што сказаў нешта залішняе, і паспрабаваў пажартаваць: — Нават у ложку з Аленкай я не такі шчаслівы, як там. А можа, мне проста не пашанцавала з Аленкай, — рассмяяўся хлопец.

— Валера, — раптам успомніла дзяўчына, — раней Стас быў капітанам, а зараз хто?

Валера замёр, вочы пачалі бегаць, ён злаваў на сябе, ніхто ж не прасіў расказваць пра футбол, і калі ўжо далей маўчаць стала непрыстойна, ён выдавіў:

— Я.

— Ты? Валера! Як жа так! — не ведала што сказаць Таня.

— Але не бывае каманды без капітана, — паспрабаваў ён апраўдацца.

— Канешне, канешне, — прамовіла Таня, ледзь стрымліваючыся. «Футбол для яго самае важнае, тое, дзеля чаго варта жыць... Інакш смерць? Значыць, увесь той час, пакуль Стас быў капітанам, Валера яму зайздросціў? І наколькі далёка ён зайшоў у сваёй зайздрасці? Настолькі, каб...»

— Валера, лепш выйдзі, я прашу цябе! — Таня не хацела падмацоўваць сваё падазрэнне ўсё новымі і новымі дробязямі і выбегла першай.

Валера абапёрся галавой на рукі: «Вось так заўсёды, якая-небудзь драбната выдае з галавой... Не, ніколі немагчыма ўлічыць усё».

У гэты момант увайшла Веранічка і здзіўлена паглядзела на Валеру, які сядзеў у пустым пакоі. І хлопец паспяшаўся выйсці.

Веранічка лягла на ложак, закінула ногі на палічку для кніг. У дзверы нехта пастукаў і, пачуўшы запрашэнне, няўпэўнена ўвайшоў. Мужчына, высокі і цёмнавалосы, у тым узросце, калі чалавеку можна даць і 40 гадоў, і 60, няёмка пераступаў на парозе.

Веранічка з цікавасцю глядзела на яго, нават не паспрабаваўшы прыняць прыстойную паставу. Мужчына грэбліва прыўзняў густыя бровы і стараўся не глядзець на задраныя ногі дзяўчыны.

— Я шукаю Таню Захарэвіч, — яму было няёмка і непрыемна звяртацца да гэтага нявыхаванага дзіцёнка.

— І што вам ад мяне трэба? — нечакана для самой сябе сказала Веранічка.

— Таня?! — жахнуўся мужчына і ўжо ўважлівей абгледзеў яе спакушальную паставу. — Канешне, канешне, ведаючы Стаса, як мог я спадзявацца... — ён хацеў яшчэ нешта дадаць, але, глянуўшы на ногі дзяўчыны, перадумаў.

Веранічка раптам адчула, што гэта дрэнна — выдаваць сябе за іншую, але было ўжо сорамна прызнацца, і таму палічыла за выратаванне, калі ў пакой ўляцела Іра і загаварыла:

— Веранічка, бяжы хутчэй на кухню. Я не ведаю, што далей рабіць!

Веранічка з выглядам шэф-повара прадэфілявала паўз мужчыну і нясціпла так яму падміргнула.

— Веранічка? Дык гэта не Таня? — ён паціху адыходзіў ад шоку.

Ірына засмяялася, папрасіла яго пачакаць і пабегла шукаць Таню.

І калі тая ўвайшла ў пакой, сціплая і безабаронная, мужчына расплыўся ва ўсмешцы:

— Спадзяюся, што вы дакладна Таня!

— Мне ўжо сказалі, як пажартавала Веранічка, — дзяўчына не ведала, што трэба далей гаварыць гэтаму чалавеку, якога яна ўпершыцю бачыла і які не спяшаўся называць сваё імя. Нарэшце ён зразумеў сваю памылку:

— Я бацька Стаса, Сяргей Антонавіч.

— Стаса? — Тані чамусьці захацелася збегчы, знікнуць.

— Мне Максім расказаў, што вы цяжарная.

— Максім? А, Аспірант, мы клічам яго Аспірант, — Таня гаварыла абы гаварыць. Яна не ведала, што мог ёй паведаміць у такой сітуацыі бацька Стаса, і яна страшэнна баялася, што ён зараз пачне дапытвацца, ці сапраўды гэта Стасава дзіця. Яна не хацела адчуць сябе аўтаматам па вырабу немаўлятак. І яна хацела пазбегчы гэтай размовы.

— Я быў дрэнным бацькам Стасу, але ён мой адзіны сын, у мяне ёсць яшчэ дачка ад другога шлюбу. Я не змог наладзіць з ім кантакт, і ён вырас такім, якім вырас. І я не хачу паўтараць сваіх памылак. Я лічу, што ў дзіцяці павінна быць сям'я. Вы ж не пазбавіце сваё дзіця сям'і? — прасіў мужчына, ад якога яна чакала абразы.

Таня ўздыхнула з палёгкай:

— А я так баялася гэткай сустрэчы... я была вырашыла для сябе, што ніколі нічога ў вас не папрашу, не буду дабівацца прызнання дзіцяці... што я ўсё зраблю сама. І мне ... мне вельмі прыемна, што вы прымаеце нас... мяне і ... — Таня ўжо плакала.

— Ну, не трэба, не трэба, — Сяргей Антонавіч няўмела спрабаваў супакоіць дзяўчыну.

— Не хвалюйцеся. Гэта я ад радасці, — Таня смяялася і плакала адначасова.

— Таня, ты не павінна жыць у інтэрнаце ў такім стане.

— Засталося здаць сесію, а потым я на лета дадому. А пасля нараджэння малога бацькі абяцалі здымаць мне кватэру.

— Гэта не спатрэбіцца, кватэру мы ўжо купілі.

Таніны слёзы імгненна высахлі. Значыць, ён прыйшоў, прасіў прыняць сям'ю, казаў пра высокія матэрыі, пра дрэнныя адносіны са Стасам, а сам ўжо купіў кватэру. Падкупіць яе хоча, нават калі ў гэтым няма патрэбы. А потым будзе папракаць. Ці дзіця забяруць. Але, з іншага боку, яна ў любы момант зможа адмовіцца ад усяго. А пакуль што

кватэра ёй не зашкодзіць. Як непрыемна ў такія справы блытаць матэрыяльныя інтарэсы.

— Табе будзе цяжка жыць адной. У Мінску вучыцца адна з маіх пляменніц, калі захочаш, яна будзе дапамагаць. Ну, і канешне, Максім абяцаў, калі трэба, дапамагаць і зрабіць усё дзеля твайго камфорту.

— Ну, Сяргей Антонавіч, я сказаў бы тое самае, але больш красамоўна, — на парозе стаяў Аспірант і па-змоўніцку ўсміхаўся.

Сяргей Антонавіч зірнуў на гадзіннік і паспяшаўся развітацца. Аспірант нахіліў галаву на бок і па-бацькоўску глядзеў на дзяўчыну.

— Максім, дзякуй, што ты вырашыў адну з самых важных для мяне праблем.

— Сказаць шчыра, я думаў не толькі пра цябе. Калі бацькі згубілі Стаса, яны не павінны згубіць для сябе ўнука.

— Ці ўнучку! — выгукнула Таня.

— Нават лепей унучку, бо жанчыны ў сям'і Сяргея Антонавіча нашмат прыемнейшыя за мужчын. І я спадзяюся, дзіця возьме ад ўсіх самае лепшае.

— Максім, ты сапраўдны сябра, — прашаптала Таня, а ў вачах яе свяцілася нешта большае за звычайную ўдзячнасць.

Аспірант нахіліўся, абняў Таню, якая не даставала яму нават да пляча, і сказаў ёй на вуха: «Усё будзе найлепшым чынам, я табе абяцаю».

Ён вярнуўся ў свой пакой і стомлена лёг на ложак, стома была не фізічная, ад якой так лёгка пазбавіцца, а эмацыянальная. У галаве круцілася калейдаскопам: маленькая Таня, Стас, Сяргей Антонавіч, зноў Таня, зноў Стас, вось яны разам, вось Стас робіць апошні крок у люк. Аспірант міжволі застагнаў, уткнуўся галавой у падушку, каб не заплакаць. Ён сеў на ложку, дацягнуўся рукой да тумбачкі, узяў фотаздымак, дзе побач стаялі ён і Стас. Ён і Стас.

— Зноў сабе сэрца надрываеш? — пісклявы голас Веранічкі, як камарыны звон, парушыў цішыню.

Аспірант павольна схаваў фота ў шуфлядку і запытальна паглядзеў на дзяўчыну. Яна залезла на яго ложак з нагамі, закінула галаву і, гледзячы ў столь, з горкай усмешкай сказала:

— Я таксама хацела б плакаць па ім. І плакала б... калі б не была для яго ўсяго толькі анучай для выціраннябот аў.

— Ну што ты, Вераніка, — Аспірант механічна вымавіў тое, чаго чакала ад яго дзяўчына.

— Я ведаю, як вы, хлопцы, да мяне ставіцеся. Як да... якойсьці. Я ведаю. Я не ведаю, чаму я так жыву, але я так жыву. Хлопцы думаюць, што яны мной карыстаюцца, а на самай справе ўсё наадварот.

Такі нестандартны падыход зацікавіў Аспіранта, ён адарваўся ад сваіх думак і пачаў слухаць.

— Я прыходжу са спаткання і распавядаю дзяўчатам розныя інтымныя падрабязнасці. Лёгка быць цнатлівымі, калі самае цікавае я ім ужо расказала. Я, калі хочаш, заканадаўца мод. Заўважыў, як дзяўчаты Данікам грэбуюць, а ўсё з-за мяне.

— Ніка, калі мяне яшчэ склероз не замучыў, са мной ты не кахалася. А я не магу паскардзіцца на недахоп жаночай увагі.

— Выключэнне толькі пацвярджае правіла! — выратавала сваю феміністскую тэорыю Веранічка. — Проста ты на два гады старэйшы і з дзецьмі не водзішся.

— Калі не лічыць Іру, — засмяяўся хлопец.

— Іра — гэта часовая з’ява, павер мне, — прашаптала яна і паклала далонь на калена Аспіранта.

— Эх, Ніка-Вераніка, хочаш пазбавіць правіла выключэння, — намагаючыся не пакрыўдзіць дзяўчыну, сказаў Аспірант і ўзяў яе руку ў сваю.

Вераніка ўздыхнула:

— Зноў пракол, можа, я старэю, га?

— Значыць, самы час пісаць мемуары, — пажартаваў Максім.

— Ну, то да пабачэння, пайду пісаць мемуары! — сумна згадзілася дзяўчына.

Адкрываючы дзверы ўласнага пакоя, яна пачула гучны смех і паспяшалася далучыцца да кампаніі.

У госці прыйшоў Данік, і хоць як мужчыну яго не ўспрымалі, у якасці паэта ён захапляў усіх дзяўчат. І спецыяльна для іх ён пісаў свае эратычныя вершы.

Убачыўшы Веранічку, ён не разгубіўся, як звычайна, а прадэкламаваў:

> Як падаюць зоры —
> Жаданне сваё загадаю.
> Прачнуцца б з табою!
> Я большага шчасця не маю.

— Данік, ты са мной не прачнешся, бо ты са мной не заснеш! — смяялася да слёз дзяўчына.

— Ніка, што ж ты перапыняеш, я ж яшчэ не скончыў.

— Ну, даражэнькі, ад вершаў і я не скончу! — словы Веранічкі паглынуў выбух смеху. І хоць яна здзекавалася з кожнага сказа, ёй была прыемная такая ўвага.

— Веранічка, я напісаў такія вершы, што нават ты скончыш, — пачырванеў Данік.

> Не снілася замежным рэжысёрам,
> І порназоркам, й порнагледачам,
> Як мы з табой свой забывалі сорам,
> Як мы з табой свой выяўлялі нораў.

— Данік, гэта сапраўды не снілася замежным рэжысёрам. Гэта снілася табе, Данік!!! — Вераніка ўжо трымалася за жывот, бо болей не было моцы смяяцца. — Данік, яшчэ адзін такі верш — і я памру.

Данік, нібы вампір, сілкаваўся гэтым смехам, гэтай увагай.

— А вось яшчэ верш!

— І каму ты яго прысвяціў? Мне, канешне, — здагадалася дзяўчына.

Згарае ноч пад ранкам,
Як нехта пад табой.
А ты сядзіш на ганку,
Мяне ж там не было.

— Ну, хоць у адным вершы не схлусіў, — падзякавала Веранічка і пацалавала паэта.

— Ну, Ніка, ты сама справакавала, — загарэўся паэт.

Я вазьму аберуч твае рукі.
Ты смяешся — смяюся і я.
І на целе, вільготным і пругкім,
Застаецца пяшчота мая.

— Данік, гэта ўжо нахабства! А ну, сцірай сваю пяшчоту з майго цела! — жартоўна загадала «запэцканая». — Э! Э! Рукі прыбяры!!! Лепш брудная хадзіць!

Таня шчыра радавалася поспеху Даніка і ў захапленні выдала амаль афарызм:

— Гэта святыя людзі, хто ў 19 год шчэ піша вершы. Усе мы спрабавалі, але ў час зразумелі, што гэта не для нас.

— Данік, дай німб памацаю, — павалілася ад смеху Веранічка.

— Я быў бы не супраць, каб ты што іншае памацала.

Дзяўчына павольна падняла галаву і паглядзела на яго, яна была ўпэўнена, што і гэты яе жарт ён сцерпіць і стрывае безліч зняваг ад яе, а ён...

— Данік, у цябе пераходны ўзрост скончыўся ці толькі пачынаецца?

— Хадзем праверыш! — надзвычай самаўпэўнена прамовіў хлопец, душа ж яго на самай справе трэслася, як заечы хвосцік.

Веранічка дэманстратыўна занепакоілася:

— Данік, я лічыла, што сваю цнатлівасць ты страціш са мной. Але ж ты таксама, як бачу, у шапку не спаў.

— Я насамрэч спаў не ў шапку, праз шапку нязручна, — трыумфаваў паэт. Галоўнае, перагаварыць Веранічку, добра яе падкузьміць. І не будуць больш па ім таптацца. А то любы слабак, каб вылучыцца, на ім у славесным двубоі трэніруецца.

— Тайм-аўт! — спыніла іх Таня. — Людзі, хочаце сварыцца? Мы можам выйсці. Лепш пачытай што-небудзь яшчэ, Данік!

— А Данік вам штось чытаў? — зазірнуў у пакой Санька. — Штосьці з новенькага? Ён са сваім запорам усю туалетную паперу вершамі спісаў. А потым «Не снілася замежным рэжысёрам...», канешне, не снілася, яны ад запораў не пакутуюць!

Данік збялеў, а Санька загадкава на яго пагля-дзеў, маўляў, паспрабуй дакажы, што запор быў не ў цябе, а ў Юры-Трасянкі. Дзяўчаты абурыліся і выгналі Саньку, найбольш у гэтым працэсе шчыравала Веранічка, ды кульгавы аўтарытэт Даніка зноў кульнуўся з хісткага п'едэстала. Хлопец усё зразумеў і хутка развітаўся.

Дзяўчаты ўладкоўваліся на ноч, калі Веранічка стала сярод пакоя і абвясціла:

— Таня, я табе зайздрошчу!!!

— Чаму мне? — Таня ад здзіўлення не магла прыдумаць нічога разумнейшага.

— Цяжарнасць жанчыну ўпрыгожвае. У цябе жывоцік ужо ёсць, і ты стала такой пяшчотнай, круглай. Па ўсім відаць, для цябе самае важнае зараз — ты сама, а ўсё вакол хай праваліцца, зруйнуецца, цябе нішто не вытрусіць з тваёй раўнавагі. Напэўна, прырода такім чынам ахоўвае маці і дзіця, вы ў такой абалонцы эмацыянальнага спакою...

— Звар'яцела? — груба спыніла яе Іра.

— Іра, ну навошта ты так? — Таня абурылася за Веранічку, бо тая стаяла ў сваіх развагах, бы статуя. Таццяна звярнулася да свайго жывоціка:

— А мы з табой самыя шчаслівыя насуперак усяму. І сказала нам пра гэта цёця Вераніка.

— Вы мне надакучылі са сваімі хворымі фантазіямі! — крыкнула Ірына і захуталася ў коўдру з галавой.

— Толькі б мне Стас не прысніўся, — ледзь чутно прашаптала Вераніка, гэтую фразу як замову яна паўтарала кожны вечар з дня гібелі хлопца.

Усе заснулі, адна толькі Таня ўспамінала, якім прыемным быў для яе дзень. Веранічка пачала куёўчыцца ў ложку, стагнаць, і Таня падумала: «Зараз галёкаць будзе!» Яна ціхенька адшукала нагамі тапкі і падышла да ложка суседкі:

— Ш-ш-ш-ш! Спі, Веранічка! Ш-ш-ш-ш...

Веранічка стагнала і плакала ад сну-ўспаміну. Яна зноў перажывала тую гісторыю.

Стас ўжо не кантраляваў сябе, у шаленстве ён нічога вакол сябе не бачыў:

— Я прасіў цябе? Не ўблытвайся ў маё жыццё! Ты — дзеўка! Якой я карыстаюся, калі захачу! Я ... цябе, але не кахаю! І ср... я хацеў на твае пачуцці! У цябе няма пачуццяў!

А ўсё распачалося толькі з-за таго, што Веранічка паставіла на тумбачку Стаса свой фотаздымак у рамцы.

— Але фатаграфію Тані ты носіш з сабой! — абаранялася дзяўчына.

— Таня — не ты! Адчуй розніцу, шлюндра! — пырскаў слінай Стас.

— Захоўваеш яе фота, выдатна, яна твае — даўно ўжо скарыстала па прызначэнню!— бясконцыя абразы раз'юшылі нават Вераніку.

— Рухай капытамі, кабыла! — расчыніў дзверы Стас. — А фота Тані я зраблю постэрам!

Стас палез у заплечнік, але не знайшоў фатаграфіі.

— Сука! Ты ўзяла! — ён абрынуў на яе стопку кніг са стала. Яна ўпала, а Стас пачаў пінаць яе

нагамі, найчасцей трапляючы па кнігах, робячы балюча сабе і ад гэтага яшчэ болей шалеючы.

І тут у пакой убег Аспірант:

— Стас, супакойся! Што ж ты за звер такі! Веранічка, Веранічка!

Дзяўчына, захліпваючыся, паўтарала: «Гэта не я зрабіла! Гэта не я! Стас! Гэта не я! Не я!». Аспірант паклаў яе на свой ложак, раз'ятрана запытаў у Стаса: «Што яна такога зрабіла?» і, сцяўшы сківіцы, чакаў адказу. Стас, задыхваючыся, расказаў. Аспірант схапіў заплечнік, памацаў рукой у кішэні і выцягнуў фотаздымак, што забіўся глыбока сярод папер. Стас з палёгкай выдыхнуў, пяшчотна ўзяў фота і нібыта забыўся на здарэнне. А Вераніка разрыдалася: «Я ж казала! Гэта не я!»

Таня стаяла наўколенцах перад ложкам дзяўчыны, Вераніка плакала і крычала: «Гэта не я! Гэта не я зрабіла! Ста-ас!» Таня спачатку хацела разбудзіць яе, але счакала колькі часу, каб паслухаць, што яшчэ тая скажа. Але Вераніка бясконца паўтарала адно і тое ж і сцякала слязьмі. Таня пашкадавала яе і выратавала ад жахлівага сну. Вераніка падхапілася, пачала выціраць твар. Яна спужана паглядзела на Таню і, запыняючыся, патлумачыла: «Дрэнны сон!» Яна нічога больш не сказала, а Тані ўсю ноч снілася, як Ніка крычала.

Іра цяжка прачнулася:

— Я сёння нейкая разбітая. Адчуванне, што мяне праз мясарубку прапусцілі.

— Ніка дрэнна спала, крычала ноччу, — расказала Таня.

— Ёй прыснілася, што яна цяжарная? — падкалола Іра.

— Не, ёй прысніўся Стас, — Таня не вытрымала. — А што ты маеш супраць цяжарнасці?

— А тое, што я таксама цяжарная! — ужо крычала дзяўчына.

— Аспірант будзе ад шчасця на сёмым небе, — з лёгкім сумам выказала меркаванне Таццяна.

— Ах! Ён будзе на сёмым небе! Цудоўна! Выдатна!.. Я рада за яго. А пра мяне ты падумала? Ён праз пару месяцаў скончыць універ і, калі не паступіць у аспірантуру, паедзе дадому вучыць дзетак у школцы, а я застануся тут цяжарная?! А калі Аспірант сапраўды стане аспірантам, я што, буду жыць у інтэрнаце ўсё жыццё? Не смяшы мяне!

— Ты можаш жыць са мной, бацькі Стаса купілі кватэру...

— Я не такая разумная, як ты! Трэба было ад Стаса зацяжарыць, а не ад гэтага... А ты святая, Стасу бацькі кватэру не купілі, бо шлюх вадзіў бы штоночы, а ты во як атрымала. А мой Аспірант, цьфу! Цюха-мацюха! Сёння я іду рабіць аборт! Я ўжо даўно ўсё вырашыла! І не збіраюся гэта абмяркоўваць!

Тані стала непрыемна выслухоўваць ўсё гэта, і яна пакінула Ірыну сам-насам з яе незапланаванай і непажаданай цяжарнасцю.

Па калідоры насустрач ішоў Аспірант, ён быў надзвычай вясёлы і ледзь стрымліваўся, каб не спяваць на ўвесь інтэрнат.

— Танюш, які сёння дзень? — гучна і ўрачыста спытаў хлопец.

— 27 чэрвеня. У мяне заўтра ў 14.00 апошні экзамен, а я ўжо ўсе білеты ведаю! — Таня падладзілася пад яго настрой.

— А сёння што? — пакрыўджана вымавіў Аспірант.

— Ма-аксім! Прабач, сёння твой дзень нараджэння! Шчасця, здароўя!

Таня ўспомніла пра Ірыну і дадала:

— І калі нешта дрэннае будзе адбывацца ў тваім жыцці, лепей, каб ты пра гэта не ведаў.

— Дзіўнае пажаданне... Але... Вы, паненка Таццяна, і ваша шаноўнае дзіця, спадзяюся, дзяўчын-

ка, запрошаны сёння на святкаванне майго дня нарodзінаў. Прабачце, што не ў пісьмовай форме паклікаў. А яшчэ... Ты Іру не бачыла? Яна дома? — спытаў ён, ужо адчыняючы дзверы.

Ірына сядзела на ложку неапранутая, заплаканая, і кожны, хто б пабачыў яе ў гэты момант, зразумеў бы, што лепей ёй на вочы не трапляцца. Але Аспірант, захоплены ўласным святам, заўважыў яе стан занадта позна.

— Пайшоў прэч! — Іра нават не глянула на яго, а зноў легла і адвярнулася тварам да сцяны. Хлопец, пакрыўджаны няўвагай, пачаў дапытвацца, чым ён заслужыў такое стаўленне.

— Ах, ты хочаш ведаць, чым ты заслужыў? Вось гэтым органам! — Іра недвухсэнсоўна паказала рукой.

Але калі галава шчэ хвіліну таму была занятая рыхтаваннем да застолля, то цяжка скеміць, што мае на ўвазе твая дзяўчына.

— Ідыёт! Я цяжарная! Але не радуйся, я не збіраюся нікога нараджаць! — крыкнула Іра і ад лішку эмоцый выскачыла з ложку, амаль кідаючыся на Аспіранта.

— Іра, выходзь за мяне замуж! — экспромтам выдаў хлопец, забараніўшы сабе думаць пра наступствы гэтай прапановы. Ён разумеў, што яму няма куды прывесці жонку і дзіця, але ён ведаў, чым усё скончыцца, калі не паспрабаваць.

— Не, ты невылечны! Ты разумееш, што я не хачу ні цябе, ні твайго дзіцёнка! — ужо смяялася Ірына. — І не кажы мне пра Таню! Яна гэткая ж хворая на галаву, як і ты! Праўда, ёй пашанцавала ў апошні момант! Кватэра з неба звалілася!

— Не хочаш дзіця ад мяне? Ты ад некага іншага хацела б? Хопіць, Іра! — Максім паспрабаваў абняць яе, але яна не далася. — Я разумею: ты хочаш рабіць аборт. Ты ведаеш усе вынікі гэтага рашэння, не мне табе тлумачыць. Але пачакай яшчэ дзень!

Адзін дзень! Прыходзь сёння на мой дзень нараджэння. Заўтра мы з табой сядзем і ўсё ўзважым. Ніколі не позна зрабіць апошні крок. Я прашу цябе сёння пра гэта не думаць, заўтра, мы ўсё абмяркуем заўтра! Іра! Калі ласка!

— Максім, мы ўжо ўсё абмеркавалі. Але сёння я нічога і не збіралася рабіць, усё будзе заўтра, заўтра, — схлусіла дзяўчына і выйшла ў калідор, не зважаючы на занадта інтымны выгляд сваіх піжамных штонікаў.

Максім застаўся стаяць пасярод пакоя, стрымліваючы слёзы. Ён разумеў, што нічога не зменіць.

Аспірант вярнуўся ў свой пакой, дзе хлопцы — дрэнныя кухары — раскладалі па талерках гатовыя стравы. Імяніннік падышоў да акна і толькі тут, крыху супакоіўшыся, ён зразумеў сэнс Танінага пажадання. Калі нават яна такое сказала, значыць, справа сапраўды безнадзейная.

— Хлопцы, піва хочаце? — пачуў Аспірант уласны голас.

Хлопцы піва хацелі. Што зробіцца цэлай скрыні ад недахопу чатырох бутэлек?! Валера расставіў стаканы, Юра дастаў піва, а пяшчотны Валік прагна пазіраў на кілбасу.

— Валік! Сапраўдныя мужыкі не закусваюць піва! Яны півам закусваюць! — скаламбурыў Максім.

Хлопцы з раніцы амаль нічога не елі, і таму іх вочкі хутка сталі пазіраць на кончык носа. Але праз тры гадзіны, калі ўсё пачалося, іх стан быў ужо мала заўважны.

У пакоі хлопцы ссунулі сталы, недзе пазычылі абрус, прынеслі талеркі, і свята павінна было б пачацца. І толькі Валера заўважыў:

— Людзі, а пачакаць сяброўку імянінніка? Святая справа!

Таня заўважыла, як перасмыкнула твар Аспіранта, і зразумела, што ён ведае пра рашэнне Ірыны. Ёй было непрыемна, што яна нібыта ўцягнутая

ў гэтую гісторыю. Такія рэчы — справа інтымная, а Іра ўсё расказала ёй, не хаваючы і сваіх адносінаў да Максіма.

Ірына крыху спазнілася, яна з'явілася ў выглядзе жанчыны-вамп. І Таня зразумела, што гэтую «вампіршу» цяжка ўявіць цяжарнай. Тое самае адчуў і Аспірант. Іра падышла да яго і прысмакталася такім доўгім пацалункам, што Максіму не хапіла паветра. Ён аддыхаўся і запытальна паглядзеў на дзяўчыну, яна адмоўна пахітала галавой. Гэтую пантаміму зразумела толькі Таня. А Валера, прапанаваўшы Ірыне месца побач з Аспірантам на канцы стала, пажартваў:

— Нешта мне гэта нагадвае! Вяселле! Ха!

І пайшлі тост за тостам, чарка за чаркай. Таня не піла і са здзіўленнем заўважыла, як «дзіцячае» застолле падобна да «дарослага». Напэўна, традыцыя святочнага стала — адзіная традыцыя, што перадаюць бацькі дзецям. Ніхто ўжо не ведае калыханак, а тосты ўсе з адной кніжкі. І замест студэнтаў можна было пасадзіць пенсіянераў — і былі б тыя ж жарты, тыя ж песні, тыя ж твары ў салатніцах. Толькі Аспірант не піў, але ён заўсёды піў мала, і гэта нікога не здзіўляла. Таня падумала, што ў такой сітуацыі яму трэба было б напіцца, каб забыць. А вось Ірына жлукціла моцныя напоі, як ваду, і ўвесь час ліпла да Юры-Трасянкі.

Тосты скончыліся — і над сталом павісла цішыня.

— Хлопцы, не маўчыце, кожную хвіліну маўчання мент нараджаецца! — загадала Ірына.

— Стас не даў бы засумаваць! — п'яна заўважыла Веранічка.

— Ох, ты і развесяліла нас, Ніка! — спыніў яе Валера. — Людзі, у нас амаль ва ўсіх заўтра апошні экзамен. Апошняя наша сустрэча за сталом у гэтым навучальным годзе! Вып'ем! За сустрэчу!

— І за апошні экзамен! — дадала Таня, трымаючы стакан з сокам.

— Ох, казаў жа Стас, што ты завучка! — Юра-Трасянка, толькі выпіўшы, казаў праўду. — Стас быў майстра даць мянушку! Вось спытаеце, чаму я — Юра-Трасянка? Я зараз на любой мове добра размаўляю, а прыклеілася! О-па! Вось так!

Аспірант бачыў, як непрымна Тані чуць усё гэта, як ёй увогуле брыдка быць у гэтай п'янай кампаніі. Ён паставіў дыск, абвясціў танцы, а сам выйшаў з Таняй, краем вока заўважыўшы, што Іра-вамп таньчыць з Юрам-Трасянкам.

Яны прыйшлі ў Танін пакой.

— Таня, мне трэба з табой пагаварыць.

— Максім, я цябе слухаю.

— Ты ведаеш, пра што я хачу з табой пагаварыць. Пра Іру.

— Максім, прабач мяне.

І хлопец не вытрымаў:

— Няма за што табе прабачаць. А вось ёй я не дарую. Ну я разумею, калі б я адмовіўся жаніцца... А я ж быў на ўсё згодны... Гэта было і маё дзіця! Не толькі яе! Яна не мела права!.. Я разумею, як гэта цяжка: дзевяць месяцаў не належаць сабе, абмяжоўваць, цярпець нязручнасці розныя, боль... Але скажы мне, ці ж дзіця не вартае гэтага?! Я насіў бы яе на руках усё жыццё, а не толькі дзевяць месяцаў!.. Таня! Як яна магла! Ты разумееш, чаго яна мяне пазбавіла! Шчасце бацькоўства не меншае за шчасце мацярынства! А можа, нават мацнейшае, бо жанчына побач з дзіцем, яны адно цэлае, а мужчына не можа зносіцца з ім «без пасярэднікаў» у такія важныя для дзіцяці моманты... Калі б яна нават мне не сказала, я адчуў бы... У мужчын таксама ёсць інтуіцыя... Божа мой!

— Максім, можна я табе раскажу?.. Чаму я аборт не зрабіла... Я прыйшла да ўрача, мне падалося, я цяжарная. Так і было. Але, ведаеш, пакуль яны за-

паўнялі паперы, я сядзела на кушэтцы каля гінекалагічнага крэсла. Я не ведаю, наколькі ты ўяўляеш сабе гэтае прыстасаванне, але гэта рэч, побач з якой шкадуеш, што нарадзілася дзяўчынай. Там стаяла вядро з нейкімі інструментамі, жахлівымі крукамі. Як робіцца аборт — я ўяўляю толькі тэарэтычна. Мне стала млосна: я ўявіла, як мяне будуць вышкрабаць тымі крукамі.

Я яшчэ не ведала, ці я цяжарная, але стопрацэнтна ведала, што ніколі не аддам сябе і сваё дзіця на здзек аборту. Не ведаю, як каму, але мне прасцей нарадзіць і выхаваць дзіця, гэта прасцей для маёй псіхікі. Я, магчыма, не нашмат пражыла б сваё ненароджанае дзіця. Не магу шукаць апраўданняў Ірыне, бо сама я не зрабіла гэтак жа. Яна спужалася будучыні, неўладкаванасці жыцця... Вось бачыш, я ўжо пачынаю яе апраўдваць. Максім, я не ведаю, што я павінна сказаць, каб табе дапамагчы.

Максім сеў на ложак і закрыў твар рукамі. Таня села побач, яна не магла нахіліцца да яго — перашкаджаў круглы жывот. Але яна змагла заўважыць, як па ягоных руках сцякалі слёзы. Мужчынскія слёзы... Калі плача мужчына, то немагчыма ўявіць, якая невылечная крыўда яму нанесена. Калі мужчына бездапаможны, значыць, нешта не так у гэтым сусвеце.

Нарэшце ён падняў галаву і зірнуў на Танін жывот позіркам параненага звера, і ёй на сотую долю секунды стала страшна.

— Таня, прабач мне, прабач... — шаптаў ён.

— Максім, за што? — не зразумела дзяўчына.

— Я толькі зараз зразумеў, што ты робіш подзвіг. Самы вялікі подзвіг, які можа здзейсніць чалавек, ты ахвяруеш сваім жыццём, каб выгадаваць дзіця Стаса, — словы гучалі б занадта пафасна, калі б не былі такімі шчырымі.

— Ты забываеш, што гэта яшчэ і маё дзіця, — крыху абурылася Таня.

— Не, я памятаю... Таня, а можа, гэта лёс? — Максім павольна павярнуў твар да дзяўчыны ў пошуках згоды і падтрымкі.

— Што — лёс? — няўцямна паўтарыла Таццяна.

— Лёс дае нам шанц! Я згубіў сваё ненароджанае дзіця, а тваё ненароджанае дзіця згубіла бацьку, — хутка гаварыў Аспірант, каб яна не паспела запярэчыць.

— Не, не. Максім, гэта гавораць твае эмоцыі, — Таня нават усміхнулася, бо не ўяўляла сабе такога простага вырашэння ўсіх праблем механічнай заменай асоб.

— Урэшце, гэтае дзіця мне не чужое. Стас быў маім братам, хай мы не дужа сябравалі, але ўсё ж... Буду я дзядзькам яму ці татам, якая розніца? — Максім канчаткова вырашыў спрычыніцца да выхавання дзіцяці.

— Ну, Максім, нездарма далі табе мянушку Аспірант, гаворыш, бы доктарскую дысертацыю абараняеш! — Таня ўжо і не ведала, як яго спыніць.

— Я не пачуў адказу. Так ці не? — Максім пяшчотна ўзяў яе за руку.

— Максім, ты забываеш пра мяне. Я таксама чалавек. Я не магу выйсці за цябе замуж не кахаючы. Я нават за Стаса замуж не пайшла, — нагадала Таня.

— Ты кахала Стаса? — раптам спытаў Максім.

— Кахала. А ты кахаеш Іру? — у адказ пацікавілася Таццяна.

— Ты лічыш, у такой сітуацыі могуць захавацца нейкія пачуцці? Нават Стас цяжарную — цябе — за Дзеву Марыю лічыў, нават Стас.

«За Дзеву Марыю?» — у думках спытала сябе Таня. Напэўна, так і было. Ён уляцеў у пакой не пастукаўшыся, трасянуў яе за плечы і раззлавана спытаў: «Гэта праўда, што ты цяжарная?» Таня скінула ягоныя рукі і годна кіўнула. А ён усміхнуўся, задаволена пашкроб патыліцу і радасна прапанаваў: «Дык, можа, ажэнімся?» Яму, напэўна, зда-

валася, што зараз яны прымірацца, яна ўсё даруе і жыццё пачнецца наноў, але Таня стомлена адказала: «З Веранічкай ажаніся!» Пасля яна тысячу разоў успамінала гэтую дурную адмову. Калі б яна тады згадзілася, невядома, як бы склалася жыццё, але, вядома ж, горш быць не магло б. У памяці часта ўсплываў Стас, злосны ў самым пачатку і пад канец такі амаль безабаронны са сваёй прапановай. Відавочна, што ажаніцца ён наважыўся адразу, як даведаўся пра яе цяжарнасць, але тады адкуль злосць?

— А гэта ж быў Стас! Дык няўжо ж я бяздушны?! Ты павінна зразумець: мы са Стасам браты, мы вельмі падобныя.

— Ага, проста блізняты, — аджартавалася Таня.

— Ты не зразумела. Знешне мы розныя, толькі што рост «агульны». Але я чамусьці думаю, што ты кахала не ягоныя прыгожыя вочкі і галівудскую ўсмешку, — сказаў Максім, усміхаючыся.

— У цябе таксама нядрэнная, — Таня зразумела, што ён напрошваўся на камплімент.

— Вось бачыш, а ты казала: непадобныя. Стас нічога не гаварыў пра нашу сям'ю? — спытаў Максім, каб расказаць нарэшце ўсё, што так хвалявала яго брата.

— Вельмі мала. А што? — крыху занепакоілася Таня, якая сапраўды ведала толькі пра двух мужоў іх маці.

— Ну, то я раскажу. Як ты ведаеш, мы браты па маці, у нас розныя бацькі. Як ты разумееш, я старэйшы. Мама зацяжарыла і мела няшчасце пасварыцца з маім бацькам, якога вельмі кахала. Але яна не зрабіла аборту! Ёй было 19 год, узрост вельмі легкадумны, і яна выйшла замуж за лепшага сябра майго бацькі. Той ведаў пра цяжарнасць і ўсё адно ажаніўся. Што было з маім бацькам, калі ён даведаўся! Ён быў хлопец настойлівы, і чакаў зорнай хвіліны. Маці нарадзіла мяне, праз два гады — Стаса. Я дакладна не ведаю, што там адбылося, але яна

сабрала свае рэчы, узяла пад пахі дваіх дзяцей і пайшла жыць да майго бацькі.

Вось так мы і жылі, у нядзелю прыязджаў Сяргей Антонавіч, браў Стаса, тата даставаў санкі ці веілк (у залежнасці ад пары года), браў мяне, і мы ўчатырох ішлі гуляць. Нейкая шведская сям'я. На святы мы збіраліся разам, Сяргей Антонавіч прывозіў жонку і дачку. Было весела, але...

Горш за ўсіх было Стасу. Мама не разумела, што разбіла нам жыццё. Стас не разумеў, чаму я магу жыць з мамай і татам, а ён — не. Мне ж было няёмка, што мой тата заўсёды побач. Напэўна, таму мы сталіся рознымі. Аднолькавая энергія, здавалася б, але да чаго яна давяла Стаса і як выкарыстаў яе я? Чаму я Максім-Аспірант, а мой брат Станіслаў не Слава, а Стас? Вось я і кажу, што мы аднолькавыя і адначасова розныя.

— Чаму ён мне не казаў пра свае перажыванні? — Таня заўсёды бачыла Стаса вельмі самаўпэўненым, хлопцам, у якога не было ніякіх праблем.

— Яму была непрыемная гэтая гісторыя. Ён помсціў усім за тое сваё гора і помсціў да апошняга дня. Таму ён быў такім калючым, — даў сваю версію Аспірант.

— Тым больш! Калі яго нешта непакоіла, ён проста павінен быў мне гэта сказаць! — Таня з сумам падумала, што Стас так ніколі не давераўся ёй, каб не шкадавала, калі яны былі разам, і каб не скарыстала, калі разыдуцца.

— Не хвалюйся так, а то я ўжо шкадую, што сказаў табе, — Максім занепакоена зірнуў на яе жывот.

— Не, не. Усё правільна, — Таня скрывіла твар, бо дзіцятка чуйна рэагавала на маміныя перажыванні.

— Я не пра Стаса хацеў гаварыць, а пра нас, — Максім вярнуўся да пачатку размовы.

— А? Што? — Таня так задумалася пра свае адносіны са Стасам, што прапусціла яго словы.

— Ты мяне нават не слухаеш! Таня! Ты згодна быць маёй жонкай? — з усмешкай спытаў Максім, упэўнены, што Таня адразу пагодзіцца.

— Дай тры гады падумаць, га? — паспрабавала выкруціцца Таня.

— Даю! — хлопец не паказаў, што адказ яго здзівіў.

— Цудоўна! Праз тры гады прыходзь, — Таня з задавальненнем адзначыла, што ўдала выкруцілася з няёмкай сітуацыі.

— Я прыду раней! — паабяцаў Максім.

— Прыходзь, калі хочаш, толькі зараз мы павінны вярнуцца да тваіх гасцей, імяніннік!

Яны павольна ішлі па калідоры, Максім маўчаў, і Таня думала: «Дарма я сябе цешыла! Стас не кахаў мяне, калі не расказаў пра самае галоўнае ў яго жыцці».

— Максім, я не знайшла нідзе свайго фотаздымка. Ты ведаеш, Стас яго заўсёды ў заплечніку насіў. Значыць, там быў нехта яшчэ. Яны хутчэй за ўсё пасварыліся. Максім, я шмат думала і я ведаю, дакладней, мне здаецца, што я ведаю, хто гэта зрабіў.

— Хто? Скажы мне? — Аспірант сам бы, здаецца, забіў, калі б Таня назвала імя.

— Прабач, я не маю права! А раптам я памыляюся?! Пачакай крыху.

Калі яны ўвайшлі ў пакой, Юра-Трасянка ўспамінаў жарты Стаса наконт Валіка:

— Валік выклікаў у Стаса вялікае пачуццё. І гэта не на шчасце нашаму «тлушчавіку»! Ха! Гэта слова таксама Стас прыдумаў.

Валік няўмела рабіў выгляд, што яму таксама смешна. Яго белыя броўкі рухаліся, змагаючыся з крыўдаю, імітуючы смех.

— Калі ласка, панове! Другая мянушка Валіка — «На табе булачку»! Але гэта так, драбяза! — Юра пахітаў рукой перад тварам, нібы ён нешта хоча спыніць.

— Стас рабіў Валіку цудоўны камплімент! О-о, болей не магу! Ён хваліў, маўляў, цябе, Валік, даіць можна! А яшчэ шыкоўна... Пачакайце... Як жа... А! «Валік, калі я стану старым і на мяне дзеўкі глядзець не будуць, я цябе паклічу, каб хоць за грудзі патрымацца!» — спарадзіраваў Юра.

Усе разрагаталіся, а ў Валіка на вейках павісла слязінка, якую ніхто, акрамя Тані, не заўважыў. А Юра ўсё не сунімаўся:

— А вось сапраўдны шэдэўр Стасавай думкі! Ён называў Валіка, нашага надзвычай пяшчотнага Валіка (ад сораму і крыўды Валік моцна заплюшчыў вочы, нібы чакаючы ўдару, і ён дачакаўся), Стас называў яго Валечка! Наша Валечка!

Таня ніколі не бачыла такога прылюднага катавання, і яна разумела, чаму Валік не гарэў сяброўствам да Стаса і чаму ён так акрыяў пасля смерці свайго ворага. Але колькі такіх ворагаў шчэ будзе! Усе ж не загінуць.

У гэты момант Ірына, на якой вамп-макіяж ператварыўся ў вамп-маску (чырвоныя вочкі, чорныя вусны, размазаная туш), выцягнула Таню ў калідор, не даўшы даслухаць.

— Што гаварыў пра мяне гэты слімак? — горда ўзняла галаву дзяўчына.

— Мы гаварылі пра Стаса! — абурылася Таня за «слімака». Яна мела дзіўную звычку абурацца за іншых, калі некага крыўдзілі пры ёй. Яна крыху памаўчала і не ў тэму дадала:

— Ты не кахаеш Максіма.

— Ён такое ж быдла, як і твой Стас!

— Ты проста яго не кахаеш! — шчасліва паўтарыла Таня.

— Чым я сябе выдала, пан дэтэктыў? Стаса ж забілі, мне Валера расказаў пра твае пошукі! Ох, Ста-ас! Не адна ты, Танюша, была ў палоне яго чорных вачэй, паўінтэрната млела ад яго. І да цябе, і пры табе, і пасля цябе! — пакпіла Ірына.

— Я кажу зараз не пра Стаса, — паспрабавала павярнуць размову Таня.

— А за што яго, Аспіранта, кахаць? Ён мяне цікавіць толькі як бляклая копія Стаса! Яны падобныя, але Стас быў прыгажун, а Максім — звычайны, прапанову мне сёння рабіў, ледзь не плакаў,— Іра ўжо бессаромна выдавала свае таямніцы.

— А ты можаш кахаць не толькі за знешнасць? — абурылася Таня.

— Ты прапануеш мне кахаць яго за розум? — п'яна разрагаталася Ірына. — За розум кахаюць толькі тыя, каго кахаюць за розум, цябе, напрыклад. Толькі вось не ведаю, нашто Стасу спатрэбіўся твой розум! — Іра ўжо плакала. Не столькі ад успамінаў, колькі ад болю: вакуум-аборт аказаўся не такім бяскрыўдным, як яна сабе ўяўляла. Лекі перасталі дзейнічаць, і цяпер у яе было адчуванне, што яна памірае.

Каб не працягваць гэты пачуццёвы стрыптыз далей, Таня прывяла Іру ў іх пакой і паклала спаць не распранаючы.

Калі Таня вярнулася ў пакой Аспіранта, яе пяшчотна прыціснуў да сцяны Валера-футбаліст і пачаў спавядацца:

— Тань, я не забіваў Стаса! Клянуся!

— Ды я ведаю! — дзяўчына не ўяўляла, як выслізнуць з гэтых абдымкаў, якія Валера разлічыў для цяжарнай.

— Не, я скажу! Я баяўся, што ты матыў знойдзеш, а для мяне футбол — усё. Большага матыва знайсці нельга, таму я і не хацеў, каб ты шукала. Хлопцаў падгаварыў... А Валік шасцёрка! Не крыўдуй, Тань. Ты ж усё адно не знайшла... А так бы да мяне прычапілася.

— Валерка, гэта ты да мяне прычапіўся! Пусці!

Таня адпіхнула хлопца і зайшла ў пакой. Аспірант стомлена пазіраў на сваіх гасцей, лежачы на ложку. Імяніннік патрэбны толькі на пачатку свята. А далей можна самім. Хлопец запытальна паглядзеў на Таню, але яна паціснула плячыма, маўляў, яшчэ не ўпэўненая.

Юра-Трасянка расказваў ужо каторую гісторыю з жыцця Стаса. Нечакана ён спыніўся і папрасіў Веранічку прынесці яму вады, простай вады. А сам працягваў расказваць. Героямі наступнага жаху былі Стас Зварын і Даніла Ручка.

— Вось узнагародзіў бацька прозвішчам! Ручка! Ножка! А Стасу толькі дай да чаго прычапіцца. Дарэчы, з Даніка прыемней здзекавацца, бо ён крыўдзіцца. Валік нармальна да ўсяго ставіцца. А Данік віруе, злуецца. А нічога зрабіць не можа. Толькі пасквілі, паэмкі пісаў, але і Стас не зломак. Слухайце, што ён напісаў:

Ішоў паэт
Даніла Ручка.
Ён склаў санет
«Кабель і сучка».

І быў яшчэ такі мужчынскі жарт, прабачце, дзяўчаты. Стас казаў: «Данік, ты пры мне штаны шырынкай назад не апранай!»

Сэрца Тані сцялася ад болю і шкадавання да Даніка. Якім жа жорсткім быў Стас! Як праз туман да яе даляцеў голас Юры:

— Але мне найбольш падабаецца Стасава фраза: «Я — active, Валік — passive, а Данік — universal».

Тані здалося, што яна зараз кіне ў Юрыка талерку ці што-небудзь іншае з посуду, але нават гэта не спыніла б гаваркога хлопца.

За вадой для Юры-Трасянкі Веранічка пабегла чамусьці на кухню. Там ўжо нікога не было, толькі галодны Данік варыў бульбу і пісаў чарговы верш.

І тут з'явілася Веранічка. Данік не змог ацаніць, была яна апранута добра ці дрэнна, ён бачыў толькі, што мала. Яна села на ягоныя паперы:

— Што піша паэт?

— Верш, — задрыжэў Данікаў голас.

— Пра мяне? — яна падсунулася бліжэй. Данік ліхаманкава ўспамінаў усё, што расказваў яму пра секс Санька, бо разумеў, што прыйшоў час яму страціць цнатлівасць. Ягоная нявіннасць вісела над ім дамоклавым мячом, але ён гэтак жа баяўся сексу, як і чакаў яго.

Спадніца была занадта кароткай, Данік спрабаваў адвесці вочы і не мог. «Дык вось як гэта выглядае!»

Ён падняў руку і хацеў пакласці ёй на калена, нечага спужаўся і адвёў. Але Веранічка сама злавіла ягоную далонь і паклала пад спадніцу. І тут Данік падумаў, што яшчэ хвіліна — і ён згубіць прытомнасць ці памрэ ад разрыву сэрца. А бацькам скажуць, што памёр ад сексуальнага напружання. Сорам! Ганьба!

Ён разумеў, з якой мэтай прыйшла Веранічка і баяўся, што яна ўсяго толькі выпрабоўвае яго. Яму зусім не хацелася сексу на кухні, куды ў любы момант маглі зайсці, хоць дзяўчына і прычыніла дзверы. Яму па-іншаму ўяўляўся гэты дзень пачатку яго мужчынскага жыцця. Сказаць пра гэта Веранічцы? Засмяе!

Ён не ведаў, з чаго пачаць, якім трэба быць: нахабным ці пяшчотным? На шчасце, яму хапіла розуму застацца самім сабой. Данік узяў яе руку і пацалаваў. Веранічка чакала чаго заўгодна, але толькі не гэткага рыцарства. Яна зразумела, што зараз будзе мець магчымасць удзельнічаць у «класічнай любоўнай сцэне з цнатлівага савецкага фільма». І яна ўспомніла, што ніводзін з яе шматлікіх хлопцаў не цалаваў ёй рукі.

Данік разумеў, што трэба пацалаваць яе, але проста не ўяўляў, як гэта зрабіць. І яна сама пацалавала яго. З Данікавага рота пахла малаком, як пахне з рота ў немаўлятак. Гэтае параўнанне здалося ёй вельмі смешным, але не хацелася крыўдзіць паэта смехам.

Яны цалаваліся, ён няўмела абдымаў Ніку. І Веранічка нарэшце зразумела, што прайшло паўз яе ў гэтым жыцці. Але яна гэтак жа разумела, што ніколі ўжо не зможа стаць іншай. Пацалункі-абдыманкі яна прайшла шчэ ў восьмым класе, а Данік лічыў немагчымым дакрануцца да яе грудзей. Бульба падгарэла, і Веранічка першая гэта ўчула, яна паказала Даніку на каструлю, жартоўна пацалавала ў нос і выйшла з кухні, сутыкнуўшыся ў дзвярах з Таняй. Данік задуменна стаяў каля пліты, вячэра не атрымалася, кішкі гралі марш, галава кружылася, было не да вершаў і жахліва хацелася ў прыбіральню... Голас Тані вярнуў яго з эратычных трызненняў:

— Віншую, Данік, з Веранічкай.

— Ты падглядала? — чамусьці спужаўся хлопец.

— Данік, нам трэба сур'ёзна пагаварыць! — сумна сказала дзяўчына. — Данік, гэта ты забіў Стаса, і не апраўдвайся.

— Я не забіваў яго! — скрывіў твар паэт.

— Не перапыняй мяне. Спачатку я скажу, чаму я так думаю. Данік, ты не можаш адмаўляць, што ты не любіў Стаса. Ты яго ненавідзеў. Стас, дзе мог, заўсёды абражаў цябе, здзекваўся, а ты, маючы тонкую душэўную арганізацыю, — Таня не ўтрымалася ад іроніі, — ледзь стрымліваўся, каб не пабіць яго. Але было б смешна накінуцца на яго, ён утрамбаваў бы табой сцяжынку, па якой хадзіў ва універ. І ты вырашыў узяць яго ў аблогу! А я была інструментам! Я верыла толькі табе, бо лічыла, што няма большага ворага, чым лепшая сяброўка. І менавіта

табе я скардзілася на Стаса, толькі табе. Ты ведаў тое пра Стаса, чаго не ведаў сам Стас, тое, што расказала табе я. І твае вершы, якія даводзілі Стаса да вар'яцтва, грунтаваліся менавіта на тым, што не змагла схаваць я. Я занадта позна зразумела ўсё гэта, а Стас зразумеў рана, ды не ў час. Я правільна кажу?

— Я не забіваў яго! — амаль плакаў Данік.

— Не смяшы! Ты прыходзіў да мяне кожны дзень, пакуль я была са Стасам. Пасля яго смерці ты за чатыры месяцы прыйшоў два разы: у дзень смерці Стаса і вось нядаўна вершы чытаў. Мне яшчэ цікава, адкуль Стас даведаўся, што я цяжарная. Па вачах здагадаўся? І можа, менавіта таму ён і не так моцна абрадаваўся, бо пачуў гэтую навіну ад некага, вельмі непрыемнага яму? Але, Данік, не толькі ты скарыстаўся нашым з табой сяброўствам. Памятаеш, ты мне паказаў, як ты ў матрац хаваеш свой сшытак з вершамі? Прабач, але я заглянула туды ўчора. Ты не хочаш даведацца, што я там знайшла? Фотаздымак, Данік! Мой фотаздымак! Які заўсёды быў у Стаса! Вось зараз можаш гаварыць, Данік!

— Я не забіваў яго, Таня! Ты не паверыш! Мы сустрэліся выпадкова. Ты ведаеш Стаса... Прычапіўся да нечага... Слова за слова... Ён жа быў, няйнакш, хворы на галаву... Калі раззлуецца, гатовы забіць ні за што... Даруй, я яго табой папракнуў. А ён крычыць, каб увесь свет чуў, бегае, мітусіцца па снезе... Фатаграфію тваю дастаў, лаяўся на цябе, што ты ўсё мне расказвала. Гэта ён сапраўды рана зразумеў. Фатаграфію ён кінуў мне ў твар, я падняў і запіхнуў у кішэню. Стас яшчэ больш пачаў крычаць... А там люк быў... Стас не на мяне кідаўся, ён ад мяне... Спінай.. Я не забіваў яго! Я толькі не спыніў яго, не папярэдзіў... Ён быў такі высокі, дужы. Я быў упэўнены, што праз хвіліну ён вылезе адтуль і прыб'е мяне за тое, што я бачыў яго ганьбу... І калі ён зваліўся, я пабег... Мне трэба было

крыкнуць, што за яго спінай люк. А я не крыкнуў... Даруй мне... — заплакаў Данік і схапіў Танiны рукі.

— Пусці! — бяссільна папрасіла Таня.

Ад дзвярэй кухні нячутна адышоў Аспірант. Праз некалькі хвілін Таня адшукала яго.

— Я думала на Даніка. Ён быў там, але ён не вінаваты! — з трывогай яна зазірала ў вочы Аспіранту, бо лёс Даніка залежаў цяпер ад яго.

— Таня, я чуў, я ўсё чуў. Я веру Даніку, не хвалюйся. Ужо нічога не зробіш. Стаса не вернеш. Я толькі пра адно думаў, раскажаш ты мне ці не! Таня, што ты скажаш наконт маёй прапановы?

— Мне ці Ірыне? Дзве прапановы за адзін дзень! Ці не зашмат? — усміхнулася Таня і адмоўна пахітала галавой.

...І яны раз’ехаліся на лета. Аспірант пабыў тры дні з бацькамі, а потым узяў білет і праз некалькі гадзін стаяў перад Танінай кватэрай. Яе мама здзіўлена адчыніла дзверы незнаёмаму хлопцу.

А суседка, заўважыўшы праз акно, як Таня і Максім ідуць, трымаючыся за рукі, сказала мужу:

— Адумаўся, гад, прыехаў за ёй. А то хлусілі: загінуў, загінуў!

## СПРОБА НАПІСАЦЬ ДЭТЭКТЫЎ

### Апраўданне грэшнага чалавека

Менавіта спроба. Бо дэтэктыва ў чыстым выглядзе не атрымалася. Можна нават сказаць, што дэтэктыўная лінія ў «Забойстве ў студэнцкім інтэрнаце» слабая, невыразная і распадаецца пры чытанні. Як банальна я прыпляла гэты фотаздымак! Як шмат розных недарэчнасцяў!

І, самае галоўнае, я парушыла адзін з запаветаў для аўтара дэтэктыва: абавязкова павінна быць забойства. А ў мяне атрымалася, што фактычна Стас сам уваліўся ў каналізацыю. На першы погляд. На самай жа справе, забойства было. Калі ўявіць, што Стас быў там не з Данікам, а з любым іншым жыхаром інтэрната, то відавочна, што ён не загінуў бы.

Данік — вельмі эмацыянальны чалавек, але ягоныя пачуцці не знаходзяць іншага выйсця, акрамя твораў. А гэтага, відавочна, недастаткова. Даніку хапала пакутаў і без Стасавых здзекаў. Зварын жа проста стварыў дадатковы ціск на псіхіку Данілы.

Данік забіў. Бо ён быў адзіным чалавекам у інтэрнаце, хто не папярэдзіў бы (і не папярэдзіў) Стаса пра люк за спінай.

Пакрыўджаны Стасам Валік крыкнуў бы пра люк, нягледзячы на ўсе абразы, бо вызначальная рыса яго характару — дабрыня і цярплівасць. Ён гатовы плакаць ад жорсткіх жартаў, але ў яго галаву не прыходзіць думка, што можна неяк адпомсціць ці хаця б супрацiўляцца такому гвалту.

Ірына таксама б не змаўчала, бо выратаваць Стаса хаця б ад купання ў каналізацыі — значыць, паказаць ягоную слабасць. І гэта таксама помста.

Астатнія героі і гераіні папярэдзілі б Стаса, ды яшчэ такім чынам, каб ён не пакрыўдзіўся. Як я ўжо напісала, толькі Ірына падкрэсліла б, што робіць ласку.

Чужая душа — загадка, нават калі гэта душа прыдуманага мною героя. Але я ўпэўненая, што ў нейкую сотую долю секунды Данік пажадаў Стасу смерці. Людзі, здараецца, крычаць ці думаюць «Я яго заб'ю!», а на самай справе не жадаюць ні забойства, ні яго наступстваў (маюцца на ўвазе не судовыя, а эмацыянальныя).

Данік жа быў даведзены да такой ступені пакрыўджанасці і абражанасці (на яго думку), што заставалася толькі чакаць выбуху. Калі б не люк, Данік ляснуў бы Стаса цаглінай па галаве, ці спіхнуў бы з балкона, ці... Магчыма безліч варыянтаў.

## Прага крыві

Чаму людзі пішуць дэтэктывы? Ім альбо ёсць, што сказаць (калі пішуць міліцыянеры), альбо ёсць, каго забіць. Напрыклад, маецца вораг ці проста непрыемная асоба. Аўтар забівае свайго героя, потым шкадуе яго і пераносіць такія свае пачуцці на прататып. Так што я нікога не збіраюся біць цаглінай па галаве... Я проста напішу пра тое, як нехта быў стукнуты цаглінай.

Данік не пісаў дэтэктываў, таму прамаўчаў, калі Стас рабіў апошні крок да люка. Апраўданне Даніка перад Таняй — ненатуральнае, штучнае, хлусня. Гэта тыя словы, якія хацела пачуць Таня і я, бо, у рэшце рэшт, мне бязмежна шкада Даніка. Менавіта таму ў апошні момант я зрабіла яго крыху невінаватым. Я страшэнна пакутую ад неабходнасці кагосьці

забіць, таму мой герой Стас Зварын нібыта заслугоўвае гэтай кары. Але за што пакутваць Даніку?

Данік збег не таму, што чакаў, што Стас вылезе з люка і прыб'е яго, а каб не чуць крыкаў (калі яны будуць) і каб жыць свабодна (калі б Стас выжыў, сумняваюся, што ён абражаў бы каго-небудзь. Кожны мог бы напомніць яму пра каналізацыйныя прыгоды) і з чыстым сумленнем (нічога не чуў, не бачыў і ўвогуле, мяне там не было).

Чамусьці мне думаецца яшчэ, што не змагла б Таня здагадацца пра злачынства Даніка па ягоных паводзінах. Такія людзі выдумляюць сабе легенду здарэння і шчыра вераць у яе. Але гэта толькі маё меркаванне. Праяўленні чалавечага характару нельга ўкласці ні ў якія схемы.

Я не ведаю, да якой ступені гневу ці крыўды трэба дайсці, каб забіць чалавека. Хутчэй за ўсё гэта справа індывідуальная. Але, каб перастрахавацца, каб стварыць умовы для падазрэння кожнага з герояў, каб завочна апраўдаць Даніка, я перагрувасціла твор рознымі Стасавымі грахамі, каб чытач падумаў, што такога і трэба было забіць. Але Стас — чалавек, значыць акрамя людзей, якія яго ненавідзяць, ёсць людзі, якія яго любяць ці шкадуюць: Таня, Аспірант, Веранічка, Валік, Валера...

### Падман

Я даволі нядрэнна малюю, па маіх малюнках відаць, што намалявала іх я, а не хто-небудзь іншы. Значыць, маю ўласны почырк. Спадзяюся, што з літаратурнымі спробамі станецца тое самае. Але я нездарма пачала гаворку пра маляванне.

Я малюю толькі людзей. Магу нават удакладніць, толькі дзяўчат. Але гэта неістотна. Проста іх цікавей маляваць. У фігуры жанчыны больш разнастайнасці, чым у мужчынскай, як мне здаецца. Такім чынам, для мяне істотна форма. Пры адпаведным

творчым падыходзе нават ненатуральна перакручаныя целы з надзвычайнай плаўнасцю ліній здаюцца настолькі прыгожымі, што не зважаеш на штучнасць. Так што дэтэктыў для мяне толькі форма, якой я прытрымліваюся настолькі, наколькі мне гэта зручна. А мне гэта зусім нязручна, і я падманваю чытача, абяцаючы назвай інтрыгу і не даючы яе. Ці даючы не ў такой ступені, як гэта пажадана.

Канешне, было б натуральна паказаць, як усё разблытвае міліцыя, але я не ведаю яе працы. Значыць, мне трэба было абысціся без яе. Ды мы жывем не ў сярэдневякоўі, і без міліцыі немагчыма. Тады мне трэба было неяк выключыць яе з разблытвання сітуацыі. І ў мяне гэта амаль атрымалася. Але трэба было даць Тані нейкі намёк на невыпадковасць смерці Стаса. І я прыпляла гэты фотаздымак. Гэта была адна з апошніх сцэн, якія я напісала, хоць у тэксце яна адна з першых.

Чаму ж я малюю толькі жаночыя постаці? Таму што мужчынская фігура не дазволіць мне такога багацця колераў! А колер — яшчэ больш важны для мяне, чым форма. Таму ў маіх малюнках найвялікшая ахвяра — змест. І ўвогуле, я найчасцей малюю кавалкі: ножкі, ручкі, боты на абцасах... Я не маю патрэбы ў цэласным малюнку. З літаратурным творам такія эксперыменты недазваляльныя. Але сябе не пераробіш, і найперш я напісала сцэны пра Веранічку і акцёра, Таніна апраўданне, чаму яна не зрабіла аборт (спачатку я планавала, што ў мяне ўсё ж будзе міліцыя, якая абвінаваціць у забойстве Таню, і яна тлумачыць міліцыянерам, што не змагла забіць нябачанае ёю дзіцянятка, дык як жа яна магла забіць свайго каханага чалавека), потым інтымную сцэну між Аспірантам і Ірынай, да якой я затым дапісала пачатак пра дыскатэку, потым сцэна плачу Аспіранта з нагоды Ірынага аборту... І раптам аказалася, што я не магу злучыць гэтыя асоб-

ныя кавалкі (пра прычыны чытайце ў частцы «Не вінаватая я»).

У чым жа падман? У любым дэтэктыве аўтар крыху падманвае чытача. Дэтэктыў — гэта падман. Я ж падманваю двойчы. Калі я ўжо напісала свой дэтэктыў (хоць я ўжо патлумачыла, што гэта не зусім дэтэктыў, а хутчэй твор з дэтэктыўнымі элементамі, не магу адмовіцца ад гэтага жанравага азначэння, бо не прыдумала нічога іншага) і перачытала яго, я зразумела, што знешняга раскрыцця забойства ў мяне няма. Я даручаю чытачу самому ва ўсім разабрацца, з гэтай мэтай я «падстаўляю» яму кожнага з герояў праз сны, успаміны, праз аповеды іншых асоб. І я спужалася, што ў мяне ў тэксце так мала фігуруе Таня, якая і павінна была ўсё разблытаць. Я зразумела, што ўвесь твор чытач будзе адзінокі ў сваіх падазрэннях. І што Таня ў якасці дэтэктыва зноў з'яўляецца ў самым канцы. Але я ўжо не магла дапісаць Таню прывідам у кожны эпізод. І тады я, ужо моцна запалоханая сваімі страхамі, успомніла два дэтэктывы, дзе няма знешняга разгортвання следства, аўтары Элеры Куін і Джой Дэксанкар. Комплекс творчай непаўнацэннасці адразу знік. Я падкрэсліваю, што я не брала чужых ідэй. Я імі скарысталася, каб апраўдацца. І яшчэ хачу адзначыць, што мой твор як дэтэктыў пісаўся сам сабой, асаблівую ўвагу я надавала дробязным сітуацыям, якія нічога нават не дадавалі да разблытвання.

## Проста дэтэктыў

Дэтэктыў як жанр, на маю думку, мае другое дно. Самае важнае ў дэтэктыве — галоўная інтрыга. Менавіта таму ў дэтэктыве (жанры масавай літаратуры) зусім не істотныя мастацкія вартасці. Усе сродкі, якія так цэняцца ў высокай літаратуры, тут толькі службі. Мова, вобразы — усё дробязі (хоць, канешне, і іх дасканалая распрацоўка не зашкодзіць). Там

не патрэбны аніякія складанасці і разважанні агульначалавечага характару. Можа, у гэтым сакрэт папулярнасці? Любы чалавек, хай ён нават асоба найразумнейшая ці філосаф у восьмым пакаленні, не зможа адарвацца ад добра змайстраванага дэтэктыва. А творы гэтага жанру менавіта майструюцца. Аўтару трэба ўсё ўлічыць, бо калі ягоны pazzl не складзецца і чытач не ўбачыць правільна злучаную мазаіку, ягонае абурэнне не будзе мець межаў.

І мне будзе вельмі шкада, калі ў чытача народзіцца такое адчуванне пасля прачытання майго дэтэктыва. Вось я нарэшце магу казаць пра другое дно дэтэктыва (першае — сама разблытаная інтрыга).

Чытач, калі ён не ставіць за мэту аддзяліць дэтэктыўнае мяса ад дэтэктыўных касцей, звычайна моцна захоплены вонкавымі падзеямі. І пісьменнік можа гэтым ўдала скарыстаццца. Любая, нават самая крамольная думка праглынецца пад такі акампанемент. Праглынецца і будзе засвоена па-за свядомасцю. Праглынецца незаўважаная. У гэтым небяспека для чытача, але я па іншы бок барыкады. Гэтак жа самую жахлівую ідэю можна схаваць у інтымную сцэну, пажадана, каб яна была вельмі падрабязнай і натуралістычнай. Эстэтычнае і маральнае абурэнне не дазволяць чытачу глядзець на змест аб’ектыўна.

І ў гэтае другое дно я ўклала ўвесь жах інтэрнацкага жыцця. Канешне, «інтэрнатаўцы» са мной не пагодзяцца. Я ніколі не жыла ў такіх умовах, на момант напісання твора я толькі тройчы была ў інтэрнаце і ведаю яго больш па аповедам сябровак. А расказваліся, вядома ж, самыя экзатычныя, уражальныя эпізоды, адпаведна падрыхтаваныя і яшчэ больш расфарбаваныя маім уяўленнем.

## Збор плётак, або Сметніца

Першыя мае чытачы, знаёмыя з жыццём студэнцкага інтэрната, абвінавацілі мяне ў тым, што твор поўнасцю (!) складаецца з рэальных гісторый і што яны нават пазнаюць прататыпаў. Сапраўды, некаторыя гісторыі адбываліся ў рэальным жыцці, але кожную з іх я перапрацавала так, што зараз сама не ведаю, што я прыдумала, а што было на самай справе.

Каб пазбегнуць новых абвінавачванняў, я прыводжу спіс нявыдуманых мной сітуацый:

— хлопец зваліўся ў люк (праўда, гэта быў люк цепласетак, чалавек зварыўся);

— выпадак з Веранічкай, калі яе, п'яную, зацягнулі ў прыбіральню. (Дакладна ведаю, што тазік перад яе тварам трымалі, вось толькі не памятаю, ці званітавала яна ў прыбіральні.)

— Веранічка і акцёр. (Я толькі дадала падрабязнасцей.)

— Аборт нейкай дзяўчыны ад Марэка. (Расказвалі, як дзяўчына зацяжарыла ад іншаземца і зрабіла аборт.)

— Гісторыя пра тое, як Валера кахаўся з Аленкай, калі ў пакоі спала Ліля. (Дзяўчына-прататып сапраўды спала дзіцячым сном.)

Адзін мой аднакурснік паведаміў мне:

— Ведаю я, хто хлопцаў у прыбіральню водзіць! Алена***.

І немагчыма было даказаць, што я не ведаю гэтай Алены***. І што я мела іншых прататыпаў. Але аказалася, што цалкам прыдуманыя мною гісторыі таксама адбываліся, што маюцца ў інтэрнаце паненкі, якія аддаюць перавагу сексу на кухні. А мне сцэна з Данікам і Веранічкай здавалася ці не адкрыццём. Знайшоўся і «прататып» Стаса, пра якога я ніколі нічога не чула.

## Я і яны (героі)

Амаль усе хлопцы мелі прататыпаў. Але часта пры напісанні твора я так змяняла вобраз, што пазнаць рэальнага чалавека стала немагчыма. Мне неабавязкова было браць гатовыя характары, я магла б іх проста прыдумаць, як я зрабіла гэта з гераінямі. Але мне падалося вельмі смешным выкарыстанне характараў хлопцаў, якія былі побач. Тым больш што характары прыдаліся вельмі дарэчы. Калі б іх не было, я выдумала б іх такімі. А вось дзяўчат такіх я не ведала, таму мне прыйшлося цалкам ствараць іх, запазычваючы пэўныя рысы ад маіх знаёмых. Так што я магу гарантаваць іх «эксклюзіўнасць». Але я нездарма назвала гэты раздзел «Я і яны». Наколькі ж яны — я, а наколькі я — яны?

Мае сяброўкі былі ўпэўненыя, што прататып Тані — я, маўляў, гераіня выказвае ідэі і меркаванні, якія вызнаю я сама. На гэта я адказала, што ўсе ідэі, якія выказваюцца кожным з герояў — мае. І нельга так суадносіць, а калі б я выказала пэўныя свае думкі праз Даніка, няўжо яны сказалі б, што я забойца?

Пісала я недзе месяц, але «жыла» ў гэтым інтэрнаце нашмат даўжэй. І калі я скончыла твор, я амаль паверыла, што ўсе героі існавалі.

Ёсць пэўныя праблемы з вобразам Тані: урэшце, дзяўчына атрымалася занадта плоскай, невыразнай, бляклай у сваёй правільнасці. З асаблівай увагай трэба было размясціць усе падзеі ў часе, каб Таня паспела зацяжарыць і каб у мяне было некалькі месяцаў на само расследванне. Я вылічвала ўсё ледзь не па днях. А потым злавіла сябе на думцы, як смешна выглядае збоку вылічванне месяцаў чужой цяжарнасці.

Аспірант — вобраз цалкам прыдуманы, калі не лічыць інтымнай сцэны з Ірынай, дзе ён чытае вер-

шы Арцюра Рэмбо па-французску. Мае сяброўкі і я неяк у размове выйшлі на жарт наконт аднаго з нашых выкладчыкаў, маўляў, ён так добра ведае сімвалізм і французскую мову, што нават у ложку са сваёй дзяўчынай будзе чытаць вершы Рэмбо. Напэўна б, я не расказвала тут пра гэта, але ўсё адно ўсе яго пазналі. Таму я падкрэсліваю, што ўсе астатнія рысы Аспіранта ніяк не звязаны з гэтым выкладчыкам.

Мне ўказвалі, што чытанне вершаў Рэмбо ў ложку — «сентыментальныя соплі», так уласцівыя жаночай прозе. Але праблема нашмат шырэйшая, чым простае чытанне вершаў. У гэтай нячуласці Аспіранта да Ірыны і ў яе няшчырасці з ім вымалёўваецца іх разрыў. Аспірант гэткі ж правільны, як і Таццяна.

Веранічка. У гэты вобраз, як у сметніцу, я запіхвала ўсе самыя пікантныя падрабязнасці інтымнага жыцця інтэрната.

Валік — вобраз, якім я, магчыма, пакрыўдзіла ўсіх нехудых хлопцаў. Гэтак жа сама, як і вобраз Веранічкі, Валік створаны з рысаў вялікай колькасці людзей. Я плакала, калі пісала пра тое, як Стас абражаў Валіка. Зараз гэта гучыць смешна, але так было на самай справе. Мне здавалася, што я здзіраю скуру са сваёй спіны. Не ведаю чаму, але адчуванне было менавіта такое. Валік як вобраз вельмі мне падабаўся, але я з самага пачатку ведала, як ён будзе пакрыўджаны.

Стасаў прататып адзін час мне вельмі не падабаўся, я прыдумала дэтэктыў і нарэшце пачала спакойна вітацца з тым хлопцам.

Былі свае прататыпы ў Даніка і Санькі. Але здаецца, што мае героі з цягам часу аказаліся зусім іншымі.

## Не вінаватая я

Звычайна пісьменнікі адзначаюць, што праз пэўны час героі пачынаюць жыць сваім жыццём і застаецца толькі запісваць за імі. Умберта Эка, аўтар рамана «Імя ружы», лічыць, што на самай справе ўсё не зусім так. Героі могуць жыць сваім жыццём, але яны не выходзяць за межы рэчышча, што адведзена ім пісьменнікам, ім зададзены накірунак.

Я не планавала, што Ірына зробіць аборт. Але, па Умберта Эка, можна сказаць, што я стварыла яе такой, што яна аказалася здольнай на гэта. Гэтаксама я не збіралася зводзіць Аспіранта з Таняй. Так атрымалася само сабой. А гэта тыя ж самыя «сентыментальныя соплі» і адвечнае жаданне happy end'а.

Гэты рух да шчаслівай канцоўкі можна прасачыць па чарнавіках. Спачатку я напісала сцэну, дзе Ірына захоплена расказвае Тані пра ноч з Аспірантам, а потым само атрымалася, што кахае Іра не яго, а Стаса. Значыць, не можа быць аніякага захаплення, а магчымыя толькі нешматлікія двухсэнсоўныя выказванні. Сцэну прыйшлося выразаць.

Я была таксама абвінавачана ў залішняй натуралістычнасці і пошласці.

Тая ж Веранічка ў прыбіральні. Усе адзначаюць, што сцэна жахлівая і ўвогуле як можна так пісаць. Але, калі я пішу, я іншы чалавек, для мяне няма нічога добрага ці дрэннага, прыгожага альбо непрыгожага, ёсць мэта і ёсць словы.

А калі сказаць шчыра, то, пішучы сцэну з Веранічкай, я не ўяўляла сабе, як яна там ляжыць, званітаваўшы, і чытачам сваім не раю.

А наконт пошласці... Адзін мой аднакурснік раіў па-сяброўску, што трэба так пражыць студэнцкія гады, каб потым усё жыццё ўспамінаць. Трэба жыць, трэба піць і г. д. Але, прачытаўшы твор, ён быў

жахліва абураны маёй «пошласцю». Ён прызнаваў, што ўсё, апісанае мной, існуе, але: «Навошта пра гэта пісаць? Гэта бульварнае чытво! Збор плётак!»

Так я даведалася, што лепш усё гэта рабіць, чым пра ўсё гэта пісаць.

### Напішы інтымную сцэну

Самы вялікі камплімент, які я атрымала за «Забойства ў студэнцкім інтэрнаце», было абвінавачванне ў тым, што інтымную сцэну Аспіранта з Ірынай я аднекуль спісала. І аргумент быў «жалезны», маўляў, я такое напісаць не магла.

На што я адказала, што магу сесці і напісаць дваццаць разнастайных інтымных сцэн, і для гэтага зусім не абавязкова ўсе гэтыя дваццаць сцэн перажыць.

А яшчэ мне паведамілі, што «хто пра што, а я пра секс», што апісваць інтымныя сцэны анамальна, бо трэба сябе ўяўляць на месцы сваіх герояў. Хлусня!!! Зусім не трэба сябе ўяўляць. Калі б я ўяўляла сябе, я не напісала б такіх інтымных сцэн. Калі ўспомніць момант, дзе Ірына скочыла на Аспіранта, а потым уявіць на яе месцы мяне, то стане відавочна, што кампрэсійны перालом пазваночніка быў бы таму Аспіранту забяспечаны.

Такім чынам, рукапіс...

А рукапісу не было. І ў гэтым я бачу вялікі свой недахоп. Адна справа пісаць, прапускаючы праз руку кожны радок, а другая — не задумваючыся, ляпаць па клавіятуры. Не магу пісаць ад рукі, бо праз хвіліну пачынаю маляваць між сказаў і ў рэшце рэшт не напішу нічога. Калі я пішу ад рукі, я страшэнна доўга абдумваю кожны сказ, бо лянота заядае сто разоў перапісваць, а на камп'ютэры: захацела — напісала, захацела — знішчыла.

А знішчыла я даволі шмат. Быў цікавы эпізод інтымнай сцэны Даніка з Веранічкай. Данік нібыта

па матывах кніжкі, якую даў яму сябар, займаўся з Веранічкай аральным сексам. Мае сяброўкі пачыталі, абмеркавалі і вырашылі, што не мог Данік такога зрабіць. І ў апошнім варыянце Данік цалуе Веранічцы руку. А тая першая сцэна не прападзе, устаўлю ў які-небудзь іншы твор, бо я, як Плюшкін, нічога не выкідаю, а перапісваю ў іншы файл.

ЗМЕСТ

Ляўша на тэнісным корце ........................................ 5

Моцарт і Моцарт ........................................................ 25

Улляна, альбо Нарадзі ў сабе гейшу ........................ 37

Смерць на роліках ..................................................... 149

Нястрымнае жаданне:
*Жартаўлівы дэтэктыўчык* ..................................... 226

Забойства ў студэнцкім інтэрнаце ............................ 273

Спроба напісаць дэтэктыў ......................................... *339*

*Літаратурна-мастацкае выданне*

Бязлепкіна Аксана Пятроўна

**Ляўша на тэнісным корце**

*Аповесці і апавяданні*

Рэдактар *Н. Давыдзенка*
Тэхнічны рэдактар *А. Глекаў*
Карэктар *Н. Аляксеева*
Вёрстка *Л. Ваўчок*
Адказны за выпуск *Г. Вінярскі*

Падпісана да друку 5.04.2002 г. Фармат 84x108 $^{1}/_{32}$
Папера афсетная. Гарнітура SchoolBook. Ум. друк. арк. 18,48.
Ул.-выд. арк. 13,53. Наклад 500 паасоб. **Зак. № 0285.**

МГА «Беларускі кнігазбор».
220034, Мінск, вул. Фрунзе, 5.
Тэл./факс (017) 220-70-27.
Ліцэнзія ЛВ № 105 ад 31.12.97 г.

Надрукавана з дыяпазітываў заказчыка ў друкарні «Прынткорп».
Ліцэнзія ЛП № 347 ад 11. 05. 1999 г. 220141,
г. Мінск, вул. Купрэвіча, 18.

ISBN 985-6638-58-5
9 789856 638582

Ляўша на тэнісным корце
Моцарт і Моцарт
Уляна, або Нарадзі ў сабе гейшу

Аксана БЯЗЛЕПКІНА

# *Ляўша на тэнісным корце*

Смерць на роліках
Нястрымнае жаданне
Забойства ў студэнцкім інтэрнаце